# палескае вяселле





*Палескія родныя нашы прасторы,*
*Як глянеш — ім краю нідзе не відаць,*
*Лясы, пералескі, з блакіту азёры,*
*Над Прыпяццю вольнай дубровы шумяць.*

*І там, дзе ляжалі калісьці балоты,*
*Сады зеленеюць, палі і лугі,*
*І жыта буйное стаіць, як чароты,*
*Квітнее цудоўны наш край дарагі.*

А. Дзеружынскі



# Палескае вяселле

*Укладанне і рэдакцыя В. А. Захаравай*

Мінск
Выдавецтва „Універсітэцкае"
1984

ББК 82.3 Бел-6
П 14

Рэкамендавана кафедрай рускай савецкай літаратуры філалагічнага факультэта БДУ імя У. І. Леніна; загадчык кафедры І. П. К а х н о, доктар філалагічных навук

Р э ц э н з е н т ы:
К. П. К а б а ш н і к а ў,
доктар філалагічных навук, прафесар;
А. С. Ф я д о с і к,
доктар філалагічных навук, прафесар

П $\frac{4604000000-005}{М 317-84}$ 51—83

**© Выдавецтва «Універсітэцкае», 1984**

# ФАЛЬКЛОР І СУЧАСНАСЦЬ

У апошняе дзесяцігоддзе ў многіх краінах свету прыкметна ўзмацнілася, у параўнанні з папярэднімі перыядамі, цікавасць да народнага мастацтва. Праблема яго захавання і прымнажэння «набывае новы — **экалагічны аспект**, вылучаны XX стагоддзем у сувязі з працэсамі ўзрастаючай урбанізацыі, тэхнічнага прагрэсу...»[1].

Наша мастацтва аперыруе такімі сацыяльна-філасофскімі катэгорыямі, як «час», «грамадства», «мір». Да іх настойліва і патрабавальна далучаюцца жыццёва неабходныя тэмы эпохі: «чалавек і прырода», «мастацкая культура і прырода», а ў наш час паўстае і больш шырокае пытанне аб захаванні раўнавагі ў сістэме чалавек — тэхніка — прырода.

У СССР дзейнічае Закон «Аб ахове і выкарыстанні помнікаў гісторыі і культуры», які забяспечвае «захаванне і эфектыўнае выкарыстанне» помнікаў гісторыі і культуры «ў інтарэсах камуністычнага будаўніцтва», у мэтах «фарміравання высокага пачуцця савецкага патрыятызму, ідэйна-маральнага, інтэрнацыянальнага і эстэтычнага выхавання працоўных». У лік гэтых помнікаў уключаюцца «запісы фальклору і музыкі»[2].

Народнае мастацтва ва ўзбагачэнні духоўнага патэнцыялу працоўных займае значнае месца. Любоў да роднай зямлі і мірнай працы, непрымірымая нянавісць да прыгнятальнікаў, да дэспатызму і насілля, імкненне да свабоды, праўды, дабра, справядліва-

---

[1] *Некрасова М. А.* Актуальные проблемы теории и практики народного искусства в свете постановления ЦК КПСС «О народных художественных промыслах».— У кн.: Проблемы народного искусства.— М.: Изобразительное искусство, 1982, с. 7.

[2] Правда, 1976, 31 окт.

сці — вось тыя традыцыі, якія мы пераймаем у народнай паэтычнай творчасці мінулых эпох і якія лічым жывымі і дзейснымі і ў наш час. Многія пісьменнікі, мастакі, кампазітары чэрпалі і чэрпаюць натхненне з бяздонных крыніц фальклору.

У Канстытуцыі СССР запісана: «Дзяржава клапоціцца аб ахове, прымнажэнні і шырокім выкарыстанні духоўных каштоўнасцей для маральнага і эстэтычнага выхавання савецкіх людзей, павышэння іх культурнага ўзроўню»[3].

Фальклор савецкіх народаў мае вялікую каштоўнасць для навукі яшчэ і таму, што ён да гэтага часу ў асобных рэгіёнах нашай краіны захоўвае жывыя формы творчасці і жывыя формы бытавання, тады як у многіх народаў Еўропы ён даўно ўжо стаў рэліктам. Сучасныя фалькларысты, студэнты вышэйшых навучальных устаноў кожны год наладжваюць паездкі за паэтычнымі скарбамі народа, запісваюць многія тысячы тэкстаў.

У навуковых даследаваннях беларускіх фалькларыстаў і этнографаў В. К. Бандарчыка, Г. А. Барташэвіч, Н. С. Гілевіча, М. Я. Грынблата, М. М. Грынчыка, І. В. Гутарава, К. П. Кабашнікава, У. А. Калесніка, М. Р. Ларчанкі, А. С. Ліса, Л. А. Малаш, М. М. Нікольскага, Л. М. Салавей, К. А. Цвіркі, Г. І. Цітовіча, І. К. Цішчанкі, А. С. Фядосіка, Р. Р. Шырмы і інш. разглядаюцца пытанні паходжання, эвалюцыі, ідэйна-тэматычнага зместу і паэтыкі асноўных жанраў і відаў беларускага фальклору, выяўляюцца ўзаемасувязі літаратуры і фальклору, вывучаецца праблема развіцця беларускай вусна-паэтычнай творчасці ў мінулыя часы і яе лёс у савецкі перыяд. Значнае месца займае даследаванне беларускай народнай творчасці ў міжславянскіх сувязях.

Немалаважны ўклад у скарбніцу агульнабеларускага фальклору ўнесла Беларускае Палессе. Гэты край мае сваю шматвяковую гераічную гісторыю і багатую народную культуру, якая адыходзіць у глыбіню стагоддзяў, добра захоўвае традыцыйныя элементы ўсёй славянскай духоўнай культуры.

Палессе знаходзіцца паміж тэрыторыямі, на якіх сфарміраваліся тры роднасныя народы ўсходнеславянскага паходжання — рускі, беларускі, украінскі. На захадзе яно прымыкае да іншых славянскіх тэрыторый. Тут здаўна адбывалася ўзаемадзеянне розных этнічных культурных традыцый, якія мелі глыбокія гістарычныя карані.

Аб выключным значэнні даных палескай духоўнай і матэрыяльнай культуры не толькі для вывучэння ўсходнеславянскага асяроддзя, але і для славянскай фалькларыстыкі і этнаграфіі ў цэлым пісалі Д. Булгакоўскі, З. Даленга-Хадакоўскі, М. Доўнар-Запольскі, І. Сербаў, А. Сержпутоўскі, П. Шпілеўскі, О. Коль-

[3] Канстытуцыя (Асноўны Закон) Саюза Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік.— Мн., 1977, с. 14.

берг, К. Машынскі і інш. [4] У працах гэтых вучоных сабран значны матэрыял па фальклоры, звычаях, норавах, паданнях і быце жыхароў Палесся. К. Машынскі пераканаўча даказаў, што каштоўныя даныя, якія адлюстроўваюць многія старажытнаславянскія (праславянскія) рэліктыўныя формы і адносіны, могуць быць выкарыстаны для рэканструкцыі праславянскага стану [5].

У апошні час да гэтага рэгіёна зноў звярнуліся рускія, беларускія і ўкраінскія вучоныя. Ужо некалькі гадоў экспедыцыі Інстытута славяназнаўства і балканістыкі АН СССР па комплекснай праграме працуюць над Атласам духоўнай культуры Палесся, які мае лінгвістычны, фальклорны, этнаграфічны аспекты. Як піша даследчык славянскай духоўнай культуры М. І. Талстой, «у сучасных умовах, у сучаснай Славіі (у сферы распаўсюджання славянскіх моў і этнасаў)... Палессе для лінгвіста, фалькларыста і этнографа з'яўляецца запаведнікам моўнай і духоўнай культуры, які захаваў мноства каштоўнейшых помнікаў вуснай, жывой даўніны» [6].

Пытанні ўзаемадзеяння рознаэтнічных фальклорных традыцый і рэгіянальнай асаблівасці беларускага фальклору вывучалі і даследчыкі беларускай народнай музыкі. Вялікую тэарэтычную і практычную цікавасць мае збіральніцкая і даследчая дзейнасць на Палессі народнага артыста СССР Р. Р. Шырмы, найбуйнейшага знаўцы беларускай народнай творчасці. Чацвёрты том «Беларускіх народных песень», выдадзеных Р. Р. Шырмай, прысвечан вяселлю [7], якое ён разглядае як «самы ўрачысты абрад у жыцці беларускага народа», як «своеасаблівую народную оперу з пралогам, драматычнай кульмінацыяй і заўсёды шчаслівым заканчэннем». Збіральнік піша: «Народ стагоддзямі дасканаліў, калі можна так назваць, лібрэта гэтае оперы, якая надзвычай багата насычана спевамі, музыкай, танцамі, вострым дыялогам, гумарам» [8].

Праз «далячынь стагоддзяў» беларускі народ пранёс выдатныя мастацкія тварэнні мінулага. Першае пісьмовае ўпамінанне аб вясельных песнях адносіцца да 1096 г. [9], але ўзніклі яны намнога раней. Аб існаванні вясельных звычаяў апавядае летапіс па Лаў-

---

[4] *Кабашнікаў К. П.* Беларускі фальклор у параўнальным асвятленні.— Мн.: Навука і тэхніка, 1981.

[5] *Moszyński K.* O sposobach badania Kultury materialnej Praslowian.— Wrocław — Warszawa, 1962.

[6] *Толстой Н. И.* Атлас духовной культуры Полесья — лингвистический, фольклорный и этнографический аспекты.— У кн.: Рэгіянальныя традыцыі ва ўсходнеславянскіх мовах, літаратурах і фальклоры. Тэз. дакл. II рэсп. навук. канф. Гомель, 1980, с. 17.

[7] Пададзены ў гэтым томе абрад «Вяселле» запісан у 1928 г. ад Захвеі Хвораст у в. Шакуны Пружанскага павета (былая Заходняя Беларусь). У наш час тут працавала фальклорная экспедыцыя БДУ імя У. І. Леніна.

[8] Беларускія народныя песні.— Мн.: Беларусь, 1976, т. 4, с. 5.

[9] *Карский Е. Ф.* Белорусы.— М., 1916, т. 3, ч. 1, с. 48.

рэнцьеўскаму спісу (980 г.), калі полацкая князёўна Рагнеда адмовілася выйсці замуж за ноўгарадскага князя Уладзіміра, бо ён быў сынам рабыні [10].

Па глыбіні зместу, сваіх мастацкіх вартасцях вылучаюцца старадаўнія сіроцкія вясельныя песні Палесся, якія запісаны ў наш час. У іх знайшлі сваё адлюстраванне архаічныя з'явы славянскай абраднасці, якія звязаны з культам продкаў і аграрнымі культамі. Найбольш цікавым з'яўляецца ўяўленне аб касмічным вечным свеце і хмары як пасрэдніцы паміж нябесным і зямным светам, а таксама крыніцы бессмяротнасці. Маладая не баіцца хмары, бо ў ёй — яе бацька і маці. Яны «дробным дожджыкам абальюць, шчасцем-долейкай абашлюць». У якасці пасланцоў да абагатвораных продкаў, якія знаходзяцца на небе, у песнях выступаюць птушкі (сокал, салавей, сініца, зязюля і інш.). Яны надзяляюцца здольнасцю размаўляць на мове чалавека, устанаўліваць зносіны як з мёртвымі, так і з жывымі.

Даследчыца рускай народнай песні Н. П. Калпакова, разглядаючы вясельныя песні, зазначала, што на Украіне і ў Беларусі песні захавалі «больш строгую абрадавую афарбоўку, у рускіх яны ўжо даўно перайшлі на больш ажыўленую і вясёлую стадыю гульні і пацехі, гэта значыць, што рускі фальклор значна раней, чым украінскі і беларускі, стаў губляць многія са сваіх архаічных рыс...»[11].

Старажытная аснова ў рускіх, украінскіх і беларускіх вясельных песнях была агульная, але захавалася яна не ўсюды ў аднолькавай ступені. Гэта можна сказаць і аб каляндарных абрадах і песнях.

Бясцэнным дарам Зямлі — маці і карміцелькі, багаццем народа з'яўляецца хлеб. Яму прысвячаюцца многія абрады і песні. Зажынкі і дажынкі — заўсёды свята ў вёсцы. Яны адноўлены на сучаснай аснове і напоўнены сённяшнім зместам. Не забываюцца і іншыя старажытныя абрады і песні, якія звязаны з асноўнымі этапамі росту, выспявання і жніва яравых культур, а таксама пажаданымі для гэтых этапаў перыядамі дажджоў (абрад «ваджэння Куста», які функцыянальна блізкі траецкаму святу, завіванню вянкоў «на годы добрыя, на жыта густое, на ячмень каласісты, на авёс расісты, на грэчку чорную, на капусту белую»).

Шэсце на чале з «Кустом» спраўляе «дзявоцкае войска» раннім летам, калі ўсё красуе, пясціцца і любіць. Галоўную ролю ў куставой абраднасці адыгрывае раслінкасць. Дзяўчына, якая выконвае ролю Куста, з ног да галавы пакрыта галінкамі клёну, ліпы, на яе галаве красуе вянок з палявых кветак. У час шэсця яна

[10] Повесть временных лет.— М.— Л., 1950, ч. 1, с. 54.

[11] *Колпакова Н. П.* К вопросу о жанровом соотношении бытовых народных песен восточных славян.— У кн.: Русский фольклор. М.— Л.: Изд-во АН СССР, 1963, т. 8, с. 204.

сапраўды нагадвае куст у руху. Гэта ўвасабленне жывых сіл прыроды, прадукт мастацкага мыслення, мастацкай дзейнасці людзей.

Удзельнікі святочнага шэсця з кожнага сялянскага двара патрабавалі дары, таму што Кусту трэба «піці, есці даці». У старадаўнасці ў гэты дзень жанчыны выпякалі каравай і ішлі з ім у поле, там яго дзялілі. Дзяўчаты частку каравая высушвалі на сухары і хавалі. У час вяселля з гэтых сухароў рабілі квас і ўлівалі ў цеста, прызначанае для вясельнага каравая. Матывы шлюбу і сельскагаспадарчай урадлівасці ў гэтай абраднасці спляліся так неразрыўна, як гэта магло быць толькі на ранніх ступенях развіцця каляндарнай паэзіі. У час экспедыцый куставы абрад і песні былі запісаны ў Пінскім і Столінскім раёнах у 70-я гады.

Хлеб у абрадавай паэзіі ніколі не ўспрымаўся толькі як прадукт харчавання. Ён — арэчаўленне жыццёвага вопыту, працы многіх пакаленняў хлебаробаў.

Найбольш старадаўнія звесткі аб караваі пакінулі летапісцы. Іх скупыя запісы сведчаць пра тое, што нашы продкі — язычнікі — пакланяліся не толькі галоўным багам — Перуну, Воласу, Хорсу, Дажбогу, Стрыбогу, але і Роду і Рожаніцам. Выступаючы супраць язычаства і шанавання язычаскіх багоў, аўтар «Слова хрысталюбца» малюе карціну ахвярапрынашэння: «И тако покладывают им требы и **короваи** (выдзелена намі. — **В. З.**) им ломят... моленое то брашно дают и ядять... ставять лише кумиромъ трапезы котѣйныя и законѣнага абѣда, иже нарицается беззаконная трапеза, мѣнимая Роду и Рожаницам...»[12]

Род быў пры першабытнаабшчынным ладзе асноўнай грамадскай арганізацыяй. Ён уяўляў сабой саюз вялікіх сямей, якія знаходзіліся у сваяцкіх адносінах і вялі агульную гаспадарку. Старажытныя славяне, як і іншыя народы, спачатку абагатваралі сілы прыроды, а потым і грамадскія адносіны людзей. Гэта зазначаў Ф. Энгельс: «Фантастычныя вобразы, у якіх спачатку адлюстроўваліся толькі таямнічыя сілы прыроды, набываюць цяпер таксама і грамадскія атрыбуты і становяцца прадстаўнікамі гістарычных сіл»[13].

У славянскай міфалогіі ўвасабленнем роду, адзінства продкаў і патомкаў былі богі Род і Рожаніцы. Людзі маліліся гэтым багам, каб яны паслалі ім сваю міласць, спраўлялі ахвярапрынашэнні ежай: кашай, якая спецыяльна для гэтага гатавалася, сырамі, піццём (мёдам). У ліку гэтых страў былі і караваі.

Палескае вяселле — гэта вяселле па так званаму каравайнаму абраду. Узнікла яно ў глыбіні сівога матрыярхату, калі існаваў радавы лад. Аб гэтым можна меркаваць, зыходзячы з асобнай вядучай ролі роду (радзіны), племя, грамады, каравайніц, брата і ма-

---

[12] Памятники древнерусской церковно-учительной литературы.— Спб., 1897, вып. 3, с. 225—227.

[13] *Маркс К., Энгельс Ф.* Соч. 2-е изд., т. 20, с. 329.

ці нявесты, свата на вяселлі, што знайшло адлюстраванне і ў песнях («Станавіся, родзе багаты», «Адзывайся, племя», «Не стой, род, за плячыма» і інш.).

«...Племя, род і іх установы былі свяшчэнныя і недатыкальныя, былі той дадзенай ад прыроды вышэйшай уладай, якой асобны чалавек заставаўся безумоўна падпарадкаван у сваіх пачуццях, думках і ўчынках»[14]. Разам з жаніхом у песнях род ідзе да яго «цесценькі на вайну», каб «зваяваць» нявесту, узяць «маладу Надзечку з вяночкам», род «запівае» маладую, дарыць маладую і маладога, клапоціцца аб іх шчасці. Вяселлю надавалася і надаецца вялікае значэнне.

Вядомы савецкі фалькларыст і этнограф К. В. Чыстоў адзначаў, што ў фальклоры ёсць жанры, «якія ўяўляюць вялікую тэарэтычную цікавасць як з'ява, якая стаіць на мяжы быту і мастацтва і дазваляе назіраць заўсёды таямнічую для нас «механіку» ўзнікнення вялікага мастацтва на глебе самага штодзённага, будзённага жыцця»[15]. Гэта было сказана пра галашэнні.

Вось гэта «мяжа быту і мастацтва», «„механіка" ўзнікнення вялікага мастацтва на глебе самага штодзённага, будзённага жыцця», на наш погляд, выразна выяўляецца ў каравайным абрадзе і яго паэзіі, якія па ступені распрацаванасці унікальныя ва ўсім славянскім свеце. Трэба падкрэсліць, што тут гаворка ідзе аб вяселлі, якое бытавала не толькі ў мінулы час, але запісана цяпер. У 60—70-я гады нам неаднаразова даводзілася прысутнічаць на вяселлі ў Пінскім (в. Парэчча, Табулкі, Чамярын) і Столінскім (в. Верхні Церабяжоў) раёнах. Тут ашчадна захоўваюць усё лепшае ў традыцыйным вяселлі.

Каравай — галоўны сімвал вяселля. Ён звязан з паэтызацыяй адносін да хлеба, да чалавека, які стварае хлеб. У старажытнасці гэтаму асабліваму свяшчэннаму хлебу прыпісвалася магічная сіла, у яго прыгатаванні прымалі ўдзел не толькі шчаслівыя ў сямейным жыцці жанчыны, але і, паводле ўяўленняў нашых продкаў, нябесныя свяцілы. Маці маладой (маладога) каравайнічак збірае «па месяцу і па зорачках і па яснаму сонцу».

Каравайніцы звяртаюцца з просьбай да месяца спусціцца з неба, сесці на самым пачэсным месцы — покуце, дапамагчы ім, «пасвяціць ясненька, каб было відненька». Для самога ж каравая «многа ўсяго трэба»: «з сямі палёў пшаніца, з сямі крыніц вадзіца, з сямі кароў масла, а яец паўтараста», прычым усё гэта павінна быць маладым, ярым: «і яйца з маладых курэй, і мёд з ярых пчолак».

Песні, якія выконваюцца ў час каравайнага абраду ў строгай паслядоўнасці з прыгатаваннем абрадавага хлеба, тэматычна звязаны паміж сабой, і гэта дазваляе гаварыць пра іх як пра часцінку

[14] *Маркс К., Энгельс Ф.* Соч., т. 21, с. 99.
[15] *Чистов К. В.* Русская причеть.— У кн.: Причитания. М., 1960, с. 7.

паэтычнага расказу аб заключэнні шлюбу. Лічыцца, што шчаслівы шлюб можа адбыцца толькі пры наяўнасці прыгожага, удала выпечанага каравая. Па ходу абраду некалькі разоў гучыць песня:

Ой, чыя то маценка
Па ўсіх вулачках ходзіць
І суседачак просіць:
— Ой, суседачкі мае,
Прыхадзіце да мяне,
Да майго дзіцяці,
Каравай рашчыняці (мясіці, качаці,
садзіці, вымаці, квяціці).

Каравайніцы з'яўляюцца сапраўдным увасабленнем лепшых маральных якасцей народа. Гэта сумленныя, высакародныя, працавітыя жанчыны, яны карыстаюцца ўсеагульнай любоўю і павагай.

Такая, здаецца, больш чым празаічная справа, як выпечка каравая, ператвараецца ў цэлы рытуал са складаным комплексам этычных і эстэтычных уяўленняў народа, прычым адбываецца ён на вачах шматлікіх гледачоў. Дзеці таксама прымаюць самы непасрэдны ўдзел у гэтым абрадзе. Для ўпрыгажэння каравая яны прыносяць кветкі, пучкі аўса, галінкі каліны. Для іх разам з караваем і з таго ж цеста пякуцца булачкі.

Каравайніцы не з'яўляюцца прафесіянальнымі выканаўцамі абраду і песень. Часцей за ўсё гэта сваячкі маладой (маладога), суседкі. Сярод іх заўсёды знаходзіцца жанчына, якая ведае многа песень і бездакорна выконвае іх. Яна раней за ўсіх пачынае песню, якую потым падхопліваюць астатнія. Яна ж даўжэй за ўсіх трымае на адной ноце «падгалосак». Голас такой спявачкі прыкметна вылучаецца ў хоры іншых галасоў. Звычайна бывае 5—7 каравайніц, у асобных выпадках іх лік даходзіць да 33.

Жанчыны працуюць весела, лёгка і ўвішна. Каравайныя песні — неад'емная частка прыгатавання абрадавага хлеба:

Благаславіце, людзі,
Блізкія суседзі,
Гэтаму дзіцяці
Каравай учыняці,
Ручкамі бяленькімі,
Персцянямі залаценькімі,
Песнямі весяленькімі.

«Песні весяленькія» ў той жа ступені садзейнічаюць поспеху ў выпечцы абрадавага хлеба, як і дружная работа каравайніц.

Прывабная праца, пранікнутая клопатам аб шчасці маладых, дае кожнай каравайніцы магчымасці для рэалізацыі свайго творчага патэнцыялу, для выяўлення сваёй асобы ва ўсёй духоўнай паўнаце. Увесь каравайны абрад, ад пачатку да канца, — арыгінальная з'ява беларускай нацыянальнай культуры.

У жыцці нявесты і жаніха каравай мае і практычнае, матэрыяльнае, і духоўнае прызначэнне, таму ў каравайных песнях звычайна адлюстроўваюцца бытавыя гаспадарчыя клопаты маладых. Жаніх павінен быць добрым земляробам, поле для каравая ён арэ «залатым» плугам. Нявеста вырошчвае для каравая «перабор пшаніцу»:

Ой, зоры, зоры,
Узыдзіце ў поры,
Маладая Надзечка
Пшанічаньку поле.
Яна поле
Ды перабірае,
Кукуль-зеллечка
На мяжу скідае.
. . . . . . . .
Расці, пшаніца,
У каравай багаты.

Каравайныя песні напоўнены вобразамі роднай прыроды, сямейна-бытавых адносін, сельскагаспадарчай працы. У іх паэтызуецца не толькі ўвесь працэс вырошчвання залатога зерня, але і абрадавы бок жніва. Назіранні народа над сваёй уласнай працай і творчасцю надзвычай цікавыя:

Яравая пшанічанька,
Як цябе сеюць—ветры веюць,
А як валочаць—дажджы мочаць,
А як зажынаюць—дык спяваюць.

Паэтычныя вобразы каравайных песень прыкметна збліжаюцца з вобразамі каляндарна-абрадавай паэзіі, адным з вядучых матываў якой з'яўляецца дастатак хлеба. У адной з песень пшаніца выступае як жывая істота. Звяртаючыся да людзей, яна гаворыць:

Альбо вы мяне сажніце,
Альбо касою скасіце.
Ужо мне надаела стаяці,
Залатое зерне трымаці.

Усе гэтыя творы, безумоўна, звязаны са старадаўнім звычаем заклінання гаспадарчага дабрабыту, накіраваным на палягчэнне земляробчай працы. І «чым далей у старыну, тым звычайней і мацней вера ў здольнасць слова адным сваім з'яўленнем рабіць тое, што ім азначана»[16]. На такой веры заснаваны многія каравайныя песні. Здольнасцю станоўчага ўздзеяння на людзей і прыроду надзяляецца каравай, які ў песнях выступае як рэальны сродак для дасягнення жыццёвых ідэалаў. Умовы яго выпечкі незвычайныя:

---

[16] *Потебня А.* Объяснение малорусских и сродных народных песен. Колядки и щедровки.— Варшава, 1887, т. 2, с. 59.

Затапіла маці
Залатымі дровамі,
Шоўкавыя дымы ішлі,
Там для Надзечкі
Каравай пяклі.

Каравай уяўляе сабой нейкую ўмоўную матэрыялізацыю высокіх духоўных якасцей людзей, у першую чаргу каравайніц. Замешваючы цеста, яны як бы «замешваюць» шчасце будучай сям'і. Кожная з запрошаных жанчын павінна прыняць удзел у прыгатаванні каравая і тым самым як бы перадаць яму свае лепшыя якасці.

Прыгатаванне вясельнага каравая перш за ўсё застаецца справай рэальнай. Разам з тым яна паступова асэнсоўваецца і ўспрымаецца ва ўмоўным плане, які надае сапраўднай жыццёвай з'яве рысы чараўніцтва, казачнасці. Гэтаму садзейнічаюць рытуальныя дзеянні і песні:

Да й узыдзі, месячык, узыдзі,
Да нашага караваю паглядзі.
Да нашага караваю паглядзі,
Ці хораша маладзіца рашчыніла.

Або:

А на небе месячык узышоў,
У дзяжы каравай падышоў.

Выяўленню сапраўднай сутнасці каравайнага абраду садзейнічае і такая песня:

Не ўленкайся [17], дзеванька,
Твой каравай падыходзіць.
З дзяжы века падымае—
Твая доля прыбывае.

Паводле старажытных уяўленняў, золата, серабро, каштоўныя камяні — атрыбуты сонца. У каравайных песнях нават у печы «залатыя плечы, а срэбныя крыла». Маці нявесты (жаніха) запрашае каравайніц каравай

На золаце качаці,
На серабры саджаці,
Шоўкавым памялом месці,
Залатой лапатай несці.

Каравай — гэта ўвасабленне жывых сіл прыроды, ён мае свае думкі, размаўляе, дзейнічае, як чалавек. Ён можа быць нават незадаволены чымсьці, гэта значыць зведаць сапраўды чалавечыя пачуцці. І ўжо зусім як чалавек, які добра папрацаваў, каравай «гаворыць» пра сябе:

---

[17] Уленкацца — непакоіцца.

Ой, быў жа я ў печы,
Асмаліў сабе плечы.
Дайце мне сыру, масла,
Каб маё цела згасла.

Пра каравай ў вясельных песнях гаворыцца як пра «нявесціну заслугу», якую яна заслужыла не за год, не за два, а за ўсё сваё жыццё, прычым заслужыла і добрасумленнай працай і сваімі паводзінамі. Добра выпечанаму караваю радуюцца не толькі людзі, але і печ і прыпечак. Сама ж нявеста ператвараецца ў «дзіва», надзяляецца чароўным дарам прыносіць шчасце людзям. Вось як малюецца яе прыезд у дом жаніха:

Выйдзі, матанька, паглядзі,
Што ў цябе за дзіва на двары.
Лесам ехала—шумела,
Полем ехала—звінела,
У сені ўплыло ракою,
У хату ўвайшло паваю,
За стол села паннаю.

Папулярнасць і даўгавечнасць палескім вясельным песням забяспечылі іх цесная сувязь з абрадам, багатая і высакародная змястоўнасць, глыбокая эмацыянальнасць, чароўная паэтычнасць.

Цікавым у вясельных песнях з'яўляецца вобраз бацькі жаніха. Усе яго ўчынкі, перажыванні гавораць аб глыбокай чалавечнасці, мудрасці, маральнай сіле. Як і маці, ён праяўляе сардэчнасць і ўвагу да сына:

— Рад быў я, сынку,
Як ты радзіўся.
Цяпер радзейшы,
Што ажаніўся.

Бацька ў вясельных песнях павучае, настаўляе сына, накіроўвае яго ўчынкі і дзейнасць па разумным шляху, дае яму парады і пры выбары нявесты:

Не любі, сыночку,
Дзеўку ў цянёчку.
Палюбі сабе
У полі на ніве.
У полі на ніве,
На харошым жніве,
Што жне нізенька,
Кладзе раўненька,
Вяжа ёмненька,
Ставіць копкі
На полі гусценька.

Маральны ідэал працоўных мас вырастаў з патрабаванняў самаго жыцця. У дынамічным малюнку вясельныя песні аднаўляюць рух думак і пачуццяў, імкненняў, жаданняў, прычым гэта не простая іх змена, а тыя якасныя змяненні, якія адбываюцца ў барацьбе супярэчлівых тэндэнцый і якія складаюць змест песні. Замілавальна і паэтычна звяртаецца да бацькі дачка, якую ён аддае замуж:

— Ты, мой баценька,
Ты, мой родненькі,
За каго аддаеце?
Як за якога, за лайдакога,
Дык і паперу не псуйце.
Як за Колечку маладзенькага,
Золата не шкадуйце.

З вялікім пачуццём чалавечай годнасці дзяўчына абараняе сваё права выйсці замуж за таго, хто ёй па душы, прычым у сваім суджаным яна вышэй за ўсё цэніць працавітасць. У вясельных песнях праўдзіва і глыбока раскрываюцца самабытныя рысы нацыянальнага быту беларускага народа, яго светапогляд і ідэалы.

Прамяністым светам сонца асветлен вобраз маці, якая выпраўляе сына ў дарогу — за нявестай, а потым сустракае яго з маладой:

Маці сына выражала,
Месяцам апаразала,
Зоркаю засцягнула,
Долею агарнула.

Гэта карціна поўная велічнасці. Тут мала слоў, але адабраны, арганізаваны яны так, што захопліваюць, непакояць, хвалююць нас. І не адно мацярынскае сэрца здрыганецца ў момант выканання гэтых песень. А хіба могуць іх слухаць без хвалявання сыны? Многія з іх успомняць сваіх маці, якія іх выгадавалі і паслалі ў шырокі вольны прастор жыцця.

Вывучэнне палескага вяселля паказвае, што выкарыстанне прагрэсіўных народных традыцый узбагачае сямейныя святы, дае магчымасць прымаць удзел у іх многім людзям, уносіць ва ўсеагульнае вяселле шмат цікавых, своеасаблівых элементаў рамантыкі і паэтычнасці, эмацыянальнай насычанасці, маляўнічасці. Творы традыцыйнага фальклору застаюцца актуальна блізкія да нашага часу. Бясспрэчна іх светапоглядная ідэалагічная значнасць.

Уступленне чалавека ў самастойнае жыццё, выкананне ім свайго абавязку перад грамадствам, блізкімі, роднымі, выбар ім правільнага жыццёвага шляху — гэтыя пытанні заўсёды хвалююць людзей. Ды і зразумела: асноўнай умовай існавання народа з'яўляецца яго ўзнаўленне, новыя пакаленні ўвасабляюць і забяспечваюць прагрэсіўны рух чалавечага грамадства, з імі звязваецца ўяўленне аб будучым. З гэтага пункту гледжання вясельная паэзія мае значны інтарэс.

Як усялякая гістарычная з'ява, звычаі, абрады, святы і суправаджаючая іх паэзія схільныя да змянення, развіцця. Людзей новага грамадства не задавальняюць сумныя матывы, роспач, асуджанасць, уласцівыя вясельным галашэнням. У новых умовах жыцця такія творы амаль цалкам зніклі. Яны наогул не характэрны для беларускай вясельнай паэзіі. Гэтага нельга сказаць аб сіроцкіх песнях, у якіх гучыць вялікі душэўны боль жаніха або нявесты-сіраты. Найбольш багатыя і змястоўныя сярод іх выконваюцца ў наш час. Як і пахавальныя галашэнні, сіроцкія песні грунтуюцца на кульце продкаў, веры ў бессмяротнасць душы, на ўяўленнях аб тым, што нябожчыца-маці або нябожчык-бацька пасля сваёй смерці дапамагаюць сіротам.

Большую частку свайго традыцыйнага складу захоўваюць рытуальныя, заклінальныя, велічальныя, вясельныя лірычныя, жартоўна-сатырычныя песні, прыпеўкі да танцаў і ў час застолля, прыгаворы, рацэі, зычэнні.

Зусім выключнае месца ў вясельнай паэзіі Палесся займаюць каравайныя песні, якія садзейнічаюць фарміраванню, рэалізацыі абраду.

* * *

Песні, што склалі гэты зборнік, запісаны на Беларускім Палессі на працягу апошніх дваццаці гадоў — галоўным чынам студэнтамі філалагічнага факультэта БДУ імя У. І. Леніна ў часе фальклорнай практыкі. Адбор і сістэматызацыя матэрыялу падпарадкаваны асноўнай задачы — высветліць агульныя заканамернасці і спецыфічныя асаблівасці развіцця фальклору гэтага краю.

Непасрэднае кіраўніцтва вучэбнай практыкай і навукова-даследчай работай па фальклоры на кафедры рускай савецкай літаратуры (загадчык кафедры — доктар філалагічных навук І. П. Кахно) было ўскладзена на дацэнта В. А. Захараву; кіраўнікамі студэнцкіх груп у часе палявых работ былі выкладчыкі Т. В. Кабржыцкая, А. В. Карасёва, Р. М. Кавалёва, В. Д. Літвінка, І. І. Лушчыцкая, Г. Л. Нефагіна, І. С. Скарапанава, Д. В. Фёдараў, Р. І. Яраслаўцава. Разам са студэнтамі на практыку выязджалі аспіранткі Л. Л. Дзямянцей, С. Я. Ганчарова.

Пры выбары аб'екта вывучэння ўлічвалася не толькі ступень яго абследаванасці ў мінулым, але і гістарычны лёс гэтай мясцовасці.

Штогодняя палявая работа ў перыяд летняй практыкі спалучалася са стацыянарным абследаваннем асобных вёсак студэнтамі, ураджэнцамі гэтай мясцовасці (в. Дружылавічы, Моталь Іванаўскага раёна; Верхні Церабяжоў — Столінскага; Парэчча, Бо́лгары — Пінскага; Какорыца, Салава — Драгічынскага; Хаціслаў — Маларыцкага; Азершчына — Рэчыцкага раёнаў і інш.).

Пры вывучэнні вясельнага абраду і яго паэзіі былі абследаваны гарады і вёскі, што ляжаць на важнейшых водных магістралях краю (басейн Прыпяці з прытокамі Піна, Ясельда, Бобрык, Цна, Лань, Случ, Пціч, Стыр, Гарынь, Ствіга, Убарць), участкі басейнаў Заходняга Буга (басейн Му́хаўца), Нёмана (частка басейна Шчары) і Дняпра (басейны Сожа, Верхняй і Сярэдняй Брагінкі).

Тэксты падаюцца ў адпаведнасці з сучасным прынцыпам правапісу беларускай мовы, фанетычныя і марфалагічныя асаблівасці народнага вымаўлення захоўваюцца толькі ў тым выпадку, калі гэтага патрабуе форма (рыфма, рытм і інш.).

Падбор нот зроблен Ул. І. Раговічам, фотаілюстрацыі каравайнага абраду — Г. А. Краскоўскім.

Раздзел «Вяселле ў Дружылавічах» падрыхтаван аспіранткай Л. Л. Дземянцей.

Пры складанні зборніка былі ўлічаны крытычныя заўвагі і прапановы рэцэнзентаў і членаў кафедры рускай савецкай літаратуры БДУ імя У. І. Леніна.

Складальнік выказвае шчырую падзяку выканаўцам вясельных песень, якія далі магчымасць адчуць непаўторнае хараство, сілу і жыццёвасць фальклору.



# вясельны абрад

. . . . . . . . . . . . . . . . . .

*Прынесла аднойчы свой серп у дакоры.*
*Як глянуў каваль ёй у вочы-азёры,—*
*Увесь разгубіўся*
*Ды ў іх утапіўся.*
*Зацвіў, як ніколі,*
*Ледзь вымавіць здолеў:*
*— Я серп твой папраўлю, што будзе ён тонак,*
*Скую ж табе разам, дзяўчынка, пярсцёнак:*
*Прыложыш да вока —*
*Пабачыш далёка,*
*Калі ж загадаеш,*
*Каханне пазнаеш!*

П. Броўка

Вясельны абрад з'яўляецца адным з самых старажытных абрадаў беларускага сялянства. Узнік ён у феадальную эпоху на аснове традыцыйнага сялянскага сямейнага быту. На працягу такога значнага часу многія старажытныя элементы абраду былі страчаны, але галоўныя моманты развіваліся і захаваліся да нашых дзён.

Яркім і самабытным з'яўляецца вясельны абрад Палесся, у якім прымае ўдзел амаль уся вёска. І хоць зараз некаторыя другарадныя элементы абраду знікаюць, галоўныя застаюцца і выкананне іх з'яўляецца абавязковым. Можна выдзеліць наступныя асноўныя этапы палескага вяселля:

1) пярэпыты; 2) сватанне; 3) запоіны; 4) вянкі; 5) каравай; 6) першы дзень вяселля; 7) другі дзень вяселля; 8) трэці дзень вяселля; 9) госці.

Як відаць з такой класіфікацыі, вяселле працягваецца амаль цэлы тыдзень. Так было раней. Цяпер жа вяселле часта заканчваецца падзелам каравая; выконваюцца ўсе этапы вяселля ў тым выпадку, калі жаніх і нявеста жывуць блізка адзін ад другога і гасцям не трэба спяшацца дамоў.

## ПЯРЭПЫТЫ

Пярэпыты, як і сватанне, з'яўляюцца падрыхтоўчым этапам вясельнага абраду. Гэта не само вяселле, якое пачынаецца з выпечкі каравая, а як бы яго прадпасылка.

Па просьбе хлопца і пры згодзе дзяўчыны маці жаніха, хрышчоная маці, сястра мацеры, замужняя сястра жаніха («раднейшыя») ідуць у хату нявесты, каб перапытаць яе, ці згодна яна выйсці замуж. «Пайшлі на пярэпыты», — гавораць у такіх выпадках.

Маладыя людзі ўжо дамовіліся аб уступленні ў шлюб, атрымалі на гэта згоду бацькоў, але маці жаніха павінна «аглядзець» сваю будучую нявестку, перапытаць, ці згодна яна выйсці замуж за яе сына. Важна, каб дзяўчына сама сказала аб гэтым. Маці жаніха пячэ хлеб для мацеры нявесты. Пры згодзе на будучы шлюб мацеры абменьваюцца хлебам, пасля чаго робіцца лёгкі пачастунак. Па ўсёй вёсцы распаўсюджваецца навіна: «Хлеб абмянялі»[18].

У час падрыхтоўкі да шлюбу, калі Палессе было глухім і бедным краем, адбывалася і такое абрадавае дзеянне: хлопец прыходзіў у хату сваёй абранніцы, несучы цераз плячо для ўсёй сям'і дзяўчыны лапці (пасталы) — узор свайго майстэрства. Ён кідаў іх на сярэдзіну хаты і пытаў: «Падобенькі пастоленькі?» Калі дзяўчына была згодна выйсці за яго замуж, яна адказвала: «Падобенькі». Так адбывалася дамаўленне, пасля чаго хлопец мог засылаць у хату дзяўчыны сватоў [19].

## СВАТАННЕ

Выбар сватоў, сяброў жаніха звычайна адбываецца на савеце, які трымаюць жаніх, яго бацькі і таварышы. Сватанне не даручаецца свацці-прафесіяналцы, сярод вясельных чыноў яе няма. Тэрміны «сват», «сваццяя» абазначаюць, з аднаго боку, прадстаўнікоў роду жаніха або нявесты, з другога боку, сват — хтосьці з бліжэйшых сваякоў жаніха або добрых знаёмых, надзеленых у час сватання і вяселля асобымі функцыямі кіраўніка абраду. У сваты звычайна ідуць вечарам у суботу, часцей усяго толькі мужчыны: сват (яго называюць старэйшым), жаніх, яго родны бацька, хрышчоны бацька, швагер, брат або іншыя сваякі (пяць, сем, дзевяць або адзінаццаць чалавек, лік звычайна няцотны).

Сваты павінны быць кемлівыя, умець паказаць жаніха з найлепшага боку, весела і непасрэдна даведацца ў дзяўчыны аб яе намерах. Гутарка часта вядзецца ў іншасказальнай форме (купляем або шукаем што-небудзь). У хаце нявесты знаюць аб прыездзе сватоў, рыхтуюць пачастунак. Сваты вязуць з сабой хлеб і віно. Яны прыязджаюць пасля заходу сонца, каб людзі не бачылі, на выпадак, калі нявеста перадумае і не дасць згоды на шлюб. У хаце нявесты старэйшы сват гаворыць: «Мы — людзі з далёкага краю, дарогаю прытаміліся, ці не пусціце, людзі добрыя, ноч пераначаваць?» Бацька маладой дазваляе. Тады сваты пытаюць: «Мы чулі, што ў вас цялушка ёсць, ці не прадасце вы яе нам?» Бацькі нявесты адказваюць, што няма ў іх цялушкі. Тады сваты гавораць: «Не, людзі добрыя, нам не цялушка патрэбна. Мы чулі многа добрага аб вашай дачушцы, што яна і прыгожая, і гаспадыня дбай-

---

[18] В. Верхні Церабяжоў Столінскага раёна.
[19] В. Пярэдзелка Лоеўскага раёна, в. Рубель Столінскага раёна.

ная, і да работы спраўная ды скорая. А ў нас ёсць галубок да пары вашай галубцы: і прыгожы, і гаваркі, і ў полі работнік, пашукаць такога. Дык ці не спараваць нашых галубкоў? Каб яны разам жылі, дзетак расцілі ды й на нас не забываліся?»

Старэйшы сват можа весці размову з бацькамі нявесты і так:

Наш хлеб—ваша вадзіца,
Наш хлопец—ваша дзявіца,
Наш хлопец не ўмее лапці плесці,
Ваша дзявіца не ўмее хату месці,
Трэба іх да кучы звесці.

Рытуал сватання патрабуе, каб сваты праяўлялі знаходлівасць, кемлівасць, вялі размову ў простай жартаўлівай форме, іншы раз атрымліваецца нават грубавата: «У вас — цялушка, у нас — бык, наш бык да вашай цялушкі прывык». Нярэдка сваты выдаюць сябе за купцоў: «Мы, багатыя купцы, збіліся з дарогі. Ваша хата — першая на павароце, вось мы і зайшлі». Бацькі нявесты пытаюць: «А што вы купіце?» Сваты адказваюць: «У вашым двары — красна дзявіца, у нашым двары — малады купец. Як сойдземся ў цане, дык яе купім».

Пры размове сватоў дзяўчына не павінна прысутнічаць. Калі ж яны просяць паказаць ім нявесту, спачатку да іх падводзяць іншых дзяўчат, але сваты гавораць, што гэта не тая, якая ім патрэбна, пасля чаго выходзіць сапраўдная нявеста. Сваты хваляць яе. У знак сваёй згоды на шлюб дзяўчына дарыць бацькам жаніха ручнік (для бацькі) і хустку (для мацеры).

У час сватання, калі на ім прысутнічаюць дзяўчаты, пяюцца песні:

Чаго, сваты, ды й прыехалі:
Чы па гарох, чы па сачавіцу?
Сачавіца ў капе стаіць,
А дзеванька ў касе сядзіць.

* * *

Прыбілася рыбка к гату,
Пусці, сват, у хату.
Мы ж цябе не згубім,
Возьмемо, што злюбім,
Вып'емо па кубачку,
Схопімо галубачку.
Вып'емо, падскочымо,
Возьмемо, што схочымо.

Бацькі і сваты ўдакладняюць тэрмін вяселля.

Калі дзяўчына не хацела ісці замуж або яе бацькам жаніх не падабаўся, яны ветліва адмаўлялі сватам, гаворачы, што дачка

яшчэ маладая, ёй рана замуж ісці, або клалі ў вазок сватоў звараны гарбуз. Дзяўчына пацвярджае свой адказ выйсці замуж і тым, што на наступны дзень плаціць сватам за выпітае імі ж віно.

Бывае, што бацькі не хочуць выдаваць дачку замуж, а яна імкнецца выйсці. Тут дзяўчыне трэба праявіць сілу волі, упартасць. Звычайна бацькі палохаюць тым, што вяселле ёй не зробяць, але далей пагроз справа не ідзе.

## ЗАПОІНЫ

Праз некаторы час пасля сватання ў доме нявесты праходзяць запоіны. Тут дзяўчыну як бы «запіваюць» да роду жаніха, і яна ўжо не мае права адмовіцца ад замужжа. Пасля сватання адказ яшчэ магчымы, хоць непажаданы. Вось як праходзяць запоіны на Палессі (в. Асаўніца, Моладава, Моталь Іванаўскага раёна, Салава, Какорыца, Спорава Драгічынскага раёна, Чамярын, Парэчча Пінскага раёна і інш.).

Звычайна запоіны прызначаюць на вечар у суботу ці нядзелю, калі не так многа гаспадарчых спраў. Жаніх з бацькамі і бліжэйшымі сваякамі (чалавек 20) ідуць да нявесты. Калі яны заходзяць у хату, нявеста хаваецца, каб яе не ўбачылі. Затое сама хоча ўбачыць жаніха першай, каб у будучым сямейным жыцці верхаводзіць мужам. Потым выходзіць да гасцей, вітаецца. Але прывітанне яе незвычайнае. Калі ўжо вечар, то яна кажа: «Добры дзень», калі яшчэ дзень, то «Добры вечар». Кожнаму з гасцей падае руку — гэтым падкрэслівае сваю згоду належаць да іх роду. Чаму вітаецца так незвычайна, невядома.

У гэты дзень нявеста апранута па-святочнаму, але не ў вясельны ўбор. Пасля прывітання гучаць жарты:

— Чаму вы сюды зайшлі, ці не згубілі чаго-небудзь?

— Вось шукалі жаніха, ішоў з намі ды згубіўся.

— Дзе ж вы хадзілі, што жаніха згубілі?

У падобных дыялогах кожны праяўляе сябе як можа.

Госці застаюцца ў доме, рассаджваюцца хто дзе, але за сталы не сядаюць, хаця ўсё ўжо падрыхтавана. А нявеста з жаніхом ідуць клікаць сваякоў нявесты, таксама самых блізкіх. Яны прыходзяць, і ўсе разам садзяцца за сталы, прычым самыя ганаровыя месцы адводзяцца бацькам жаніха і тым, хто прыходзіў сватаць нявесту.

У час запоін пяюць песні. Вось адна такая песня жартаўлівага характару:

Піце, сваты, гарэлку,
Запівайце дзеўку.
Хай гэта дзеўка
З касою не ходзіць,
Кавалераў не зводзіць.
Хай тыя кавалеры
Платоў не ломяць.

Акрамя спецыяльных пяюць самыя розныя песні, частушкі.

Перад тым як разысціся дадому, бацькі маладых абменьваюцца хлебам. Нявеста дае бацькам жаніха бутэльку з зернем жыта. Як тлумачаць вясковыя жанчыны, гэта сімвал таго, што нявеста аддае ім сваё жыццё, сваю долю. Маці жаніха гэта зерне рассыпае ў сябе па двары і ў хаце, каб з новым чалавекам да яе ў дом прыйшоў дабрабыт і шчасце [20]. Калі жаніх заставаўся жыць у нявесты, то бутэльку з зернем маці жаніха пакідала ў доме нявесты.

Ад запоін да дня вяселля нявеста павінна насіць толькі заплеценую касу. Калі раней валасы яна магла ўкладваць як хацела, то цяпер яе адзіная прычоска — каса. Гэтым падкрэсліваецца, што нявеста развітваецца са сваім дзявочым жыццём. Пасля вяселля хадзіць з касой яна не мела права.

Вяселле прызначаюць праз тыдзень-два пасля запоін, у залежнасці ад таго, як паспеюць падрыхтавацца. Напярэдадні вяселля бывае дзень, калі пякуць каравай. У гэты ж дзень (звычайна ў суботу) нявеста запрашае да сябе «на вянкі» ўсіх сяброўак. Па сутнасці, так пачынаецца вяселле.

## ВЯНКІ

Сяброўкі шыюць вэлюм, робяць кветкі для каравая, жаніха, дружкоў. Працуючы, пяюць песні:

Яра рутка, яра
Каля плота стаяла.
Там Надзечка плакала,
З руткі росу брала,
Расою ўмывалася,
У маценкі пыталася:
— Мая маценка родна,
Ой, пайдзі да каморы,
Прынясі шлюбны ўборы.
— Маё дзіцятка роднае,
Я ж цябе гадавала,
Шлюбны ўборы гатавала.

Жаніх запрашае братоў, сясцёр, сяброў (усіх чалавек 5—8) і едзе да нявесты «на вянкі».

Калі дзяўчаты зробяць кветкі, вэлюм, то ставяць на стол талерку з зернем, закрываюць хусцінкай, а наверх кладуць вэлюм. Кветкі складваюць у рэшата і ставяць на стале разам з вэлюмам. Самі дзяўчаты садзяцца вакол стала і пяюць жартоўную песню:

---

[20] Цікавая легенда, звязаная з рассыпаннем збожжа па хаце, бытавала ў народзе. Сэнс яе ў тым, што жыта выганяла з хаты «нячыстую сілу», якая перашкаджала жыць чалавеку.

Звілі вяночка з барвінку,
Нясі, маладьі, гарэлку.
Як не выкупіш—не дадзім,
А расшыем, прададзім.

Жаніху нічога не застаецца, акрамя выкупу вэлюму. У гэтым яму дапамагае брат або сябар, які нярэдка бывае больш кемлівы, чым жаніх.

Пасля выкупу вэлюму маладыя, дзяўчаты і ўсе астатнія садзяцца за сталы. Паглядзець на «вянкі» прыходзяць і пажылыя жанчыны. Іх таксама частуюць. Пяюць песні, толькі не вясельныя, а часцей за ўсё лірычныя [21].

«Вянкі» захаваліся да нашага часу.

## КАРАВАЙ (РЭДКА—ЗБОРНАЯ СУБОТА)

З выпечкі каравая і пачынаецца вяселле; без каравая яно немагчыма. Каравай «прысутнічае» пры ўсіх асноўных момантах вяселля, а яго выпечка і ўпрыгажэнне складаюць абрад з багатай паэтыкай і сімволікай, які дайшоў да нас з часоў язычаства.

На вяселле пякуць два караваі: адзін у нявесты, другі ў жаніха. У некаторых вёсках [22] каравай нявесты выпякаецца ў форме сонца, круглы, а каравай жаніха ў форме месяца, паўкругам. У такім выпадку каравай-сонца павінен сімвалізаваць нявесту, а каравай-месяц — жаніха. Абрад выпечкі абодвух караваяў аднолькавы. Каравай пякуць або ў дамах жаніха і нявесты, або ў дамах іх хрышчоных маці, таму што ўсё роўна кіраўніком пры выпечцы каравая з'яўляецца хрышчоная маці. І калі пякуць каравай у яе доме, то гэтым значна аблягчаецца падрыхтоўка да вяселля ў дамах маладых. Вяселле можа быць і з адным караваем, які пякуць у нявесты, радзей у жаніха, і дзеляць потым на ўсіх гасцей. Але такі абрад не распаўсюджан і сустракаецца рэдка [23].

За якасць каравая поўнасцю адказвае хрышчоная маці, якую называюць старэйшай каравайніцай.

Пякуць яшчэ і шышкі — спецыяльнае ўпрыгажэнне каравая, без якога ён немагчымы. Запаслівыя бацькі робяць шышкі задоўга да дня вяселля з галінак дрэў. Галінкі ачышчаюць ад кары і высушваюць. Для каравая патрэбна пяць шышак, прычым неад-

---

[21] У некаторых апісаннях вяселля «вянкі» зліваюцца з каравайным абрадам, які праходзіць у гэты час, таму захаваліся толькі элементы абраду «вянкоў». У в. Салава каравай пякуць таксама ў суботу, а ўпрыгожваюць яго ў нядзелю рана. Тут абодва гэтыя абрады захаваліся вельмі добра. Каравайны абрад в. Салава нічым не адрозніваецца ад апісанняў яго ў іншых вёсках.

[22] В. Лышча Пінскага раёна.

[23] В. Ботава Пінскага раёна.

нолькавых. У каравai нявесты павінны быць дзве шышкі з двума парасткамі («двойчатыя») і тры шышкі з трыма парасткамі («тройчатыя»). Каравай жаніха ўпрыгожваецца трыма шышкамі з двума парасткамі («двойчатымі») і двума шышкамі з трыма парасткамі («тройчатымі»). Так патрэбна, каб у час вяселля абмяняцца шышкамі.

Шышкі абкручваюць доўгімі вузкімі палоскамі цеста і кладуць у печ разам з караваем, але дастаюць раней, таму што яны хутка запякаюцца. Цеста для шышак замешваюць асобна, бо з каравайнага цеста нельга зрабіць доўгія палоскі, яно вельмі мяккае.

З таго ж цеста, што і шышкі, робяць іншыя ўпрыгажэнні для каравая: тры птушачкі, тры месяцы, тры кветкі. Іх кладуць на каравай зверху па кругу перад тым, як яго паставіць у печ, а вакол абводзяць пляцёнкай з цеста. Каравай выпякаецца ўжо ўпрыгожаным.

Пакуль каравай у печы, тыя каравайніцы, якіх чакаюць свае неадкладныя гаспадарчыя справы, могуць пайсці дамоў. Але калі наступае час даставаць каравай, павінны з'явіцца абавязкова ўсе каравайніцы.

Дастаць каравай з печы зусім не так проста, як здаецца на першы погляд: ён можа вырасці вельмі вялікім. Таму да месца тут прагучыць песня каравайніц:

Ой, дзе ж тыя кавалі,
Што стальныя сякеры?
Трэба печ рубаці,
Каравай вымаці.

На самой справе бывалі выпадкі, калі каравай немагчыма было дастаць з печы і патрэбна было расшыраць вусце, вымаць некалькі цаглін. Каравай ні ў якім разе нельга было пашкодзіць — лепш печ разбурыць.

Для каравая падрыхтоўваюць месца: века (абіку) з-пад дзяжы, якое ўсцілаюць белым абрусам, а наверх насыпаюць зерне аўса або пшаніцы. На гэта зерне і ставяць каравай.

Потым ідзе абрад далейшага ўпрыгажэння каравая. Гэта ў асноўным упрыгажэнне шышак, і тут праяўляецца эстэтычны густ жанчын: няма нічога лішняга і ў той жа час прыгожа, мэтанакіравана.

Упрыгажэннямі служаць кветкі, галінкі елкі, зялёны засушаны авёс, мята, кляновае і ліпавае лісце, лянок («слёзкі») і барвінак. Стараюцца, каб было больш зеляніны, яркіх красак. Жывымі кветкамі каравай упрыгожваюць рэдка, таму што за тры дні вяселля яны завянуць.

Да шышак упрыгажэнні прывязваюць чырвонымі шарсцянымі ніткамі. Іх пасля падзелу каравая кідаюць у аўчарню, каб авечкі пладзіліся. Працуючы, каравайніцы ўвесь час пяюць. Песні гу-



*Многа на Палессі нявест-прыгажунь*

чаць непасрэдна, змяняючы адна другую, надаючы ўсяму святочнае, незвычайнае адценне.

Старшая каравайніца
Ўсе платы паламала,
Усё барвінку шукала,
Каравая ўбірала.

Убірайся, караваю,
То ў рутку, то ў мятку,
То ў чырвоныя кветкі,
Каб любіліся дзеткі.

* * *

Багат, Надзечка, бацька твой:
Густая пшаніца на навіне,
Высокія стагі на гумне—
Вышэй каравай на стале.

* * *

Удача, удача,
Наш каравай удаўся
Ды шырокім лісцем услаўся,
У чырвоныя кветкі ўбраўся.

Потым каравайніцы бяруць па ўпрыгожанай шышцы і ўсе разам адначасова ўтыкаюць іх у каравай. Паміж шышкамі кладуць на каравай яшчэ маленькую булачку. Каб шышкі не разыходзіліся ва ўсе бакі, іх абвязваюць чырвонымі ніткамі пад песню:

Ды бяжыць зайчык-райчык,
Нясе ў зубах ніці.
Нашто тыя ніці?
Каравай упавіці.

Сам каравай абвязваюць рушніком. А зверху шышкі пакрываюць белай хусткай [24].

## ВЫКУП КАРАВАЯ

Нялёгкая праца каравайніц павінна быць узнагароджана, таму за каравай яны патрабуюць «выкуп». Каравай «выкупляе» брат (або дваюрадны брат, калі няма роднага) жаніха ці нявесты. Каравайніцы пяюць:

Мядзведзь барадаты—
Гаспадарык багаты.
Баіцца прыступіці
Каравай выкупіці.

Пасля гэтай песні брат падыходзіць да каравая, кладзе на стол грошы, бярэ каравай разам з вечкам, на якім ён стаіць, і, павольна кружачыся па ходу сонца і паднімаючы каравай над галавой, ідзе да каморы [25].

Выносячы каравай, брат прыгаворвае:

---

[24] В. Салава Драгічынскага раёна.
[25] Камора — кладоўка.

Караваю, раю, раю,
Я з табою пагуляю.

За братам ідуць каравайніцы і пяюць:

Ой, чый-то братайка
Пад караваем гуляе?
Да новай камораньні
Дарожанькі пытае?

Гэта Надзеччын братайка
Пад караваем гуляе,
Да новай камораньні
Дарожанькі пытае.

Каравай ставяць у каморы на зерне пад песню каравайніц:

Высока сонейка, высока.
Занясём каравай далёка
Ды й паставім на жыце.
Дай божа, маладзенькім
Добра пражыці.

Паставім на аўсе,
Дай, божа, як усім.
Паставім на сена,
Пражывіце шчасліва.

Пасля вынасу каравая ўсе садзяцца за стол. Пяюць песні, але не каравайныя. Каравайныя песні можна спяваць толькі пры выпечцы і ўпрыгажэнні каравая і нідзе больш. Грошы, якія брат паклаў за каравай, застаюцца на стале да таго часу, пакуль яго не падзеляць.

Цікава, што раней, калі яшчэ вянчаліся, каравай у царкву не везлі. Растлумачыць гэта можна толькі тым, што вянчанне, якое ў вясельны абрад увяла царква значна пазней яго ўзнікнення, так і не было прызнана народам важнейшым элементам вяселля. Без вясельнага абраду, без каравая шлюб лічыўся несапраўдным, нават калі маладых павянчалі ў царкве. Нездарма пасля вянчання, калі вяселле ў сілу якіх-небудзь прычын адкладвалася, маладыя ехалі кожны к сабе дамоў. Поп як бы не меў права злучыць маладых, калі гэтага не зрабілі людзі, род. А злучыць маладых можна толькі вясельным абрадам, які немагчымы без каравая. Такім чынам, выяўляецца проціпастаўленне каравайнага абраду царкоўнаму вянчанню.

І цяпер, калі абрад вянчання аджыў свой час, каравай застаецца адным з асноўных элементаў вяселля і нічым не замяняецца.

Народ апаэтызаваў свае адносіны да хлеба, да чалавека, які стварае хлеб. І яркі прыклад такой паэтызацыі — каравайны абрад і сам каравай.

## ПЕРШЫ ДЗЕНЬ ВЯСЕЛЛЯ (ЗАПРАШЭННЕ ГАСЦЕЙ)

У жаніха і нявесты гасцей на вяселле запрашае бацька, прыкладна за тыдзень да вяселля. Бацька носіць з сабой абавязкова маленькую булачку ці проста акраец хлеба. Заходзячы ў хату, ён вітаецца, распытвае пра здароўе, навіны, а потым ужо запрашае на вяселле.

У некаторых вёсках [26] прынята кланяцца і цалавацца з кожным, каго запрашаеш. Прычым у першы дзень вяселля запрашэнне паўтараецца, за выключэннем тых гасцей, якія жывуць далёка. Гэтым як бы падкрэсліваецца павага гаспадара дому да сваіх гасцей. Акрамя бацькі гасцей можа запрашаць маці, брат ці сястра. Шырока распаўсюджаным было запрашэнне гасцей да нявесты самой нявестай. Такая форма запрашэння захавалася і да нашага часу [27]. Вось як праходзіць такое запрашэнне.

Нявеста са сваёй лепшай сяброўкай апранаюцца аднолькава: чырвоныя спадніцы са стужкамі, чорныя жакеткі, белыя вышываныя блузкі і такія ж фартухі, кашаміравыя хусткі з кветкамі, на нагах аднолькавыя туфлі або чобаты [28]. У нядзелю раніцай, у першы дзень вяселля, яны павінны зайсці ў кожны дом, дзе трэба запрасіць гасцей. Пры ўваходзе кланяюцца паасобку ўсім, хто знаходзіцца ў доме, нават чужым людзям і дзецям, але пачынаюць са старэйшых. З кожным абедзве дзяўчыны павінны пацалавацца, але першай цалуецца нявеста і кажа: «Запрашаю вас да сябе на вяселле».

Нявеста абавязкова носіць з сабой хлеб, загорнуты ў хусцінку, на яе руцэ завязаны рушнік. Выходзячы з хаты, нявеста з сяброўкай кланяюцца ўсім, а нявеста цягне па падлозе свой рушнік, каб за ёю хутка ішлі замуж іншыя дзяўчаты, якія жывуць у гэтай хаце. Дзверы за сабой яны пакідаюць адчыненымі.

Вяселле пачынаецца ў жаніха і нявесты асобна. Да жаніха яго род збіраецца крыху раней, чым да нявесты яе род, таму што ў нявесты чакаюць прыезду жаніха. А пакуль ён прыедзе, госці сядаюць за сталы, але некалькі накрытых сталоў пакідаюць для жаніха са сватамі.

У жаніха з ліку гасцей выбіраецца (звычайна бацькамі жаніха) яго дружына, або сваты, якія паедуць разам з ім да нявесты, у той час як усе іншыя застаюцца ў доме. Едуць чалавек пяць сватоў, старэйшым з іх з'яўляецца хрышчоны бацька жаніха. Наступныя па старшынству два сваты даглядаюць коней і вязуць усіх да маладой. Астатнія — простыя сваты. Яны ва ўсім дапамагаюць жаніху. Акрамя сватоў з жаніхом едуць два дружкі, абавязкова нежанатыя. Гэта браты або сябры жаніха. У некаторых вёсках старэйшы сват называецца дружком. Выконвае ён тыя ж функцыі, што і хрышчоны бацька жаніха, але носіць з сабой канчук (упрыгожаны кнут). Калі хрышчоны бацька добра ведае абрад, умее арганізаваць людзей, знае песні, жарты, то ён запраўляе ўсім вяселлем. Калі ў хрышчонага бацькі няма адпаведных якасцей, то сапраўдным кіраўніком з'яўляецца другі сват, хаця хлеб і гарэлку вязе хрышчоны бацька.

---

[26] В. Салава Драгічынскага раёна.
[27] В. Моладава Іванаўскага раёна.
[28] Чобаты — боты.



*Брэсцкая крэпасць. Кветкі да магілы невядомага салдата*

З жаніхом едуць таксама пяць свах. Свахамі з'яўляюцца сёстры, дваюрадныя сёстры, цёткі. Звычайна гэта ўжо замужнія жанчыны. Хрышчоная маці з імі не едзе. Асноўны абавязак свах — спяваць. Яны і падбіраюцца часта з такога пункту гледжання.

Госці жаніха спачатку садзяцца за сталы; тыя, хто паедзе да нявесты, садзяцца асобна, каб сваімі зборамі не перашкаджаць іншым весяліцца. Усе дараць жаніха. Перад ім ставяць талерку з кавалкам хлеба або булачкай. Грошы, сарочкі і іншыя рэчы кладуць на талерку. Калісьці дарылі парасят, цялят, авечак, гаворачы: «Дару цябе цялём» або: «Дару грошы, каб былі дзеці харошы».

Перад тым як дарыць, абавязкова пяюць:

Колечка спрамагання просіць:
«Радзіна, спрамажыце мяне,
Чым добрым надарыце мяне».

Госці застаюцца за сталамі, а сваты выходзяць з хаты і збіраюцца ў дарогу. Перад выхадам з хаты пяюць:

У нядзельку рана
Вакол стала сталі,
А за тымі сталамі
Колечка са сватамі.
У дарожаньку збіраецца,
Бацяньку пытаецца:
— Мой жа бацяньку,
Мой жа родненькі,
Ці мне там начаваці,
Ці дадому прыязджаці?
— Мой жа сыначку,
Мой родненькі,
Прыязджай дадому
Хоць уночы,
Хоць у поўначы,
Хоць і к беламу свету
І к маёму прывету.

І другая песня з'яўляецца абавязковай:

Колечка збіраецца,
Бацяньку пытаецца:
— Мой жа бацяньку,
Мой жа родненькі,
Што мне там гаварыці?
— Не гавары, сынку, нічога.
Ёсць у цябе дружок для тога.
Што мацъ будзе,
Гаварыць будзе
За цябе, маладога.

Хрышчоны бацька бярэ хлеб, потым, узяўшы за руку жаніха, абводзіць яго тры разы па ходу сонца вакол стала, за якім яны сядзелі. Следам за жаніхом абыходзяць стол і дружкі. У такім парадку яны выходзяць на вуліцу, дзе іх чакаюць вазы. Вазоў звычайна два, бо на адным усе не памесцяцца.Запрэжаны яны парамі коней. Зімой замест вазоў карыстаюцца санямі. Дугі над коньмі ўпрыгожаны каляровымі стужкамі, кветкамі, зеленню. На дугі прывязваюць і рушнікі, але могуць ехаць і без іх, таму што ўсё роўна зробяць гэта ў нявесты. Абавязкова прывязваюць званочкі, нават па некалькі штук на адну дугу, каб вяселле было чутна здалёк.

Жаніх сам на воз не павінен садзіцца. Яго бярэ на рукі адзін са сватоў, звычайна самы дужы, і саджае на воз. На гэтым жа возе едуць дружкі і хрышчоны бацька, некалькі свах. Астатнія расаджваюцца на другім возе.

У гэты час бацька жаніха бярэ вядро вады, хлеб і тры разы абыходзіць вазы. Ваду з вядра вылівае пад ногі пярэднім коням. Цікава, што гэты абрад захаваўся да нашага часу. Цяпер, хаця жаніх часцей едзе на машыне, усё роўна льюць ваду пад пярэднія колы машыны, а саму машыну таксама ўпрыгожваюць. Сваты ад'язджаюць, а астатнія госці застаюцца весяліцца да позняй ночы.

Сватам усе павінны ўступаць дарогу, яны нікуды не зварочваюць, а едуць прама да нявесты. Усю дарогу пяюць песні, напрыклад:

У дарозе, Колечка, у дарозе,
Някованы конікі ў возе.
Ёсць у маёй Надзечкі пярсцёнкі,
То будуць конікам падкоўкі.
Ёсць у маёй Надзечкі каснічкі,
То будуць конікам уздзечкі.

А як ахоўваецца ў дарозе малады, відаць з наступнай песні:

Хоць я свашка маленька,
Абы я разумненька.
Слала бор белым радном,
Дарожаньку—палатном,
Каб у бары не ўрасіўся,
У дарожаньцы не ўпыліўся,
Да Надзечкі не спазніўся.

Прыязджаюць да нявесты пад ганак, сват знімае жаніха з воза, сваты падыходзяць да ганка і пяюць:

Звіўся салавейка ў вішнёвы сад,
Стукнуў крылечкамі аб вінаград.
Стукнуў крылечкамі, пытае:
— Ці тут мая зязюлька,
Ці нямае,
Ці з другімі салаўямі
Лятае?

Уехаў Колечка ў цесцеў двор,
Стукнуў чабатком аб пароґ.
Стукнуў чабатком, пытае:
— Ці тут мая Надзечка,
Ці нямае,
Ці з другімі хлопцамі
Гуляе?

Выходзіць бацька нявесты і запрашае сватоў у дом: «Прашу, сваты, дахаты». Першым у дом заходзіць хрышчоны бацька. За ім—жаніх і ўсе астатнія. Іх адразу ўсаджваюць за сталы, жаніха садзяць паміж дружкамі. Нявеста ў гэты час хаваецца, каб яе не ўбачылі. Але сама стараецца праз шчыліну ўбачыць жаніха, як і ў час запоін.

## АБМЕН ПАДАРУНКАМІ ПАМІЖ ЖАНІХОМ І НЯВЕСТАЙ [29]

Сваты частуюцца. Праз некаторы час з'яўляецца нявеста, апранутая як заўсёды, яшчэ не ў вясельны ўбор. Яна нясе талерку з цукеркамі, дзвюма хусцінкамі, яблыкамі. За ёю ідуць сяброўкі, родзічы і пяюць:

Запіта, Надзечка, запіта,
Золатам косанька абліта.
Хто ж яе, маладую, запіваў,
Золатам косаньку абліваў?
Запіваў яе ўвесь род,
Малады Колечка найпярод.
Запівалі яе дзявочкі,
Аддалі Колечцы на ручкі.

Нявеста падыходзіць да стала, ставіць перад жаніхом талерку пад песню:

Каціўся гарошак па сенажаці,
Хваліўся Колечка Надзечку ўзяці.

[29] Найбольш поўна гэты момант вяселля запісаны ў в. Чамярын Пінскага раёна.

Яна, маладая, яго жалавала,
Выняла хусцінку да й падаравала:
— Дарую хусціну бялым-бяленьку,
Глядзі, Колечка, каб доля дабрэнька.
Мая хусцінка шоўкам нашыта,
Глядзі, Колечка, каб не была біта.

Ідзе абмен падарункамі паміж жаніхом і нявестай. Яны жадаюць адзін аднаму добрага здароўя. Раней жаніх дарыў нявесце рэчы (туфлі, сукенку), цяпер жа часцей абыходзіцца грашыма.

Нявеста выходзіць з пакоя, ідзе пераапранацца ў свой шлюбны ўбор у суседні дом.

Што абазначае абмен падарункамі паміж жаніхом і нявестай? Думаецца, што гэта адзін з момантаў далучэння нявесты да роду жаніха. Абмен падарункамі як бы замацоўвае іх саюз, узаконьвае новую роднасць.

Пасля таго як нявеста пайшла апранацца, жаніх частуе ўсіх цукеркамі, якія пакінула нявеста. Цётка нявесты або яе старэйшая замужняя сястра абвязвае сватоў палатном і даматканымі рушнікамі крыж-накрыж. Свах абвязваюць тканінай (па 2 — 3 метры), а родных сясцёр жаніха — двума кавалкамі тканіны. Лічыцца, што гэтымі падарункамі абвязала сватоў маладая. Дру́жкі нявесты прымацоўваюць на грудзі жаніху і яго дружка́м папяровыя яркія кветкі. У жаніха кветка самая прыгожая і большая па размерах. Жывых кветак не прышпільваюць таму, што яны хутка вянуць. Жаніх і дружкі́ ходзяць з кветкамі ўсё вяселле. У прыдачу да кветак дру́жкі перавязваюць дружкоў вышыванымі рушнікамі. Дружкоў на вяселлі адразу можна пазнаць па кветцы і рушніку.

## НЯВЕСТУ АПРАНАЮЦЬ

Нявеста сама надзявае доўгую белую сукенку, белыя туфлі і сядае на дзяжу, якая пакрыта аўчынай (каб у нявесты было столькі багацця, колькі шэрсці на гэтай аўчыне). У некаторых мясцінах нявеста не мела права садзіцца на дзяжу, калі яна згубіла нявіннасць, бо інакш яна абразіць каравай і накліча на сваю сям'ю ў будучым няшчасці. Цяпер часта дзяжа падмяняецца звычайнай табурэткай, пакрытай аўчынай або падушкай; можа таму, што хлеб дома не пякуць, дык і дзяжу знайці не так проста. Брат або які-небудзь іншы хлопчык расплятае ёй касу пад песні:

Ой, чый жа братайка
Русу косу расплятаў,
Русы воласы расчасаў?
Гэта Надзеччын брацейка
Русу косу расплятаў,
Русы воласы расчасаў.

* * *

Дзе ж тыя кавалі,
Што русу косу часалі?
Няхай яны раскуюць,
Срэбра-золата разбяруць.

У касу абавязкова ўплецена стужка, якую брат выплятае. Нават цяпер, калі дзяўчаты не носяць кос, нявеста ўсё роўна завязвае ў валасы стужку, якую брат павінен развязаць. Як бачым, абрад расплятання касы захаваўся.

Убірае, прыхарошвае нявесту звычайна адна жанчына, не абавязкова сваячка. Запрашаюць такую жанчыну загадзя, ад яе патрабуецца ўменне добра прычасаць, падмаляваць нявесту, апрануць ёй вэлюм. У жанчыны аказваецца многа добраахвотных памочніц, і наогул збіраецца шмат гледачоў: усім цікава пабачыць, як нявеста апранута, як трымае сябе. Усе, хто знаходзіцца ў доме, спяваюць. Атрымліваецца цэлы хор, і песні гучаць адна за другой. Пяюць аб нявесце, аб яе дзявочым жыцці і наступаючых пераменах. Сама нявеста не пяе, але ўсе песні адрасаваны толькі ёй:

Дзе ж ты, Надзечка, хадзіла,
Што сваю галоўку ўкляціла?
— Хадзіла, дзеванькі, у вішнёвы сад,
Ды на маю галоўку квет упаў,
Ды на маёй галоўцы расцвітаў,
За тое мяне маладзенькі спадабаў.

Песні адлюстроўваюць і той момант, калі нявесце надзяваюць на галаву вянок з кветак. Гэта развітанне з дзявочай воляй:

Ой, знаці, знаці,
Што багаты сёстры.
Хадзілі да рынку
Купляці барвінку
Для сваёй сястрынкі
Убіраці галоўку.

Барвінку, барвінку
Куплялі на рынку.
Як я цябе не рушыла,
Плакаці не мусіла.
А цяпер парушу- -
Заплакаці мушу.

Калі ў нявесты няма бацькі ці маці, то пяюць і так званыя сіроцкія песні. Гэтыя песні кранаюць сваёй шчырасцю, паэтычнасцю, тым больш што маецца на ўвазе канкрэтны жыццёвы выпадак. Тут цяжка ўтрымацца ад слёз. Плача не толькі нявеста, але і ўсе навокал.

Ой, што ж гэта ў небе,
У небе загрымела?
Надзеччына маці
З госпадам гаварыла:
— Ой, божа мой, божа,
Ой, пускай мяне з неба.
З неба—імгліцаю,

На зямлю—расіцаю,
На двор—дробным дождкыкам,
У хату—мілым госцейкам
Адведаці дзіцяці,
Ці яно благаславёна.
У галованьцы кветка,
А яно ж як сіротка.

Або:

Сірата долі не мае,
Голасам неба прабівае,
Слёзкамі сцежку палівае,
Коскамі сцежку замятае,
Сваю маці ў хату зазывае.



*«Застава», в. Табулкі (Пінскі раён)*

У час вяселля як бы забываюць, што нявеста-сірата, стараюцца не ўспамінаць аб гэтым, каб не трывожыць лішні раз сэрца. Але калі нявесту апранаюць, то як бы адступаюць ад гэтага правіла, жадаючы разам з ёю выплакаць яе гора, раздзяліць яго на ўсіх. Спачуванне народнае нявесце-сірацe парадзіла жамчужыны паэзіі.

Калі нявесце апранулі вэлюм, яна ўстае, нізка кланяецца тры разы той жанчыне, якая яе апранала, і цалуецца з ёю. Потым кланяецца па тры разы ўсім, хто знаходзіцца ў хаце, нават дзецям, і цалуецца з кожным. Ёй спяваюць:

Карыся, Надзечка, карыся,
Кожнаму да ножак кланіся.
Старога, малога не мінай,
Кожнаму да ножак прыпадай.
Кожнаму да ножак нізенька,
Каб была доленька дабрэнька.

Ад жаніха ідуць дружкі з гарманістам, каб адвесці маладую дамоў. Яна кланяецца і дружкам, тыя бяруць яе пад рукі і выводзяць. А ўслед дружкам гучыць песня:

Памалу, дружкі, ідзіце,
Пылу не рабіце,
Каб наша маладая пава
Пылам не прыпала.

Тыя, хто апранаў нявесту, з жартамі і смехам кідаюцца да дзяжы, адкрываюць яе і знаходзяць падарункі — узнагароду за працу.

Ідучы дадому, нявеста нізка кланяецца людзям; звычайна яе вядуць цераз жывы калідор, таму што ўсе хочуць убачыць нявесту і яе ўбор. Дома першымі нявесту сустракаюць бацькі і самыя блізкія сваякі. Нявеста тры разы нізка кланяецца маці, потым бацьку і іншым. З кожным цалуецца. Зноў спяваюць песню «Карыся, Надзечка, карыся...».

Тыя, каму нявеста кланяецца, жадаюць ёй шчасця, здароўя, добрай долі. Ёсць класічнае пажаданне:

З добрым векам,
З добрай доляй,
Каб здарова была, як зіма,
А вясёла, як вясна,
А ціха, як лета,
А багата, як восень.
Каб табе вадзіла і пладзіла...

Дружкі вядуць маладую за стол, але не за той, дзе сядзіць жаніх. Нявеста стаіць за сталом паміж сваімі дру́жкамі і не мае права садзіцца сама. Яе павінен пасадзіць брат або дзядзька. Гэта называецца «пасадзіць маладую на пасад». Вось як гэта адбываецца. Брат бярэцца за рушнік, які завязаны на руцэ ў нявесты, просіць дазволу «гэтае дзіця на пасад пасадзіць». Родзічы дазваляюць. Тады ён аслабляе крыху рушнік, нявеста садзіцца, але адразу ж зноў устае. Так паўтараецца тры разы. Пры пасадзе нявесты пяюць песні, напрыклад:

Брат сястру на пасад вядзе.
Месца рыхтуе, цяжка сумуе:
— Тут мая сястра сядзе.

Або:

Ляцелі гусанькі цераз сад,
Клікалі Надзечку на пасад.
— Ой, што вам, гусанькі, да таго,
Ёсць у мяне баценька для таго,
Будзе мяне баценька садзіці,
Вялікім дарам дарыці.
Вялікім дарам — пасагам,
Добрай доляй і шчасцем.

Нявесту дараць пад песню:

Станавіся, родзе багаты,
Дары Надзечку статкам рагатым,
Авечкамі ды бычкамі,
Каб былі яны багачамі.

Спачатку дарыць бацька, маці, потым усе астатнія. Кожны пры

гэтым жадае маладым шчасця, здароўя, дабрабыту, кахання. Дарыць грошы, тканіну, самыя розныя рэчы.

У наш час маладыя едуць распісвацца ў клуб ці ў сельскі Савет, вянчанне засталося ў мінулым. Урачыстая рэгістрацыя шлюбу прынята ў многіх вёсках [30]. Вось як яна адбываецца.

Калі клуб блізка, то маладыя ідуць туды пешкі ў суправаджэнні сватоў, свах, дружкоў і іншых родзічаў. Калі далёка, то едуць на вазах або, часцей, на машынах, якія ўпрыгожаны зелянінай, кветкамі, стужкамі. Перад ад'ездам бацька аблівае вадой пярэднія колы машыны. Заўсёды бывае вельмі многа гледачоў.

У клубе жаніха з нявестай сустракаюць хлебам-соллю, для іх рассцілаюць дарожку, па якой яны павінны прайсці (нявеста стараецца ступіць на яе першай). Старшыня сельскага Савета аб'яўляе аб рэгістрацыі і віншуе іх. Сват прыносіць заручальныя пярсцёнкі, і маладыя надзяваюць іх адзін другому. Тут жа ад імя калгаса або калектываў, дзе працуюць маладыя, уручаюцца ім падарункі. Гучаць музыка, пажаданні добрага, шчаслівага жыцця. Абавязкова маладыя танцуюць вальс, які іграюць спецыяльна для іх.

Потым маладыя выходзяць на вуліцу і ад'язджаюць дамоў, дзе вяселле ідзе ў традыцыйным парадку.

Маладым перагароджваюць сталамі дарогу ў вузкім месцы, часта на мосце, або нават цераз вуліцу працягваюць вяроўку, каб нельга было аб'ехаць перашкоду. Маладую ўсаджваюць на стул, падкідваюць тры разы ўверх, жадаючы ёй шчасця; за ёю паднімаюць і маладога, патрабуючы выкуп. Маладыя адкупляюцца, тады перашкоды знімаюць. Гэты звычай не толькі захаваўся да нашага часу, але і актыўна бытуе.

Прыязджаюць дамоў. Маладыя раскідаюць цукеркі ва ўсе бакі (або зерне сыплюць), госці адразу ж падхопліваюць іх. Гэта даўняя традыцыя існуе і цяпер. Потым хлопцы хуценька ўсаджваюць маладых на лаўку і паднімаюць высока на руках, патрабуючы пацалавацца і адкупіцца гарэлкай, што маладыя і робяць. Паднімаюць таксама свата са свахай, дружкоў.

Маладыя не могуць зайсці ў дом, пакуль бацька нявесты не выйдзе і не скажа: «Запрашаю, дзеці, дахаты». Можа сустракаць маладых і маці нявесты, але цяпер часцей гэта робіць бацька. Свахі, стоячы ля ганка, пяюць:

Адчыні, маці, аконца,
Едзе дочка, як сонца.
Адчыні, маці другое,
Едуць дзеці абое.

У хаце маладых саджаюць разам на аўчыне або на падушках так, як раней брат саджаў нявесту на пасад.

---

30 В. Парэчча Пінскага раёна, в. Моладава Іванаўскага раёна.

Пачынаецца вяселле традыцыйным «горка», песнямі, танцамі. У канцы першага дня вяселля жанчыны рыхтуюць пасцель дзе-небудзь у асобным пакоі (раней у каморы, дзе стаяў каравай) і адводзяць туды маладых. Звычайна ў першы дзень вяселля маладыя не елі або елі вельмі мала, таму ў гэты пакой прыносілі для іх ежу. Пасля пакідалі іх адных.

## ДРУГІ ДЗЕНЬ ВЯСЕЛЛЯ

З самай раніцы ў доме жаніха ўсе госці збіраюцца ехаць да нявесты. Рыхтуюць не менш двух вазоў — для нявесты і яе прыданага. У дом прыносяць з каморы каравай, ставяць на стол. Зноў-такі дараць жаніха.

Асабліва ярка момант збораў жаніха ў дарогу адлюстраван у песні, дзе жаніх просіць бацьку:

— Выражай мяне,
Ты мой баценька,
У вяліку дарожаньку.
Дай мне дзевяць коней
Пад маю дружынаньку,
А дзесятага, варанога,
Пад мяне, маладога.
Адзінаццату, жарабіцу,
Пад маю маладзіцу.

Сват зноў усаджвае жаніха на воз, бяруць з сабой каравай і едуць. Калі да нявесты недалёка, то госці ўсе, апрача жаніха і сватоў, ідуць пешкі. Калі ж далёка, то едуць хто на чым: на машынах, матацыклах, вазах. Па дарозе спяваюць:

Дзіўна ў полі, дзіўна,
Што нікога не відна.
Адно толькі завідаці
Колечку з сястрынкамі.
— Сястрыцы ды парадніцы,
Ды парадзьце вы бо мне,
Як цесця ваяваці,
Сабе Надзечку браці.
— Ды ваюй, братка, ваюй,
Сівы коні на двор вярні,
Сабе Надзечку бяры.
Бяры яе ды ручэнькамі,
Вязі яе канічэнькамі.

Па дарозе або перад домам нявесты жаніху абавязкова перагароджваюць вуліцу сталом зусім чужыя людзі, нават у чужой вёсцы, цераз якую едзе жаніх. Тыя, хто едзе з жаніхом, пяюць у такім выпадку:

Колечку, саколічку,
Выкрунься на коніку
Ды пабі тыя вербы,
Што ў цесця перад дзвермі.
Паламай тыя лозы,
Што ў цесця на парозе.

Сваты павінны адкупіцца, інакш іх не прапусцяць.
Калі прыедуць да ганка нявесты, пяюць:

Вынось, цешча, дзежку
Пад зяцеву ножку.

Жаніх чакае, пакуль хто-небудзь не вынесе з хаты дзяжу. Ступае спачатку на дзяжу, а потым на зямлю. Дзяжу адразу ж забіраюць, а свахі пяюць:

Чаму цешча не выходзіць?
Чаму зяця не вітае?
Ці кажуха не мае?
Ці сораму не знае?
Пайшла цешча ў сяло
Кажуха дабываці,
Будзе зяця вітаці.

Выходзіць на ганак цешча вітаць зяця. Але калі яна ўдава, то вітае не сама, а жанчына, якая шчаслівая ў сямейным жыцці. Лічаць, што і ў дачкі будзе такі ж лёс, як у маці. Цешча выходзіць у кажусе, які апрануты шэрсцю наверх, каб маладыя былі багатыя [31]. У руках трымае вечка ад дзяжы, на якім ляжыць хлеб, нож, стаіць бутэлька віна і талерка з мёдам. Госці пяюць:

Знаці, знаці,
Што чужая маці.
Вывернула кажуха
Ды й хоча злякаці.

Цешча кажа:

Дзень добры, зяцю!
Як я цябе не знала,
То й зяцем не звала.
Як я цябе пазнала,
То й зяцем назвала.

Вечка хто-небудзь трымае, а цешча бярэ кавалачак хлеба, мажа мёдам і падае зяцю.

А ў хаце ў гэты час «асыпаюць» маладую. «Асыпальніцай» з'яўляецца звычайна сваячка жаніха, дзяўчынка не больш пятнаццаці гадоў. Нявеста апранута ў свой шлюбны ўбор і сядзіць на сваім учарашнім месцы за сталом. Каля яе сядзіць дружка. Свахі і асыпальніца ідуць да нявесты і пяюць:

Не лякайся, Надзечка,
Асыпальнічка ідзе,
У руках золата нясе.
Як ступіла залатым абцасам
На ўслон,

[31] Магчыма, гэта адгалоскі культа мядзведзя, які бытаваў у беларусаў.

Дык сыпнула шчасцем-долею
Цераз стол.

Асыпальніцу ставяць на стул, і яна тройчы абсыпае нявесту зернем аўса ці жыта, якое трымае ў хусцінцы. Кожны раз нявеста кланяецца сваёй асыпальніцы.

Нявеста дарыць асыпальніцы стужку ці тканіну на сукенку. А хто зніме асыпальніцу са стула, атрымае ад яе за гэта падарунак. Асыпальніца займае ганаровае месца каля нявесты і сядзіць разам з ёю да ад'езду ў дом жаніха.

Пасля «асыпання» нявесты пачынаецца «торг» паміж дружка́мі жаніха і дру́жкамі нявесты. Яны «перакупляюцца».

Кожная пара таргуецца асобна. Перад імі ставяць пустую талерку. Дружка насыпае туды крыху семачак, цукерак, а дружок павінен плаціць за іх. Дружка імкнецца атрымаць грошай паболей, таму падкладвае цукеркі па адной. Патрохі выкладвае грошы і дружок. Ствараюцца дзве партыі «балельшчыкаў», якія падбухторваюць і дружку і дружка. Тут абодвум «перакупшчыкам» трэба выказаць паболей гумару, знаходлівасці, інакш цябе засмяюць твае ж балельшчыкі. Потым дзяўчаты збіраюць вытаргаваныя грошы, а дружкі́ цукеркамі частуюць ўсіх, у першую чаргу саміх дружак.

Каравай жаніха ставяць у каморы разам з караваем нявесты. Госці заходзяць у дом, рассаджваюцца за сталы. Жаніх ідзе на сваё месца да нявесты. Калі ён праходзіць, нявеста падстаўляе нагу, каб жаніх пераступіў: пераступіць — значыць заўсёды будзе ўступаць ёй, калі ж не, то незайздросны ёй жаніх папаўся; гэтым можна ўсю радню нявесты давесці да слёз.

Бацькі нявесты частуюць гасцей, а тыя ў песнях хваляць гаспадароў або патрабуюць да сябе большай увагі:

Дзе бывала, то бывала,
Такой чэсці не відала,
Як у свата свайго,
У святліцы яго.

У саду салавейка гняздо ўе,
Ці ўсім сватовам месца е?
Ды каму няма, кажыце,
Усю сваю радзіну садзіце.

У нашага свата
Галава кудлата.
Галавою патрасе,
А гарэлкі прынясе.

У нашага свата
Жалуды, жалуды.
Не дае нам гарэлачкі,
А вады, вады.

Праз некаторы час у хату ўносяць абодва караваі, каб абмяняцца шышкамі. Шышкі мяняе хрышчоная маці нявесты. З каравая нявесты яна бярэ шышку з трыма парасткамі («тройчатую»), а на яе месца ставіць шышку з двума парасткамі («двойчатую») з каравая жаніха. Гэтым як бы падкрэсліваецца перавага жаніха. Каравай жаніха абвязваюць рушніком нявесты, хаця на ім ужо ёсць рушнік.

## БРАТ «ПРАДАЕ» НЯВЕСТУ

Пасля абмену шышкамі пачынаецца «продаж» нявесты, якую «прадае» брат ці дзядзька. Ён садзіцца на покуце і пачынае таргавацца са сватамі. У гэты час пяюць:

Ой, не брат, не брат—татарын.
Аддаў сястрынку задарам.
Белае лічанька за пятак,
Русую косаньку аддаў так.

Калі сваты даюць мала грошай за нявесту, то родзічы нявесты могуць праспяваць і такую песню:

Вазьмі, свацейка, грошы
Ды купі жонцы солі.
Свірэпіцу [32] пасаліце
Ды свае дзеці пакарміце.

Усе грошы, якія брат вытаргуе за сястру, належаць яму. Распіваюць барыш, і на гэтым торг заканчваецца. Лічаць, што нявеста не мае права вярнуцца ў свой былы дом, яна ўжо належыць другой сям'і.

Сваты «выкупляюць» прыданае нявесты, яе пасцель, падушкі. Звычайна іх «прадае» сястра або брат. Усё прыданае выносяць і складваюць на воз; маладых на возе садзяць на падушкі. Дугі коней, якія вязуць прыданае, абвязваюць рушнікамі. Збіраючыся дадому, сваты пяюць:

Дадому, сватове, дадому,
Паелі конікі салому,
Яшчэ й грачаную мякіну,
Па-пад плотам крапіву.

Перад ад'ездам дараць нявесту ў другі раз. Хрышчоная маці накідвае на яе плечы пакрывала (кусок палатна), за што жаніх плаціць грошы. Маладыя заўсёды разам з сабой вязуць і каравай. Сяброўкі нявесты, свахі пяюць ёй развітальныя песні:

Выграбай, матка, попел,
Мы тваю дачку ўхопім.
Выграбай, матка, жар, жар,
Будзе табе дачку жаль, жаль.
Накладай у печ дровы,
Заставайся здарова.

---

[32] Свірэпіца — свірэпа.

* * *

Ужо зязюлька ў лугі ўлятае,
Ужо Надзечка ў вазы сядае.
Сваім сяброўкам дабранач дае:
— Дабранач, дзявочкі, мае калегачкі,
Кідаю я вам падаруначкі.
Падаруначкі—у саду кветачкі,
З ружы чырвоны, з руты зялёны.
Кветачкі рвіце, вяночкі віце
І замуж ідзіце.

У песнях нявеста развітваецца з бацькамі. У доме ўжо не будзе такога парадку, які вяла дзяўчына:

Пазнаешся, мая матка, без дачкі.
Пазарастаюць па-пад лаўкаю казлячкі,
А траўкаю ды мураўкаю лыжачкі,
А пад прыпечкам ды ракітнічак зацвіце.

Калі ж дзяўчына не вельмі сумуе, едучы ў чужую сям'ю, родзічы пяюць:

Трэба даці цыбулі ў вочы,
Каб заплакала, ад маценкі
ідучы.
Што мелі—перапелі,
Надзечку не разжалілі.
Хіба ж яе разжаліць
Ды чужая старонка.

Ды няродна маценка
Не б'е, не карае,
Хораша называе.
Пакарае словамі—
Абальешся слёзамі.
Пакарае вернымі —
Абальешся дробнымі.

Хрышчоны бацька выводзіць жаніха з нявестай на вуліцу. Нявеста кланяецца бацькам, развітваецца з імі. Сяброўкі пяюць:

За сеньмі, за сенячкамі
Развіталася Надзечка
З тагарышкамі,
Каліну ламала,
Шчыпала арэшкі:
— Заставайцеся,
Мае таварышкі.

З сабой нявеста вязе хлеб, талерку, на якую ёй дарылі грошы, лыжку і кулёчак з жытам, каб пасыпаць у доме жаніха. Калі нявесту пасадзілі на воз, сяброўкі пытаюцца ў яе:

— Надзя, дзе ключы?

Яна адказвае:

— На гары ў аўсе,
Каб выйшлі замуж
За мною ўсе.

Можа здарыцца, што нявеста забудзе гэтыя словы і не скажа. Гэтым можна кроўна пакрыўдзіць сваіх сяброваак.

Бацька нявесты абыходзіць вазы з вядром вады, і маладых вывозяць. Па дарозе свахі спяваюць:

Не спала ночку,
Не спала другую,
Пакуль вытаптала
Для матанькі слугу.

Для матанькі слугу,
Для сябе другую,
Для свайго братайка
Жонку маладую.

Не абыходзяцца свахі без песні, у якой лякаюць нявесту ліхой свякроўкай, але нявеста не губляецца. Вось як пяецца аб гэтым:

Лес, за лесам
Ды мядзведзь рыкае,
Будзе табе, дзеванька,
Свякроўка ліхая.
— Я таму мядзведзю
Саладзіну кіну,
На сваю свякроўку
Пярыну накіну,

Будзе мядзведзь
Саладзін смактаці,
Будзе мая свякроўка
Пад пярынаю кректаці.
Як будзе варчаці,
Я буду маўчаці.
Як будзе гаварыць,
То я буду наравіць.

Пад'язджаючы да хаты, спяваюць, праслаўляючы нявесту:

Расступіцеся, людзі,
Багатырачка ідзе.
Вязе скрыню, пярыну,
Да хаты гаспадыню,
На поле работніцу.

Каля хаты жаніха маладых сустракаюць бацька жаніха і іншыя сваякі. У варотах кладуць салому і, як толькі вазы або машыны пад'едуць бліжэй, запальваюць яе. Коні не хочуць ісці, але іх усё роўна напраўляюць цераз касцёр. Касцёр распальваюць і цяпер. Праехаць цераз агонь для нявесты з'яўляецца асаблівым гонарам. Старыя жанчыны лічаць, што агонь патрэбен для таго, каб нявесту не «сурочылі» злыя вочы. Касцёр маглі не распальваць толькі ў тым выпадку, калі нявеста згубіла дзявоцкасць да шлюбу, і то рэдка. Пры ўездзе ў двор нявеста правай рукой сыпле жыта.

Выходзіць маці жаніха ў вывярнутым кажусе, нясе абіку з мёдам, хлебам, чаркай. Калі маці — удава, то замест яе сустракае нявесту жанчына, у якой ёсць муж. Убачыўшы маці, свахі пяюць каля ганка:

Ой, знаці, знаці,
Што не родна маці.
Вывернула кажуха
Нявестку лякаці.

І далей падбадзёрваюць свякруху:

Не лякайся, маці,
Што нявестка маленька.
Мы яе падвышаем,
На шоўку паставім,
Золатам падсыплем,
З сынам зраўняем.

Нявеста кланяецца свекрыві, якая кажа:

Дзень добры, нявестачка!
Як я цябе не знала,
Той й нявесткай не звала.
Як я цябе пазнала,
То й нявесткай назвала.
Каб ты была здарова, як зіма,
А вясёла, як вясна,
А ціха, як лета,
А багата, як восень.

Маці жаніха «перапіваецца» з нявестай, як раней маці нявесты з жаніхом. Нявеста кладзе на абіку свой клуначак, дзе загорнуты хлеб, талерка і лыжка. Выходзіць бацька жаніха і запрашае ўсіх у хату.

Калі нявеста заходзіць у хату, то рассыпае ўсюды жыта. Потым яна абвязвае ўсіх кускамі тканіны, пачынаючы з бацькоў жаніха. Кланяецца кожнаму і цалуецца. Падарункі гэтыя везлі сюды прыданкі — жанчыны, якія прыехалі разам з прыданым нявесты. Бацькі запрашаюць усіх за сталы. Прыданак усаджваюць на ганаровых месцах. Першую чарку выпіваюць маладыя з бацькамі жаніха і хрышчонай маці нявесты, якая цяпер суправаджае нявесту.

Свякроў нявесту перапівае,
Перапівае, паздараўляе:
— Будзь ты, нявестка, умна-разумна,
Умна-разумна і шчаслівая.
Ды папусці долю па майму полю,
А прыдоллечка — па застоллю,
А здароўечка — на маю сям'іцу.
Каб мая ніва жыта радзіла,
Каб мая сям'іца здарова хадзіла.

Пасля гэтага выпіваюць усе, чуецца «горка», пачынаюцца танцы.

## НЯВЕСТУ РАСПРАНАЮЦЬ

Праз некаторы час да нявесты падыходзіць гарманіст, пытае ў людзей дазволу «пакрывала зняці». Знімае пакрывала з нявесты і кідае яго маці жаніха, якая стаіць на лаўцы каля печы з жанчына-

мі і чакае гэтага моманту. Злавіўшы пакрывала, яны накрываюць ім сабе галовы і, скачучы, спяваюць:

Дзякуй богу, сына ажаніла,
Ды нявесткі дачакала.
Ды не буду воду насіці,
Ды не буду хлеба мясіці,
Ды не буду хату мясці,
Толькі буду парадачак вясці,
Дай, божа, ляльку,
То я буду за няньку.

Хрышчоная маці нявесты знімае з яе вэлюм. Тут звычайна падбягае дзяўчына, каб вэлюм адразу надзелі ёй: тады яна хутка выйдзе замуж. А нявесце на галаву завязваюць хустку (калісьці надзявалі чапец, абкручваючы яго наміткай [33]).

Часта нявесту прымушаюць выконваць розную работу, каб убачыць, якая атрымаецца з яе гаспадыня. Нявеста павінна сячы дровы, насіць ваду, месці падлогу, прычым усе стараюцца перашкаджаць ёй, пакуль жаніх не выкупіць яе ад такога занятку. Вельмі добра захаваўся звычай пасылаць нявесту за вадой і абліваць вадой жаніха. Вось як гэта адбываецца.

Паверх сваёй хусткі нявеста завязвае яшчэ адну, бярэ некалькі манет, вядро, па кавалачку каўбасы, хлеба, сыру і напраўляецца да калодзежа. Разам з ёю ідзе жанчына, якая шчаслівая ў сямейным жыцці. За імі ідзе жаніх і падганяе нявесту, быццам паказваючы сваю ўладу над ёю. Манеты нявеста кідае ў калодзеж, а хлеб, сыр раскладвае па яго кутках. Потым разам з жанчынай чэрпае ваду. Першыя два вядры яны выліваюць зноў у калодзеж, абліваючы яго вуглы. Трэцім вядром стараюцца абліць жаніха. Ён павінен не ўцякаць, а, злаўчыўшыся, абліць вадой нявесту. Ідзе барацьба за вядро з вадой. Калі ваду выпадкова разлілі, а жаніх сухі, то нявеста з жанчынай чэрпаюць яшчэ вядро, пакуль не абальюць жаніха (верх узяла нявеста). Звычайна мокрым ад калодзежа ідзе жаніх, таму што нявесце дапамагае жанчына, а жаніх «змагаецца» адзін. Пасля перамогі над жаніхом нявеста знімае з галавы лішнюю хустку і аддае жанчыне; у дадатак абвязвае яе кавалкам тканіны, дзякуючы за дапамогу ў працы. Ёсць вёскі [34], дзе пасля таго, як нявеста абалье жаніха, усе госці пачынаюць таксама абліваць адзін аднаго вадой. Смех, жарты суправаджаюць абліванне. Гэты звычай шырока распаўсюджан і цяпер. Потым чэрпаюць яшчэ вядро вады, якое нявеста нясе ў хату і ставіць на стол. Усе госці абавязкова п'юць гэту ваду і хваляць яе: вада вельмі смачная, таму што яе прынесла сама нявеста.

---

[33] Намітка — даўні галаўны ўбор замужніх жанчын з палатна вельмі тонкага вырабу.

[34] В. Верхні Церабяжоў, в. Гарадная Столінскага раёна.

Нявеста пераапранаецца, але хустку з галавы не знімае. Жаніх і сват едуць за перазовам. Урачыстых провадаў жаніху не робяць, ён ад'язджае з дому непрыкметна.

## ПЕРАЗОЎ (АБО ПЯРЭЗВЫ, ПРЫДАНЫ)

Перазоў — гэта родзічы нявесты, якія ідуць у дом жаніха праведаць нявесту. У перазоў павінны ісці ўсе госці нявесты, а не толькі самыя блізкія сваякі. Бацькоў нявесты вязе абавязкова сам жаніх, астатнія ідуць пешкі або здабываюць свой транспарт.

Хрышчоны бацька нявесты нясе з сабой буханку хлеба, іншыя — рушнікі, абрусы, каб развесіць іх у доме жаніха. Перазоў па дарозе пяе:

Чый гэта перазоў
Цераз вуланьку перайшоў?
З коскамі, касіцамі,
З чорнымі ачыцамі?
Гэта Надзеччын перазоў
Цераз вуланьку перайшоў
З коскамі, касіцамі,
З чорнымі ачыцамі.

Ой, мы следам ідзем,
Куды наша кунька бегла.
Расіцу патрусіла
Ды нас запрасіла —
Ды на адну гадзінаньку
На сваю радзінаньку.
На адзін вечарочак,
На салодкі мядочак.

Убачыўшы хату жаніха, спяваюць песню:

Знаці тую хату,
Куды Надзечка ўзята.
На хаце зялёнае,

А ў хаце вясёлае.
На хаце зеллечка,
А ў хаце вяселлечка.

Каля ганка перазоў песняй кліча маладую, якая не мае права выйсці да родзічаў:

Выйдзі, Надзечка, з хаты,
Прыехала твая маці.
Прывязла іголку,
Клубочак шоўку,
Каб шыла-вышывала,

Як у мяне, бывала.
— Няма калі, матка, шыці,
Трэба справу рабіці.
Свякроўка старая,
А залвіца малая.

Бацька жаніха запрашае перазвян у хату. Але заходзяць у першую чаргу тыя, хто будзе развешваць па сценах рушнікі, занавескі на вокны. Трэба сказаць, што занавескі былі загадзя прымераны і пашыты па размеру акон жаніховай хаты. Перазоў прыносіць абрусы на сталы, пакрывала на пасцелі; гэтыя рэчы складваюць дзе-небудзь каля печы.

Нявеста не сустракае сваіх блізкіх, а, наадварот, хаваецца ад іх. Перазоў сядае за сталы, бацькі жаніха частуюць яго. Перазвяны пяюць такія ж песні, якія спявалі родзічы жаніха ў доме нявесты, просячы гарэлкі, хвалячы гаспадароў. Але ёсць песні, якія спяваюць толькі перазвяны:

Здрыгануліся сені,
Дзе перазвяны селі.
Ды не гэтак здрыгануцца,
Як мядочку нап'юцца.
Мядочку саладзенькага
З кубачку залаценькага.

А нявеста ўсё не выходзіць. Тады перазвяны пытаюцца:

Дзе наша гадаванае,
Мілае, каханае?
Што з намі не вітаецца,
У нас здароўя не пытаецца?

Калі нявеста не спяшаецца, гучыць і другая песня:

Злодзей сватка, злодзей
Украў нашу дочку.
Захаваў у каморачку,
Замочкам замкнуў,
Калочкам заткнуў,
Мядочкам замазаў
І нам не паказаў.
Замкнёнае адамкніце,
Заткнёнае адаткніце,
Нам наша пакажыце.

Уваходзіць нявеста, кланяецца спачатку бацькам, потым усім іншым. Перазвяны спяваюць у гэты час:

Пазнай, маці, дочку,
Учора была ў вяночку.
Учора была ў зялёным,
А цяпер у бялёным.

У нявесты на галаве паверх хусткі завязана яшчэ адна, абавязкова белая хустачка. Дзяўчына садзіцца на сваё месца, а свякроў прыносіць ёй мёд і хлеб. Нявеста частуе сваіх родных хлебам з мёдам. Не бачачы зяця, перазоў пяе:

Дзе наш зяць падзеўся,
Ці ў клочча ўкруціўся?
Ці пайшоў сена касіці,
Што не йдзе нас прасіці?

Прыходзіць жаніх, садзіцца каля нявесты; маладыя выпіваюць разам з усімі. Абавязкова перазоў спявае песню, дзе просіць родзічаў жаніха клапаціцца аб нявесце:

Ой, свашачкі ды галубачкі,
Просім вас,
Каб не было нашаму дзіцяці
Ганьбы ў вас.
Каб не стаяла цёмнай ночкаю
Пад акном.
Каб не ўцірала дробных слёзак
Рукавом.
Каб не была ды каморачка
За хатку,
Каб не была ды суседачка
За матку.

А свахі адказваюць:

Будзе ёй каморачка за хатку,
Будзе ёй суседачка за матку.

Перад тым як пайсці дамоў, перазоў дарыць маладую (у трэці раз). Выходзячы з хаты, перазвяны спяваюць:

Часала Надзечка белы лён,
Выганяла перазвян з хаты вон:
— Ідзіце, перазвяны, з хаты вон,
Бо я буду часаці белы лён.

Яны стараюцца зрабіць якую-небудзь шкоду, звычайна разбіваюць гаршчык пад песню:

Мы так не паедзем,
Шкоданькі не зрабіўшы,
Лаванькі не зламіўшы,
Горшчыка не разбіўшы.

Па дарозе дамоў перазвяны звычайна спяваюць такую песню:

У нас па вяселлі
Ды хадзілі па застоллі.
Хадзілі, гукаючы,
Вяселля шукаючы.

Разам з перазовам ідуць дамоў і бацькі нявесты. Нявеста застаецца ў доме жаніха.

Так заканчваецца другі дзень вяселля.

## ТРЭЦІ ДЗЕНЬ ВЯСЕЛЛЯ

У гэты дзень вяселля дзеляць каравай. Зноў збіраюцца ўсе госці, да жаніха і нявесты асобна. Абодва караваі дзеляць паасобку, як і пякуць.

Каравай уносяць у хату, ставяць на стол. Дзеліць каравай звычайна хрышчоны бацька. Ён спачатку мые рукі і выцірае тым рушніком, якім абвязан каравай. Потым развязвае гэты рушнік і перавязвае ім сябе цераз плячо. Яму падаюць нож, і ён разразае каравай на часткі пад песню жанчын:

Крайчык каравай крае,
Залаты ножык мае.
Срэбрана яго ручка,
Залатая талерачка.

Чацвёртую частку каравая і шышку з двума парасткамі («двойчатую») бацька аддае маці жаніха (ці нявесты, таму што абрад раздзелу каравая ў жаніха і нявесты адзін і той жа). Гэтымі часткамі каравая маці жаніха і нявесты абмяняюцца ў час «гасцей».

Потым бацька разразае каравай на маленькія кавалачкі і разам з кавалачкамі шышкі «прадае» гасцям. Спачатку каравай «ку-

пляюць» бацькі, потым усе астатнія. Хрышчоны бацька выклікае ўсіх па чарзе:

Ці ёсць тут маці (брат, сястра, дзядзька)?
Малады (маладая) караваем абсылае.
А як не прымаеш,
То музыцы аддаю.

Кожны бярэ кавалачак каравая, прычым не голай рукой, а праз хустачку, і кладзе на стол грошы (звычайна па рублю). У доме жаніха, як і нявесты, маладым каравая не даюць, таму што гэта ж яны самі абсылаюць усіх сваім караваем.

За каравай дзякуюць, жадаюць маладым добрага жыцця:

Каравай прымаю і вас вітаю,
Каб жылося, каб вялося,
Каб пладзілася.
А з бутэлькі каб лілося,
Не цадзілася.
Каб гэтак жыццё пражывалі,
Як гарэлку распівалі.

Госці, падзяліўшы каравай, садзяцца за сталы. Вясельных песень не спяваюць: па сутнасці, падзелам каравая вясельны абрад амаль заканчваецца. Але госці і не думаюць разыходзіцца. Яны рыхтуюцца ісці ў «цыганы».

## «ЦЫГАНЫ»

«Цыганы» — гэта цэлае тэатралізаванае прадстаўленне, дзе ясна вызначана роля кожнай дзеючай асобы.

Спачатку «цыганы» збіраюцца ў доме жаніха, каб ісці да бацькоў нявесты. Заўсёды знаходзіцца вельмі многа гледачоў, якія суправаджаюць іх у дарозе. Дзеючыя асобы: «цыган» — жанчына, якая апранаецца ў мужчынскае адзенне, прычым выбірае найбольш зношанае, абадранае, часта курыць; «цыганка» — мужчына ў спадніцы, хустцы, кофце. Усё на ім сядзіць нязграбна; у рухах, паходцы стараецца паходзіць на жанчыну, што выклікае выбух смеху. Часта «цыган» бывае маленькага росту, а вось «цыганка», наадварот, бамбіза. Ходзяць яны ўвесь час у пары, вельмі любяць скокі, спяваюць частушкі: хто каго пераможа. Гэта самыя вясёлыя, знаходлівыя людзі, таму што ім патрэбна не толькі весяліцца самім, але і весяліць публіку. Да «цыган» прыстаюць дзеці, дражняць іх, а яны са смехам ганяюцца за малышамі, лякаюць іх, ды не толькі іх, але і дарослых. Заўсёды «цыганка» гадае ўсім жадаючым, гэта таксама своеасаблівы спектакль.

Акрамя «цыган» заўсёды ёсць «доктар», які захутваецца ў прасціну або надзявае белы халат. «Доктар» носіць з сабой сумку

з чырвоным крыжам або чамаданчык, дзе захоўваецца звычайна лякарства ад усіх хвароб — гарэлка. Ён лечыць «хворых», якіх становіцца падазрона многа, нават выпісвае рэцэпты найбольш настойлівым, дае карысныя парады.

Для аховы парадку ёсць «салдат», абавязкова ў ваеннай форме або хоць у салдацкіх штанах. Але галоўным для «салдата» з'яўляецца яго фуражка, якая так падабаецца дзецям, што яны стараюцца яе збіць з галавы. Часта салдатам апранаецца жанчына, якая малюе сабе вусы.

Абавязкова павінны быць фальшывыя жаніх і нявеста, прычым нявестай можа апрануцца мужчына, а жаніхом — жанчына.

«Цыган» чуваць здалёк па крыку, смеху, песнях, скоках. У хаце бацькоў нявесты наваяўленыя «маладыя» скардзяцца на сваё гаротнае жыццё. Асабліва стараецца «нявеста» размаляваць, як з яе здзекуюцца ў доме мужа, як яна сумуе без бацькоў. «Цыган» запрашаюць за сталы, частуюць.

Ад гасцей нявесты ў гэты ж дзень таксама пасылаюцца «цыганы» ў дом жаніха, толькі сярод дзеючых асоб няма «жаніха» з «нявестай», таму што там знаходзяцца сапраўдныя маладыя.

«Цыганамі» заканчваецца трэці дзень вяселля. Вяселле лічыцца незаконченым, пакуль родзічы жаніха і нявесты не сходзяць адны да другіх у госці.

Гэты абрад называецца ў розных вёсках па-рознаму: госці, гасціны, спірогі (ад слова «пірагі»), адведкі, пірагі. Але сутнасць яго ўсюды адна і тая ж.

## ГОСЦІ
## (АБО ПІРАГІ)

Увесь цыкл вясельнай абраднасці заканчваецца ўзаемным наведваннем бацькоў маладых. Робіцца гэта праз пэўны час пасля вяселля. На пачастунак запрашаюцца таксама блізкія сваякі — важнейшыя і найбольш сталыя асобы: хросныя бацькі, дзядзькі, цёткі і г. д. Да сваёй новай радні маладыя ставяцца з асаблівай павагай, любасцю і ўдзячнасцю. «Госці» могуць быць на чацвёрты і пяты дзень вяселля, але класічна гэты этап вяселля праходзіць так.

Спачатку маладыя разам з бацькамі жаніха і бліжэйшымі родзічамі ідуць (едуць) да бацькоў нявесты ў першую нядзелю пасля вяселля. Нявеста да гэтага дня не мае права бываць у сваіх бацькоў, нават калі ёй вельмі патрэбна. А ў суботу прыязджае бацька нявесты і забірае да сябе дамоў жаніха і нявесту, дзе яны і начуюць. Раніцай прыходзяць астатнія. Маці жаніха прыносіць і аддае маці нявесты чвэрць каравая і шышку. Бацькі маладой склікаюць сваіх сваякоў, добрых знаёмых, разам з якімі яны ўшаноўваюць гасцей, частуюць іх.

Госці гуляюць даволі доўга, бо «яшчэ дадому не пара, не з'елі ў свата барана». Старэйшыя, як правіла, вядуць размову пра ўзаемаадносіны бацькоў і дзяцей, пра будучае жыццё маладой пары, клапоцячыся аб іх шчасці. Танцуюць мала. Спецыяльных «гасцінных» песень няма, звычайна паўтараюцца тыя, што спявалі прыданкі аб жаночай долі ў чужым краі, у чужым родзе. Героямі гэтых песень часта з'яўляюцца брат і яго замужняя сястра:

— Сястра наша, сястра,
Чаго пастарэла?
— Пастарыла мяне
Чужа старонанька,
Бедна галованька.

Зноў гучаць у песнях матывы тугі і смутку, выкліканыя развітаннем нявесты з «дзявоччынай», з «пагуляннейкам і красаваннейкам», з сяброўкамі і родным домам. Але такіх песень спяваюць мала. Пяюць жартоўныя прыпеўкі:

Выкацілі, выкацілі мядовую бочку.
Што хацелі, то зрабілі
З пана-свата дочкай.

Ды й пасадзім, ды й пасадзім
На новым вазочку.
Ды й павязём, ды й павязём
Да свайго дамочку.

Жыта маё, жыта маё
Трэба адсяваці,
Жонка мая маладая—
Трэба шанаваці.

Жыта маё, жыта маё
Сыпалася з меха,
Жонка мая маладая—
Бярэць мяне ўцеха.

Андрэй, не дурэй,
Не дзяры сарочкі,—
Не ты праў, не ты ткаў
І не твае дочкі.

А куды ж ты павядзеш,
Ці не ў канапелькі?
Ці не стыдна табе,
Такі маладзенькі.

Праз масточак у ручаёчак
Вадзіца сачылася.
Я ў мілога на каленях
Песенькі вучылася.

Маладыя вяртаюцца дамоў разам з гасцямі.

На наступны дзень са сваёй часткай каравая і шышкай ідуць (едуць) да бацькоў жаніха на перазоў бацькі і родзічы нявесты. Гэта апошняя вясельная бяседа. Жанчыны лічаць, што «госці» патрэбны для таго, каб «сышліся» род з родам, каб маладую ўвесці ў кола жанчын, якія будуць ёй сяброўкамі, а можа і пераразваці, адклікаць маладую назад, выкупіць яе «з няволі».

Асноўныя вясельныя абрады супадаюць ва ўсіх мясцовасцях Беларусі. Адхіленні датычацца галоўным чынам мясцовых асаблівасцей. Напрыклад, у в. Верхні Церабяжоў Столінскага раёна каравай пякуць, а потым дзеляць толькі ў доме жаніха. У доме нявесты пякуць прадаўгаватыя пірагі, абвітыя пляцёнкай з цеста (у выглядзе дзявоцкай касы). Гэтыя вясельныя пірагі называюцца вярчамі. Калі маладая пакідае родны дом, яна бярэ верч з сабой, а ў доме жаніха кладзе яго на печ. У пэўны час верч называецца снеданнем. Па звычаю, раніцай на другі дзень вяселля радня маладой (хросная маці, цёткі, замужнія сёстры) вязе да яе матчына снеданне, у якое абавязкова ўваходзіць верч.

Калі маці маладой разам з іншай раднёй едзе ў дом жаніха ў перазоў, яна таксама вязе з сабой верч. Гасцей частуюць ужо маладыя гаспадары. Маладая разразае верч, намазвае кавалкі мёдам і раздае ўсім дамашнім і гасцям.

Так заканчваецца цікавае і прыгожае вяселле.



# Вясельныя песні

*Піце гарэліцу, госцейкі, піце,*
*Слаўную Ганначку нашу любіце.*
*Першай з брыгадай яна ўставала,*
*Першай на поле ішла працавала.*

*Весела, госцейкі, песню спявайце,*
*Песняю Ганначку нашу ўслаўляйце,*
*Зорка, што свеціць ў яе, залатая*
*Хай ёй дарогу ў жыццё азарае.*

. . . . . . . . . . . . . . . .

*Танец хай стужкі вясёлкамі кружыць,*
*Шчасце хай з нашаю Ганначкай дружыць,*
*За маладых уздымаем мы чаркі,*
*Ярка свяці, наша сонейка, ярка!*

М. Танк

## СВАТАННЕ, ЗАПОІНЫ (ЗМОВІНЫ, ЗАРУЧЫНЫ)

### 1. Было ў месячкі два ражкі...

Было ў месячкі два ражкі,
Было ў Лёнечкі два швагры.
Адзін швагер каня сядлае,
А другі — павучае:
— Паедзем, брацец, да сцілкі
Выведаць табе дзве дзяўчынкі.
Адна будзе ўся ў золаце,
А другая — з розумам.
Не бяры, брацец, што ў золаце,
Бяры тую, што з розумам,
Бо золата мы самі прыкупім,
А розума мы не ўложым.

### 2. Гарошак па дарозе коціцца...

Гарошак па дарозе коціцца,
Жанішок у дарогу ладзіцца.
Баценька распытваецца:
— Ці простая дарога?
— Ідзі, сынку, бітымі мастамі
Ды завярні конікаў да сяла,
Там табе дзяўчына весяла.

### 3. Даю табе дзевяць конікаў...

Даю табе дзевяць конікаў
Пад тваю дружынаньку,
А дзесятага яшчэ варанога
Пад цябе, маладога.
Ой, борам, борам, баравінаю
Едзе Колечка там з дружынаю,
А з дружынаю,
З вялікім войскам.

## 4. Не любі, сыночку...

Не любі, сыночку,
Дзеўку ў цянёчку.
Палюбі сабе
У полі на ніве.
У полі на ніве,
На харошым жніве,
Што жне нізенька,
Кладзе роўненька.
Кладзе роўненька,
Вяжыць ёмненька,
Становіць копкі
На полі гусценька.

## 5. Ванечка коніка сядлае...

Ванечка коніка сядлае,
У коніка праўдачкі пытае:
— Ой, коню, мой коню дарагі,
Ці надзеешся на сілу,
Ці давязеш маю дружыну?
Мая дружына невялікая.
Сем каней вараных прыстане,
Пакуль маю дружыну даставе.

## 6. Маці сына да выражала *...




Маці сына да выражала **,
Месяцам апаразала.

Зораю засцягнула,
Доляю агарнула.

Ідзі, сынаньку, борам,
Табе дарога з богам.

Борам, борам, баравіннечкам,
Мацерыным благаславеннечкам.

## 7. Дымна ў полі, дымна...

Дымна ў полі, дымна
Ды нікога не відна.
Чуць завідае —
Сівы конь выбягае,
Колечка, Колечка выязджае
І са сваёю сваццецаю,
З роднаю сястрыцаю.
— Сястрыца-парадніца,
Ды парадзь ты мне:
Як цесця ваяваці,
Сабе Олечку браці.
— Ды вауй, братка, вауй,
Сівых коней на двор вярні,
Сабе Олечку бяры.

---

* Выражаць — упрыгожваць.
** Першы радок кожнай страфы паўтараецца.

### 8. Ой, мая мамачка родная...

— Ой, мая мамачка родная,
Што мне ды за сон сніўся:
Галубы ўвесь двор укрылі,
Чорны шоўк распусцілі,
Золата рассыпалі.
— Маё дзіцятка роднае,
Якая ты ды не дагадлівая,
Я твой сон ды разгадаю:
Галубы — сваты твае,
Чорны шоўк — госці твае,
Золата — слёзкі твае.

### 9. А ў нядзельку рана...

А ў нядзельку рана
Дзеванька гаварыла:
— Ой, мамачка мая родная,
Сніўся мне сон дзіўненькі:
Сівыя сокалы наляцелі,
Па застоляю паселі,
Чорны шоўк распусцілі,
Шчыра золата рассыпалі.
— Маё ж дзіцятка роднае,
Малады розум маеш.
Малады розум маеш,
Свайго сну не разгадаеш:
Сівыя сокалы — то сваты твае,
Чорны шоўк — коскі твае,
Чорны шоўк — коскі твае,
Шчыра золата — слёзкі твае.

### 10. Сакалок да бору ляціць...

Сакалок да бору ляціць,
Зязюлька пералятае.
Колечка дадому ідзе,
Лідачка перапыняе.
А з суботкі на нядзельку
Лідачка сон сасніла
Да бацэньку спавясціла:
— Ой, бацэнька, ой, родненькі,
Прысніўся мне сон дзіўны:
Цераз новыя сені
Два сокалы ляцелі,
Ой, ляцелі, ляцелі
Да на покуці селі.
Белы жэмчуг развярцелі,
Золата рассыпалі.
— А дзіцятка маё,
Ты не ўвесь розум маеш,
Свайго сна не адгадаеш:
Сакалы — сваты твае,
Белы жэмчуг — коска твая,
Золата — слёзкі твае.

### 11. Маладая ўжо дзеванька кажа...

Маладая ўжо дзеванька кажа:
— Дзеванькі, падружанькі,
Выйдзеце за вароты
Ды прыляжце к дарозе:
Ці не стучыць дарога,
Ці не шуміць дуброва,
Ці не едуць маршалкі
Ды па нашы падаркі.

### 12. Ой, скарэй бы вечара даждаці...

Ой, скарэй бы вечара даждаці,
Пойдуць недзе дзяўчыну сватаці.
Пойдуць недзе дзяўчыну сватаці,
А мы пойдзем пад акно слухаці,
Ды што будзе дзяўчына казаці.
Дзеўка ходзіць ды ўсё пахаджае,
Белыя ручкі на сэрцы складае.
— Маці, маці, парадніца ў хаце!
Парадзь, маці, што свату казаці:
Ці ісці замуж, ці з год пагуляці?

### 13. Краем, борэм калінанька зацвіла...

Краем, борэм калінанька зацвіла,
Краем, борэм чырвоная зацвіла.

Ой, ехаў там пан-дружанька пяючы,
Пачуў ён сіву зязюльку куючы.

То не зязюлька сівая кувала,
Ганначка харошы песні спявала,

Пад акенцам на крэсялку седзючы,
Свайму міламу кашуленьку шыючы:

— Ой, дай, божа, кашуленьку пашыці,
Майму міламу здарову знасіці!

### 14. Ой, белая бярозанька...

— Ой, белая бярозанька,
Чаму ж ты не зялёненькая?
— Ой, як жа мне зялёненькай быць,
Калі каля мяне шлях-дарога ляжыць.
Кожны дзень купцы едуць
І з мяне дубцы рэжуць,
На карэньчыках агонь кладуць.
Карэньчыкі выгараюць,
Голлейка высыхае.
— Маладая дзевачка,
Ой, чаму ж ты невясёлая?
— Ой, як жа мне вясёлай быць,
Яшчэ ўчора сваты былі ў хаце,
Не даюць бацьку спаці,
Хочуць мяне маладую забраці.

### 15. Маладзенька Ганулька...

— Маладзенька Ганулька,
Чаго ты невясёлая?
— Ой, як жа мне вясёлай быць,
Калі з вечара сваты ходзяць
Ды гарэлачку носяць,

Ды майго бацьку просяць,
Ды не даюць бацьку спаці,
Ды хочуць мяне маладую ўзяці,
Ды не даюць мне ўзрасці,
Ды русыя косачкі сплясці.

### 16. Судзі, божа, ды латаці даждаці...

Судзі, божа, ды латаці даждаці
Ды я пашлю да дзеўчынанькі сваты.
А сам пайду пад акенцам слухаці,
Аб чым будуць гаварыці.
Бедная дзеўка ды па хатанцы ходзіць,
Белыя ручанькі ды за галаваньку ломіць,
У сваёй маманькі ды парадачкі просіць:
— Маці, маці, парадніца ў хаце!
Ды парадзь жа мне, што сватам адказаці?
Ці мне, мамка, ды падаркі гатаваці,
Ці мне, мамка, яшчэ зіму зімаваці?
— Кладзі, доня, усе падарачкі ў скрыначку.

### 17. Ой, чыя ж гэта радзіна...

— Ой, чыя ж гэта радзіна
Ды пад вокнамі хадзіла,
Ды зубамі лескацела,
Ды ў хату хацела?

— Ох, гэта ж Коліна радзіна
Ды па падваконню хадзіла,
Ды зубамі лескацела,
Ды ў хату хацела.

### 18. Ай, у лесе, у лесе даліна...

Ай, у лесе, у лесе даліна,
Там Танечка рушнікі бяліла.
Пабяліўшы рушнікі, заснула,
Прыйшоў родны татанька, не пачула.
— Ды ўстань, устань, Танечка, годзе спаць,
Бо ўжо на двары госценькі стаяць.
— Няхай яны стаяць здаровы,
Бо мае рушнікі ўжо гатовы.

### 19. Ой, хлопчыкі, за гумном...

Ой, хлопчыкі, за гумном
Стаяць стагі ўсе радом:
То па два, то па чатыры.
І усе пшанічныя.

А ў дзеванькі за сталом
Сядзяць сваты ўсе радом:
То па два, то па чатыры.
І ўсе маладыя,

## 20. Каля балоцечка гуляла маладзенька...

Каля балоцечка гуляла маладзенька,
Гуляла, гуляла, руту-мяту мяла.
— Расці, расці, рута-мята, сінія васілёчкі,
Калі ў мамачкі буду — палоць, паліваці буду,
А калі ў свякроўкі — з коранем ірваці буду.

## 21. Ты, мой баценька...

Ты, мой баценька,
Ты, мой родненькі,
За каго аддаеце?
Як за якога, за лайдакога —
То паперу не псуйце.
Як за Колечку маладзенькага —
Золата не шкадуйце.

## 22. З-пад белага ды бярэзнічку...




З-пад белага ды бярэзнічку
Выбягае белы конічак.

Ды не сам жа конічак бяжыць,
На ём хлопец удаленькі сядзіць.

Ён коніка паганяе
І з конікам размаўляе:

— Ой, ты коню, ты мой коню,
Ты выхвалівайся мною,

Ты выхвалівайся мною
І маёю ты жаною.

Пераскоч ты вароцечка,
Не зачапі ты капыцечка.

Ды не выбі, коню, брамачкі,
Не зрабі, коню, няславачкі.

Не дай, коню, цесцю знаці,
Што мы будзем ваяваці.

І камору мы зграбуем,
І ўвесь двор мы адваюем.

Каморачку ды навенькую,
Дзяўчынаньку маладзенькую!

### 23. Ды не наступай, Літва...

Ды не наступай, Літва,
Будзе з намі бітва.
Будзем біці да ваяваці
Ды Галечку не аддаваці.

### 24. Ой, чые гэта конікі...

Ой, чые гэта конікі
Каля залатога плота стаялі?
І вады не п'юць,
Капытамі б'юць.

### 25. Стукнула-грукнула на дварэ...

Стукнула-грукнула на дварэ.
— Глянь, мая мамачка, ці не ка мне?
Знай, мая мамачка, што сказаць,
Пашлі сваё дзіцятка ў сад
Сабе на вяночак цвяточкі рваць.

### 26. А ў нядзелечку парану...

А ў нядзелечку парану
Ішла дзевачка па ваду,
Зачула коніка ў бары,
Кінула вядзёрцы на зямлю.
— Станьце вы, вядзёрцы,
Дагары дном.
А сама яна прыйшла ў хату.
— Татачка, мамачка, гатуйся,
Вараныя коні сватоў вязуць
Адлучаць мяне ад татачкі,
А прылучаць мяне к свёкару.
Адлучаць мяне ад мамачкі,
А прылучаць мяне к свякрухе.
Адлучаць мяне ад сястрыцы,
А прылучаць мяне к заловачцы.
Адлучаць мяне ад браткі,
А прылучаць мяне к
дзевяраткі.

### 27. Ой, у саду салавейка гняздо ўе...

Ой, у саду салавейка гняздо ўе,
Ці ўсім сватовам месца е?
А каму няма — скажыце,
Усю сваю радзіну садзіце.
А каму не будзе — той стане,
А хто не стане — дастане.

### 28. Ешче галушкі...

Ешче галушкі,
Бо ў нас хлеба няма.
Спіце на рагожы,
Бо падушкі няма.
Ох, каб наша бяседанька была весяленькая
І ў нашага свата за сталом.

### 29. Ці я табе, маманька, надаела...

Ці я табе, маманька, надаела,
Што ты мяне аддаеш за дзеда?
Ці я табе кашуленькі не прала,
Ці я табе пасцеленькі не слала?
Прала табе кашуленьку бяленькую,
Слала табе пасцеленьку мякенькую,
Прала табе кашуленьку на моры,
Слала табе пасцеленьку ў каморы.

### 30. Няпраўдзівая калінка казала...

Непраўдзівая калінка казала:
— Цвісці не буду,
Белых цвяточкаў не ўраджу.
Як прыйшла пара — зацвіла,
Красны ягады пусціла.

Непраўдзівая Валечка казала:
— Замуж не пайду,
Маладога Толечку не люблю.
Як прыйшлі сваты, то пайшла,
Маладога Толечку палюбіла.

### 31. Хвасталася ды дзеванька...

Хвасталася ды дзеванька:
— Ой, замуж не пайду,
Пасеяла чарнабрыўцаў,
Ой, цэлую граду.
Чарнабрыўцы для мілога
Захавайце,

За нялюбага, ой, замуж
Не аддавайце.
Ой, вы, дзеўкі, чарнабрыўцы,
Ой, не зрывайце,
Ой, вы, дзеўкі, чарнабрыўцы,
Ой, палівайце.

### 32. Гаварыла каліна...

Гаварыла каліна:
— Цвісці не буду.
Гаварыла Вера,
Што Андрэя любіці не буду.

Прыйшла вясна —
Каліна зацвіла,
Прыйшло врэмя —
Вера Андрэя палюбіла.

### 33. Сівы, белы селязеньчыку...

— Сівы, белы селязеньчыку,
Ці быў ты на Дунайчыку,
Ці бачыў ты сваю качачку?
— Да не то я яе бачыў,
Я з ёю наплаваўся,
Я з ёю нашчабятаўся.

— Маладзенькі жаніх,
Ці бачыў ты сваю дзевачку?
— Да не то я яе бачыў,
Я з ёю нагаварыўся,
Я з ёю настаяўся.

### 34. Дай, божа, маладым...

Дай, божа, маладым
Добру долю абаім.
Маманька, родненькая,
Пазачыняй брамачкі
Ды пастаў ля вартачкі,
Бо вылецiць ды галубанька.
Галубанька ды сiвенькая,
Марыначка маладзенькая.

### 35. Пашлём сокала аж пад небеса...

Пашлём сокала аж пад небеса
Па роднага батаньку,
А зязюльку на Ўкраiнаньку
Па яе радзiнаньку.
Саколiк ляцiць, вестачкi шле,
Што батанька будзе.
Зязюлька ляцiць, вестачкi шле,
Што радзiнанька прыбудзе.

### 36. Ой, прыходзьце на заручыны...

Ой, прыходзьце на заручыны,
Дзе дзевачка заручаецца
Ды ад роду адракаецца,
Ды к хлопчыку прылучаецца.
— Ой, зяць мой любы,
Не будзь ты горды,
Каб цябе людзi зналi.
Палож рублiк на талерачку,
Штоб музыкi гралi.
Палож другога,
Хоць залатога,
Штоб дружачкi скакалi.

### 37. Звалi мяне на заручыны...

Звалi мяне на заручыны,
Сенечкi ды й закручаны.
Пакуль яны адкруцiлiся,
Маладыя заручылiся.

### 38. Ды стаяла Танечка пад вязком...

Ды стаяла Танечка пад вязком,
Ды гукала Колечку галаском:
— Едзь, едзь, Колечка,
не баўся,
Бо ўжо мой татачка сабраўся.
Цясовыя столiкi засланы,
Дарагiя госцiкi сазваны,
Залатыя кубачкi налiты,
Без цябе, Колечка, не пiты.

### 39. Нас на змовiны пазвалi...

Нас на змовiны пазвалi,
Чаркi гарэлачкi не далi.
Каб мы гэта ведалi — не пайшлi б.
Цi мы б сабе работы не найшлi?
Была б кудзелька — мы пралi б,
Не было б кудзелькi — мы б спалi.

### 40. Таццянчын баценька...

Таццянчын баценька
Сабалямі двор сцеле
І золатам пасыпае.
Скора госцейкі на двор прыйдуць,
Сабалі зашумяць,
А золата зазвініць.

### 41. Беражыся, дзевачка, беражыся...

Беражыся, дзевачка, беражыся,
Пад акенцам спаць не лажыся.
А то ноч і здрадзе,
Прыйдзе Ванечка і ўкрадзе,
Завязе цябе за Дунай.

А там горы крутыя,
А там людзі чужыя,
А там чужая старана,
Каб нам не было сорама.

### 42. Сяк-так вяселле бог нам даў...

Сяк-так вяселле бог нам даў,
Ажаніўся мяшок, торбу ўзяў.
Мяшок трэсак, торбу лучыны —
То нашы заручыны.

### 43. Наехалі заручнікі...

Наехалі заручнікі
Ды па белы ручнікі.
Ды па белы ручнікі,
Ды некага заручаці.

Машачкі няма дома,
Бо пайшла ў красачкі.
Сабе на цвяточак,
Сабе на вяночак.

### 44. Білі два званы, білі...

Білі два званы, білі,
Дзетачкі гаварылі.
Кубачкі спаўняліся,
Дзетачкі змаўляліся.

### 45. Пусці, сваццця, у хату...

Пусці, сваццця, у хату
На пячы пагрэцца,
На дзеваньку падзівіцца:
Ці харошая, ці ўбраная,
Ці нам спадабаная,
Ці харошая па лічаньку
Нашаму панічаньку.

### 46. Пусці, свацця, у хату...

Пусці, свацця, у хату
Хаця ручкі пагрэць,
Бо мы свахі — з дарогі,
Памарозілі ногі.

### 47. Сватове-панове, па што вы прыехалі...

Сватове-панове, па што вы прыехалі:
Ці па гарох, ці па сачавіцу,
Ці па красную дзявіцу?
Наш гарох не малочаны,
А сачавіца ў капах стаіць,
А наша дзевачка ў косах сядзіць.

### 48. За гумном — даліна...

За гумном — даліна,
Там Анечка рушнікі бяліла.
— Бялі, бялі рушнікі бяленька,
Ужо твае баяры блізенька.
Пагаворaць з табою ціхенька:
— Годзе, годзе, Аня, бяліці,
Прыехалі баяры дзяліці.

### 49. Хто ў маім садочку рана быў...

— Хто ў маім садочку рана быў,
Хто маю рутаньку страхануў?
Адазваўся Колечка:
— Я ў тваім садочку рана быў,
Я тваю рутаньку страхануў.

### 50. Зязюлька гняздзечка звіла...

Зязюлька гняздзечка звіла,
Салавей прыляцеў і сеў.
Надзечка сталы заслала,
Колечка прыехаў і сеў.

### 51. Мастом ідзе — маставіна гнецца...

Мастом ідзе — маставіна гнецца,
У сяло прыйдзе — людзі дзівяцца.
— Бог таму дае, чый сын ідзе,
Таму яшчэ лучшэй, каму зяцем будзе.
— Ой вы, жаночкі, ды вы не дзівуйце,
Пагадуйце дочак, то і ў вас зяць будзе.

### 52. Казалі дзевачкі...

Казалі дзевачкі:
— Красівы жаніх,
Пойдземце яго паглядзім,
Ці мы яму заганы
Не дадзім?

Першая загана — зладзюга,
Другая загана — грыбазвон,
Трэцяя загана — конь не свой.
Прадаў коніка за табаку,
Прыехаў к Танечцы на сабаку.

### 53. Не ідзі, не ідзі, маладая дзеванька...

Не ідзі, не ідзі, маладая дзеванька,
Туды, дзе п'юць.
Не бяры таго гасцінчыка, што даюць.
Бо яны ж цябе тым гасцінчыкам абмануць
Ды ад маманькі
Ды да свякроўкі павядуць.

### 54. Я думала, што на сяле граюць...

Я думала, што на сяле граюць,
Аж яны мяне запіваюць.
Мёд і віно на стол носяць,
Бацьку майго хораша просяць.
Мой баценька жаласлівы,

Дзе стане, там і заплача,
А дзе сядзе — абальецца:
— Дзіця маё ды й не вернецца,
Дзіця маё ды й раджонае,
Каму яно суджонае?

### 55. Кукавала кукушачка за дваром...

Кукавала кукушачка за дваром,
Плакала свет-Танечка за сталом:
— Божа мой! Ды хто мяне, горкую, узвесяліць,
Хто мяне няшчасную ўзвесяліць?

### 56. Ой, гула пчолка, гула...

Ой, гула пчолка, гула
Каля новага двара.

То не пчолка гула,
То Лідачка плакала.

### 57. Як цябе, мая мамачка, жаль не бярэ...

Як цябе, мая мамачка, жаль не бярэ,
Што твая дочачка вочкі трэ.
Апусціла вочкі да долу,
Капаюць слёзы на зямлю.

### 58. Заручае мяне татка, заручае...

Заручае мяне татка, заручае,
Няхай ён у суседа ды спытае.
Кажуць людзі,
Што ў тым доме свёкар горды.
Будзе мною, маладою, гардаваці,
На чужую работаньку пасылаці.

### 59. Піце, сваты, гарэлачку...

Піце, сваты, гарэлачку,
Падчышчайце талерачку,
Запівайце паненачку:
І румяна і прыгожа,
Да любой работы гожа.

### 60. Піце, ешце, сваты...

Піце, ешце, сваты,
Ды хваліце маці,
Што дзеўку гадавала,
Для вас наражала.
Ешце, піце, сваты, гарэлку,
Запівайце дзеўку.

### 61. Каціўся гарошак ды па сенажаці...

Каціўся гарошак ды па сенажаці,
Хваліўся Колечка Олечку ўзяці.
Яна, маладая, яго жалавала,
Выняла хусцінку, яму даравала:
— Ды мая хусцінка
Ды бялым-бяленька.
Ды глядзі, Колечка,
Каб доля дабрэнька.
Ды мая хусцінка,
Ды шоўкам шыта.
Ды глядзі, Колечка,
Каб не была біта.

### 62. Ой, у цябе, Галечка...

— Ой, у цябе, Галечка,
Каменнае сардэнька,
Што ты вечар сядзіш
Ды не заплачаш?
— Ой, як жа мне плакаць
І сваё лічанька церці,
Калі маё лічанька, як яблычка,
А сама я, як вішанька.

### 63. Вецер не вее, сонца не грэе...

Вецер не вее, сонца не грэе —
Каліна не спее.
Ох, каб я знала, ведала
Блізкія заручыны,
То я б паслала сваю маманьку
У цёмны луг па каліну.
Маманька пайшла,
Увесь луг абышла,
Без каліны прыйшла.
Вецер не вее, сонца не грэе —
Каліна не спее.
Ох, каб я знала, ведала
Блізкія заручыны,
То сястрыцу паслала б
У цёмны луг па каліну.
Сястрыца пайшла,
Увесь луг абышла,
Без каліны прыйшла.
Вецер не вее, сонца не грэе —
Каліна не спее.
Ох, каб я знала, ведала
Блізкія заручыны,
Я б паслала свайго Колечку
У цёмны луг па каліну.
Колечка пайшоў,
Да луга не дайшоў
Ды і каліну знайшоў.
Вецер вее, сонца грэе —
Каліна паспела.

### 64. Ой, калі б знала, калі б ведала...

Ой, калі б знала, калі б ведала,
Што запоіны будуць,
То б паслала сваю мамачку
У луг па каліну.
Мамачка пайшла, каліначку не знайшла,
Ды й заплакаўшы, прыйшла:
— Вецер не вее, сонейка не грэе —
Каліначка не спее.
Ой, калі б знала, калі б ведала,
Што запоіны будуць,
То паслала б свайго татачку
У луг па каліну.
Татачка пайшоў, каліначку не знайшоў,
Ды й заплакаўшы, прыйшоў:
— Вецер не вее, сонейка не грэе —
Каліначка не спее.
Ой, калі б знала, калі б ведала,
Што запоіны будуць,
То паслала б свайго мілога
У луг па каліну.
Мілы пайшоў, каліначку знайшоў:
— Сонца грэе, вецер вее —
Каліначка спее.
Мілы каліну знайшоў — дзеўку сабе ўзяў.

### 65. Ой, што б я знала, ведала...

Ой, што б я знала, ведала
Блізкія заручыны,
Выправіла б я свайго брата
У лес па каліну.
Брацік прыйшоў, каліны не знайшоў.
Выправіла б я сваю сястру па каліну.
Сястра прыйшла, каліны не знайшла:
— Сястра мая родненькая —
Гэта судзьба твая,
Без каліны я прыйшла.
Пыталася сястра ў сястрычкі:
— Ці добра табе, сястрычка,
Седзячы за сталом?
— Ой, датуль добра, датуль хараша,
Пакуль жаніх мой не ідзе.
Прыйдзе — слёзкі разалье,
Маю касу распляце,
За сябе замуж вазьме.

### 66. Годзе, каліна, годзе, маліна...

Годзе, каліна, годзе, маліна,
Годзе вам у лузе стаяць.
Годзе табе, дзевачка, годзе ў мамкі гуляць.
Паслала я свайго бацьку каліну ламаць.
Бацька пайшоў, увесь луг абышоў,
Каліны не знайшоў.
Паслала я сваю маці каліну ламаці.
Маці пайшла, увесь луг абышла,
Каліны не знайшла.
Паслала я свайго любага
Каліну ламаць.
Любы пайшоў, каліну знайшоў:
— Годзе табе, дзевачка,
Без вяночка хадзіць.

### 67. Ой, калі б знала, калі б ведала...

Ой, калі б знала, калі б ведала,
Ой, калі б знала, калі б ведала,
Што заручыны будуць,
То б я руты не сеяла,
Васількоў бы не саджала,
Стада коней увагнала б.

Стада маё вараненькае,
Тапчы зелле зяляненькае.
І рутаньку, і мятаньку,
Усю маю пакрасаньку.
Ды й тую, што саджала ў нядзельку,
Што саджала ды й палівала.

Адзін вяночак звіла
Ды й таго не знасіла.
У сенечках ды павесіла.
У сенечках ды на калочку,
На жалезным гваздочку, на жалезным гваздзе,
Ды й прыехалі госці ка мне.

### 68. Чаму зязюля не кукавала...

— Чаму зязюля не кукавала,
Як сады расцвіталі?
Чаму Ганулька не заплакала,
Як яе запівалі?
— А я думала, а я мысліла,
Што яны жартавалі.
Гэтыя жарты выйшлі на праўду:
Што ў мамачкі не быць,
Вяночкі не насіць.

### 69. Ой, у полі бярозанька развіта...

Ой, у полі бярозанька развіта,
Ды ўжо наша Ніначка запіта.
Ой, ды запіваў жа яе ўвесь род,
А яе ж бацюхна напярод.

Ой, у полі дубочак развіты,
Ды ўжо наш Колечка запіты.
Ой, ды запіваў жа яго ўвесь род,
Ды яго ж бацюхна напярод.

### 70. Дзяўчына мая заручаная...

— Дзяўчына мая заручаная,
Дзяўчына мая заручаная,
Ды чаго ходзіш засмучаная?
— Як жа мне не плакаці,
Як жа мне смутнай не быці:
Палюбіла хлопца, не магу забыці.

### 71. Дзяўчына мая заручаная...

Дзяўчына мая заручаная,
Чаго ж ты сядзіш засмучаная?
Ой, я ж цябе браў, як калiначку,
А ты ссохла, завяла, як былiначка.
Ой, я ж цябе браў, як з ружы цвяток,
А ты высахла, як жоўты пясок.

### 72. Ой, пад плотам бузiна...

Ой, пад плотам бузiна
Ды закручаная.
Не чапайце мяне хлопцы:
Я заручаная.
Не вядзiце мяне ды па пожаньцы:
Па пожаньцы мае ножкi баляць,
А па дарожцы яны самi бяжаць.
Што чарот, што асока — харошае зелле,
А як будзе мясаед,
Дык будзе вяселле.

### 73. Сонейка за гару заходзiць...

Сонейка за гару заходзiць *.
Ганначка Андрэйку праводзiць.

— Правяду я яго да лесу,
А сама вярнуся да часу.

Правяду я яго да бору,
А сама вярнуся дадому.

Правяду я яго з скрыпкамi,
А сама вярнуся з дзеўкамi.

### 74. Пушчу я паву па Дунаю...

Пушчу я паву па Дунаю,
Сама пайду па беражочку.
Ды цi не ўбачу таткавы сенi?
Ды хоць убачу — мне там не быцi,
З таткам не жыцi,
Цясовыя сталы не засцiлацi,
У залатыя кубкi вiна не налiвацi,
Дарагiх гасцей не дажыдацi.

* Кожны першы радок паўтараецца.

### 75. Заручоначка Ніначка...

Заручоначка Ніначка
Перайшла сені бацькавы.
— Падай татачку вадзіцы
Са студзёнай крыніцы.
— Я ж табе, татачка, не слуга,
Каб табе вадзіцы падала.
А служка я свёкаркава,
А služанaчка я свякрусіна,
Верная жонка Віцюсіна.

### 76. Добра было, мамка, заручыны піці...

Добра было, мамка, заручыны піці,
Добра было, мамка, заручыны піці,
А хто ж будзе, мая родна,
Без мяне рабіці?
Прыйдзе вясна, наступіць красна —
Не будзе каму ткаці.
Прыйдзе лета, паспее жыта —
Не будзе каму жыта жаці.
Займеш постаць доўгу, шыроку —
Не будзе каму падганяці.
Нагнешся, разагнешся,
Слёзкамі абальешся:
— Ох, тут было дзіця люба,
Ды яго ж забралі чужы людзі.

### 77. Ці я табе, мамка мая, дакучала...

— Ці я табе, мамка мая, дакучала,
Што ты мяне, маладую, заручала?
— Не дакучала, доню мая, дакучалі
Доню мая, ой, сваты твае.
Дакучалі, доню мая, сваты ў хаце,
Не давалі, доню мая, ночы спаці.

### 78. Запіта, дзеванька, запіта...

Запіта, дзеванька, запіта,
Золатам косанька абліта.
Хто ж яе, маладую, запіваў,
Золатам косаньку абліваў?
Запівалі ж яе дзевачкі
Ды далі жанішку на ручкі.

### 79. Ой, у полі бярозанька не крыта...

Ой, у полі бярозанька не крыта,
Ужо наша Волечка запіта.
Ой, хто ж яе запіваў — радзіна,
Штоб была долечка шчасліва.

## 80. На заручынах была...

На заручынах была
Ды гарэлачку піла.
Гарэлачка саладзенькая,
Марынка маладзенькая.

## 81. Не сядзіце, сваты, без дзела...

Не сядзіце, сваты, без дзела,
Ды чаму ж вы не едзеце
дадому?
Ды ўжо вам, сваты, час-пара,
Бо ўзышлі месячык і зара.
Месячык вароты асвеціць,
А ветрык вароты адчыніць.

## 82. З богам, з богам, пан-дружанька, у дарогу




З богам, з богам, пан-дружанька, у дарогу *.
Месяц табе дарожаньку асвеціць.
Вецер табе дарожаньку асушыць.
Ой, дай божа, нядзеленькі даждаці,
У Ганначкі на вяселлечку гуляці.

# ВЯНКІ

## 83. Журылася дзеванька, журылася малада...

Журылася дзеванька, журылася малада,
Ой, што ж рана ды зіма стала.
Ой, што ж рана ды зіма стала,
Снягом ружа прыпала:
— Ой, ды няма з чаго вянка віці
Ды да шлюбу налажыці.
Адазваўся жанішок:
— Не журыся, малада,
Будзе вянчык пярловы,
Ды й да шлюбу гатовы.

---
* Кожны радок паўтараецца.



*Гучаць мелодыі роднай зямлі*

## 84. Разжалілася каліна...

Разжалілася каліна,
У лесе стоячы,
На ўсе дрэвы гледзючы:
— На ўсіх дрэвах зелен ліст,
На мне, каліне, няма.
— Чакай, каліна, пятровак,
Будуць на табе кветачкі,
Яшчэ й чырвоненькія ягадкі.

Разжалілася Надзечка,
У свайго баценькі жывучы,
На ўсіх дзяўчат гледзючы:
— На ўсіх дзяўчатах вяночкі,
На мне, маладой, няма.
— Чакай, Надзечка, нядзелі,
Прыедзе Колечка на кане,
Прывязе вяночка ён табе.

### 85. Да ружы, дзевачкі, да ружы...

Да ружы, дзевачкі, да ружы,
Мы сваю Ганначку адлучым.
Мы яе ад дзевак адлучым
Ды к бабам прылучым.

— Сядзела каля дзяўчатак,
Каля сваіх сябровак,
А дзевачкі пяюць,
Мяне не знаюць,
Да баб адпраўляюць.

### 86. Сягоння субота — святы дзянёчак...

Сягоння субота — святы дзянёчак,
Сягоння субота — святы дзянёчак.
Звілі Марыі з руты вяночак.
Ой, вілі, вілі ды ўсё гаварылі:
— Чым жа яна табе, мамачка, дачка не міла,
Ці яна работкі шчыра не рабіла?
Позна клалася, рана ўставала,
Сабе работку сама назначала.

### 87. Ды й хадзіла ж Ніначка па полю...

Ды й хадзіла ж Ніначка па полю,
Звіла яна вяночак з куколю.
Ды прасіла мамачку, прасіла,
Штоб таго вяночка знасіла.
— Ды панасі, дочачка, панасі,
А ўвечары падружанькам аддасі.

### 88. Чуці, чуці ў зялёнай руце...

Чуці, чуці ў зялёнай руце
Плакала Надзечка, вяночка ўючы.
Пачуў Колечка, па каня ідучы.
— Чаго, Надзечка, горка плачаш?
— Я таго плачу, што сама бачу:
У цябе, маладога, радзіны многа,
У мяне, маладой, падарункаў мала.
У цябе радзіны, як у лесе лышчыны,
У мяне падарункаў, як у лесе гаёчкаў.
— Блізкую радзіну ўсю абдары,
А дальнюю радзіну перапрасі.

## 89. У суботаньку — вясёлы дзянёк...




У суботаньку — вясёлы дзянёк,
Плятуць маладой вянок.

Дзевачкі сядзяць, кветкі раўняюць,
Хлопчыкі ў карты граюць.

— Не ідзі, малада, у чужое сяло,
Табе будзе невяселó.

Там суседачкі вельмі судлівы,
Цябе будуць судзіці.

Там дарожанькі не траплівы,
Ты там будзеш блудзіці.

Не ідзі, малада, у чужое сяло,
Табе будзе невяселó.

## 90. Маладая паміж радзінаю хадзіла...

Маладая паміж радзінаю хадзіла
Свайго баценьку нізкім паклонам прасіла:
— Падзяржы мяне, ты мой баценька, з гадочак,
Пакуль я знашу гэты харошы вяночак.
— З богам, з богам, маё дзіцятка, ад мяне,
Ёсць у мяне меншая дочка за цябе.

## 91. Каб я знала, што ў баценькі болей не буду...

Каб я знала, што ў баценькі болей не буду,
Я б не сеяла зялёную руту.
Я б пералазы загарадзіла,
На зялёную руту конікаў пусціла.
— Ешце, ешце, конікі, зялёную руту,
Бо я ўжо ў баценькі доўга не буду.
Адзін дзянёчак, адзін вечарочак,
Ужо я ў баценькі апошні часочак.

### 92. Ішла Надзечка з вядром па ваду...

Ішла Надзечка з вядром па ваду,
Кінула вядро на буйны вецер,
А сама пайшла ў новы гародчык,
У новы гародчык, у рутку зялёну.
— Ой, рутка мая дробная, зялёная,
Ужо мне больш з цябе вянкоў не віці,
Вянкоў не віці, іх не насіці.
Адну гэту ночку пераначаваці,
Заўтра раненька пакланюсь нізенька
Свайму бацэньку за гадаванне,
Сваёй маценцы за прыгожае ўбранне,
А браточкам — за пачытанне.

### 93. Ды й ішло сонца-сонейка...

Ды й ішло сонца-сонейка,
Ды й з рускай стараны.
Я ж думала, што сонейка —
Гэта родны татачка.
— Ці дазволіш, татка, гуляці,
Ці дазволіш, татка, насіці?
Я два венчыкі знасіла,
Два казачэнькі ссушыла.
А два венчыкі зеляны,
Два казачэнькі малады.

### 94. У нядзельку рана сіняе мора іграла...

У нядзельку рана сіняе мора іграла,
А там дзеванька з беражка ў мора ўпала
Ды ратунку чакала.
— Ой, мой бацэнька родны,
Ды ратуй мяне з мора,
Хоць я не служачка твая.
— Маё дзіцятка роднае,
Рад бы я цябе ратаваці,
Ды не ўмею плаваці.
Няма чоўна, няма чоўна,
Няма вясла,
Ліхая доля цябе ўнясла.

### 95. Дзе ты, дзеванька, хадзіла...

— Дзе ты, дзеванька, хадзіла,
Што сваю галоўку ўквяціла?
— Хадзіла я ў вішнёвы сад,
Ды на маю галованьку цвет апаў,
Ды на маёй галоўцы расцвітаў.

## 96. Зборная суботка настае...




Зборная суботка настае,
Марылька дружынку збірае,
Вакол століка саджае.
Яна, маладзенькая, між усіх
Скланіла галованьку ніжэй усіх.
Яе думкі галованьку заламалі,
Каб яе ўжо назаўтра звянчалі.
Маладая Марылька, малада,
Будзе стаяць ля воза, як роза,
Ды ўздыхне цяжка: «Мой божа,
Хто ж мяне пад вянец завязе,
Хто ж маю косаньку распляце?»
Адазваўся брат: «Не плач, сястра мая,
Ёсць у цябе родны брат,
Усё зраблю я.
Я ж цябе пад вянец завязу,
Я ж тваю косаньку расчашу,
Месці людзей вулачку папрашу.
Ой, мяціце вуліцу да канца,
Ды паедзе сястрыца да вянца.
А вы, людзі добрыя, глядзіце,
Куды наша сястрыца паедзе:
Ці пад тую горачку крутую,
Ці пад тую цэркаўку святую.
Ой, попе, попе, ойча наш,
Адчыняй цэркаўку, звянчай нас».
— Калі вы прыехалі, адчыню,
Калі вы прыступіце, звянчаю,
Залатыя пярсцёнкі змяняю,
Шчаслівага жыцця вам пажадаю.

## 97. Зборная суботачка, зборны дзень...

Зборная суботачка, зборны дзень.
Ды сабрала Леначка ўсіх людзей,
Ды садзіла яна іх усіх у рад,
А сама села між усіх,
Ды скланіла галоўку ніжэй усіх,
Задумала думачку больш усіх.
— Ды не думай, Леначка, не думай,
Пераедзем рэчаньку ды Дунай.
— А як жа мне, маладой, не думаці,
Ды не знала свякроўкі, а трэба знаці,
Я мала, не знаю, як назваці.
Назвала б свякроўкай — не смею,
Назвала б матачкай — не будзе.
Толькі майму сярдзеньку жаль будзе.

## 98. Ды прала дзевачка белы лён...

Ды прала дзевачка белы лён
Ды гнала дружачак вон.
— Ідзіце дружачкі ад мяне,
Няхай сядзе Пецечка ля мяне.
— На што лён белы ўбіраць,
На што дружачак уганяць.
Мы ж не самі паселі,
Нас Манечка папрасіла,
Ля сябе пасадзіла.

## 99. Ды вілі ёлку на сяле...




Ды вілі ёлку на сяле,
На сяле,
Ды пілі гарэлку на стале.

Ды гарэлка наша з сытою,
З сытою,
Маладым Іванька з жаною!

Ды не плача Ганначка, не плача,
Не плача,
Ой, ды дайце, дзевачкі, помачы.

Ой, ды дайце, дзевачкі, помачы,
Помачы,
Ды горкай цыбулі пад вочы.

Ды няхай жа грызе, як белка,
Як белка,
Ды няхай жа плача, як дзеўка.

### 100. Ляцелі галкі ў тры радочкі...

Ляцелі галкі ў тры радочкі,
А зязюля папераду.
Галачкі селі, зашчабяталі,
А зязюля закукавала.
Ішлі дзевачкі цераз сенечкі,
А Ганначка папераду.
Дзевачкі ішлі, песні запелі,
А Ганначка заплакала:
— Сенечкі мае, сені новыя,
Будзеце не мецены.
Браточкі мае, браты родныя,
Будзеце нявеселы.
— Будуць мецены, будуць мецены
Іванькавы сенечкі,
Будуць веселы, будуць веселы
Іванькавы браточкі.

## КАРАВАЙ

### 101. Стаіць дубочак тонкі, высокі...

Стаіць дубочак тонкі, высокі,
На Дунай нахіліўся.
Малады жаніх свайму бацeньку
Ў ногі пакланіўся:
— Дай мне, бацeнька, дзевяць конікаў
Пад маю дружынаньку,
А дзесятага да варанога
Ды пад мяне, маладога.

Стаіць дубочак тонкі, высокі,
На Дунай нахіліўся.
Малады жаніх сваёй мацеры
У ногі пакланіўся:
— Спячы, мацeнька, спячы, родная,
Дзевяць буханоў хлеба,
А дзесятага да й харошага
Слаўнага каравая.

## 102. Ой, чыя то маці...




Ой, чыя то маці
Па ўсіх вулачках ходзіць,
Па ўсіх вулачках ходзіць
І суседачак просіць:
— Ой, суседачкі мае,
Прыхадзіце да мяне,
Да майго дзіцяці,
Каравай рашчыняці.

Кольчына маці, Кольчына маці
Па ўсіх вулачках ходзіць
І суседачак просіць:
— Ой, суседачкі мае,
Прыхадзіце да мяне.
Да старыя — на параду,
Маладыя — да караваю.
Да старыя — мёд-віно піці,
Маладыя — песні пеці.

## 103. Ой, вечар, вечар...

Ой, вечар, вечар,
Каравай не спечан.
Маці маладой
Як завіхнецца,
Каравай спячэцца.

## 104. Збірайцеся, каравайнічкі, усе пяць...

Збірайцеся, каравайнічкі, усе пяць,
Станавіцеся каля стала ўсе ў рад.
Сабраўшыся, сабе служаньку найміце
І да Львова па вінаград пашліце.
Наш каравай з вінаградам зрасцецца,
Наша пара да на век доўгі зыйдзецца.

## 105. Ой, над сялом...

Ой, над сялом
Бела лябёдка лятае.
Надзечка кажа:
— То не лябёдка лятае,
То мая маценка
Каравайнічак збірае.
— Збірайцеся, каравайнічкі, у радочак,
Як ярыя пчоланькі ў мядочак.

### 106. Ой, ніхто не ўгадае...

Ой, ніхто не ўгадае *,
Што ў нашым караваі.

Цэбар вады крынічнай,
Пуд мукі пшанічнай.

Цэбар вады із крыніцы,
Пуд мукі із пшаніцы.

### 107. Каравайнічкі, ручкі мыйце...




Каравайнічкі, ручкі мыйце
Да на вішанькі ліце,
Каб вішанькі радзіліся,
Каб дзеткі любіліся.

### 108. Наша печ рагоча...

Наша печ рагоча,
Да чаго ж яна хоча?
А прыпечак залівaецца —
Караваю спадзяваецца.

Шоўкавае памяло
Печ мяло,
Жалезная качарга
Жар грабла,
Дубовая лапата
Каравай саджала.

### 109. Ой, матка-ютка...

Ой, матка-ютка,
Завіхайся хутка.
Матка завіхнула,
Каравай згібнула.
Каравай згібнула
Ды ў печ шугнула.

Печ мая маляваная
На курыных ножках стаіць,
А ў ёй каравай сядзіць,
Нашых маладых каравай.

---

* Першы радок кожнай страфы паўтараецца.



*Таленавітая выканаўца вясельных песень Захвея Хвораст*

### 110. Ляцелі галачкі з-пад гаю...

Ляцелі галачкі з-пад гаю,
Пыталіся караваю:
— Да ці ўжо ж каравай усадзілі,
Чаму нас, галачак, не прасілі?
Мы б вам каравай усадзілі
І каравай прыбралі,
Дзюбкамі, лапкамі папісалі.

### 111. А хвала табе, божа...

А хвала табе, божа,
Што мы дзела зрабілі,
Каравай учынілі,
Замясілі, усадзілі.

Замясілі, усадзілі
Ручанькамі ды бяленькімі,
Перснямі залаценькімі.

## 112. Каравай у печы йграе...

Каравай у печы йграе,
Заслонку адбівае.
— Старшая каравайніца,
Не сядзі на заслоне,
Сядзь жа ты каля печы
Каравай сцярэгчы,
Каб яго не спалілі,
Харашэнька ўгадзілі.
Харашэнька ўгадзілі,
Увесь род абдзялілі.
Як старога, так і малога,
Волечку абдзялілі
І Колечку маладога.

## 113. Стану я ў печы...

Стану я ў печы
Каравай глядзеці,
Каб ён не абпёкся,
Каб ён не абжогся,
Каб нам сорам не быў
Ад чужых людзей.

## 114. Караваю, расці...




Караваю, расці,
Караваю,
Вышэй таго гаю.
Вышэй тае печы,
Вышэй печы,
Што ўтрох можна легчы.

Што ўтрох можна легчы,
Што ўтрох легчы,
Каравая сцярэгці.

## 115. Ой, калі мы каравай пяклі...

Ой, калі мы каравай пяклі,
То й хата дрыжала,
То й сені скакалі.
Наша печ перапой * была,
Каравая засмаліла.

---

* Перапой—п'яная.

## 116. Каравай гіча, гіча...




Каравай гіча, гіча *,
Каравайнічак кліча:

— Дзе ж вы так забарыліся,
Што да мяне не з'явіліся?

Ой, гіча каравай у печы,
Каравайнічак кліча:

— Дзе ж вы, мае каравайнічкі,
Дзе ж вы, мае нядбайнічкі?

Ці на мяду запіліся,
Што пра мяне забыліся?

## 117. Удайся, каравай, удайся

— Удайся, каравай, удайся.
— Чаму яму не ўдацца?
Багатая ўчыняла,
Прыгожая качала,
Чэрэватая ** мясіла,
Губатая сажала,
А красная ды харошая
Ў печ заглядала.
— Расці, расці, каравай,
Выша стаўба медзянога,
Выша жаніха маладога.

## 118. Ой, дзе ж тыя кавалі...

Ой, дзе ж тыя кавалі,
Што стальныя сякеры?
Няхай яны печ рубаюць,
Каравай вымаюць.

## 119. Чаго наша века рагоча...

Чаго наша века рагоча,
Ды чаго ж яно хоча?
А ты, свацейка, не жміся,
Сторублёваю кладзіся.

---

* Першы радок кожнай страфы паўтараецца.
** Чэрэватая—цяжарная.



*Караваю, мой раю,*
*Я ж цябе прыбіраю*
*Ручкамі да бяленькімі,*
*Перснямі залаценькімі.*



*Каравайнічкі, ручкі мыйце*
*І пад вішанькі ліце,*
*Каб вішанькі радзіліся,*
*Каб дзетачкі любіліся.*





*Ззяе печка, ззяе —*
*Шышачак чакае.*
*Прыпечак рагоча —*
*Караваю хоча.*





*Палажыце каравай на жыце,*
*Дай божа, яго спажыці,*
*А нашым дзецям*
*Доўга пражыці.*



*Наш сват каравай нясе*
*Ды кудрамі трасе.*
*Хоць трасі, хоць не трасі,—*
*Нам караваю дасі.*





*Колькі на небе зорачак —*
*То на караваі шышачак,*
*Як на небе ясныя —*
*То на караваі красныя.*





*Удача, удача,*
*Наш каравай удаўся,*
*Шырокім лісцем услаўся,*
*У чырвоныя кветкі ўбраўся.*

* * *

*А што ў нашым караваі?*
*Да сямі нівак пшаніца,*
*Да сямі крыніц вадзіца,*
*Да сямі сальніц сальніца.*

*Да сямі сальніц сальніца,*
*Да сямі курак яечка,*
*А навокал — сыр і масла,*
*Пасярод — доля і шчасце.*



*Каравай, ідзі з клеці*
*Да сядай на покуці,*
*Бяры сабе чарачку,*
*Налівай гарэлачку.*

### 120. Наш каравай харошы...

Наш каравай харошы,
Падзівіцеся, хто гожы.
Наш каравай на аўсе,
Падзівіцеся, людзі ўсе.
Наш каравай на палаценцы,
Падзівіцеся, маладзіцы.

### 121. Ой, чыя то маценка...

Ой, чыя то маценка
Па ўсіх вулачках ходзіць
І суседачак просіць:
— Ой, суседачкі мае,
Прыхадзіце да мяне,
Да майго дзіцяці
Каравая ўбіраці.

### 122. Загарадзі, баценька, гародзец...

Загарадзі, баценька, гародзец,
Да насеем ружанькі загонец.
Як будземо каравая й убіраці,
То не будзем ружаньку дабываці.
То не будзем ружаньку дабываці,
Да мы будзем ружаньку сваю маці.

### 123. Ой, бяжаць дзеўкі, бяжаць...

Ой, бяжаць дзеўкі, бяжаць
Да нерудкі * шчыпаць,
Да нерудкі шчыпаць,
Каравай убіраць.

— Убірайся, караваю,
То ў руту, то ў мяту,
То ў чырвоныя квеці.
То ў чырвоныя квеці,
Штоб любіліся дзеці.

### 124. Як мы свайго каравая радзілі...

Як мы свайго каравая радзілі,
То ў бор па каліну хадзілі.
Той бор адказаў, як сам знаў:
— Я вашага караваю не знаю.
Я вашага караваю не знаю,
Я да яго зеллейка не маю.

### 125. Спусціся з неба...

Спусціся з неба,
Ты цяпер нам трэба.
Сядзь сабе ды на покуці,
Будзь нам ды на помачы.

Пасвяці, месяцу, з гаю,
К нашаму ды караваю.
Пасвяці ясненька,
Каб было відненька.

---

* Нерудкі — лугавая трава.

## 126. Убірайся, каравай...

Убірайся, каравай,
То ў рутку, то ў мятку,
То ў чырвоныя кветкі.
То ў чырвоныя кветкі,
Каб любіліся дзеткі.

## 127. Першая каравайніца...

Першая каравайніца
Не ў бяседзе сядзела,
Па падсаддзю хадзіла.
Па падсаддзю хадзіла,
Цвет-каліну ламала,
Каравай квяціла.

## 128. Старшая каравайнічка...

Старшая каравайнічка
Не ў бяседзе сядзела,
Па падсаддзю хадзіла.
Па падсаддзю хадзіла,
Зеллечка збірала,
Каравая ўбірала.

## 129. Караваю, наш раю...




Караваю, наш раю,
Мы цябе ды й убіраем.
Шышкі з грушкі,
Каравай грэцкі,
Спяклі па-шляхецкі!
Караваю, наш раю,
Мы цябе да й убіраем
Ручкамі да бяленькімі,
Пярсцёнкамі залаценькімі.

## 130. Загарадзі, баценька, гародзец...



Загарадзі, баценька, гародзец,
Ды насеем рутанькі загонец.

Як мы будзем каравай убіраці, убіраці,
То не будзем рутаньку дабываці, дабываці.

То не будзем рутаньку дабываці,
Ды мы будзем рутаньку сваю маці.

### 131. Ды бяжыць зайчык-райчык...

Ды бяжыць зайчык-райчык,
Нясе ў зубах ніці.
— Нашто тыя ніці?
— Каравай упавіці.

### 132. Удача, Надзечка, удача...

— Удача, Надзечка, удача,
Як твой каравай удаўся,
То й у рутку і ў мятку ўбраўся.

### 133. Ой, у новаму двары...

Ой, у новаму двары
На цясовым стале
Дарагі тавар стаіць.
Ой, не ёсць бо то ж тавар, —
То Надзеччын каравай,
То яе заслужанька.
Заслужыла ў бацэнькі
Не за рочак, не за два,
Не за чатыры нядзелькі —
Да з малыя дзяцінкі.

### 134. Да багат, Васілька, бацька твой

Да багат, Васілька, бацька твой *.
Густа пшаніца на навіне,
А высокі стагі на гумне,
Яшчэ вышэй каравай на стале.

### 135. Караваю, мой раю...

Караваю, мой раю,
Каля цябе добра йграю
І з скрыпкамі, і з дудкамі,
З маладымі малодкамі.

---

* Кожны радок паўтараецца.

## 136. Ой, караваю, перад печчу...

— Ой, караваю, перад печчу
Да куды сцежачкай?
— Да клеці.
— Ой, ты піражочкам папірайся,
Да новыя каморанькі дабірайся.

## 137. Дзе ж нашы каравайніцы забарыліся...

Дзе ж нашы каравайніцы
забарыліся,
Што на мяне забыліся?
Ці на гарэлачцы запіліся.

Ці на гарэлачцы запіліся,
Ці на мяду заеліся.
Ці на мяду заеліся,
Што на мяне пазабыліся?

## 138. Мядзведзь барадаты...

Мядзведзь барадаты —
Гаспадар багаты.
Баіцца прыступіці
Каравай выкупіці.

Мядзведзіца кашлата —
Гаспадыня багата.
Баіцца прыступіці
Каравай выкупіці.

Дзе наш дамавы гаспадар?
Няхай выкупіць дзіўны каравай.
Няхай дасць бочку мядочку, віна — дзве
Да й возьме каравай сабе.

## 139. Ой, дзе ж наш гаспадар дзеўся...

Ой, дзе ж наш гаспадар дзеўся *,
Ці ў клочча ўвярцеўся?

Ці пайшоў сенажаць касіць,
Чаму гасцей не просіць?

Трэба яму да сорам знаці —
Нам гарэлачкі даці.

## 140. Едкі каравайнічкі, едкі...

Едкі каравайнічкі, едкі,
Да цэлага вала з'елі,
Па сталу да качаючы,

А ў суль да мачаючы.
На стале — ні крышачкі,
Пад сталом — ні костачкі.

---

* Першы радок кожнай страфы паўтараецца.

### 141. Старша каравайнічка п'яна...

Старша каравайнічка п'яна,
Да й на парозе ўпала,
Да й ноччу задрамала.
Да дзівіцеся, хлопцы,
Ці ў тонкай сарочцы?
— У жоўтай да канаплянай,
Выбачайце мне п'янай.

### 142. Да былі мы ў каморцы...

Да былі мы ў каморцы,
Там нас частавалі
Да віном зялененькім,
Да мёдам саладзенькім.

### 143. Ой, мала, мала вошчачку

Ой, мала, мала вошчачку.
Прыляці, пчоланька,
Пад саму камораньку
Ды прынясі вошчачку
Валечцы на свечачку.
Ой, віўся, віўся хмель
Ды ўсё ўгору,
А з гары да долу віўся хмель.
Штоб так віўся жаніх
Каля дзевачкінай свечачкі.

## ПЕРШЫ ДЗЕНЬ ВЯСЕЛЛЯ

## У МАЛАДОГА, КАЛІ ЗБІРАЮЦЦА ЕХАЦЬ ПА МАЛАДУЮ

### 144. Сыпце пшаніцу ў новы карыта...




Сыпце пшаніцу ў новы карыта,
Карміце коней у далёку дарогу.
У вялікай дарозе трое варотаў:
У першых варотах месячык свеціць,
У другіх варотах сонейка грэе,
А ў трэціх варотах малады едзе.

Месячык свеціць — відненька будзе,
Сонейка грэе — цёпленька будзе,
Малады едзе — вяселлейка будзе.

### 145. Маці сына да выражала...

Маці сына да выражала *,
Месяцам аперазала.

Зоркаю засцягнула.
Шчасцем-долею агарнула.

— Едзь, мой сыну, на Ўкраіну
Па чужое дзіця.

На чужую староначку
Па ціхаю жоначку.

Чужое дзіця ціха размаўляла,
Майго сыночка сабе выбірала:

— Залаты месяц цябе
аперазаў,
Дарожку шчасліву табе ўказаў.

Зоранька ясна цябе засцягнула,
Маценка благаславіла.

### 146. У стораны, усе дочкі, у стораны...

У стораны, усе дочкі, у стораны,
Ды не пераходзьце дарогі.
Ды няхай пяройдзе сам гасподзь-бог,
Ды няхай пяройдзе бацька мой.
Ды няхай пяройдзе ясна зара,
Ды няхай пяройдзе маці мая.
Ды няхай пяройдзе зарыца,
Ды няхай пяройдзе сястра мая.

### 147. Лёнечку маці радзіла...

Лёнечку маці радзіла,
Месяцам абгарадзіла,
Зоркаю падперазала
І ў дарожку паслала.
— Едзь, мой сынок, не стой,
У цябе конічак не свой,
Дарога не пеўная,
Дружына няверная.
— Мы дарогу церабіць будзем,
А дружыну прасіць будзем.

### 148. Ой, у гародцы на новай градцы...

Ой, у гародцы на новай градцы
Зеллечка разлягае,
А ў жанішка маладога
Вяселле пачынае.
Бог яму дае,
Бог яму дае,
Матулька памагае.

* Першы радок кожнай страфы паўтараецца.

### 149. Едзе жанішок да дзеўкі...

Едзе жанішок да дзеўкі,
Як месячык да зоркі,
Ды пытаецца ў матулькі:
— Што дзеўцы гаварыці?

— Не гавары, сынку, нічога,
Ёсць у цябе дружкі для тога,
Будуць знаці, што гаварыць
За цябе, маладога.

### 150. Стаіць дубочак, стаіць зялёны...

Стаіць дубочак, стаіць зялёны,
На Дунай пахіліўся.
Сядзіць жанішок маладзенькі
Ды да шлюбу нарадзіўся.
У правай ручаньцы дзержыць хустаньку.
Сваёй мамачцы, сваёй родненькай да ног прыпадае:
— Мая мамачка, мая родненька,
Дай мне дзевяць коней,
А дзесятага варанога — пад мяне, маладога,
А адзінаццатую жарабіцу — пад маю маладзіцу.

### 151. Знаці, чашнічак, знаці...

Знаці, чашнічак, знаці,
Што разумная маці,
Як выпраўляла, дык навучала:
— Будзь, сынок, разумненькі,
Налівай румкі з лёгкай рукі,
Частуй дзевачак і малодачак,
Каб былі п'янюсенькі.

### 152. Ой, бацэнька родненькі мой...

Ой, бацэнька родненькі мой,
Сядай сабе ў канец століка,
Будзеш за саколіка.
Ой, паляцім на Ўкраіначку
Збіраць усю сваю радзіначку:
Блізкую, далёкую, убогую, багатую.
Што багатая — піці, есці,
А ўбогая — песні пеці.
Багатая — для славанькі,
А ўбогая — для парадaнькі.

### 153. Ванечку маладзенькага...

Ванечку маладзенькага
Хочыць баценька жаніці.
Ёсць шырокі двор і вялікі забор,
Ды не ўся радзінанька.
Паслаў сокала, паслаў яснага
Пад высокае неба,
А зязюленьку на Ўкраінаньку
Па сваю радзінаньку.
Няма сокала, няма яснага
З-пад высокага неба,
І зязюленькі з Украінанькі,
Няма маей радзінанькі.

### 154. Ой, заказаў Васілька свайму роду...

Ой, заказаў Васілька свайму роду:
— Ой, куйце падковы пад вараны коні
Да кладзіце суконкі пад свае жонкі,
Бо будзем ехаць борам баравістым,
Полем камяністым.
А хто пачуе, той пазавідуе,
А таму гасподзь даў, чый сын едзе,
А таму найлепей, чый зяць будзе.

### 155. Не куй, Ванечка, стальнога нажа...

Не куй, Ванечка, стальнога нажа,
Падкуй, Ванечка, варанога каня.
Стальному нажу на блюдзе ляжаці,
Вараному коніку дарогу бяжаці.

### 156. Расхадзіўся ясны месячык па небу...

Расхадзіўся ясны месячык па небу,
Расхадзіўся ясны месячык па небу
І сабраў ясны зорачкі ў грамаду.
— Ды асвецім горы-даліны ўсе разам.
Расхадзіўся малады Грышачка па роду
І сабраў усю радзіначку на скам'ю.
— Ды паедзем да майго цесця на вайну.
Станем мы сваім палком пад ганкам
Ды праб'ём сцену кубочкам,
Ды вазьмём маладу Волечку з вяночкам.

## 157. Ясны месячык па небу бродзіць...

Ясны месячык па небу бродзіць,
Малады хлопчык за стол заходзіць
Лісты пісаці да цесця слаці.
— Ой, цесцю, ды не будзь горды,
Ды не будзь горды,
Будзь вясёлы,
Калі я к табе прышлю
Ды любу грамаду,
А ў той грамадзе
Сам буду.
Сам маладзенькі
І мой конь вараненькі.

## 158. Вы, баяры мае любыя...

Вы, баяры мае любыя,
Калышыце мяне высока,
Штоб я ўбачыў далёка,
Штоб я ўбачыў цесцяў двор.
Як там мая Ганначка гуляе,
Па двары вяночак качае,
Залатыя пярсцёнкі мяняе
І мяне, маладога, дажыдае.

## 159. Ой, на моры...

Ой, на моры
Ды на каменні
Там атаман абедае,
Ніхто яго не ведае.
Ды дазнаўся Сяргейка, коніка сядлаючы,
Атамана ды пытаючы:
— Атамане, наш пане,
Падаруй мне палавіну войска
На святую ды нядзелю,
Бо паедзем ды па дзеваньку красну
У дарожку шчасну,
Ды па дзевачку красну.
У дарожачку крамяністую
Ды па дзевачку наравістую.

## 160. Бацька едзе па лучыну...

Бацька едзе па лучыну,
Ой, ха-ха-ха,
А сын едзе па дзяўчыну,
Ой, ха-ха-ха.
Пытаецца бацька ў сына
Ой, ха-ха-ха:
— Што каштуе та дзяўчына,
Ой, ха-ха-ха?
— Што каштуе — трэба даці,
Ой, ха-ха-ха.
Гаспадыня будзе ў хаце,
Ой, ха-ха-ха.

## 161. Ды чаму ж, жанішок...

Ды чаму ж, жанішок,
Дадому не дбаеш?
— Я маладзёнак,
Дадому раднёнак,
Калі мяне цешчанька
Мёдам частуе,
Сваю дочку ды навек даруе.
— Бяры, зяцю, дочку,
Дам цялушачку
І бодзеньку плаццяў,
Яшчэ і падушачку.

## 162. Мамачка сыну вячэру давала...

Мамачка сыну вячэру давала
І выпраўляла:
— Едзь, мой сыночак, не станавіся,
Каб твая шапачка ветрам не спала,
Каб твая Танечка за другім не стала.
— Не бойся, не стане,
Я ўчора там быў.
Бор будзе шумець
І падкоўка звінець,
Людзі пачуюць — дзівіцца будуць,
А цешча пачуе — гатавацца будзе.

## 163. Ідзе жанішок да дзеўкі...

Ідзе жанішок да дзеўкі,
Нясе барыла гарэлкі.
Ды не так барыла, як бутлю,
Свайго цесця напаіці.
— Там за майго цесця п'юць,
Там мяне доўга ждуць.

## 164. Іванка ідзе да дзеўкі...

Іванка ідзе да дзеўкі,
Як месячык да зоркі,
Ды пытаецца ў матанькі:
— Мая матанька родная,
Ці мне там начаваці,
Ці дадому прыязджаці?
— Не начуй, мой сыночак,
Не начуй, маё дзіцятка.
Прыязджай да маманькі
Хоць уночы, хоць у паўночы,
Хоць к беламу свету
І к майму абеду.

## 165. Хоць я свашка маленькая...

Хоць я свашка маленькая,
Але я разумненькая:
Слала бор белым радзенцам,
А дарожаньку палаценцам,
Каб у бару не ўрасіўся,
На дарожцы не ўпыліўся,
Да дзяўчыны паспяшаўся.

### 166. З каралеўскага двара...

З каралеўскага двара
Сівы конік выбягае.
Не сам жа ён выбягае,
На ім Колечка выязджае.
Забачыў каханку
На высокім ганку.
— Ды каханка — нябога,
Пераймі ды каня майго.
— Пераняла бы каня твайго,
Ды баюся татачкі свайго.
— Ды не бойся татачкі свайго,
Бойся мяне, маладога.
Бойся мяне, маладога,
Канчука залатога.

### 167. Дабранач, бацюхна...

Дабранач, бацюхна,
Ды не лажыся спаці.
Ды не лажыся спаці,
Бо не будзем начаваці.
Бо ночанька цёмненька,
Дарожанька дрэнненька,
Каб нам ды не зблудзіці,
Ды чаго б не забыці.

### 168. Калышыце мяне высока...

Калышыце мяне высока,
Каб я бачыў далёка:
Як мая Анечка гуляе,
Па двару вяночак качае.

### 169. Полем, полем, як дымам...

Полем, полем, як дымам,
А дарогаю, як шнурам,
Ехалі баяры ўсе радам.
Малады Барыска папераду.
— Ды чаго, Барыска, надуўся,
Ці грошы дома забыўся?
Пастаў каней на мяжы
Ды дамоў па грошы бяжы.
— А на мяжы коні не стаяць,
Дома грошы не ляжаць.

### 170. Там поле роўненька...

Там поле роўненька,
На двары коней поўненька,
А там хлопчык каня павёў,
У каня праўду запытаў:
— Коню, мой коню вараны,
Ці надзеешся на сілу,
Ці давязеш маю дружыну?
Мая дружына невялічка.
Сем коней вараных прыстала,
Сінюю карэту зламала.

### 171. Пад сяло пад'язджаем...

Пад сяло пад'язджаем
Ды галак страляем.
Галачкі — ды на юшачкі,
Пер'ейкі — ды на падушачкі.
Ой, гукнём, Антоне,
Бо ўжо сяло Тоні.
Ой, гукнём, Аніська,
Бо ўжо сяло блізка.

## У МАЛАДОЙ ДА ПРЫЕЗДУ МАЛАДОГА. ПРЫЕЗД МАЛАДОГА. У ЗАСТОЛЛІ

### 172. Дзеванькі, падружанькі...

Дзеванькі, падружанькі,
Ужо стучыць дарога,
Ужо шуміць дуброва.
Едуць маршалкі
Ды па нашы падаркі.

### 173. Ды на рагі хата, на рагі...

Ды на рагі хата, на рагі,
Вязе жанішок пірагі.
Ды вязе жанішок падаркі
Да сваёй дзеванькі-каханкі.

### 174. Цешча зяця дажыдала...

Цешча зяця дажыдала,
На парозе агонь клала,
Каб было віднюсенька,
Зяцю цяплюсенька.

### 175. Цешча зяця сладкавала...

Цешча зяця сладкавала,
Сытою двор палівала.
Сытою двор палівала.
— Ці будзе мой зяць, ці не будзе,
Шкада маёй сыты будзе.
Калі б знала,
Калі б знала,
Што зяць мой,
То вынесла б кажух свой, кажух новы,
А мой зяць чарнабровы.

### 176. А цешча зяця на вячэру ждала...

А цешча зяця на вячэру ждала,
Бяленькі сахар на блюда клала.
Прыляцеў сокал,
Рассыпаў сахар.
Пер'ейкам, крылейкам
Па сталу разнасіў.
— Нечым мне, нечым мне
Зяця частаваці.
Прыйдзецца, прыйдзецца
Дочку аддаваці.

### 177. Ой, зялёная рутачка...

Ой, зялёная рутачка,
Жоўты цвет.
Пыталася Валечка:
— Ці ўжо свет?
Чаму майго Грышачкі
Доўга нет:
Ці яму вяночак не звілі,
Ці яму хустачкі не далі?
— Звілі яму вяночак з рутачкі,
Далі яму платочак у ручачкі.

### 178. Ой, ляцеў салавейка ў вішнёвы сад...

Ой, ляцеў салавейка ў вішнёвы сад
Ды ўдарыўся крыламі ў вінаград.
Ударыўся крыламі ды й пытае:
— Ці тут мая зязюленька пражывае,
Ці з іншымі салаўямі лятае
Ды залатыя пёрышкі мяняе?
Ой, уехаў зяценька на цешчын двор
Ды ўдарыў падкоўкамі аб парог
Ды й пытае:
— Ці тут мая Танечка пражывае,
Ці з іншымі кавалерамі гуляе,
Залатыя пярсцёнкі мяняе?

### 179. Мы зусім ды не ведалі...

Мы зусім ды не ведалі,
Самі коні заехалі.
Дарогаю тапталіся,
Ці сюды напуталіся?
Дарогаю-кастрыцаю
За сваёю маладзіцаю.

### 180. Круглае, маленькае...

Круглае, маленькае
Мярчыцкае сяло.
Няма дзе коням стаці,
Сваццейцы пагуляці.
Ой, выйшла, выбегла
Маладая дзеванька,
Хусцінкаю махнула
І сваццiцу гукнула:
— Ды сюды, сваццея, ды сюды
Да майго татачкі,
А ў майго татачкі
Сенажаці ў гародзе.
Сенажаці ў гародзе,
Яшчэ калодзеж у падвор'і.
Там коні папасуцца,
Яшчэ і вады нап'юцца,
Травіцы шаўковай,
Вадзіцы крынічнай.

### 181. З'ехала дзвесце баяр на наш двор

З'ехала дзвесце баяр на наш двор.
— Пазнай, дружка Марусенька,
Каторы твой?
— Што ў сінім і зялёным—
То не мой,
А ў чырвонай кітаячцы—
Гэта мой.

### 182. Стукнула, грукнула на дварэ...

— Стукнула, грукнула на дварэ,
Паглядзі, мамачка, ці ка мне?
— Па цябе, дачушка, па цябе,
Па цябе, дачушка, па цябе.

### 183. Ды наехала сватоў поўны двор...

Ды наехала сватоў поўны двор,
Ды наехала сватоў поўны двор.
— Ой, пазнай, мацi, каторы твой,
Каторы твой?
— Што на кані сівым—
Дзевер твой.
У шубаньцы, у чаботаньках—
Зяць мой.

### 184. Ды прыехаў Колечка з-за Асінцу...

Ды прыехаў Колечка з-за Асінцу,
Ды прывёз Анечцы гасцінцу.
— На ж табе, Анечка, гасцінцы
Ад маёй мамачкі ў хусцінцы.
На ж табе, Анечка, падаркі
Ад маёй мамачкі-каханкі.

### 185. Пад парогам быстра рэчка...

Пад парогам быстра рэчка,
А ў сенях балота.
У сенях балота,
А ў хаце золата.

Ой, як жа нам у хату ўступіці,
Золата ды й ухапіці.
Ой, як жа нам улезці,
Каля золата сесці.

### 186. Як уехаў жаніх у варота...

Як уехаў жаніх у варота,
Як уехаў жаніх у варота,
Спала яго шапачка залота.
Выйшла яго цешчанька вітаці,
Стала яго шапачку здымаці.
— Не здымай, цешчанька,
Няхай паляжыць,
Пакуль твая дзевачка прыбяжыць.
Паляжала шапачка з гадзінку,
Пакуль прыйшла дзевачка з рынку.
Узяла тую шапачку, падняла,
Узяла яго за ручаньку, павяла.
А на ім шапачка — каўпачок
Ды заплаціў жанішок пятачок,
А на ім шапачка — з бабра
Ды заплаціў жанішок паўрубля.

### 187. Ці, Валя, на таго ты паглядзела...

— Ці, Валя, на таго ты паглядзела,
Ці, Валя, сабе ты такога спадабала,
Ці за яго жупанікі зялёныя,
Ці за яго конікі вараныя?
— Жупанікі зялёныя, ды не яго,
А конікі вараныя — суседа яго.
Жупанікі зялёныя ў суседа ляжаць,
Конікі вараныя ў суседа стаяць.

### 188. Пусці, сват, у хату...

Пусці, сват, у хату
На печы пагрэцца.
На печы пагрэцца,
На дзеваньку падзівіцца:

Ці хараша, ці ўбрана,
Ці нам спадабана?
Ці хараша па лічаньку
Нашаму панічаньку?

### 189. Прыбілася ды рыба к гату...

Прыбілася ды рыба к гату,
Пусці, сваццця, у хату
Ды ручанькі пагрэці,
Маладую паглядзеці.

### 190. На марозе ды на северы...

На марозе ды на северы
Памерзлі ды пасавелі.
Ды зубанькі ляскочуць,
Яны ў хатаньку хочуць.
У нас кароткія світы,
Памерзлі ў нас лыты.
У нас кароткі кажушкі,
Памерзлі мы да ложачкі.

### 191. Першы сват цераз парог лезе...

Першы сват цераз парог лезе
Ды ў печ заглядае.
Ды ў печ заглядае:
Ці густа капуста,
Ці вялікі гаршчок кашы,
Ці наядзяцца нашы?
Адзін кажа:
— Маўчы.
Другі кажа:
— Таўчы, не бясіся.
Трэці кажа:
— Натаўчом ды наядзімся.

### 192. Увайшоў сватка ў хату...

Увайшоў сватка ў хату
Ды ў печ пазірае:
Ды ці густая капуста,
Ці вялікі гаршчок кашы,
Каб пад'елі ды сваты нашы.
Аж у печы ячмень,
А сваха кажа:
— Таўчэм!
А сватка спужаўся
Ды пад печ схаваўся.

### 193. Прыехала сваха...

Прыехала сваха,
Прывезла бутэлечку,
Чырвоную гарэлачку.
— Мы далёка ехалі,
Бутэлечка пабілася,
Гарэлачка разлілася.
— Трэба, сваты, не ехаць,
Трэба было пяшком ісці,
Бутэлечку ў руках нясці.
Наце вам пятачку,
Пашліце сабачку.
— Мы ганьбы не даём,
Мы пятачок вазьмём
І сабачку пашлём.

### 194. На паўзгор'ю сінія кветкі цвіцелі...

На паўзгор'ю сінія кветкі цвіцелі,
А па застоллю мілыя госці паселі.
На паўзгор'ю кветкі-цвяточкі,
А па застоллю — мілыя госці-сваточкі.

### 195. Ой вы, бацюхна...

— Ой вы, бацюхна,
Гарэлачку п'яце.
Гарэлачку п'яце
Ды майго жанішка
Не пытаеце.
Можа ён лянівы,
Можа ён санлівы,
Можа ён распівец,
Можа ён разбівец?

— Ой, калі лянівы,
То конік не ўбраны.
А калі санлівы,
То не асядланы.
Ой, калі распівец,
То хусціна мокра.
А як разбівец—
Шабелька востра.

### 196. А я ў таткі на адыходзе

А я ў таткі на адыходзе.
Пасадзіла гарох у гародзе.
Гарох расце, да й хістаецца,
Няхай татка пацяшаецца.

## АБМЕН ПАДАРУНКАМІ ПАМІЖ ЖАНІХОМ І НЯВЕСТАЙ

### 197. Жаркая, жаркая ды каліна ў лузе...

Жаркая, жаркая ды каліна ў лузе,
Жарчэй каліны дзеванька ў баценькі.
Па двару хадзіла, увесь двор красіла,
За сталом села, як ружа спела.
Каля яе селі дзеванькі ў тры радочкі,
Зашчабяталі, як ластавачкі.

### 198. Маладая Леначка...

— Маладая Леначка,
Чаму ж ты такая харошая:
Ці цябе сонца радзіла,
Ці месячык цябе гадаваў?

— Нарадзіла мяне маці
На цясовай краваці,
На малковай дзяружанцы,
На пуховай падушачцы.

### 199. Маладая дзевачка...

— Маладая дзевачка,
Чаму ты такая харошая:
Ці не сонца цябе радзіла,
Ці не месяц цябе гадаваў,
Ці не зоры цябе калыхалі?

— Дзевачкі мае, сястрычкі,
Радзіла мяне мамачка,
Гадаваў мяне татачка,
Забаўлялі дзве сястрыцы
Ды ў новай святліцы.

### 200. Ой, каля стола — сіняе мора...




Ой, каля стола — сіняе мора,
Ой, каля стола — сіняе мора,
А за морам — уся радзінанька.

Хоць цераз мора пераплывайце,
Хоць цераз мора пераплывайце,
А Надзечку перапівайце.

Перапівайце капою жыта,
Перапівайце капою жыта,
Капою жыта, шчаслівым бытам.

## НЯВЕСТУ АПРАНАЮЦЬ. РАСПЛЯТАННЕ КАСЫ

### 201. Не сядзі, Надзечка, не сядзі...

Не сядзі, Надзечка, не сядзі,
Адкрый акенца — паглядзі:
Ці высока месячык на зары,
Ці харош жанішок на кані.
— Харош жанішок і прыгож,
Ды чаму чаравік не прывёз?
— Як я маю вазіці,
Калі ты не ўмееш насіці.
— Хоць чырвоныя прывязі,
Я не буду хадзіці па гразі.
Я буду хадзіці па клеці,
Будуць мае чаравікі рыпеці.

### 202. Каб я знала, што ў бацькі не быці...

Каб я знала, што ў бацькі не быці,
То я б не садзіла зялёнае руты,
Я б пералаз разгарадзіла,
На зялёну руту конікаў пусціла.
— Ешце, конікі, зялёну руту,
Бо ўжо мне ў баценькі нядоўга жыці.
Адзін дзянёчак перадняваці,
Адну ночаньку пераначаваці.

### 203. Ой, нізам, нізам...

Ой, нізам, нізам
Сонейка заходзіць.
А маладая тры разы
Ўжо дзяжу абыходзіць.

Ой, яшчэ вышэй
Сонейка ўзыдзе,
А маладая
Дзяжу ўжо абыдзе.

### 204. Выскачыў старшы брат з каморы...

Выскачыў старшы брат з каморы:
— Я для цябе, сястрынка, гатовы.
Я цябе на дзяжу пасаджу,
Я табе косаньку расчашу.

### 205. Станьце, дзеванькі...

Станьце, дзеванькі,
У тры радочкі,
Ідзі, маці, пазнаваці дочку.
На плячы каса развіваецца,
А на тварыку сляза разліваецца.

### 206. Ой, рута, рута, дробнае зелле...

Ой, рута, рута, дробнае зелле,
Дробнае зелле, чорнае насенне,
Ужо мне з цябе вянка не віці,
Ужо мне ў мацёнкі доўга не жыці.
Адну ночаньку паначаваці,
Адну вячэру павячэраці.

### 207. Брат сястрычку расплятаў...

Брат сястрычку расплятаў,
Дзе тыя шнурочкі падзяваў?
Ці ў мора, ці ў рэчку пакідаў,
Ці сабе чобаты падвязаў?

### 208. Ой, маманька-кветка...

Ой, маманька-кветка,
Не аддай мяне ўлетку.
А аддай мяне ўзіму,
Падгадуй жа мне сілу.
Падгадуй жа мне сілу
На свякрову ніву.

У свёкра ніва вяліка,
У мяне сіла малая,
Я й сама маладая.
Свёкра ніва разарэцца,
Мая сіла разарвецца.

### 209. Захацела Надзечка з каліны вяночка...

Захацела Надзечка з каліны вяночка
Ды паслала бацэньку за Дунай па каліну,
Цераз брод — па маліну.
Хутка бацэнька дабягае,
Ужо каліначка адцвітае,
А маліпанька ападае.
Ой, шчаслівае зелле,
Чаму не паспела на вяселле,
Майму дзіцяці на вяночак
З чырвоненькіх ягадочак?

### 210. Ой, гула пчолка, гула...

Ой, гула пчолка, гула
Каля новага двара,
То не пчоланька гула,
А Надзечка плакала,
Бацэньку пыталася:
— Ці я буду такая,
Як каліпанька тая?
— Надзечка, дзіця маё,
Як ты была ў мяне,
То ты была такая,
Як калінанька тая.
Як пойдзеш за чужога,
То спадзе з цябе краса,
Як з калінанькі раса.

### 211. Хадзіла дзеванька па полю...

Хадзіла дзеванька па полю,
Дзе звіла вяночак з куколю.
Прасіла ў матачкі дзянёчка
Панасіць з куколю вяночка.
— Прасі, маё дзіцятка, не прасі,
Да нядзелі вяночак панасі.
У нядзелю дзевачак прасі,
Дзевачкам вяночак аддасі.
Яны яго па кветачках разбяруць,
Яны табе песеньку спяюць.

### 212. Субота, нядзеля настае...

Субота, нядзеля настае,
Зялёная рутачка на стале.
Надзечка дружыну збірае,
Вакол свайго століка саджае.
Сама ж, маладзенькая, між усіх
Скланіла галоўку ніжэй усіх,
Скланіла галоўку з касою,
Паліліся слёзкі расою.
Сівая зязюлька сакоча
Ды ад бору ляцець не хоча.
Маладая Надзечка ўсё плача
Ды ад мамы ехаць не хоча.
Бо ў мамы парогі нізенька
Ды хадзіць па ваду блізенька.
У свякрові парогі высока
Ды хадзіць па ваду далёка.

## 213. Ляцелі галачкі ў тры радочкі...

Ляцелі галачкі ў тры радочкі,
А зязюлька — папераду.
Галачкі сталі ды й закрычалі,
А зязюлька закавала.
Ідуць дзевачкі ў тры радочкі,
А Галечка — папераду.
Дзевачкі сталі ды й заспявалі,
А Галечка заплакала.
— Ой, чаго ж плачаш, маладая Галечка?
Ой, ці жаль табе бацькі свайго,
Ці дворыка яго?
— Ой, не жаль мне бацькі свайго,
Ні дворыка яго.
Ой, ды жаль мне русай касы,
Яшчэ дзявочай красы.

## 214. Ой, чыя гэта вішня...

— Ой, чыя гэта вішня,
Чыя непадрубленая?
— Ой, чыя гэта дзяўчына
Незаплеценая?
— Ой, мая гэта дзяўчына,
Незаплеценая.

## 215. Ой, што гэта, ой, што гэта ды за зарыва...




Ой, што гэта, ой, што гэта ды за зарыва,
Што з вечара загарэлася?

Што з вечара, што з вечара загарэлася,
Тудой Маня хадзіла.

Тудой Маня, тудой Маня хадзіла,
Тое зарыва тушыла.

Тудой Маня, тудой Маня хадзіла,
Сваіх дружачак будзіла:

— Уставайце, уставайце, мае дружачкі,
Расчашыце мае косанькі.

Расчашыце, расчашыце мае косанькі,
Разалліце мае слёзанькі.

Ужэ ж мая, ужэ ж мая ды вайна едзе,
Яна ж мяне ды разваюе.

Наперадзе, наперадзе ды ваеннічак,
Ой, ён мяне ды адваюе.

Ой, ён мяне, ой, ён мяне ды адваюе,
У маёй мамачкі ўваруе!

### 216. Наша дружка маленька...

Наша дружка маленька,
Яе ручка залаценька.
Яна шыла, вышывала,
Русу косу гадавала.
— Ой, жа ты, мая руса каса,
Куды ж ты ўбіраешся?
Ці ў гай, ці ў дуброву,
Ці да свёкра ў камору?
— Я ні ў гай, ні ў дуброву,
А да свёкра ў камору.

### 217. Нежаласлівая Валечка...

— Нежаласлівая Валечка,
Не разжаліла мамачку.
— Калі захачу — разжалю,
Выпляту ўплёты з русых кос.
Павешу ўплёты на плот,
Кудой мая мамачка ў клець ходзіць.
У клець ідучы, забачыць,
А з клеці ідучы, заплача:
— Гэта ж маёй дачушкі ўплёты —
Усе дзявоцкія работы.

## 218. Загрукацелі вараныя коні на дварэ...




Загрукацелі вараныя коні на дварэ,
Ой, зазвінелі залатыя кубкі на стале!

Ой, як пачула маладая Ганна ў каморы,
Ой, яна ўпала сваёй роднай маці ў ногі:

— Ой, не аддавай, мая родна маці, ад сябе!
А як жа цябе, мая дачушка, не аддаць?

А як жа цябе, мая дачушка, не аддаць?
Ой, прыехалі ды такія госці, каб цябе забраць!

## 219. Стукнула, грукнула на дварэ...




Стукнула, грукнула на дварэ,
На дварэ,
Ці не едуць, мамачка, па мяне?

— Па цябе, дачушка, па цябе,
Па цябе!
— Схавай мяне, мамачка, за сябе!

— Дарма мяне, мамачка, не аддавай,
Не аддавай,
Стаўляны гарады запрашай.

— Стаўляны гарады не дадуць,
Не дадуць,
Яны цябе, маладу, так звязуць!

### 220. Таргуйся, брацец, таргуйся...

Таргуйся, брацец, таргуйся,
Ой, рана-рана, таргуйся.
Ой, рана-рана, таргуйся,
Прасі за сястрыцу сто рублёў,
За русую касу — тысячу,
За ум і розум цаны няма.

Татарын, брацец, татарын,
Ой, рана-рана, татарын.
Ой, рана-рана, татарын
Прадаў сястрыцу задарам,
Красу дзявочую за пятак,
Русую косаньку аддаў так.

### 221. Распляцём касу маладой дзевачцы...

Распляцём касу маладой дзевачцы
Ды пададзім уплёты ды яе мамачцы,
Хай яна разгорне.
Хай яна разгорне,
К сэрцу прыгорне.
— Ой, плёты-ўплёты ды майго дзіцяці.
— Прынясі, мамка, масла —
Я твае каровы пасла
Ад расы да расы —
Памазаць маслам косы.

### 222. Расплятаю касу...

Расплятаю касу,
Вяду цябе па валасу.
Касу русу распляла,
Табе парачку дала.
Жыві, жыві — не скучай,
А на другіх — забывай.

### 223. Завівайся, мая каса русая...

Завівайся, мая каса русая,
Завівайся, мая каса русая.
Завівайся — не ўсміхайся.
Я на цябе паглядаю,
Русу косу завіваю,
Песеньку запяваю.

### 224. Меншы брат касу расплятаў...

Меншы брат касу расплятаў,
А дзе ён уплёты падзяваў,
А дзе ён уплёты падзяваў?
— На стале паклаў, брат пабраў.
Брат пабраў,
Меншай сястрыцы падараваў.
— На ж табе, сястрыца,
Сястрын знак.
Судзі божа, сястрыца,
І табе так.

### 225. Дагадайся, Галечка...

Дагадайся, Галечка,
Дагадайся, Галечка,
Ды чаго мамка ды ў клець пайшла.
Ды пайшла ў кублішча,
Ды па новае чапчышча.
Ды кідай, кідай, Галечка,
Ды чапец у парог, у парог.
Ды хадзем з намі гуляці ды на двор.

### 226. Затрубілі ў трубачку рана на зары...

Затрубілі ў трубачку рана на зары,
Заплакала дзевачка па русай касе:
— Каса ж мая, косачка, каса русая,
З-за дзіўных сарочак касу прайграла.
Пасадзілі дзевачку яшчэ і на куце,
Раздзялілі косачку на дзве касы.
Ды й надзелі чэпчык ёй да й брусцом.
Пасадзілі дзевачку з добрым малайцом,
З хлапчынай-купцом.

### 227. У сенечках на крэслечку...

У сенечках на крэслечку
Насценька косы часала.
Чэшучы ды й гаварыла:
— Я баценькі не міла,
Мілей бацэнькі горкая гарэлка,
Чым я, маладзенька.
Усе пілі, усе гаварылі,
А мною заплацілі.

### 228. Скакала сарока па страсе...

Скакала сарока па страсе,
Заплакала Танечка па касе:
— Каса ж мая русая, русая,
А часала ж цябе не год, не два,
А за адну чарачку прапіла.

### 229. Каціліся калёсы...

Каціліся калёсы
Ды па ранняй расе.
Плакала дзеванька
Ды па жоўтай касе.
Ды не так па касе,
Як па ўплёту,
Бо яе ўплёты з шчырага злота.
Учора купіла, а цяпер згубіла,
Сваёй мамачцы жалю нарабіла,
А сваю свякроўку развесяліла.

### 230. Ды стаяць дзевачкі...

Ды стаяць дзевачкі
Ў чатыры радочкі.
Мы іх не знаем,
Маладых Манечак.
А па чым пазнаем?
Па плячу коска
Ды разлягаецца,
А па твары слязінка
Ды разліваецца.

### 231. Ой, глянь, мамка...

Ой, глянь, мамка,
Ды на той пасад:
Усе дзеўкі ў косах сядзяць,
А на маю імгла ўпала,
Русую касу растрапала.
Растрапала русую косаньку,
Ды й разліла маю слёзаньку,
Ды й пабіла маё лічанька.

### 232. Гуляла дзеванька...

Гуляла дзеванька
Ў роднага баценькі
Ды не даў ёй Колечка
Яшчэ больш ды пагуляці,
Русую косаньку пачасаці,
А пагнаў яе слёзачку
Ды па беламу лічыку.

## 233. Ой, церам, церам, церамок...

Ой, церам, церам, церамок,
Ой, хто цябе абцясаў?
Ой, дзеўка, дзеўка Ганначка,
— Ой, хто цябе, дзеванька, зачасаў?

## 234. Сягоння нядзелечка...

Сягоння нядзелечка,
Нядзелька,
Э-гэй, лю-лі, ой-ой, лю-лі,
Нядзелька.

А ў нашай жа Танечкі
Свадзебка,
Э-гэй, лю-лі, ой-ой, лю-лі,
Свадзебка.

Як сабрала ды Танечка
Усіх падружачак,
Э-гей, лю-лі, ой-ой, лю-лі,
Усіх падружачак.

Пасадзіла падружачак
Усіх за стол,
Э-гей, лю-лі, ой-ой, лю-лі,
Усіх за стол.

Села, села маладая
Вышэй усіх,
Э-гей, лю-лі, ой-ой, лю-лі,
Вышэй усіх.

Павесіла галовачку
Ніжэй усіх,
Э-гей, лю-лі, ой-ой, лю-лі,
Ніжэй усіх.

## 235. Карыся, Манечка, карыся...

Карыся, Манечка, карыся,
Кожнаму да ножак кланіся.
У кожнага ножанькі бяленькія,
Каб табе была доленька дабрэнькая.

## 236. Падбягу пад акенца — ажно свет...

Падбягу пад акенца — ажно свет,
Ой, выйду я за вароты — ажно след.
Вараныя конікі заржалі,
Куды тую Ганнульку паімчалі?
Бяжы, бяжы, брацейка, расой
За сястрычкінай касой.

## 237. Памалу, братка, ідзіце...

Памалу, братка, ідзіце,
Пылу не рабіце.

Наша Раечка пава,
Штоб пылам не прапала.

## НЯВЕСТА-СІРАТА

### 238. У нас сягоння святы дзянёк нядзеля...

У нас сягоння святы дзянёк нядзеля —
Пачынаецца сіроцкае вяселле.
Маладая Галечка на магілачку хадзіла
І з даліны буйна ветрыка прасіла:

— Павей, павей, буйны ветрычак з даліны,
Паразмятай жоўтыя пяскі з магілы,
Паразбівай цясовыя дошкі на крошкі
І падзімі маю мамачку на ножкі.

### 239. Цвілі садочкі ў тры радочкі

Цвілі садочкі ў тры радочкі.
У адным садзе — салавей шчабеча,
У другім садзе — зязюлька куе,
А ў трэцім садзе — Насцечка плача
Ды матухну просіць:
— Хадзі, хадзі ка мне, мамачка,
Ка мне на вяселле.
На маё вяселле ды на сірочае,
Бо некаму ўстаці,
Бо некаму парадачак даці:
Зялёны дзярночак — не зварухнецца,
Залаты пясочак — не ссыплецца,
Залаты замочак — не адмыкнецца,
А мая мамачка — не адзавецца.

### 240. Сядзела Манечка пад ляском...

Сядзела Манечка пад ляском,
Клікала мамачку галаском:
— Устань, устань, мамачка, ідзі ка мне,
Ці не будзе лепей мне.
— Не пайду, дзіцятка, не пайду,
Бо мяне марны сон змарыў,
Каб я да дзіцяці не хадзіла,
Каб я радачку не радзіла.

### 241. На сягонняшні васкрэсны дзень нядзелі...

На сягонняшні васкрэсны дзень нядзелі
Маладая Манечка на магілачку хадзіла,
Сваю мамачку на вяселле прасіла:
— Устань, устань, мая мамачка, ідзі да мяне,
Парадзь парадачку цяпер ты мне.
— Ды не магу, маё дзіцятка, не магу,
Грабавыя доскі сціснулі ножкі, не магу.
Не магу ўстаці да свайго дзіцяці
Ды парадачак даці.

### 242. Зялёная дубравушка...

— Зялёная дубравушка,
Зялёная дубравушка,
Ці ў цябе пянькоў многа?
— Зялёнага — ніводнага,
Парастачкі — адналетачкі.
— Маладая дзевачка,
Ці ў цябе бацькоў поўна?
— Роднага ды ніводнага.
Ёсць каму ды напіціся,
Няма каму пажурыціся.
Ёсць каму піці-есці,
Няма каму да ладу весці.

### 243. Знаці рутаньку, знаці...

Знаці рутаньку, знаці,
Што яна зеляненька.
Знаці Надзечку па адзеннейку,
Што яна сірацінка.

Стол нізюсенькі, двор вузюсенькі,
Радзіна не ўся дома.
Пашлі сокала на Ўкраінаньку
Па сваю радзінаньку.
А зязюленьку — на магілачку
Па роднага бацeньку.

### 244. Сірата, дзевачка, сірата...

Сірата, дзевачка, сірата,
Сірата, дзевачка, сірата.
Ды сядзіць за сталом, як золата,
Ды сядзіць за сталом, як ружа.
— Хто ж ёй, маладой, паможа?
— Паможа радзіна, паможа.
Вараныя конікі запражэ
Ды яе да шлюбу адвязе.

### 245. Плыла шчука-рыба па ціхай вадзе

Плыла шчука-рыба па ціхай вадзе.
— Прыбудзь, мой бацюхна, цяпер ка мне,
Парадзь параданьку беднай сіраце.
— Не прыбуду, маё дзіця, я цяпер к табе,
Насыпалася сырой зямлі на грудзі мае,
Шчапіліся чорныя вочы, яшчэ і губы мае.

### 246. Чаго сядзіш, Валечка...

— Чаго сядзіш, Валечка,
Ды свайго роднага татачку
Не шукаеш?
— Ой, пушчу я шчуку-рыбу па Дунаю.
Плыві, плыві, шчука-рыба,
Па ціхай вадзе.
Прыбудзь, прыбудзь, родны татачка,
На вечар ка мне.
— Не прыбуду, мая доня,
Бо не здужаю.
Налажылі белы камень.
На грудзі мае.

### 247. Чаму, Лідачка, па новым сяле не ходзіш...

— Чаму, Лідачка, па новым сяле не ходзіш,
Свайго баценьку на вяселлечка не просіш?
— Я ўжо чатыры сяла абышла,
Нідзе свайго баценьку не знайшла.
Ой, ды знайшла чырвоную каліну,
Пад калінаю свайго баценькі магілу.
І прыпала белым лічыкам да пяску
І будзіла свайго баценьку галаском:
— Устань, устань, мой баценька, прабудзіся,
Хадзі на маё вяселлечка, падзівіся.
— Не ўстану, маё дзіцятка, не пайду,
Зрабілі мне цёмную хатаньку, не выйду.

### 248. Ой, хто ж там ды памаленьку гукае?

Ой, хто ж там ды памаленьку гукае?
Ходзіць Манечка, свайго баценьку шукае.
Ой, ступіла залатым крокам у даліну,
Ой, знайшла свайго баценькі магілу.

— Устань, устань, мой баценька, не ляжы,
Хадзі, хадзі на парадачкі паглядзі.
— Ой, не ўстану, мая дочанька, не ўстану
Ды на парадачкі глядзець не буду.

### 249. Годзе, Надзечка, сядзеці...

— Годзе, Надзечка, сядзеці,
Ідзі маменьку будзіці.
— Учора хадзіла — не збудзіла
Вяселлейка наражаці.
— Сягоння пайдзі, такі збудзі
Да вянцу выпраўляці.

### 250. Хадзіла Леначка па новай святліцы...

Хадзіла Леначка па новай святліцы,
Клікала матаньку з сырой зямліцы:
— Сырая зямліца,
Што ты нарабіла,
За што ты маю маманьку
Не ўзлюбіла,
Мяне, маладую, асіраціла?

### 251. Ды хадзіла Манечка кругом саду...

Ды хадзіла Манечка кругом саду,
Ды й гукала сваю мамку на параду:
— Устань, устань, мая мамка, з таго саду
Ка мне, беднай сіраціне, на параду.
— Ой, рада б я, мая дочка, з таго саду ўстаць,
Ды не магу, мая дочка, галавы падняць.
Сырая зямля дзверы заняла, акенцы засыпала,
Дубовыя дошчачкі сціслі ножачкі, —
Не магу я ўстаць.
Жалезныя ключы замкнулі рэчы, —
Не магу гаварыць, не магу ўстаці,
Табе, беднай сіраціне, парадачку даці.

### 252. То рабая зязюлька па сенажаці лятае...

То рабая зязюлька па сенажаці лятае,
Маладая дзяўчына сваю мамачку шукае.
Абышла яна шырокае поле, даліну
Ды знайшла сваёй мамачкі магілу.

На той магіле стаіць жытні каласок,
Гэта яе мамачкі галасок.
— Ой, устань, мая мамачка, не ляжы,
Цяпер мне розуму далажы.
— Ой, не ўстану, маё дзіцятка, не ўстану.
Зрабілі мне столяры новы дом,
Што ні акенца, ні дзверцы,
Не прамоўлю, маё дзіцятка, ні слоўца.

### 253. Ой, хто ж гэта ды па барочку блукае...

Ой, хто ж гэта ды па барочку блукае,
Ой, хто ж гэта тонкім голасам гукае?
Маладая дзеванька ды маманьку шукае.
Як ступіла ды і з горынкі ў даліну
І знайшла сваёй маманькі магілу:
— Устань, устань, мая маманька, не ляжы,
Хадзі, хадзі, падарачкі пакажы.
— Ой, няволя, мая дочанька, няволя,
Збудавалі мне новы дом.
Не пакінулі ні акеньчыка, ні дзвярца,
Не прамоўлю, мая дочанька, ні слаўца.

### 254. Ой, белая, белая бярозка...

Ой, белая, белая бярозка,
Чаго на моры палягла,
Дзевачкам дарожку заняла?
Хадзіла дзевачка па моры,
Клікала мамачку з каморы:
— Ой, выйдзі, выйдзі, мамачка,
Памажы золата набраці,
Шчырае срэбра падняці.
— Не магу, дзіцятка, не магу,
Ад жалю ручак не ўздыму,
Што цябе, маладую, аддаю
Чужому татачку, не свайму.

### 255. А хто ў лесе паціханьку гукае?

А хто ў лесе паціханьку гукае?
Маруся сваю мамачку шукае:
— Адгукніся, мая мамачка, проць мяне,
Няма ў мяне парадачку без цябе.

— Не адгукнуся, маё дзіцятка, проць цябе,
Няхай табе падарачак дадуць
Добрыя людзі без мяне.
Збудавалі яны новы дом
Без сенечак, без акеначак, без сонца —
Не прамоўлю, дзіцятка маё, ні слоўца.

## 256. Ой, двор вялікі...

Ой, двор вялікі,
А забор маленькі
Ды не ўся радзіна —
Няма радзіны ні палавіны:
Ні роднай мамачкі.
Пашлю сокала на Ўкраіну
Па сваю радзіну,
А салавейку — у сыру зямельку
Па родну мамачку.
Яшчэ салавейка не далятае,
А мамачка прамаўляе:
— Чаго ж ты лятаеш,
Надакучаеш, рабенькі салавейка?
— Прасіла цябе радзінушка твая
К сабе на вяселле.
— Рада б я ўстаць,
Свайму дзіцяці парадачак даць.
Сырая зямелька дзверы залягла,
Акенца засланіла,
Ды карыся, мая дочка,
Чужой чужыне.
Няхай дадуць падарачак беднай сіраціне.
— Я карылася, мая мамка,
І не раз, і не тры.
Ніхто не даў падарачка
Такога, як ты.

## 257. Знаці рутаньку па насеннечку...

Знаці рутаньку па насеннечку,
Што яна зеляненькая.
Знаці Галечку па вяселлечку,
Што яна сіротанька.
І двор вузенькі, і стол нізенькі,
Не ўся радзіначка.
Пашлю салаўя на Ўкраіначку
Па ўсю радзіначку.

А зязюльку, жалабну пташку, —
Па родную мамачку.
Салавей ляціць, лістоўкі нясе,
Што радзіна прыйдзе.
Зязюлька ляціць, лістоўку нясе,
Што матанькі не будзе.
Ой, ты зязюля, жалобна пташка,
Паляці па мамачку.
Заляці к ляску, прыпадзі к пяску
І закуй галосненька,
А я за табою з дружынаю,
Плачучы галосненька.

### 258. На камяні чорны воран крача...

На камяні чорны воран крача,
На чужыне сіраціна плача:
— Я нядаўна сіратою стала,
За тры гады ўсё горачка пазнала.
Не аддаў замуж бацька, не аддала маці,
Аддалі мяне ўсе чужыя людзі.

### 259. Ці ты, божа, не бачыш...

Ці ты, божа, не бачыш,
Што сіротанька плача.
Што сіротанька плача,
Плача ды прычытае,
Што не свой бацька аддае.
Што не свой выдае,
А выдаюць чужаніцы,
Бо няма ні брата, ні сястрыцы.
Толькі ў мяне ды радзіначкі,
Як мае ды падружачкі.

### 260. Кукавала зязюленька ў садочку...

Кукавала зязюленька ў садочку,
Прылажыўшы галоўку к лісточку:
— Бедная ж мая галоўка на свеце,
Хто ж для мяне гняздзечка спляце?
Плакала дзеванька ў святліцы,
Прылажыўшы галоўку к аконцу:
— Бедная ж мая галоўка ў вяночку,
Няма ж маёй мамачкі ў садочку.
Бедная ж мая галоўка ў свеце,
Няма ж майго татачкі на свеце.

## 261. З неба, з неба хмарка ідзе...

З неба, з неба хмарка ідзе,
З неба, з неба цёмная.
— Маладая Надзечка,
Ці ж ты не баішся хмаркі тае?
— Ды чаго ж мне баяцца?
У гэтай хмарцы мамачка мая,
Матка родная і татка мой,
Дробным дожджыкам абальюць,
Шчасцем-долейкай абашлюць.

## 262. Знаці зязюленьку па лятанейку...

Знаці зязюленьку па лятанейку,
Што нізенька лятае,
Знаці дзяцінaчцы, што вяселлейка
Не бацька спраўляе.
Ой, ёсць каму піці-есці,
Ды няма каму да ладу давесці.
— Ой, пашлю, пашлю сіву зязюльку
Ды па роднага татку.
Маладзенькая з двара з'язджае,
Зязюлька назад ляціць.
— Прыкованы ножкі да сасновай дошкі —
Не ўстане.
Звязаны ручкі на грудзі ляжаць —
Не разгорне,
К табе на вяселлейка не прыедзе.

## 263. Дзе твая, Надзечка...

— Дзе твая, Надзечка,
Ды родная матачка?
Чаму цябе да шлюбу
Ды не прыбірае?
— Ужо мая матачка
Далёка, глыбока,
Пад трыма замкамі
Ды пад старажамі.
Першы замочак — зялёны дзярночак,
Другі замочак — жоўты пясочак,
Трэці замочак — вечны дамочак.
— Не магу, дзіцятка, устаці
Табе раданькі даці.
Сырая зямля дзверы залягла,
Аконца засланіла,
К майму дзіцяці маладзенькаму
На вяселле не пусціла.

### 264. Ой, хто гэта тонка, голасна гукае...

Ой, хто гэта тонка, голасна гукае?
Маладая Надзечка сваёй маці шукае.
Як ступіла з горанькі ў даліну,
Натрапіла на матчыну магілу.
Як прыпала белым тварыкам да зямлі:
— Прашу, мая матачка, да сябе.

### 265. Нікому няма гора...

Нікому няма гора,
Як той сіраціне.
Ніхто не прыгорне
Пры ліхай гадзіне.

Ніхто не прыгорне,
Ні бацька, ні маці.
Хіба той прыгорне,
Што думае ўзяці.

### 266. Няшчасна, матка, сіроцкая доля...

Няшчасна, матка, сіроцкая доля,
Няшчасна, матка, сіроцкая доля.
Дзевачкі пяюць, сірата плача.
Як убярэцца, то скажуць: мудруецца.
Як не ўбярэцца, то скажуць: лянуецца.
Усе людзі кажуць, што сірата лянівa,
А ў сіраты — доля нешчаслівa.
Звейся, вецер, дуй на сухія лозы
Ды ўтры, утры сіроцкія слёзы.
Слёзы сіроцкія ды так не мінаюць,
А ўпадуць на камень — камень разбіваюць
А на сэрца — сэрца разрываюць.
Сірата робіць, як будзень, так нядзелю,
А людзі кажуць, што сірата лянівa.

### 267. Станьце, мужычкі, усе ў рад...

Станьце, мужычкі, усе ў рад,
Пойдзе Аксіння таткі шукаць.
Увесь рад абышла,
Роднага таткі не знайшла.
— Галоўка мая ў вяночку,
Няма майго таткі ў радочку.
Галоўка мая ў квецi,
Няма майго таткі на свеце.
Галоўка мая — макаў цвет,
Пайшоў мой татка на той свет.

### 268. Зборная нядзелька, зборная...




Зборная нядзелька, зборная,
Сірата дружачак збірае.

Сірата дружачак збірае
Ды каля століка саджае.

Ой, выйшла да воза, як ружа,
Уздыхнула цяжанька: «Мой божа!»

Уздыхнула цяжанька: «Мой божа!
Хто ж мяне, сірату, успаможа?»

Сама яна села вышэй усіх,
Схіліла галоўку ніжэй усіх:

— Нет у мяне матулі роднае,
Нет у мяне парады жаднае!

## ПАСАД

### 269. Біце крэмень, біце...

Біце крэмень, біце,
Агню дабывайце,
Колечку застрыгайце.

### 270. Йдзе Іванка на пасад...

Йдзе Іванка на пасад,
Сустракае яго госпад-бог
З доляю добраю,
Шчасліваю гадзінаю.

### 271. Ой, ступіла дзевачка...

Ой, ступіла дзевачка
На новы парог,
Замахнула хусцінкай
На ўсіх напярод.

— Станавіся, радзіначка,
Уся ў рад,
Бо я ўжо іду ў вяночку,
Іду на пасад.

### 272. Ступнула дзевачка на парог...

Ступнула дзевачка на парог
Ды й махнула ручнікoм напярод.
— Расступіцеся, падружкі,
Упаду я свайму татку ў ножкі.
Будзе мяне мой татка дарыць
Вялікім калачом,
Яшчэ верным дружком.

### 273. Ой ты, ёлачка баравая...

Ой ты, ёлачка баравая,
У бару стаяла,
Ішла дарогаю — гудзела,
Зайшла ў хату — заззяла.
Ступіла Надзечка на парог
Ды махнула хусцінкай на свой род.
Ідзе наша Надзечка на пасад.
Сцяліце нору залатую,
Благаславіце, бацька і маці, маладую.

### 274. Сцяліце нору залатую...

Сцяліце нору залатую,
Благаслаўляйце маладую.

— Сцяліце — я пайду,
Благаславіце — я сяду.

### 275. Ды ішла дзеванька на пасад...

Ды ішла дзеванька на пасад,
Ды глянула цераз акенца ў вішнёвы сад:
Ці сільна ўзвіўся вінаград.
— Ой, сільна-сільна ўзвіўся,
Чаго ж ты, жанішок, спазніўся?

### 276. Ішла дзевачка на пасад...

Ішла дзевачка на пасад,
Заглянула ў акенца,
У вішнёвы сад.
— Чаму, чаму, мілы,
Не з'явіўся?
Чаму, жанішок, спазніўся?
— Я спазніўся, дзевачка, спазніўся,
Свайму татачку карыўся.

### 277. Разгарэўшыся, каліна...

Разгарэўшыся, каліна
Насупраць сонца стаяла.
Насупраць сонца стаяла,
На ўсе дрэўцы глядзела.
На ўсіх дрэвах лісце ёсць,
А на мне няма.
Няхай вецер галлё ламае,
А Волечка на пасад сядзе.

### 278. Ідзе, ідзе Манечка на пасад...

Ідзе, ідзе Манечка на пасад,
Крыкнулі, гікнулі на ўвесь сад:
— Ці гатова там дзеўка на пасад?

— Ой, гатова, дзеванькі, гатова.
Была ў мяне шоўкавая нітка,
Ды я яе згубіла,
Маладому Івану кветку не прышыла.

### 279. Ішла Маруська на пасад...

Ішла Маруська на пасад
Ды сустрэў яе госпад сам
З доляю шчасліваю,
З добраю гадзінаю.

### 280. Расступіцеся, падружкі...

Расступіцеся, падружкі,
Не засланяйце дарожкі.
Кланяецца Надзечка ды татачку ў ножкі.
— А ў майго татачкі ножкі бяленькі.
— Няхай табе, доню,
Будзе доля дабрэнька.

## 281. Назбірала Кацечка дзевачак поўны двор...

Назбірала Кацечка дзевачак поўны двор,
Выбірала дружачак на выбор.
Пасадзіла іх высока,
А сама села вышэй усіх,
Схіліла галованьку ніжэй усіх,
Задумала думаньку горшай усіх.

## 282. Ішла дзевачка на пасад...

Ішла дзевачка на пасад,
Схавалася ў вінаград.
— Хто знойдзе вінаград,
З тым сяду на пасад.
Пайшоў бацька — не знайшоў
Ды й заплакаў і прыйшоў.
Пайшла маці — не знайшла
Ды й заплакала і прыйшла.
Пайшоў брат — не знайшоў
Ды й заплакаў і прыйшоў.
Пайшоў Колечка — знайшоў,
Узяў за ручку і прыйшоў.

## 283. Брат сястру на пасад вядзе...

Брат сятру на пасад вядзе,
Брат сястру на пасад вядзе.
Яна яму да ножак падзе:
— Мой жа братку родны,
Чым жа я табе надакучыла:
Ці хуткаю работаю, ці сваёй ахвотаю?
— Не надакучыла ты мне,
Але сваты твае.

## 284. Брат сястру на пасад вядзе...

Брат сястру на пасад вядзе,
Сястра брату ў ногі падзе:

— Братачка ты мой родненькі, чым я табе надакучыла:
Ці русай касою, ці сваёй красою?

— Надаелі мне твае госці,
Што ў суботу прыязджаюць, а ў нядзелю ад'язджаюць.

### 285. Ляцелі галачкі...

Ляцелі галачкі
Ды ў тры радочкі.
Зязюля — папераду,
Зязюля — папераду.

Усе галачкі
На лужку селі.
Зязюля на каліну,
Зязюля на каліну.

Ідуць дзевачкі
Ў тры радочкі.
Вольгачка — папераду,
Вольгачка — папераду.

Усе дзевачкі за стол селі,
А Вольгачка на пасад.
Усе дзевачкі песні запелі,
А Вольгачка заплакала.

### 286. Пасцяліце нору, бо я іду...

Пасцяліце нору, бо я іду,
Пасцяліце нору, бо я іду,
Благаславіце, я сяду.
Паслалі нору, я прыйшла,
Благаславілі ацец, маці, я села
Ды ўсю сваю радзіначку засмуціла,
Толькі Ванечку звесяліла.
Ды ляцелі галачкі,
Ды ў тры радочкі,
Ды ў падушках селі,
А зязюля на калені.
Усе галачкі зашчабяталі,
Зязюля — закавала.
— Чаго куеш, чаго жалуеш,
Ты раба зязюля?
Ці жаль табе цёмнага лугу,
Ці яркае каліны?
— Не жаль мне цёмнага лугу,
Не жаль мне цёмнага лугу,
Ні яркай каліны.
Толькі жаль мне летняга дзянька.
Ішлі дзевачкі
Ды ў тры радочкі,
Ганначка — напорадзе.
Усе дзевачкі на лаўку селі,
Ганначка — на пасадзе.
Усе дзевачкі запелі,
Ганначка — заплакала.
— Чаго плачаш, чаго жалуеш,
Маладая Ганначка?
Ці жаль табе таткі старога,
Ці падвор'ечка яго?
— Не жаль мне таткі старога
І падвор'ечка яго.
Толькі жаль мне русай касы
І дзявочай красы.

### 287. Каля цесцева двара...

Каля цесцева двара
Ды высокая гара.
Няма як з гары прыступіці
Ды коніка напаіці.
Ой, выйшла, выбегла
Маладая Галечка.
Яна к гары прыступіла
Ды коніка напаіла.
Дала каню аўса, сена,
Сама пайшла, на пасад села.
Дала каню пшаніцы,
Каб Івана не ўгнявіці.
Дала каню аброку,
Сама села каля боку.

### 288. З мора вада выліваецца...

З мора вада выліваецца,
Зяць ад цешчы выбіраецца.
Пачакай, зяцю, хоць гадзіначку,
Падзіўлюся на дзяціначку:
Ці хораша наражана,
На пасадзе пасаджана.
Наражана, як дзіцятка,
Пасаджана, як панянятка.

### 289. Дзевачкі ідуць, вяночкі ўюць...

— Дзевачкі ідуць, вяночкі ўюць,
А ты сядзіш на пасадзе.
— А я ўжо гуляла, усе красачкі парвала,
Хачу я жонкай быць.
Цяпер сяджу на пасадзе,
Вечар сядзела ды й не заплакала.
— Няўжо ў цябе, дзевачка,
Каменна сярдзечка?
Ды дайце ёй помачы,
Горкай цыбулі пад вочы,
Штоб яна заплакала,
Мамачку разжаліла.

### 290. Ой, пусці, сваццял у хату...

— Ой, пусці, сваццял у хату
Хаця ручкі пагрэць,
Маладое паглядзець:
Ці хораша нараджона,
На пасадзе пасаджона.
— Нараджона, як дзіцятка,
Пасаджона, як панянятка.

### 291. Бяліла дзевачка белы лён...

Бяліла дзевачка белы лён
Ды выганяла дружачак з-за стала вон.
—Ідзіце, ідзіце, дружачкі, з-за стала,
Няхай сядзе Колечка каля мяне.
Ідзіце, ідзіце, дружачкі, усе на двор,
Няхай прыйдзе Колечка — мой сакол.

### 292. Ой, ці табе, мамка, жаль, не жаль...

Ой, ці табе, мамка, жаль, не жаль,
Ой, ці тваё сэрцайка не вяне,
Што тваё роднае дзіця не ўзгляне?
Ой, села ж яно вышэй усіх

Ды апусціла галованьку ніжэй усіх,
Ды думала думанькі больш за ўсіх.

— Памажыце, дзевачкі, думаці,
Як мне свайго свёкарка назваці?
Ой, назаву свёкарка бацюхна.
Яшчэ ж маё лічыка не спадзе
Ды болей розуму прыпадзе.

### 293. Закавала зязюля...

Закавала зязюля
Вышэй неба,
Ці я табе, мая мамка,
Больш не трэба?

Закавала зязюля
Вышэй дуба,
Ці я табе, мая мамка,
Больш не люба?

Закавала зязюля
Вышэй грушы,
Ці я табе, мая мамка,
Не да душы?

### 294. Ды ўступіла Галечка на парог...

Ды ўступіла Галечка на парог,
Ды махнула хусцінкай на ўвесь род.
— Станавіся, радзіначка, уся ў рад,
Бо ідзе Галечка на пасад.

Яна ўсю радзіначку абышла,
Нідзе сваёй мамачкі не знайшла.
Падышла к бацюхну свайму блізенька,
Пакланілася ў ножанькі нізенька.

### 295. Пастаньце, суседкі, усе ў рад...

Пастаньце, суседкі, усе ў рад,
Будзе ісці дзяўчына на пасад,
Нізка галоўку скланяючы,
У матулькі долі просячы.

Уся яе галоўка ў квецці,
Няма яе матулькі на свеце.
На галоўцы ружа там лілее,
А дзяўчына плача, аж млее.

Дык прыйдзі, матулька, у хатку,
Паглядзі сірочага парадку:
Як сіротка прыбрана,
Як сіротка пасаджана.

### 296. Станавіся, радзіначка...

Станавіся, радзіначка,
Станавіся ў рад,
Ідзе наша Кацярыначка на пасад.

Косанькамі да зямліцы дастае,
Слёзанькамі белае лічыка аблівае,
Очанькамі родную маманьку шукае.

### 297. Як ты, Анечка, не баішся...

— Як ты, Анечка, не баішся,
Што з сіняга мора хмара ідзе
І аб вокны страла б'е?
— То ж не хмарачка грамавая,
То ж едзе парачка любавая.
То ж не хмарачка, то ж не град,
То ж едзе Колечка на пасад.

### 298. Благаславі, божа...




Благаславі, божа,
Благаславі, божа, ды й пасажанек,
Благаславі, божа.

Ізвідкіля,
Ізвідкіля ды й пасажанька,
Ізвідкіля?

Із яснога,
Із яснога ды й соненьку,
Із яснога.

Із цямнога,
Із цямнога ды й ходаньку,
Із цямнога.

Ой, сцяклося,
Ой, сцяклося ды дзве рэчанькі,
Ой, сцяклося.

Ой, зыйшлося,
Ой, зыйшлося два пасажанькі,
Ой, зыйшлося.

Першы посаг,
Першы посаг — ясны месяц,
Першы посаг.

Другі посаг,
Другі посаг — яснае сонца,
Другі посаг.

Што з месяца,
Што з месяца — малады
Колечка,
Што з месяца.

Што з сонейка,
Што з сонейка — малада
Надзечка,
Што з сонейка.

## НЯВЕСТУ ДАРАЦЬ

### 299. Збірайся, радзіна багатая...

Збірайся, радзіна багатая,
Ды будзем гаварыці,
Што сястрыцы дарыці?
— Сястрыцы — па цяліцы,
Брацейцы — па жарабіцы.

### 300. Адзывайся, племя...

Адзывайся, племя,
Ды дары княгіню
Валамі ды каровамі,
Чорнымі ды авечкамі,
Шэрымі ды гусачкамі,
Тонкімі ды маточкамі.

### 301. Стойце, баяры, у адной старане...

Стойце, баяры, у адной старане,
Слухайце, баяры, што мне бацька дае:
Пару валоў, дванаццаць кароў.
Каб жа таму ды праўданька была,
То я ў свякрухі багатая б была.

### 302. Дарую я вам шчасце і долю...

Дарую я вам шчасце і долю,
А яшчэ дару медзі,
Каб былі дзеці,
Як мядзведзі.

### 303. Дарую грошы, каб былі дзеці харошы

Дарую грошы, каб былі дзеці харошы.
Дарую грошы, за якія працавала,
Каб маладая маладога пацалавала.

### 304. Дарую бульбы падполле...

Дарую бульбы падполле,
Каб было дзяцей застолле.

### 305. Дарую меднымі...

Дарую меднымі,
Каб не былі беднымі.

### 306. Дарую гектар грэчкі...

Дарую гектар грэчкі,
Каб вяліся авечкі.

### 307. Дарую лес, а ў лесе дубкі

Дарую лес, а ў лесе дубкі.
Колькі ў лесе дубкоў,
Каб столькі было ў вас сынкоў.

### 308. Перапіваю стог жыта...

Перапіваю стог жыта,
Каб не была ніколі біта.

### 309. Даю стакан суніц...

Даю стакан суніц,
Каб не хадзіў да чужых маладзіц.

### 310. Дарую мяшок гліны...

Дарую мяшок гліны,
Каб праз год былі радзіны.

### 311. Дарыце сіротаньку...

Дарыце сіротаньку,
Бо паедзе ў дарожаньку.

Дарыце вы яе,
Бо няма бацькі ў яе.

## ПАЖАДАННІ

### 312. Жывіце здаровы...

Жывіце здаровы,
Адзін аднаго любіце, паважайце
І нас не забывайце.

### 313. Каб жылі багата, як восень...

Каб жылі багата, як восень,
Каб былі красны, як вясна,
А дужы, як вада,
Каб разам усё жыццё ішлі,
Шчасце-долю сабе знайшлі.

### 314. Дару падарунак...

Дару падарунак
На чатыры канты,
Каб было чатыры сыны
І ўсе — музыканты.

### 315. Відна Надзю па паходцы...

Відна Надзю па паходцы,
Скупую радню мае:
Золата хавае,
Серабро мяняе,
Медзю перапівае.

## ПЕРАД АД'ЕЗДАМ ДА ШЛЮБУ

### 316. Зялёная рутанька...

Зялёная рутанька
Вышэй плоту стаяла,
Расою прыпала.
Маладая Надзечка,
Пазбірай тую росу
Ды ўмый русу косу.
Расою ўмывалася,
Красою ўціралася,
Да шлюбу збіралася.

### 317. Ох ты, ёлачка баравая...

Ох ты, ёлачка баравая,
Ты ў бары расла, шумела.
А дарогаю ішла — звінела,
А ў хату ўвайшла — заззяла.

А на стале стала — стукнула
Ды ўсіх дружачак гукнула.

### 318. Рада маценька...

Рада маценька,
Што вяселлейка прычакала,
На гадзіначку
Усю радзіначку сабрала.

### 319. Сядай, Надзечка, у канец стала...

Сядай, Надзечка, у канец стала
З доляю гаварыці.
— Доленька мая,
Як ты шчаслівая,
То ідзі да шлюбу са мною.
А як нядобрая,
Нешчаслівая,
То плыві на мора з вадою,
Доленька мая,
З быстрымі ручайкамі,
А я пайду да шлюбу
Са сваімі дружанькамі.

### 320. Ды сядзела дзеванька вышэй усіх...

Ды сядзела дзеванька вышэй усіх,
Думала-гадала больш за ўсіх,
Як ёй, малодзенькай, пад шлюб стаць,
Гэтаму чужынцу руку даць.
— Станавіся, дзеванька бяленька,
Падавай жа ручаньку смяленька.

### 321. Ты ж, мая матанька...

Ты ж, мая матанька,
Выражай хуценька,
Бо мне прыйдзецца
У бары начаваці,
З зялёнае елі
Пасцельку слаці,
Павіна пер'еца
Ў падушку класці.

### 322. За лесам, ляском сонейка ўзыходзіць...

За лесам, ляском сонейка ўзыходзіць,
Маладая Ірачка дзяжу абыходзіць.
Пакуль сонейка вышэй падыдзе,
Маладая Ірачка дзяжу абыдзе.
Пакуль сонейка на поўдзень стане,
Маладая Ірачка на шлюбе стане.

### 323. Да дубу, зязюля, да дубу...

Да дубу, зязюля, да дубу,
Час табе, Ганначка, да шлюбу.
— Што табе, зязюля, да таго?
Ёсць у мяне мамачка для таго.

### 324. Даліна, даліна...

Даліна, даліна,
Даліна шырокая.
Па табе, далінушка,
Туман рассцілаецца.

Дзеўка ўбіраецца,
Замуж сабіраецца
За дружка нявернага,
Салдата ваеннага.

### 325. Ды падай, маманька, грабянца...

Ды падай, маманька, грабянца,
Расчасаці косаньку да вянца.

Ды ўпаў грабянец пад сталец,
А мая косанька — пад вянец.

### 326. Ды гудуць пчолкі ды на тры райкі...

Ды гудуць пчолкі ды на тры райкі,
Ды на яравое зелле.
— Ды прыбудзь, прыбудзь, гасподзь-бог,
Ды на наша вяселле.
— Я сам не пайду, ангела прышлю,
Няхай ангел ладзіцца,
Ды дай, божа, што б нам
Добра згадзіцца.

### 327. Ды ўпаў грабянец пад стол...

Ды ўпаў грабянец пад стол.
— Ды падай, мамка, грабянца,
Расчасаць косаньку да вянца.

— Ідзі, дочанька, у вазы,
Расчэшам косаньку ў дарозе,
Прыложым галаваньку к бярозе.

### 328. У нядзельку рана...

У нядзельку рана,
У нядзельку рана,
Сонца ў хмары грала.

Там дзеванька сабіралася.
Там дзеванька сабіралася
Ды да шлюбу ўбіралася.

### 329. Тая ёлачка, тая сасёначка...

Тая ёлачка, тая сасёначка
Зялёная, зялёная,
Усю зіму зялёненькая стаяла.
Ты дзевачка, красная, маладая,
Усю нядзельку маладзілася,
Русую косачку часала, часала,
А ў нядзелечку к вянцу ехала, паехала.

### 330. Ды падай, мама, шубу...

— Ды падай, мама, шубу,
Бо я еду да шлюбу.
Там мяне не знаць муць,
Там мяне ды пытаць муць:
Ці я пайду да вялікага
Татачкі, ці багатага.
У мяне роду каля стола,
А конікаў поўна стойла.

### 331. Дзевачка ды да шлюбу ішла...

Дзевачка ды да шлюбу ішла,
Дзеўкаю ды шубу нясла.
— Мая шуба не тут ткана,
Са Львова прыслана.
Шылі яе шаўцы-краўцы,
Прыслалі мне, панёванцы.
Ой, шылі-вышывалі
Ды мне прыслалі.
Шылі яе іголачкамі,
Шаўковымі нітачкамі.

### 332. Ой ты, грушка мая кучаравая...

— Ой ты, грушка мая кучаравая,
Калі ты ўзышла, калі вырасла?
— Я вясною ўзышла, летам вырасла,
На Дунай, на раку нахілілася.
Красная дзевіца зажурылася,
Зажыгала свечку з воску ярага,
Дажыдала дружка разудалага.

### 333. Пасеяў Валодзя свой сад-вінаград

Пасеяў Валодзя свой сад-вінаград.
— Хто ж той сад вартаваці будзе?
— Малады Валодзечка вартаваці будзе.
Вартаваў ночку, вартаваў другую,
А на трэцюю моцненька заснуў.
Прыйшоў татачка ды й стаў будзіць:
— Уставай, сыночак, хопіць спаць,
Ужо твой сад-вінаград пташачкі аб'елі,
А тваю маладую дружкі абселі.
— Няхай абсядаюць, як самі знаюць,
А я сваю Ганульку ўсюды пазнаю.

### 334. Паедзем, дзевачка, да богу маліцца

Паедзем, дзевачка, да богу маліцца.
Ведай, дзевачка, ды дзе станавіцца.
Не станавіся пасярод касцёла,
Стань сабе, маладая, блізка каля стола.

Ды анёлы ісці муць ды долю нясці муць,
Ды будуць пісаці, ды будуць чытаці,
Якую гэтаму дзіцяці ды долю даці:
Ці грошавую, ці хлебавую.

### 335. Ды ўслужы, братка, услужы...

Ды ўслужы, братка, услужы,
Варанога коніка запражы.
Варанога коніка запражы,
А сястрыцу да шлюбу адвязі.

### 336. Да вянца, дзеванька, да вянца...

Да вянца, дзеванька, да вянца,
Сыпнула золата з рукаўца.
А за ёю мамачка з прыпалом,
Збірае золата рукавом.
— Вярніся, мамачка, не збярэш,
Толькі свае слёзачкі разальеш.

### 337. Да вянца, Манечка, да вянца

Да вянца, Манечка, да вянца.
Ці давала мамачцы паклонца?
— Давала, дзевачкі, давала,
Кожнаму да ножак падала.
Старога, малога не мінала,
Кожнаму да ножак прыпадала.

### 338. Ой, коню, коню буланы...

Ой, коню, коню буланы,
Ці чуеш сёння сілу?
Ой, ці чуеш сёння сілу,
Ці завязеш да шлюбу княгіню?
Ды пад тую гораньку крутую,
Ды ў тую цэркаўку святую.
А ў той цэркаўцы святы спас,
Павянчае дзетачак у божы час.

### 339. З дарогі, варогі...

З дарогі, варогі,
Не пераходзьце дарогі.
Няхай пяройдзе госпад-бог,
А за госпадам — бацька мой.
Няхай мне судосіць,
У госпада долі папросіць.

### 340. Не сядзі, княжа, не сядзі...

Не сядзі, княжа, не сядзі,
Ідзі па вуліцы пахадзі,
Скінь з капы тры снапы
Ды й накармі коніка варанога,
Каб добра было ехаць да вянца,
Ворагі, ворагі, сходзьце з дарогі,
Хай пяройдзе маці мая,
Каб шчаслівай дарога была.

### 341. Памолімся богу, памолімся богу...

Памолімся богу, памолімся богу
Ды й пойдзем у дарогу.
Ды ў дарожаньку шчасную,
Ды па дзеваньку красную.
Ды ў дарожаньку сукаватую,
Ды па дзеваньку багатую.
Далі каням жыта,
Каб нам дарожанька была біта.
— Адступіцеся, ворагі,
Ды не пераходзьце дарогі.
Ды няхай пяройдзе радзіна,
Каб нам дарожанька была шчасліва.
Ды няхай пяройдзе мамка мая,
Каб нам дарожанька гладка была.
Ды няхай пяройдзе госпад-бог,
Каб нам у дарозе памог.

### 342. Ой, бярыце, дзевачкі, розачкі...

Ой, бярыце, дзевачкі, розачкі,
Ой, бярыце, дзевачкі, розачкі
Ды мяціце вуліцу і дворцы,
Ды вязіце Насценьку да вянца.
Ды мясці вуліцу канчайце,
Ды вязіце маладзеньку вянчайце.

### 343. Мамачка, перайдзі мне дарожачку...

— Мамачка, перайдзі мне дарожачку,
Бо я іду да шлюбаньку.
— Няхай, дзіцятка маё роднае,

Няхай табе бог пяройдзе
Ды са святым Міколаю,
Ды са шчасцем і доляю.

### 344. Ды за нашу Дашу...

Ды за нашу Дашу
Дайце кашы.

Калі каша з мёдам,
То аддадзім мядзведзям.

Калі каша з макам,
То аддадзім сабакам.

Ды за нашу дзевачку
Дайце гарэлачкі.

## ПА ДАРОЗЕ ДА ШЛЮБУ

### 345. Вярба, вярба, вярбіца...

Вярба, вярба, вярбіца,
Ды чаго ж ты на мора палягла,
Ды дзевачкам дарогу заняла?
— Не сама я, дзеванькі, палягла,
Палажыла мяне дзеванька,
У камору часта ходзячы,
Прыполамі золата носячы.
Рассыпала золата па моры
Да клікала татачку ў каморы
Пазбіраці золата па моры.
— Няхай табе, дзіцятка, той збярэ,
Хто з табою, маладою, шлюб бярэ.

### 346. Ой, чые то конікі...

Ой, чые то конікі
Ў залатым плоце стаяць
І вады не п'юць,
Капытамі б'юць?
Знаць, дарожаньку чуюць.

### 347. Ой, броду, броду...

Ой, броду, броду,
На ясным лёду,
Там Колечка коніка куе.
Дзе ён, малады, падкоўкі бярэ?
Яму сястрынкі даюць пярсцінкі
З правае ручкі на падковачкі,
З левае ручкі на падбіёначкі.

— Куй, браток, коні
На ўсе чатыры ногі.
Будзем ехаць борам, краменнем,
Борам, краменнем, лесам, каменнем.
Будзе лес шумеці,
Камень брышчэці,
Будуць нам людзі завідаваці.

### 348. Добра таму, чый сын едзе...

Добра таму, чый сын едзе,
А таму лепей,
Чый то зяць будзе.
— Дзіўныя людзі,
Нам не дзівуйце,
Сваіх гадуйце.
Бо нас маценка
Выгадавала,
Цёмныя ночы не дасыпала,
Ясные свечы не загашала,
З гусілачак ножак
Не вынімала.

### 349. Ой, на гары ды цэркаўка стаяла...

Ой, на гары ды цэркаўка стаяла,
Там дзяўчына па няволі шлюб брала.
— Шлюб мой па няволі беручы,
Ці добра мне будзе за нялюбым жывучы.
Будзе добра, то буду панаваці,
Як нядобра — буду праклінаці.

### 350. Ой, маманька мая...

Ой, маманька мая,
Ой, маманька ж мая,
Ужо я цяпер не твая,
Ужо я цяпер ды таго пана.
Ужо я цяпер ды таго пана,
З кім на шлюбу стаяла.
З кім на шлюбу стаяла,
Госпаду ды прысягала.
Прысягала богу і бацюшку сваёму,
Што дзеткі звянчаў
І не багата за русу касу ўзяў.

## ПАСЛЯ ШЛЮБУ ПЯЮЦЬ У ДАРОЗЕ І ДОМА

### 351. Субота, нядзеля, як адзін дзянёчак...

Субота, нядзеля, як адзін дзянёчак,
Ды віла дзевачка з руты вяночак.
Ды віла, віла, сабе гаварыла:
— Я ў табе, вяночак, красавацьне буду,
Будзе красаваці меншая сястрыца,
Меншая сястрыца, русая касіца.

### 352. На дварэ дождж рушыць...

На дварэ дождж рушыць,
А дзевачка дзевачак просіць:
— Дзевачкі мае, сястрыцы,
Бярыце ў рукі розачкі,
Бараніце мае косачкі.
Розачкі ды рукі збілі,
Косачак не абаранілі.

### 353. Мецена вуланька ды з канца...




Мецена вуланька ды з канца,
Прывезена Насценька з-пад вянца.
Прывезена Насценька з-пад вянца,
Сыпнула золата з рукаўца.
— Выйдзі, выйдзі, баценька, з хаты
Ды й памажы золата збіраці.
— Не збірай, дзіцятка, не збярэш,
Толькі свае слёзанькі разальеш.
— Выйдзі, выйдзі, матанька, з хаты
Ды й памажы золата збіраці.
— Не збірай, дзіцятка, не збярэш,
Толькі свае слёзанькі разальеш.

### 354. А ехала Анісся з вянца...

А ехала Анісся з вянца
Ды сеяла чорны мак з рукаўца.
— Ой, узыдзі, узыдзі,
Чорны мак.

Ой, узыдзі ўсходам зялёным,
Зацвіці цветам чырвоным,
А зялёны ўсход — то мой род,
Чырвоная макаўка — сама
малада.

### 355. Выйдзі, выйдзі, мамачка, з калачом...

Выйдзі, выйдзі, мамачка, з калачом,
Прыехала дочка з панічом.
Выйдзі, выйдзі, мамачка, са свячамі,
Мы тваё дзіцятка звянчалі.
Не так звянчалі, як сашлюбілі,
Бо мы тваё дзіцятка любілі.

### 356. Кацілася ясная зорка...

Кацілася ясная зорка
З неба да долу.
Прасілася маладая дзяўчына
З цэркві дадому:

— Вядзі мяне, дзе ты ўзяў,
Каб мой вяночак не саўяў.

Мой вяночак няхай не вяне,
Няхай мая радзіна гуляе.

Карылася дзяўчына
Мамачцы да ног.
— Карыся, карыся, маё дзіця,
Каб табе доля добрая была.

### 357. Ой, ці жаль матулю, ці не жаль...




Ой, ці жаль матулю, ці не жаль,
Ці тваё сардэнька не вяне?

Ці тваё сардэнька не вяне,
Што тваё дзіцятка не гляне?

Як села ўчора з вячора,
То сядзіць сягоння смучона.
Спусціла ачэнькі да зямлі,
Палажыла ручкі на прыпол.

Палажыла ручкі на прыпол,
Цяжанька сатхнула — божа мой!

### 358. Маманька, ужо ж я не твая

— Маманька, ужо ж я не твая.
— Дочанька, няпраўда твая.
— Маманька, там людзі былі,
Як мяне, маладую, вянчалі.
Вянчалі, вянчалі пры свячы,
Прыехалі дадому ўначы.

### 359. Прыехала дзіця з вянца...

Прыехала дзіця з вянца
Ды не прамовіць слаўца,
Жывоцік паясок ломіць,
Слаўца не прамовіць.
Паясок жыватоk цісне,
Слаўца не прапісне.
— Дзе ж ты, мая дочанька, бывала,
Што я твайго галасочку не пазнала?
— Бывала, маманька, у царкоўцы,
Там мае падружкі стаялі,
Дзе мяне, маладую, вянчалі.

### 360. Дзякуй табе, мая мамачка...

Дзякуй табе, мая мамачка,
Што ты мяне ўрадзіла
харошу.
Хараша даглядала,
Што на мяне ўсе хлопцы
Глядзяць, папы глядзяць,
Што на мяне задзівіліся
І ў кніжках памыліліся.
Сем кніг перачыталі,
Пакуль мяне звянчалі,
А восьму, маленькую, —
За мяне, маладзенькую,
Дзевяту дачытвалі,
Як мяне давенчвалі.

### 361. Прыйшла дзеванька ад вянчанейка...

Прыйшла дзеванька ад вянчанейка,
Пад калінаю стала,
Ручкі згарнула,
Важка ўздыхнула
І моцна заплакала.

Прыйшоў ды яе бацюхна:
— Чаго, дочка, плачаш?
Што ў сябе маю,
То табе даю,
А долі не ўгадаю.
А доля — не наша ўлада,
Хай табе долю бог дасць.

### 362. Прыехала дзіцятка з касцёла ды пытае...

Прыехала дзіцятка з касцёла ды пытае:
— Мамачка ці дома?
— Ой, дома мамачка, дома,
Для цябе сняданне гатуе.
Сняданне гатуе ды цябе пытае:
— Ці гарэлі ў касцёле свечкі?
— Ой, гарэлі ды палалі,
Як мяне вянчалі.
Ой, гарэлі яны сіне,
Павянчалі мяне сілаю.

### 363. Прыехала ды дзіця з вянца...

Прыехала ды дзіця з вянца,
Не прамовіла ні слаўца.
Ды не пазнала маці свайго дзіцяці:
— Ой, казала ды мая маці
Гадаваці ды не аддаваці.
А цяпер мяне аддае,
Сэрца маё разрывае,
Слёзы мае разлівае
Ды па беламу лічыку,
Нашытаму нагруднічку.

### 364. Замецена вуліца з канца...

Замецена вуліца з канца,
Прывезена ды дзеванька з вянца.
Замецена вуліца мётламі,
Прывезена дзеванька з панамі.
Замецена вуліца дзеркачом,
Прывезена дзеванька з панічом.

### 365. Сечана каліначка, сечана...

Сечана каліначка, сечана,
Ужо наша Анечка звенчана.
Пад царскім вянцом стаяла
Ды русу косаньку часала.

Ды ўпаў грабянец пад стол,
Ды ўпаў грабянец пад стол.
— Ды падай, Іванка, грабянца
Расчасаці косаньку ад вянца.

### 366. Зажыгай, маці, свечку...

Зажыгай, маці, свечку
І выходзь на сустрэчу.
Ці ўгадаеш, маці,
Ты свайго дзіцяці.

— Тады ж я ўгадала,
Як на ножкі ўпала,
Коскамі зямлю ўкрыла,
Слёзкамі ножкі ўмыла.

### 367. Ціха, не гаманіце...

Ціха, не гаманіце,
Гэта маё дзіцятка з вянчання ідзе.
Белы ручнік на ручцы мае,
Залаты пярсцёнак ды на ручцы ззяе.

### 368. Выйдзі, баценька, з бубянцамі, ключамі...

Выйдзі, баценька, з бубянцамі, ключамі,
Ужо тваё дзіцятка звянчалі.

Выйдзі, баценька, з буханцом,
Ужо тваё дзіцятка з панічом.

Прыехала Лідачка з касцёла,
Спытала маманьку, ці дома.

— Запалі, маманька, яркія свечы,
Каб было відненька, скланіўшыся нізенька.

Каб косанькі зямліцу мялі,
Маманьцы жалю задалі.

### 369. Ой, наш жаніх весел стаў...

Ой, наш жаніх весел стаў,
Ой, наш жаніх весел стаў,
Што на белым ручніку пастаяў.

З правай ручанькі персцень зняў,
Ды сабе дзевачку прыдбаў.
— Хадзі, хадзі, дзевачка, за мною,
Будзеш маёй мацеры слугою,
А мне, маладому, жаною.

### 370. А мы ў цэркві бывалі...

А мы ў цэркві бывалі,
А мы ў цэркві бывалі
Тры зеллі памянялі.
Адно зелле — рута,
Адно зелле — рута,
А другое — мята,
А трэцяе — кветкі,
Што павенчаны дзеткі.

### 371. А мы бацюшку ды ашукалі...

А мы бацюшку ды ашукалі,
Небагата за шлюб далі.
Толькі далі паўдалара
За Славіка кавалера.
Толькі далі ды паперы белай,
А ён думаў, што рубель цэлы.

### 372. Абманулі папа...

Абманулі папа,
Як малога хлопа.
Далі яму сележэчку *,
Ён думаў — бумажачка.
Далі яму тры грошы
За дзіця хароша.
Звянчалі дзеваньку ад веку
да веку
Добраму чалавеку.

### 373. Мы папа ашукалі...

Мы папа ашукалі,
Дзёшава за шлюб далі.
За пана маладога — аднаго залатога.
А за нашу паненачку —
Адну капеечку.

### 374. Каля новага двара...

Каля новага двара,
То не пчолка гула,
То Галечка плакала,
З вянца прыехаўшы,
Бацюхну да ног упаўшы:
— Ой, ты, бацюхна родны,
Развянчай жа ты мяне,
Развяжы ручкі мае.
— Ой, я рад бы развязаці,
Яшчэ радзей развянчаці.

* Сележэчка — качка.

### 375. Былі ж мы ў папа на чэсці...

Былі ж мы ў папа на чэсці,
Бачылі буянца ў хлеўцы.
Каб даўжэй пабылі,
Мы б яго спажылі.

### 376. Ляцелі павукі з навукі...

Ляцелі павукі з навукі,
Кінулі картачку на рукі.
Кінулі картачку сінюю,
Звянчалі Ірачку сілаю.
Не так сілаю — за грошы,
Бо яе Ванечка харошы.

### 377. Ой, пад мастом, пад вяльмовым...

Ой, пад мастом, пад вяльмовым
Стаялі вазы маляваны.
А на тых вазах ды пара дзетак,
Дзержуць яны па свечачцы.

— У каторага ясней гарыць?
— У Сашанькі ясней гарыць,
У Тонечкі — пагасае:
Коскі млеюць, задуваюць,
Слёзкі льюцца, залiваюць.

## ДРУГІ ДЗЕНЬ ВЯСЕЛЛЯ

## ЖАНІХ ЕДЗЕ ДА НЯВЕСТЫ

### 378. Маці сына выправажала...

Маці сына выправажала,
Яна яго ды навучала:
— Не пі, сынку, першае чаркі,
А вылі каню на грываньку,
Каб грыванька ды дубам стала,
Цешча зяця ды не пазнала,
Ды панічкам назвала:
— Я думала, што паніч едзе,
Аж гэта мой зяцюхна.

### 379. Ой, ідзі, Колечка...

Ой, ідзі, Колечка,
Цябе цесцейка чакае.
— Няхай чакае, я й буду,
Я да яго на вячэру прыбуду.
Прыехаў, за вароты схапіўся,
Свайму цесцейку
Нізкім паклонам скланіўся.

### 380. Цешча зяця злякалася...

Цешча зяця злякалася,
У клець за дзверы схавалася.
— Пастой, цешча, не лякайся,
У клець за дзверы не хавайся,
Нямнога нас прыехала:
Семсот сватоў без двух братоў
І Ванечка-сямігодачка
Між намі, як кветачка.
Дзе стане, там гуляе,
Дзе сядзе, там спявае.

### 381. Ой, з'ехаў зяць...

Ой, з'ехаў зяць
Ды на цесцеў двор,
На жалезны мост,
На тонкі абрус.
Жалезныя масты
Паламаліся,
Тонкія абрусы
Парваліся.
Жалезныя масты
Кавалі скуюць.
Тонкія абрусы
Ткачы саткуць.

### 382. Не гусі гэгалі...

Не гусі гэгалі,
Белы лебядзі.
Сватове галасілі
Ды сяла ўсё прасілі.
Пыталіся сяла,
Новенькага двара,
Надзеччына баценька.
У майго баценька
Новенькі двор,
Тынам тынаваны,
Грабелькамі выграбаны.

### 383. Не сядзі, жанішок, не сядзі...

Не сядзі, жанішок, не сядзі,
Паміж свайго роду прабяжы.
Выбірай музыку, разакі,
Выбірай жа свашкі, спявачкі,
Каб мы сталі, зайгралі,
Каб мы селі, запелі,
Бо там ды чужая старана,
Каб нам не было сорама.

### 384. Ехалі мы лесам-борам...

Ехалі мы лесам-борам,
Цераз высокія масты
Аж да Надзі ў госці.

## 385. Ой, борам, борам, барамі...

Ой, борам, борам, барамі,
Ой, борам, борам, барамі,
Выслана дарожка рублямі.
— Хто гэту дарожку высцілаў?
— Высцілаў дарожку Васечка,
Ходзячы к Наташачцы,
Дарагія падаркі насіў.
Першы падарак — пярсцёнак,
Другі падарак — конь вараны,
Трэці падарак — сам малады.

## 386. Чаму цешча не выходзіць...

— Чаму цешча не выходзіць,
Чаму зяця не вітае?
Чаму зяця не вітае:
Ці кажуха не мае,
Ці сораму не знае?

— Добры вечар, зяцю,
Як я цябе не знала,
То й зяцем не звала.
Як я цябе пазнала,
То й зяцем назвала.

## 387. Ой, братка Іванка...

Ой, братка Іванка,
Заварочвай коні.
Заварочвай коні,
Паедзем дадому.

Паедзем дадому,
Бо тут нас не ўзлюбілі.
Тут нас не ўзлюбілі
І ў хатаньку не пусцілі.

## 388. Не лякайся, цешчанька...

Не лякайся, цешчанька,
Не лякайся, родная,
Бо твой зяць едзе
Ды багата баяр вязе:

Тры ў полі ўпала,
Семсот на двары стала.
Яшчэ мы не злічылі,
Семсот і чатыры.

## 389. Чыя ж гэта радзіна...

— Чыя ж гэта радзіна
Пад караваем хадзіла?
— То Іванкава радзіна
Пад караваем хадзіла.

Наш каравай вышэй,
Наш Іванка ляпшэй.
Наш месячык ясны,
Наш Іванка красны.

— Наш каравай вышэй,
Наша Валечка ляпшэй.
Наша зоранька ясна,
Наша Валечка красна.

То Валечкіна радзіна
Пад караваем хадзіла:
— Наш каравай вышэй,
Наш і род дружней.

## МАЛАДУЮ «АСЫПАЮЦЬ»

### 390. Ой, ступіла залатым абцасам на ўслон...

Ой, ступіла залатым абцасам на ўслон
І сыпнула шчасцем, доляю цераз стол.
— Я ж была мяшчаначка, а ў сям'і сяляначка,
Я ўмела калачы пячы, я ўмела таргаваці,
Я ўмела таргаваці,
Маладую дзеўку аўсом асыпаці.

### 391. Не над рэчкаю стаю...

Не над рэчкаю стаю
Ды не золата лічу.
Не ў картанькі іграю —
Маладую асыпаю.

## БРАТ «ПРАДАЕ» СЯСТРУ

### 392. Браток, браток саколю...

Браток, браток саколю,
Пасядзі гадзінку са мною,
Бо тут прыехаў пышны пан,
Ён цябе скупіць, сядзе сам.
Не зробіш таго косячы,
Што ля мяне седзячы.

### 393. Браточку-наместнічку...

Браточку-наместнічку,
Сядзь сабе ў крэслечку,
Ды й умей таргаваці,
Як сястру прадаваці.
Не прадай яе за грош,
Не прадай яе за грош.
Не прадай яе за два,
А за чатыры залатыя.

### 394. Месяц, месяц, Колечка...

Месяц, месяц, Колечка,
Чаго баішся ступіці,
Брата ад сястры скупіці?
Кладзі грошы на талер,
Бяры брата за каўнер
Ды і цягні яго за парог.

## ГОСЦІ Ў ДОМЕ НЯВЕСТЫ

### 395. Застукалі конікі на памосце...

Застукалі конікі на памосце,
Прыехалі па Галечку госці.

— Замкні мяне, мая мамка, у каморы,
Каб не ўзялі тыя госці мяне з сабою.

— Нашто я цябе, дзіцятка, гадавала,
Каб у каморы запірала.

### 396. Сені, за сеньмі...

Сені, за сеньмі
Новымі — калодзеж.
Там Надзечка
Мёд-віно брала,
Сватоў частавала:
— Мёд-віно піце,
Мяне не бярыце.
— Мёд-віно вып'ем,
Цябе возьмем.
Было на даліну
Валы не гнаці,
Колечкі руку не падаваці.

### 397. Я не хачу, маладзенькая...

Я не хачу, маладзенькая,
Ні піці, ні есці,
Каб жа мне, маладзенькай,
Каля музыкі сесці.

### 398. Кавала, зязюлька, кавала...

— Кавала, зязюлька, кавала,
Што табе, Надзечка, казала?
— Казала, баценьку, казала,
Што заўтра будуць госці ў нас,
Што прасіць будуць мяне ў вас.
Ды ты, баценьку, не бяры,
Лепша ж я ў вас, як яны.

### 399. Няпраўдзівая калінка...




Няпраўдзівая калінка *
Казала, цвіцець не буду,
Казала, ягад не будзе.
Аж на ёй цвету бяленька,
Аж на ёй ягад чырваненька.
Няпраўдзівая дзяўчынка
Казала, замуж не пайду,
Казала, хлопца не люблю.
Аж яна яго любіла,
Сыры ў масле тапіла,
Гэтым хлопчыка прыўчыла.

---

* Кожны першы радок паўтараецца.



*Спявачка з в. Парэчча (Пінскі раён)*

### 400. Каб я знала, што ў бацэнькі болей не буду...

Каб я знала, што ў бацэнькі болей не буду,
Я б не сеяла зялёную руту,
Я б пералазы загарадзіла,
На зялёную руту конікаў пусціла:

— Ешце, ешце, конікі, зялёную руту,
Бо я ўжо ў бацэнькі доўга не буду,
Адзін дзянёчак, адзін вечарочак.
Ужо я ў бацэнькі апошні часочак.

### 401. Ой, мамка, мая кветка...

Ой, мамка, мая кветка,
Не аддавай замуж улетку.
Ды аддай мяне ўзімку,
Штоб сабрала ўсю сілку.
У свёкра ніўка вялікая,
У мяне сілка маленькая.

### 402. Як у полі дуб ды бяроза...

Як у полі дуб ды бяроза,
А ў садзіку чырвоная роза.
Пад бярозаю Маруся сядзела,
З розаю гаварыла:
— Скажы мне, вінаград-роза,
Пад свой ліст шырокі,
Пад корань глыбокі
Я пайду ў чужыя людзі?
Ці ў чужых людзях я жыць
буду,
Чужым людзям наравіць буду?

### 403. Гуляй, дзеўка, красуйся...

Гуляй, дзеўка, красуйся,
Яшчэ замуж не суйся.
Бо замужам трэба знаці:
Позна легчы, рана ўстаці.
І свякроўцы гадзіці,
Як па брытве хадзіці.

### 404. Пагуляйце, дзевачкі...

Пагуляйце, дзевачкі,
Пагуляйце ў свайго бацюшкі.
Пагуляйце ў свайго бацюшкі,
У сваёй роднай матушкі.
Пойдзеце ў чорныя людзі —
Мінецца гулянне.
Мінецца гулянне,
Дзявоча красаванне.

### 405. А ці не будзеш ты, Анечка, жалаваці...

А ці не будзеш ты, Анечка, жалаваці,
Што мы будзем па вуліцы гуляці.
Як мы будзем па вуліцы гуляці,
Ды ў твае акенцы паглядаці.
Ды ў твае акенцы паглядаці,
Ды ў твае мамачкі пытаці:
— Ох, ці дома Анечка, ці няма яе,
Ці з другімі хлопцамі гуляе?
— Няма ж нашай Анечкі, ды не будзе,
Узялі нашу Анечку добрыя людзі.
Прыйдзі, прыйдзі, маё дзіця, у гасціну,
Ды я ўжо навяжу піражкоў хусціну.

### 406. Чаму ў цябе, Ганначка, розуму не стала...

Чаму ў цябе, Ганначка, розуму не стала,
Чаму ты дзеўкай не дзевавала?
Дзевачкі пойдуць у лес па ягодкі,
А ў цябе будзе многа работкі.
Дзевачкі пойдуць у лес па кветачкі,
А цябе абступяць малыя дзетачкі.

## 407. Не кукуй, зязюлька, у зялёным лесе...

Не кукуй, зязюлька, у зялёным лесе,
Яшчэ накукуешся ў зялёнай дуброве.
Не плач, Танечка, у свайго бацenькі,
Яшчэ наплачашся ў сваёй свякроўкі,
Яе парогі пераступаючы
І яе наровы пераймаючы.
— Пераб'ю парогі на тры гваздочкі,
Перайму наровы за тры дзянёчкі.

## 408. Ой, знай, дзеванька...

Ой, знай, дзеванька,
Ой, знай, дзеванька,
Ой, знай, дзеванька,
Як свякроўцы гадзіці.

Устань раненька,
Умойся бяленька,
Умойся бяленька,
Пакланіся нізенька.

І старэнькаму ж, і маленькаму ж,
Ды яшчэ таму, што на прыпечку,
Ды яшчэ таму, што ў калыбелі,
Ды на бяленькай пасцелі.

## 409. У варот вярба стаяла...

У варот вярба стаяла,
Са двара дачка з'язджала.
Са двара дачка з'язджала,
Вярхушку з вярбы сарвала.

— Стой, мая вярба, без верху,
Жыві, мамачка, без мяне.
Без мае русае касы, без маёй красы,
Без шаўковай уплётачкі.

## 410. Галя з двара з'язджала...

Галя з двара з'язджала,
З бярозы вяршок сарвала.

— Стой, мая бяроза, без верху,
Жыві, мамачка, без мяне.

Бяроза без верху павалілася,
А па мне мамачка зажурылася.

## 411. З'язджала Галечка...

З'язджала Галечка
Са двара далоў,
Зламала ў бярозкі
Верх далоў.

— Расці, мая бярозка, без верху,
Жыві, мая мамачка, без мяне.
Без русай касы маёй,
Без шаўковага ўплёту.

Павешу я ўплёт на прыплот,
Куды маёй мамачцы ў клець хадзіці.
У клець ідучы — убачыць,
А з клеці ідучы — заплачыць.

## 412. Ой, у лузе ды каліна стаяла...

Ой, у лузе ды каліна стаяла,
Ой, у лузе ды каліна стаяла.
Маладая Анечка яе ламала.
Яна к свайму беламу лічыку каліну раўнавала:
— Каб я была такая, як тая каліна чырвоная!
— Дальбог, дальбог, маё дзіця, такая будзеш,
Калі ў мяне яшчэ гадок паходзіш.
А калі пойдзеш ад мяне,
То завянеш, як рыбка,
То збялееш, як ліпка.

## 413. Каліна-маліна, не стой за ракою...

Каліна-маліна, не стой за ракою,
Не стой за ракою, не раўняйся са мною.
Трэба было раўняцца,
Як у мамачкі жыла.

Як у мамачкі жыла,
Бялюсенька хадзіла.
Бялей твайго цвету,
Чырваней тваіх мар.

### 414. Ой, ступіла Ніначка на парог...

Ой, ступіла Ніначка на парог
Ды зламіла з каліначкі вяршок.

— Ой, жыві, жыві, каліначка, без вяршка,
Ой, жыві, жыві, мамачка, без мяне.

Як каліначка без вярха,
Так будзе мамачка без мяне.

### 415. Села Танечка за сталом...

Села Танечка за сталом,
Паклала ручачкі на стале.

— Ручачкі мае белыя,
Каму вы цяпер мілыя?

Калі старому — крый, божа,
Калі Колю — дай, божа.

### 416. Разжалілася каліна...

Разжалілася каліна,
У лузе круглу ноч стоячы,
На ўсе дрэвы гледзячы.

Разжалілася Танечка,
У свайго бацюхны жывучы,
На ўсіх дзевак гледзячы.

### 417. Надзечка на выходзе...

Надзечка на выходзе,
Пасадзі вішаньку ў агародзе.
Расці, вішанька, высокая,
Жыві, Надзенька, усім добрая.

Расці, вішанька, пагінайся,
Рабі, Надзенька, папраўляйся.
Каб і свёкру і свякроўцы
наравіла
І вячэру смачна наварыла.

### 418. Як заржалі сівы коні...

Як заржалі сівы коні,
Як заржалі сівы коні.
Ой, сівы коні, ой, у полі.
Як зачула дзеўка Валечка ў каморы:

— Уставай, уставай, мамка, раненька,
Палівай руту-мяту часценька.
Ад'язджаю, мамка, ад цябе,
Пакідаю кветкі алы табе.

### 419. Стукнулі, грукнулі на дварэ...

— Стукнулі, грукнулі на дварэ,
Паглядзі, мамачка, ці ка мне.
— Па цябе, дачушка, па цябе.
— Гатуй, мамачка, кублік мне.

— Едзь, дачушка, без кубла,
Ты ж мае кудзелькі не скубла.
— Я скубла, скубла, шамацела,
За такога п'яніцу ісці не хацела.

### 420. А ў нядзелю рана...

А ў нядзелю рана
Сіне мора грала.
Выпраўляла маці дочку
У чужу староначку.

У чужу староначку,
Ды ў чужыя людзі:
— А хто ж цябе, маё дзіця,
Даглядаць там будзе?

### 421. Калі б знала я...

Калі б знала я,
Калі б ведала
Сваю горкую долю.

То б гуляла я
У сваёй мамачкі
Дзеўкай маладою.

### 422. Плакала Лідачка ў святліцы...

Плакала Лідачка ў святліцы,
Плакала Лідачка ў святліцы,
Прыкладала галованьку к лавачцы.
Цешылі яе сястрыцы,
Цешылі яе родненькія.

— Цешце не цешце, сястрыцы,
Цешце не цешце, родненькія,
Не будзе свякроўка, як маці,
Не будзе раненька будзіці,
А пойдзе к суседкам судзіці.

### 423. Кукавала зязюленька ў садочку...

Кукавала зязюленька ў садочку,
Прыпомніла Ганначка тую ночку.
Кукавала зязюленька ў бару,
Успомніла Ганначка тую пару.

Не кукуй, зязюленька, у садочку,
Не ўспамінай, Ганначка, тую ночку.

Не кукуй, зязюленька, у бару,
Не ўспамінай, Ганначка, тую пару.

Табе, маладой, у зялёны сад не хадзіці,
Табе, маладой, у зялёны сад не хадзіці,
Табе, маладой, русую косаньку не насіці,
Русу косаньку не насіці.

### 424. Ой, прасіце, дзеўкі, бога...

Ой, прасіце, дзеўкі, бога,
Каб дуга паламалася.
Каб дуга паламалася,
А Ганначка нам засталася.

Наша дуга не паломіцца,
А Ганначка не застанецца.
Наша дуга яшчэ новая,
А Ганначка ды й вясёлая.

### 425. Чаго сядзіш, што думаеш, Ніначка?

— Чаго сядзіш, што думаеш, Ніначка?
Хто ж за табой за братачку паедзе?
Твой братачка, твой родненькі не хоча.
— А пусціце мяне, маладу, з-за стала,
Пайду я па новым двару пахаджу,
Свайго братачка, свайго роднага ўпрашу:
«Паедзь, паедзь, мой братачка, за мною.
Табе ж будзе паважанька са мною».

### 426. Сабраліся ўсе галачкі...

Сабраліся ўсе галачкі,
Населі на палачкі,
А зязюля закукавала.

Сабраліся ўсе падругі,
Песню заспявалі,
А я заплакала.

Каб быў у мяне родны татка,
Дык я б паслала ў луг па каліну.
Але таткі няма і каліны няма.

Усе падругі заспявалі,
Усе падругі заспявалі,
А я заплакала.

### 427. Выдаюць цябе замуж чужыя людзі...

Выдаюць цябе замуж чужыя людзі,
А не родна маці.
Засталася сірацінай,
Некаму гадаваці.

Будзь жа добрай жаною
Ды слухайся мужа.
А сіроча нядоля
На ўсё жыцце тужа.

### 428. Нявесціна матка па сенях ходзіць...

Нявесціна матка па сенях ходзіць,
Рукі ломіць:

— Я і гадавала, я і карміла,
І мая работа ўся не роблена.

Няма каго пасылаці,
Няма каму загадаці.

### 429. Дзіцятка маё дарагое...

Дзіцятка маё дарагое,
У чужых людзях будзь пакорнае.
Будзь пакорнае і ласкавае,
Будзь ласкавае і паклоннае.

Будзь паклоннае і жаданае,
Будзь жаданае і дагадліва.
Будзь жаданае і дагадліва,
На ўсе справы спахватліва.

### 430. Рана, рана, ранюсенька...

Рана, рана, ранюсенька
Ты, Галюхна, не лякайся
Ды ў світу адзявайся.

Рана, рана, ранюсенька
Галю ад бацькі адлучаюць
Ды к Васільку далучаюць.

Рана, рана, ранюсенька
Галю ад мацеры адлучаюць
Ды к Васільку далучаюць.

Рана, рана ранюсенька
Ты, Галюхна, не лякайся
Ды ў світу адзявайся.

Рана, рана, ранюсенька
Ты ў світу адзявайся
Ды к Васільку сабірайся.

### 431. Ой, рэчка, рэчка Славечна...

Ой, рэчка, рэчка Славечна,
Ты ўгору цякла, быстра ішла,
А сёння цячэш, ціха ідзеш.

Ой, дзеўка, дзеўка Анечка,
Ты ўчора была вясёлая,
А сёння сядзіш смутная.

— Ой, як жа мне вясёлай быці,
Як асела мяне чужына
Ды ўся Коліна радзіна.

### 432. Ужо ты, Манечка...

Ужо ты, Манечка,
Не галёкай з намі.
Ужо ты галёкай
Са старымі бабамі.

Табе не хадзіці
З намі ў гарохі,
Табе мінуліся
Дзявоцкія смехі.

Табе не хадзіці
З намі ў ягады,
Бо табе мінуліся
Дзявоцкія гады.

### 433. Не сядзі, Мішачка, не сядзі...

Не сядзі, Мішачка, не сядзі,
Ды бяры вішанькі ў кішэні.
Ды бяры вішанькі ў кішэні,
Ды давай цешчаньцы па жмені.
Цешчанька вішаняк скаштуе
І табе дочаньку даруе.
Цешчанька вішаняк спытае
І табе дочаньку аддае.

### 434. Просім цябе, малады Ванечка, з павагай...

Просім цябе, малады Ванечка, з павагай,
Каб не было нашай Ганначцы знявагі:

Каб не стаяла цёмнай ночкай пад акном,
Каб не ўцірала дробныя слёзкі рукавом.

Каб не была падпаветачка за хатку,
Каб не была суседачка за матку.

### 435. Бяры, зяцю, дачку...

Бяры, зяцю, дачку
Ды й умей шанаваці,
Не давай збыткаваці
Ні старому, ні малому,
Ні самому маладому.

Каб басая не хадзіла,
Пасталоў не насіла.
Пасталоў не насіла,
А насіла чаравічкі казловы
І панчошкі шаўковы.

### 436. Збірай, дачка, пасталы і анучы...

Збірай, дачка, пасталы і анучы,
Каб не плакала, ад бацькі ідучы.
Збірай з сабою пасталы, валокі,
Каб не напалі на цябе ўрокі.

### 437. Штосьці ў лесе зашумела...

Штосьці ў лесе зашумела,
Штосьці ў лесе зашумела,
Сасна з ветрам гаварыла.

— Ох ты, вецер, мой вецер,
Не дуй, ветру, нада мною,
Нада мною, зеляною.

Штосьці ў каморы загрымела,
Штосьці ў каморы загрымела,
Цешча з зяцем гаварыла:

— Ох ты, зяцю, ты мой зяцю,
Не карай майго дзіцяці,
Не траць маладосці.

Пускай часта ка мне ў госці,
У гадочак хоць разочак,
А ў нядзельку — на часочак.

### 438. Ідзе цешчачка ў камору...

Ідзе цешчачка ў камору,
Зяць месяцам за ёю:
— Ой, цешчачка, мая матанька,
Што ты мне падаруеш?

— Дарую, зяцю, дарую,
Сундук плацця гатую.

— Ой, цешчачка, мая матачка,
Я за гэта не дзякую.

— Дарую, зяцю, дарую,
Табе дочачку дарую.
— Ой, цешчачка, мая матанька,
Я за гэта аддзякую.

### 439. Ой, маці, маці, я твой зяць...

Ой, маці, маці, я твой зяць,
Буду я тваю дочку шанаваць:
То лышчынкаю, то дубінкаю,
Каб была дочка гаспадынькаю.

### 440. Закідай, мамка, жар, жар...

Закідай, мамка, жар, жар,
Будзе табе дачкі жаль, жаль.
Закідай, мамка, попел,
Мы тваю дачку ўхопім.

Ухопім ручкамі,
Павязём конікамі.
Ухопім ды й павяжам,
Нічога вам не скажам.

Завязём і будзем вучыці,
Завязём і будзем вучыці:
Запражом у барану
І будзем валачыці.

### 441. Чаму, Лідачка, не вячэраеш...

Чаму, Лідачка, не вячэраеш
Бацькавай вячэры?
Бо паедзеш да свёкарка,
Не будзеш вячэраці:
Самі сядуць вячэраці,
Цябе пашлюць па ваду.
Вады прынясеш, падасі піці,
Станавіся лыжкі мыці.
Лыжкі памыла, папаласкала,
Моцненька заплакала.

### 442. Чаго сядзіш, не вячэраеш...

Чаго сядзіш, не вячэраеш
У сваёй роднай мамачкі?
Ты думаеш, павячэраеш
У ліхой свякровачкі?
Цябе, маладу, пашлюць па ваду,
Самі сядуць вячэраці.
Прынясеш вады, на сябе бяды,
Скажуць лыжачкі мыці.
— Лыжачкі мыю, слёзачкі лію.
Гэта ж мая вячэрачка.
Вазьму платочак, пайду
ў куточак —
І ўся мая вячэрачка.

### 443. А ты будзеш па мяне, мамка, бедаваць...

А ты будзеш па мяне, мамка, бедаваць,
Калі я буду ў чужой староны гараваць?
Пойдзеш на роўнае поле жыта жаці,
А я буду ў быстрай рэчцы ваду браці.
Ты, мамка, запяеш, а я заплачу слязою,
Так і сайдуцца нашы галасы з табою.

### 444. Ці я табе, мамачка, надаела...

Ці я табе, мамачка, надаела,
Што ты мяне аддаеш за дзеда?
Ці я табе кашулечкі не прала,
Ці я табе пасцелечкі не слала?

Прала табе кашулечку бяленьку,
Слала табе пасцелечку мякеньку.
Прала табе кашулечку на моры,
Слала табе пасцелечку ў каморы.

### 445. Ці я табе, бацюхна, не міла...

Ці я табе, бацюхна, не міла,
Што ты аддаеш за дзеда?
Ці я табе загонцы не жала,
Ці я табе кашульку не прала?
Жала табе загонцы вярненька,
Прала табе кашульку бяленька.

### 446. Ты казала, мамка...

— Ты казала, мамка,
Што не збудзеш мяне.
Прыступісь да стала,
Падзівісь на мяне.

— Хоць прыступлюся,
Не падзіўлюся,
Дачка мая міла.

— Хоць міла, хоць не міла,
Я табе не ўгадзіла:
Ні ў полі, ні на волі.

### 447. Я табе, мая мамка, не дзіцятка...

— Я табе, мая мамка, не дзіцятка,
Што адпраўляеш у прочкі сярод ночкі.

А ў ручкі свечкі не даеш,
А ўслед праваднічка за мной не шлеш.

— А вось табе свечачка — лес і месечка,
А вось табе праваднічок — малады Іванька.

### 448. Ой, жаль мне, матухна, на цябе...

— Ой, жаль мне, матухна, на цябе.
Ой, жаль мне, матухна, на цябе.

Насупраць ночкі жэніш,
Ды праваднічка не шлеш.

— Даю табе праваднічаньку — сястрычаньку,
Даю табе праваднічка — брацейку.

## 449. Ці я табе, мамачка...

Ці я табе, мамачка,
Дрэнна рабіла,
Што ты аддаеш мяне
Ў чужыя людзі?
Ці ў цябе, мамачка,
Хлеба не стала?
Калі хатачка мала,
Трэба растачыць.
Калі хлеба мала,
Трэба дакупіць.

## 450. Убіраймася, ды не гаймася, бо ўжо свет

Убіраймася, ды не гаймася, бо ўжо свет.
Паспяшаймася ў Каралёўшчыну на абед.
А ў Каралёўшчыне мёд, гарэлачку п'юць,
А нам тут і горкую не даюць.

## 451. Ды бацюхна родны...

Ды бацюхна родны,
Частуй мае госці,
Каб мяне не дакаралі
У вялікай дарозе.
У вялікай дарозе,
У свякроўкі на парозе.

## 452. Ды добра ж табе, дзевачка...

Ды добра ж табе, дзевачка,
Што ў цябе свая маці.
Дзеліць падарачкі
З тонкай кітаечкі.

## 453. Колькі ў мамы не працуеш...

Колькі ў мамы не працуеш,
Яна лішняга не дасць:
Дзве падушкі, дзве пярынкі
І саломенны матрац.

## 454. Ой, пасею жыта...

Ой, пасею жыта
Па-над асакою.
Ці не будзе жалка
Вам, мамка, са мною?

— Ой, жалка не жалка,
Само сэрца гляне.
Ой, хто ж мяне, дочка,
На старасці дагляне?

— Пакідаю, мамка,
На меншага брата,
Будзе ў вас, мамка,
Невясёла хата.

Грайце, хлопцы, у трубы,
Біце ў барабаны.
Біце ў барабаны,
Бо я ўжо сабрана.

### 455. За лес сонца заходжвае...

За лес сонца заходжвае,
Дачку мамка праводжвае:
— Зайдзі, дочанька, за лясочак,
Падай жа мне галасочак.

Зайшла дачка за горачку,
Падала мамачцы гаворачку.
Зайшла дачка за лясочак,
Падала галасочак.

### 456. Азірніся, маці...

Азірніся, маці,
Ці ўся сям'я ў хаце?

Ці вяліка шчарбіна
Без аднаго сем'яніна?

— Яна не вяліка, не малая,
Але ж хата глухая.

### 457. Запалі, мамка, свечкі...

Запалі, мамка, свечкі,
Паглядзі ў запечча.

Ці вяліка шчарбіна
Без твайго сем'яніна?

Да ці хараша ў хаце
Без твайго дзіцяці?

### 458. Кальнула бацьку ў грудзі...

Кальнула бацьку ў грудзі,
Што бяруць дзеўку ў людзі.

А брат, што воўк, вые,
Што сам лыжкі мые.

А мацеру — у пяты,
Няма каму плацце праці.

А сястрыца галосіць,
Што сама ваду носіць.

А браціха маўляе,
Што залоўкі не мае.

### 459. Хадзіла дзяўчына па двару...

Хадзіла дзяўчына па двару
Ды гадала загадачку адну.
Ды гадала загадачку адну:
Ці ўсё ж я ад бацькі забяру?

Пакідаю слядочкі па двары.
Хто мае слядочкі пазнае,

Хто мае слядочкі пазнае,
Той мяне, маладую, успамяне.

Выйшла матуля і пазнала:
— Тут маё дзіцятка хадзіла.
Тут маё дзіцятка хадзіла,
Золата-ключык згубіла.

### 460. Пазнаеш, мамка, дачку аддаўшы...

Пазнаеш, мамка, дачку аддаўшы,
Дачку аддаўшы, а чужую ўзяўшы.
Ды будзеш хадзіць рана па вадзіцу,
Ды будзеш страсаць рана расіцу.
Ды будзеш хадзіць, ды не находзішся,
Ды будзеш страсаць, ды не настросішся.

### 461. Ой, знаці, знаці...

Ой, знаці, знаці,
Што няма дочкі ў хаце:
Ложачкі пад лаўкаю
Пазарасталі мураўкаю.

### 462. Ды хвалілася мамачка, што дачка была...

Ды хвалілася мамачка, што дачка была,
А цяпер застаецца ёй печ ды дуда.
Ох, дуда будзе іграці,
А печка будзе гуляці.

### 463. Паслухай, дзяўчынка, што твая мамка гаворыць...

Паслухай, дзяўчынка, што твая мамка гаворыць,
Праціў ночкі цямнюсенькай вон гоніць.
— Хадзі, хадзі, дачушка, павячэраем з табою,
Павячэраўшы, падзелішся са мною.
— Табе, мамка, твая хатка, камора,
А мне, маладой, куфар адзёжы ды карова.

### 464. Давай, мамка, павячэраем...

Давай, мамка, павячэраем,
Павячэраўшы, падзелімся:
— Табе, мамка, уся худобанька,
А мне скрыня ды й каpraванька.
Табе, мамка, уся паселенька,
А мне скрыня ды й пасцеленька.

### 465. Хадзем, мамка, у камору...

Хадзем, мамка, у камору,
Падзелім дабро з табою:
Табе, мамка, ніт і бердзечка,
А мне, мамка, палаценечка.

Табе, мамка, навойцы,
А мне, мамка, сувойцы.
Табе, мамка, сені, хата, камора,
А мне, мамка, скрыня, пярына, карова.

### 466. Зялёны рамон...

Зялёны рамон
Па надворыйку сцелецца.
Маладая Марыйка
Са сваёй мамачкай дзеліцца:

— Табе, мамачка, адна
кашулька,
А мне дзве,
Бо я паеду ў чужыя людзі,
А ты не.

Сягоння мае, мая мамачка,
Каляды.
Давай пашчытаемся, дарагая,
За гады.

Што ні год, ні два табе
Рабіла,
Проціў зімачкі стала табе
Няміла.

### 467. Наша маладая, як сыр белы...

Наша маладая, як сыр белы,
А ваш малады, як пень гарэлы.
Наша маладая, як ластаўка,
А ваш малады, як засланка.
Наша маладая, як нітачка,
А ваш малады, як шкарпэтачка.

### 468. Наша маладая бела, як дзень...

Наша маладая бела, як дзень,
А ваш малады чорны, як пень.
Наша маладая — сыр наліты,
А ваш малады — мех надуты.

### 469. У нашага жаніха — сокала вочы...

У нашага жаніха — сокала вочы,
Ён не баіцца цёмнай ночы.
— А чаго баяцца цёмнай ночы:
Конь пада мною,
Бог нада мною,
А маладу дзеваньку водзяць за мною.

### 470. Хваліліся сваты, што яны багатыя...

Хваліліся сваты, што яны
багатыя,
А ж яны скупаватыя.

На шляху стаялі
Ды старцаў распіналі,
Ды дружак даравалі.

### 471. Нашаму княжому...

Нашаму княжому
Чубы ды ўрэзалі,
На вароцех ды павесілі:

Хто ідзе пытае:
— Чый-та чуб лятае?

### 472. Наша маладая...

Наша маладая,
Як роза садовая.

А ваш малады,
Як пень баравы.

### 473. Ваша маладая...

Ваша маладая —
Чубатая, лупатая.
Тоўста прала,
У плот пакідала,

Яршом прыбівала.
А ў плот каламі,
А з плота — валамі.

### 474. Наша маладая...

Наша маладая —
Работніца.
Тонка прала,

Звонка ткала,
Харашэнька бяліла,
Увесь род весяліла.

### 475. У нашага свата свадзьба была...

У нашага свата свадзьба была,
Засталася свату печ ды руда.

Засталася свату печ ды руда,
А нам жа дзевачка малада.

### 476. Разганяйся, маці...

Разганяйся, маці,
Па вялікай хаце.

Ад кута да кута
Будзе табе пакута.

Аб печ галавою,
Аб запечак нагою.

### 477. Ды падзякуем свату...

Ды падзякуем свату
За паўнюсеньку хату.
Печ яго пабялёну,
Чэсць яго ды кахану.

И той, што пайшла,
Угашчэнне панясла,
Бо яна добра падавала
І вельмі смачна ўгашчала.

### 478. Ды падзякуем свату...

Ды падзякуем свату
За паўнюсеньку хату.
Ды судзі, божа, свату
Ды сына жаніці.

Ды сына жаніці,
А дочкі аддаваці.
Дочкі аддаваці
І нас на вяселле звацi.

### 479. А ў нашага свата...

А ў нашага свата
Чэрчаная хата.
Чэрчаная хата
Чырчыкам абчэрчана.
Чырчыкам абчэрчана,
Калінаю абсаджана.
Калінаю абсаджана,
Каля хаты мята.

Каля хаты мята,
А ў хаце багата.
А ў хаце багата,
Каля хаты зелле.
Каля хаты зелле,
А ў хаце вяселле,
А ў хаце вяселле.

### 480. У нашага свата...

У нашага свата
Святліца — не хата.
Печ яго маляваная,
Чэсць яго каханая.

Дзе бывала, не бывала,
Такой чэсці не відала,
Як у сваценкі свайго,
Так і ў святліцы яго.

### 481. Ой, у нашага свата...

Ой, у нашага свата
Святліца, а не хата.

Ён кудрамі патрасе,
Нам гарэлкі прынясе.

### 482. Ой, у нашага свата...

Ой, у нашага свата
Ды й харошая хата:

Калінаю абтыканая,
Людзьмі ўхвалёная.

### 483. У нашага свата...

У нашага свата
Новая хата.

Сені із бярозы,
Гуляем цвярозы.

### 484. А ў нашага свата харошая хата...

А ў нашага свата харошая хата,
Чэрчыкам абсыпана,
Калінаю абтыкана.

А ў нашага свата вясёлая хата,
А сені з бярозы,
Госцейкі цвярозы.

### 485. А ў нашага свата...

А ў нашага свата
Ды харошая хата.

Каля печы румяненька,
А на стале каханенька.

Харошая гаспадыня
Ды добра наварыла.

### 486. У нашага свата лысая галава...

У нашага свата лысая галава,
Добра на ёй боб малаціць,
Нікуды зерне не паляціць:

Ні ўбок, ні ў старану,
А ў сватаву галаву.

### 487. А на свацці кашуля...

А на свацці кашуля
Сто залатых каштуе.

— А дзе, сваццця, пакупала?
А дзе, сваццця, вышывала?

— Я ў Вільні на рыначку пакупала,
За сто залатых атрымала.

### 488. Мая сваценйка, якая ты прыгожая...

Мая сваценйка, якая ты прыгожая,
А дзе ж ты радзілася, дзе бялілася?
А на сваццi кашуля
Сто залатых каштуе.
А дзе ж яна куплялася,
Дзе вышывалася?

### 489. Паехалі, як вочачкі...

Паехалі, як вочачкі,
Прыехалі, як дошчачкі.
Паехалі, як палаценца,
Прыехалі, як вераценца.

### 490. Ды казалі нам людзі...

Ды казалі нам людзі,
Што нашы свахі-няўдахі.
А нашы свахі пераяслаўкі
Ды лятаюць, як ластаўкі.

### 491. Ой, сватка, ты харош...

Ой, сватка, ты харош,
Белы твар, доўгі нос.
Пасыпце канапель,
Хай дзяўбе, як журавель.

### 492. А сват сваццi сплёў лапці...

А сват сваццi сплёў лапці
З доўгіх лык.
Надулася наша сваццяя,
Як індык.
Сваццяя бела на покуце сядзела.
— Ды дзе, сваццяя, бялілася?
Ды дзе, сваццяя, сушылася?
— На морайку бялілася,
На сонейку сушылася.

### 493. Ехалі баяры ў сераду...

Ехалі баяры ў сераду,
Ехалі баяры ў сераду,
Маладзенькі Іванка — спераду.
А ў свата — не крыта хата,
Няма ні клеці, ні павеці,
Няма дзе суседа дзеці.

### 494. А ў нашага свата...

А ў нашага свата —
Святліца, не хата.
Печы пабялёны,
Чэсцю хвалёны.
Сені ды бярозавы,
Прыданачкі ды цвярозы.

### 495. Горды, горды сват, горды...

Горды, горды сват, горды
Панадуваў морду.
Як мыш над крупамі,
Так сват над дзяўкамі.

А сват кішэню верне
Ды знайшоў ячнае зерне.
Палажыў на талерцы,
А сам плача па гарэлцы.

### 496. Прыйшоў на вяселле наш сваток...

Прыйшоў на вяселле наш сваток,
Павязаўшы крыжамі ручнічок.
А казалі, што сват вельмі харош,
Аж у свата доўгі буслаў нос,
А ў свата лысая галава
Ды казліная рыжая барада.
Плавае па хаце, як таран,
Лыпае вачыма, як баран.
Калі, сват, гарэлкі не дасі,
Караваю трасцу ты з'ясі.

### 497. Пойдзем ды паглядзім...

Пойдзем ды паглядзім,
Пойдзем ды паглядзім.
Ён задам стаіць, як паніч,
А спераздзі зайсці — свіны лыч.

Аўсянае лічыка, грэцкі нос,
Чорт яго ведае, дзе ён рос.
Ці на сметніку валяўся,
А нашай Галечцы спадабаўся.

### 498. Нашы свахі — чохі, чохі...

Нашы свахі — чохі, чохі,
Пагубілі панчохі.
Пагубілі панчохі,

Самі пешкі пайшлі,
А маладога ў мяшку няслі,
Ногі тырчалі, сабакі гірчалі.

### 499. Нашы сваты хваліліся, што багатыя...

Нашы сваты хваліліся, што багатыя,
Аж яны скупаватыя.
Пры шляху стаялі,
Старцоў разбівалі.
Разбілі старчышча,
Найшлі шаляжышча.

### 500. Нашы свашачкі — малы пчолкі...

Нашы свашачкі — малы пчолкі,
У іх языкі, як качолкі.
Брашыце, брашыце,
Аб кол языкі чашыце.

### 501. Наш сваток, як чаранок...

Наш сваток, як чаранок,
Выстаўляе вочы, як чарток.
Ён клюе, як верабей,
А скача, як белка.
Скача, як белка,
І плача, як дзеўка.

### 502. Дзе вы, свахі, валачыліся...

Дзе вы, свахі, валачыліся,
Што па пояс памачыліся?
Ці вы сена касілі,
Ці вы хлеба прасілі?
Ці вы ў саломе начавалі,
Мышы вушы паад'ядалі?

### 503. Як у нашага свата...

Як у нашага свата
Ды дужа новая хата.
І вуглы цёсаны,
І мы, госці, прошаны.
Як у нашага свата — вуглы рагаты,
А мы, сваты, таксама багаты.

### 504. Пышна цешча, пышна...

Пышна цешча, пышна,
Проці зяця не вышла.
А на зяця ды мяцель мяце,
Дробны дождык ідзе.
Крыйся, зяцю, крыйся:
Акунямі, бабрамі, маладымі сватамі.

### 505. Наш княжок лахман...

Наш княжок лахман,
Мякінаю напхан.
Хто яго паварушыць,
Той вочы запарушыць.

### 506. У старшага дружка — лыса галава...

У старшага дружка — лыса галава,
А ў малодшага — рыжа барада.
У малодшага — рыжа барада,
А ў сярэдняга — нага крыва.
Крывою нагою — жар грабці,
Рыжаю барадою — печ мясці,
А на лысай галаве — боб малаціць,
Нікуда зярнятка не ўляціць.

### 507. Старшая дружка — кучка...

Старшая дружка — кучка,
А другая — каназубачка,
А трэцяя, што па лесу ходзіць, —
Ґ вечару сына родзіць.

### 508. Цесць, мой бацюхна...

Цесць, мой бацюхна,
Пускай нас дадому.
Цяпер ночка цёмная,
А дарожка доўгая,
Штоб мы не зблудзілі
І чаго не згубілі:
Ні скрыні, ні пярыны,
Ні маладой гаспадыні.
Бо як скрыню згубім,
То другую зробім.
А як маладую згубім,
То другой не знойдзем.

### 509. Сабірайся, Танечка, з намі...

Сабірайся, Танечка, з намі,
У нас дзела само спорыцца:
Мяцель хату сама мяце,
Мядзведзь ваду носіць,
Месяц пірагі мяшае,
Ранняя зара ў печ садзіць,
А позняя — убірае.

### 510. З намі, дзеванька, з намі...

З намі, дзеванька, з намі,
У нас вазы маляваны.
У нас справы не рабіці,
У нас справы не рабіці,
Харашэнька хадзіці.
У нас сонца хлеб пячэ,
Вада сама ў хату цячэ.
У нас свінні мыюць сцены,
Кошкі мыюць ложкі,
А вецер хату мяце.

## 511. Не думай, Манечка, не думай...

Не думай, Манечка, не думай,
Завязем мы цябе за Дунай.
Ды не так за Дунай, як за рэкі,
Маладому Іванку навекі.

## 512. Ой, сваты, сваточкі...

— Ой, сваты, сваточкі,
Што ж вы зрабілі?
Сад паламалі, сокала адбілі,
Вы ж майго татачку ды й навек згубілі.

— Не плач, дзевачка, не плач, маладая,
А як будзеш наша, то мы сад пасадзім,
Сокала прынадзім
І твайго татачку на ногі паставім.

## 513. Не журыся, Галюхна...

Не журыся, Галюхна,
Не журыся, Галюхна,
У нас табе добра будзе.

Ветрык сені мяце,
Ветрык сені мяце,
Сонейка пірагі пячэ.

А свякроўка абеду наварыць,
А свякроўка абеду наварыць,
Цябе, маладзеньку, пасадзіць.

Ты малода, дзе сядзецьмеш,
Ты малода, дзе сядзецьмеш,
На то дзіва ды глядзецьмеш?

## 514. Пасядзьце, баяры, шарам...

Пасядзьце, баяры, шарам
Ды й за сталом.
Ды паслухайце, баяры,
Што мне татка даруе.

А даруе татка ды дванаццаць кароў,
Ды дванаццаць авец.
Ды калі даруе — няхай бог пасе,
А як шкадуе — няхай воўк нясе.

### 515. Дружачкі, не даражыце...

Дружачкі, не даражыце,
Дорага не бярыце.
Бо ў нас дарога вяліка,
Трэба сена накупіці.
Трэба сена накупіці,
Конікаў накарміці.

### 516. З мора вада выліваецца...

З мора вада выліваецца,
Зяць ад цешчы выбіраецца.
Зяць ад цешчы выбіраецца,
А цешча зяцем не нахваліцца.
Пасадзі ж ты зяця ў канец
стала,
Ды дзівіся, як на сокала.
Пасадзі ж ты ды ў куточку,
Ды дзівіся, як на пташачку.

### 517. Кляновы лісточак...

Кляновы лісточак,
Кляновы лісточак,
Куды цябе вецер нясе?
Ці ў гору, ці ў даліну,
Ці назад у тваю даміну?
Маладая Машачка,
Куды цябе бацька аддае?
Ці ў туркі, ці ў татары,
Ці ў татарскую зямлю,
Ці ў шляхецкую сям'ю?

Там зямля камяністая,
Там сям'я наравістая.
Тваю хаду пераходзяць.
І работу пераробяць,
Яшчэ мову перамовяць.

### 518. Я ж табе, маманька, казала...

Я ж табе, маманька, казала,
Штоб ты мяне, маладую, не аддавала.
Як аддасі маладую,
То спраў жа мне зязюленьку баравую,

Штоб па садочку лятала
І раненька будзіла.
Бо свякруха, чужая маці, не пабудзіць,
Толькі выйдзе на вуліцу дый асудзіць:

— Драмлівая, санлівая нявестка мая,
Як часала белы кужаль, то драмала.
Пойдзе ў поле жыта жаці,
Ляжа спаці.

### 519. Аддаеш мяне, мамка...

Аддаеш мяне, мамка,
У чужую старану.
Ды аддай мне, мамка,
зязюлю рабу.
Будзе яна раненька каваці
Ды мяне, маладую,
Ой, прабуджаці.

### 520. У дарогу, дзевачка, у дарогу...

У дарогу, дзевачка, у дарогу,
У дарогу, дзевачка, у дарогу,
Бяры зязюлю з сабою.
І прыкуй зязюлю да краваці,
Яна будзе раненька куваці
І цябе, маладую, пабуджаці.

А ў цябе мамачка не свая,
Будзе раненька будзіці,
Выйдзе на вуліцу судзіці.

### 521. Пайду я ў клець спаці...

Пайду я ў клець спаці,
Не будзі мяне, чужая маці.
Няхай мяне той разбудзіць,
Хто мяне верна любіць.
Няхай будзіць паціханьку:
— Устань, міленькая, памаленьку,
Каб галоўка не балела,
Каб ты спаці не хацела,
Каб на ніўцы не драмала,
Каб свякроўка не пазнала,
Каб гультайкай не назвала.

### 522. Свату, свату разбою...

Свату, свату разбою,
Разбіў ты мяне з дачкою.
Усю маю сям'іцу разагнаў,
Гадаваную маю дачку сабе ўзяў.

### 523. Там у лесе, у лесе мядзведзь рыкае...

Там у лесе, у лесе мядзведзь рыкае,
Будзе табе, Надзечка, свякроў ліхая.
Будзе цябе рана будзіці,
Па суседзях доўга хадзіці.

### 524. Як пайду я ў лес па дровы...

Як пайду я ў лес па дровы,
Нараблю клёна.
Павёў мяне дурны розум
На чужую старану
І на чужыя людзі.
— Ой, хто ж цябе, мая доню,
Навучаць будзе?
— Ой, навучаць, мамка,
Усе добрыя людзі,
Як у маёй галаваньцы
Добры розум будзе.
— Адны будуць вучыці,
А другія судзіці.
— Нам з табою, родная маманька,
Да веку не жыці,
Глазам не відацца.
— Калі цябе, мая дочанька,
У госці дажыдацца?
— Дажыдайся, маманька,
Тады мяне ў госці,
Калі нарасце трава
Ў сенях на памосце.
Расла, расла траўка
Ды й пахілілася,
Ждала, ждала маці дочку
Ды й зажурылася.
Расла, расла траўка
Ды й стала ссыхаці,
Ждала, ждала маці дочку
Ды й стала плакаці.

### 525. Едзь, едзь, дзевачка, у чужыя людзі...

Едзь, едзь, дзевачка, у чужыя людзі,
Хто ж цябе, маладую, шкадаваць будзе?
Адазваўся малады дзіцятка:
— Я ж маладую сам пашкадую.
У майго бацькі ёсць два вядзеркі.
Яна — за вядзерка, а я — за другое,
Пойдзем па ваду ды разам абое.

### 526. Ой, паедзем, свахны, дадому...

Ой, паедзем, свахны, дадому,
Паелі коні салому.
Ды не так салому, як мякіну,
Каля плоцця крапіву.

Ды калі ж мы будзем начаваці,
Пойдзем салому купляці,
Пойдзем салому купляці,
Бо не будзе чаго каням даваці.

А саломкі жменька — капейка,
А мурожку шапка — дзесятка.
А мурожку шапка — дзесятка,
А сенца жмачок — трэцячок.

### 527. Старшая сваха, ды пасунься на лаве...

Старшая сваха, ды пасунься на лаве,
Адчыні аконца, паглядзі на сонца.
Калі яшчэ рана, то пагуляйма,
А калі ўжо не рана, то коні запрагайма.

Ды паедзем дадому, бо ў нас па дзіцяці,
Хто іх будзе калыхаці,
Калі дома чужа маці,
Не хоча дзяцей даглядаці.

### 528. Малады маршалачку...

Малады маршалачку,
Не глядзі ў чарачку,
А глядзі ў аконца,
Ці ядуць коні сенца.
Як ядуць коні сенца,
То яшчэ пасядзема,
Як ядуць саломаньку,
То паедзем дадоманьку.

### 529. Родная мая маценька...

Родная мая маценька,
Выправаджай ды не забаўляй,
Бо цяпер ночка цёмна
І дарожка няпэўна,
У той дарозе карэнняў многа.
Кожнаму ды наравіці,
І старому, і малому,
Ды й таму, што ў калыбелі,
Ды й на белай пасцелі.

### 530. Аглядзелася маці...

Аглядзелася маці,
Што чатыры вуглы ў хаце,
А пяты ў запечку.
Прапіла маці дочку
На салодкім мядочку.
Ды напіўшыся, скача,
А праспаўшыся, плача.

### 531. Лета ж маё, лета...

Лета ж маё, лета,
Ужо я не твая жнейка.
Маці ж мая, маці,
Ужо я не твая служачка.
Таго я служачка,
З кім пад вянцом стаяла.

### 532. Баценька дзетак пытае...

Баценька дзетак пытае:
— Ці ўжо, дзетачкі, світае?
— Ужо, баценька, даўно
світае,
А нашай сястрычкі дома нямае.
— Бяжыце, дзетачкі, з расою,
Ці не дагоніце з касою.
Бяжыце, дзетачкі, гаёчкам,
Ці не дагоніце з вяночкам.
— Беглі, баценька, мы ледзьве
І ў свёкра на дварэ
Зачулі галасы яе:
Да вады кароўкі ганяе
І на цялятак гукае.

### 533. Наце вам, дружачкі...

Наце вам, дружачкі,
Ды кубачак мёду.
Не давайце ганьбы
Нашаму роду.

Наш род сабраны
Ды да вас пасланы,
Каб мы вашу маладую
Да сябе забралі.

### 534. Сваце, сваце, ды давай нам волю...

Сваце, сваце, ды давай нам волю,
Пускай дадому,
Бо дадому ехаць, то не рана будзе,
Тут начаваці, то няслава будзе,
Бо ўжо мы тут забавіліся,
Коні нашы вараныя застаяліся,
Дзеці нашы маладыя ды засядзеліся.

### 535. Зімовае зеллейка, ці ты зімы баішся...

— Зімовае зеллейка, ці ты зімы баішся,
Па дарозе не сцелешся?
Маладая дзеванька, ці ты коней баішся,
Што на воз не садзішся?
— Я ж зімы ды не баюся,
Па дарозе рассцялюся.
Я ж коней не баюся,
Са сваім родам раскланяюся.
— Кланяйся ды раскланяйся,
То з дружком, то з таварышкай,
То з блізкай суседачкай.

### 536. Наша маладая, як дзень мілы...

Наша маладая, як дзень мілы,
Ваш малады, як дзед сівы.

Наша маладая, як золата,
Ваш малады, як долата.

### 537. Не плач, матанька...

Не плач, матанька,
Што я пайду,
Я буду бываці
Штодня к абеду.

Я цераз поле
Перапёлачкаю,
Я да сваёй матанькі
Маладзіначкаю.

## 538. Што ты сабе, маладая Надзечка, думаеш...

Што ты сабе, маладая Надзечка, думаеш,
На каго ты сваю матаньку кідаеш?
Твая матанька ды старэнькая,
Як у садзе ды зязюленька рабенькая.

## 539. Пі, дружачка...

Пі, дружачка,
Ды не ўпівайся,
Што табе трэба,
Не забывайся.
Бяры пярыны
На дзве дзяціны,
Бяры падушкі
Ды й на дзве душкі,
Бяры радзенца
Да свайго сэрца.

## 540. Коні гагочуць, дадому хочуць...

Коні гагочуць, дадому хочуць,
А свашка плешча, начуем ешчэ.
Хлеба паліца,
Гарэлкі купа,
Начуем тута.

## 541. Пазнаеш, матка...

Пазнаеш, матка,
Дачку аддаўшы,
А чужую ўзяўшы.
Ды будзеш хадзіці
Рана па вадзіцу,
Ды будзеш трусці
Раннюю расіцу.
Ды будзеш трусіці,
Не натрусішся,
Ды будзеш прасіці,
Не напросішся.

## 542. Ой, пабачыш, маманька...

Ой, пабачыш, маманька,
Без дачкі,
Як парастуць па залужку
Казлячкі.
Будзеш тыя казлячкі
Збіраці,
Будзеш сваю дочаньку
Ўспамінаці.
Была ў мяне дочанька
Не ляніва,
Штосуботы лавачкі
Яна мыла.

## РАЗВІТАННЕ НЯВЕСТЫ З БАЦЬКАМІ, РАДНЁЙ, СЯБРОЎКАМІ

### 543. Кланялася бяроза...

Кланялася бяроза
Зялёнай дуброве:
— Дзякуй табе,
Зялёная дуброва,
За тваё пастаянне.
Як я ў цябе стаяла,
Буйнага ветру не знала.
Адно толькі ж
Зялёнае голлечка распускала.

Кланялася Надзечка
Свайму бацаньку нізенька:
— Ой, дзякуй, дзякуй,
Ды мой бацанька,
За тваё гадаванне.
Як я ў цябе бывала,
Цяжкай справы не знала.
Адно толькі, маладзенька,
Я косаньку гадавала.

### 544. Скокнула Ганначка з лаўкі далоў...




Скокнула Ганначка з лаўкі далоў,
З лаўкі далоў.
Пакланілась мамачцы нізка да ног,
Нізка да ног.
Дзякуй, дзякуй, мамачка, за хлеб-соль,
За хлеб-соль.
Больш цяпер я не пайду за твой стол,
За твой стол.
Хоць жа я к табе прыйду ў гасціну,
У гасціну.
Калі дасі паабедаць — спасіба,
Спасіба.
Калі ж не дасі абедаць — так пайду,
Так пайду,
Ой, ці ж я сабе хлеб-соль не знайду?!

### 545. Ля варот бяроза стаяла...

Ля варот бяроза стаяла,
Надзя са двара з'язджала,
Вяршок бярозы сарвала:
— Стой, мая бяроза, без
верху,
Жыві, мая мамачка, без мяне,
Без русае косанькі без мае.

### 546. З мора вада выліваецца...

З мора вада выліваецца,
Зяць ад цешчы выбіраецца.
— Ой, зяцю, мой сыначку,
Пасядзі з гадзіначку,
Пагляджу я на сваю дачку.
— Трэба было надзівіцца,
Пасадзіці ды й глядзеці.
Пасадзіці ў канцы стала,
Дзівіцца, як на сокала,
Пасадзіці на дзежачку,
Глядзеці, як на птушачку.

### 547. Сядзем, баценька, паабедаем з табою...

Сядзем, баценька, паабедаем з табою,
Паабедаўшы, падзелімся з табою:
Табе, баценька, хата, сені і камора,
А мне, маладой, скрыня, пярына і карова,
Я ўжо табе, мой баценька, адслужыла,
Там у клуні, у староначцы, грабелькі палажыла.

### 548. Выйду за варотачкі...

— Выйду за варотачкі —
Коні ржуць.
Куды маю маладую
Надзечку павязуць?
— Не плач, маценька, не думай,
Павязуць мяне за Дунай,
За тыя лозанькі густыя,
За тыя рэчанькі быстрыя.
А я, маценька, лозанькі пасяку,
Да цябе, родненька, у госці ўцяку.

### 549. Ой, аддаў мой баценька, аддаў...

Ой, аддаў мой баценька, аддаў,
Як ту канапельку ў вадзічку ўмачыў.
Канапельку мочаць —
Ідуць выцягаці,
А мне, маладзенькай,
Цэлы век бедаваці.



*Выканаўцы вясельных песень в. Обрава (Івацэвіцкі раён)*

### 550. Лятала пава па крутой гары...

Лятала пава па крутой гары,
Заранiла пер'ейка на шаўковай траве.
Не жаль мне павы, як пер'я яе.
Плакала дзевачка, ад маткі ідучы.
— Чужы бацюшка не б'е, то журыць.

### 551. Я жаль маю, мая мамачка, на цябе...




Я жаль маю, мая мамачка, на цябе,
На цябе,
Засталася мая рутанька ўся ў цябе,
Ўся ў цябе.

Ой, рутанька ў агародчыку на градзе,
На градзе.
Ой, уставай, мая мамачка, раненька,
Раненька.
Ой, палівай маю рутаньку часценька,
Часценька.
Ой, ранняю ды вячэрняю зарою,
Зарою.
Ой, мамаччынай ды гарачаю слязою!

### 552. Пакуццё, маё пакуццё...

Пакуццё, маё пакуццё,
Пакуццё, маё пакуццё,
Хто ж цябе шараваці будзе,
Хто ж цябе прыбіраці будзе?
Як Манечка была,
Як Манечка была,
Штосуботу шаравала,
Штонядзелі прыбірала.

### 553. Скрыня мая, бязухая...

Скрыня мая, бязухая,
Куды ты патрухала?
Ці ў лес, ці ў дуброву,
Ці к свёкру ў камору?
— Ні ў лес, ні ў дуброву,
А да свёкра ў камору.

### 554. Браткі, мае браткі...

Браткі, мае браткі,
Браткі, салавейкі,
Прыхадзіце да мяне
Хоць штонядзелькі.

### 555. Ой, барвінку, барвінку...

Ой, барвінку, барвінку,
Купаваўся на рынку,
Купаваўся на рынку,
Захаваўся ў скрынку.
Я раней цябе не рушыла,
Плакаці не мусіла,
А цяпер парушу
Ды й заплакаці мушу.

### 556. Не плач, мамка, па мне...

Не плач, мамка, па мне,
Застаецца дабро табе.
Ды будзеш спажываці,
Мяне ўспамінаці.

### 557. Пара дзеўкам дадому ісці...

Пара дзеўкам дадому ісці,
Маладым маладзіцам.

У дзевачак вянкі вянуць,
У малодачак дзеці плачуць.

Вянкі вянуць, peравянуць,
Дзеткі плачуць, пераплачуць.

### 558. Ой, за сінімі, сінімі сенечкамі...

Ой, за сінімі, сінімі сенечкамі
Развіталася Манечка з падружкамі:

— Зялёна лышчына, белы гарошкі,
Бывайце здаровы, мае падружкі.

### 559. Ужо зязюлька ў лугі ўлятае...

Ужо зязюлька ў лугі ўлятае,
Ужо Лідачка ў вазы сядае,
Сваім дзевачкам дабранач дае:

— Дабранач, дзевачкі,
Дабранач, падружкі,
Кідаю я вам падаруначкі:

Кветкі рвіце,
Вяночкі віце,
І замуж ідзіце.

### 560. Kaцілася яблычка з гары далоў...

Kaцілася яблычка з гары далоў,
Кланяйся, Ганулька, бацюхну да ног.

Бацькавы ножкі бяленькі,
Будзе табе, Ганначка, дабрэнька.

### 561. Аддавала дзевачка дабранач...

Аддавала дзевачка дабранач,
А гэты дабранач — не на ноч.

А гэты дабранач — на ўвесь год,
Павезена дзевачка на ўвесь век.

### 562. Да хіліцеся ж, лозы...

Да хіліцеся ж, лозы,
Да хіліцеся ж, лозы,
Да з гары да ў даліну,
Ды няхай будзе відна,
Каго мне жалка.

Будзе жалка бацюхны свайго,
Адкуль едзе, не зайдзе,
Я, маладзенька, бачу
Да моцненька плачу,
І вытруся ды к бацюхну
не вярнуся.

### 563. Сядай, Валечка, на вазы...

Сядай, Валечка, на вазы,
Пакідай мамчыны наравы.
Адны наравы — на вячоркі,

Другія наравы — на папрадкі.
А трэція наравы — гулянне,
Цяжкае, важкае ўздыханне.

### 564. Чырка-кітайка на двор махае...

Чырка-кітайка на двор махае,
Чырка-кітайка на двор махае,
Маладая дзеванька ды на воз сядае.

У яе матанька ды ключы пытае:
— Дзе ж ты, дзеванька, ключы падзела?
— Паглядзі, матанька, там, дзе я сядзела.

### 565. Ужо конікі запрэжаны...

Ужо конікі запрэжаны,
Ужо конікі запрэжаны,
Ужо возікі завернены, просім сядаці.
— Яшчэ ж я не сядала,
Бо свайму бацюхну не дзякавала.

Дзякуй, дзякуй, татка,
Што гуляла змалку,
А цяпер не буду больш гуляці,
Трэба будзе дзяцей калыхаці
Ды сям'ю даглядаці.

### 566. Месяц узыходзіць...

Месяц узыходзіць,
А зара зарыцца.
Маладая Ірачка
Ды на воз садзіцца.

— Падыдзі, маманька,
Да мяне блізенька.
Да мяне блізенька,
Пакланюся табе нізенька.

— Не хачу, дзіцятка,
Я твайго паклону,
Ступай ад возу,
Ды хадзі дадому.

— Рада я б, маманька,
З воза ступіці,
Ды сядзіць Мішачка,
Будзе сварыці.

Рада я б, маманька,
З воза ўстаці,
Ды баюся, што Мішачка
Будзе крычаці.

### 567. Ужо свет світае...

Ужо свет світае,
Сонца ззяе.
Маладая Галюхна
Ды на воз сядае.

Выйшаў яе бацюхна
Ды й ключоў пытае:
— Дзе ж ты, дзе ж ты, Галюхна,
Ды ключы падзела?

— Паглядзі, мой бацюхна, дзе я сядзела.
Я сядзела, бацюхна, у новай каморы,
Паглядзі, мой бацюхна,
На златым прабоі.

### 568. На крутым чырвоным беражку...

На крутым чырвоным беражку
Ды на белым каменні
Не бела лебедзь клікала,
А маці аб дочцы плакала.

### 569. Маладая Манечка...

Маладая Манечка
З ганка просіць:
— Радзіна мая, успамінай мяне,
Чым-небудзь добрым падары мяне:
Ці рублём, ці другім,
Ці плацейкам дарагім.

## 570. Маладая Манечка...

Маладая Манечка,
Маладая Манечка,

Прасі ж сваю радзінку
Ў шчаслівую гадзінку.

Ды скіньцеся па рублічку,
Ды выкупіце Манечку.

Няхай ідзе з намі,
Ужо вяночкі павялі.

Ужо вяночкі павялі,
А дружачкі паскучалі.

## 571. Крача вутачка, крача...

Крача вутачка, крача,
З-пад млына ўсплываючы.
З-пад млына ўсплываючы,
Вуценят шукаючы.

Плача Галечка, плача,
Ад бацькі ад'язджаючы.
Ад бацькі ад'язджаючы,
Свой дом пакідаючы:

— Падай, бацюхна, ручку,
Пераначую ночку.
Падай, бацюхна, другую.
Яшчэ пераднюю.

## 572. Пачакайце, сваты...

Пачакайце, сваты,
Хоць перад хатай.
Забыла маці ручнікі даці.
Не так забыла, як не зрабіла.
Чужая ніва
Ды й не ўрадзіла.

## 573. Пастой, кабыла...

Пастой, кабыла,
Пярыну забыла.
Не так забыла,
Як маці не дала.
Дала падушку
З грэцкага пушку.
З возу ўпала —
Каня спужала.

## 574. Зашумела дуброва зялёна...

Зашумела дуброва зялёна,
Зашумела дуброва зялёна,
Ды куды ж наша маладая вязёна?

Яшчэ ж яна не так зашуміць,
Яшчэ ж яна не так зашуміць,
Як сама радзіна паедзе,
Чырвону каліну павязе.

### 575. Ціха, баяры, ідзіце...

Ціха, баяры, ідзіце
Ды харомы не паламіце.
Не вы нашы харомы будавалі,
Не вы нашу Анечку гадавалі.

Будавалі харомы начамі,
Гадавалі Анечку часамі.

### 576. Сабірайся, дзевачка, сабірайся...

Сабірайся, дзевачка, сабірайся,
Бо ўжо коні запрэжаны.
Бо ўжо коні запрэжаны,
Пад вароты падведзены.

— Няхай коні пастаяць,
Дадуць нам, баярам, пагуляць.
Пакуль прыйдзе татка з саду
Ка мне на параду.

От і татка ідзе,
Мне карованьку вядзе.
Як татка на парог,
Так дзевачка да ног.

— Дзякуй, дзякуй, татка,
За тваё выхаваннейка.
За тваё выхаваннейка,
За добрае гадаваннейка.

### 577. Стаіць яблынька...

Стаіць яблынька,
Расхілілася,
Ды некаму падвязаці.

Сядзіць дзеванька,
Расплакалася,
Ды некаму суцяшаці.

### 578. Дзякуй, дзякуй, татачка, за хлеб-соль...

Дзякуй, дзякуй, татачка, за хлеб-соль,
Ды ніколі не пайду ўжо за твой стол.
А калі прыйду ў гасцінаньку,
Напяку пірагоў хусцінаньку.

### 579. Ой, як кракнуў селезень...

Ой, як кракнуў селезень,
На сінім моры плывучы:
— Ці ўсе, ці ўсе мае ўцяты
За мною выплываюць?
Адазвалася ўтанька,
Сярод мора плывучы:
— Ой, яшчэ ж бо я прысталася,
На моры купалася.
Як выгукнуў Колечка
Ў свайго цесценькі на двары:
— Ці ўся, ці ўся мая дружынанька
За мною выступае?
Адазвалася Лідачка
Ў свайго баценькі ў каморы:
— Ой, яшчэ ж бо я прысталася,
Баценьку кланялася.

### 580. Дзіўныя людзі, нам не дзівіцеся...

Дзіўныя людзі, нам не дзівіцеся,
Нам не дзівіцеся, сваіх гадуйце.

Бо нас матанька выгадавала,
Цёмны ночы не дасыпала.

Цёмны ночы не дасыпала,
Ясны свечы не загашала.

Ясны свечы не загашала,
З гусёлачак ножак сваіх не вымала.

### 581. Бывайце здаровы, бацькавы парогі...

Бывайце здаровы, бацькавы парогі,
Кудою ж хадзілі ды мае белыя ногі.
Кудою ж хадзілі, ды й хадзіць не будуць.

Каго ж я любіла, таго любіць не буду.
Каго ж я любіла, стаіць за плячыма,
А каго не знала, той перад вачыма.

### 582. Куды, дачка, сабіраешся...

— Куды, дачка, сабіраешся,
Куды дачка сабіраешся,
Чаму ў мяне не пытаешся?

Ці ў бор ды па грыбочкі,
Ці ў бор ды па грыбочкі,
Ці ў лес ды па ягадкі?

— Не дажыдай мяне, мамачка,
З лесу з ягадкамі,
З бору з грыбочкамі,

А дажыдай мяне, мамачка,
У суботу вечарочкам
Ды з радзінкаю, з дружочкам.

### 583. Ой, ты, Манечка маладзенькая...

Ой, ты, Манечка маладзенькая,
Дзе будзеш начаваць?
— Начавала б я ў свайго бацюхны,
Бацюхна не прымае.
Ёсць у мяне мой свёкарка,
Ён мяне дажыдае.

## 584. Заграбай, маці, жар, жар...




Заграбай, маці, жар, жар,
Ці табе дачкі не жаль?

Накладай, маці, дрова,
Аставайся здарова.

А ты, свякруха, — трэскі,
Дажыдайся нявесткі.

## 585. Ой, гэкнула гусанька цераз мора летучы...

Ой, гэкнула гусанька цераз мора летучы:
— Ці ўсе мае гусанькі цераз мора пераляцелі?
Адазвалася адна гусанька пазаду летучы:
— Ой, пачакайце, засталася я ў моры ды купалася.

Ой, гукнула маманька сваім госцейкам:
— Ці ўсе мае любімые баяры праз сяло пераехалі?
Адазвалася Танечка, на самым заду едучы:
— Ой, пачакайце, засталася я з бацюхнам ды прашчалася.

## 586. Паганяй, фурман, клячу...

Паганяй, фурман, клячу
Ды не глядзі, што я плачу.
Я плачу ды баюся,
Што да маманькі болей
не вярнуся.

Разганяйся, маці,
Па вялікай хаце:
То ў куток, то ў запечак,
То галавой аб прыпечак.

Аглядзелася маці,
Што чатыры куткі ў хаце.
А пяты куток на паліцы,
Няма дачкі-памочніцы.

## 587. Ходзіць-паходзіць ясён месяц па небе, гэй!




Ходзіць-паходзіць ясён месяц па небе, гэй *!
Лічыць-палічыць дробны зорачкі на небе, гэй!
Недалічыўся адной зорачкі найбольшай, гэй!

Ходзіць-паходзіць сам гаспадар у доме, гэй!
Лічыць-палічыць сваіх дзетачак у доме, гэй!
Недалічыўся адной дочачкі ў хаце, гэй!

## 588. Ой, бі каня, паганяй каня...

Ой, бі каня, паганяй каня,
Каб мамачка ды не пачула
І назад коніка не вярнула.

У бару сасёнка зялёненькая
Ды галлё на ёй высока.
Буду ад цябе, мамка, далёка.

## 589. Бяжы, брацейка, расою...

Бяжы, брацейка, расою
За сястрынаю касою.
Бег брацейка, не дагнаў,
За баярамі не пазнаў.
За баярамі не відна,
А за скрыпкамі не чутна.

Зачуў галасок, як бы яе.
Ой, у свякрухі на дварэ.
Не так на дварэ,
Як за дваром,
Ой, у свякрухі за сталом.

---

* Кожны радок паўтараецца.

### 590. Ехалі, ехалі па-над прызбаю...

Ехалі, ехалі па-над прызбаю
Ды кабылкаю шустраю.
Ехалі, ехалі — конь прыстаў,
А малады з маладою з воза ўпаў.
Зялёная рутачка, жоўты цвет,
Як не будзеш памагаць, пайду ў свет.

### 591. Ляці, ляці, сокал мілы...

Ляці, ляці, сокал мілы,
У мой дом шчаслівы.

Ды накажы маёй мамачцы,
Што я еду ў парачцы.

Пішы, пішы ды вестачку,
Што я вязу нявестачку.

### 592. Бяжыце, конікі, рыссю, рыссю...

Бяжыце, конікі, рыссю, рыссю
Ды дадому з карысцю.

З карысцю, карыстанкаю
Ды з маладой нявесткаю.

### 593. Ой ты, Надзечка, упярод бяжы...

Ой ты, Надзечка, упярод бяжы,
Свайму свёкру праўду кажы,

Што вязём карову рагатую,
Вязём падушкі пуховыя.

### 594. Не лякайцеся, людзі...

Не лякайцеся, людзі:
Багатырачка едзе.

Сем вазоў дабра вязе,
На восьмым сама едзе.

Ззаду калыбель вісіць,
Спераду дзіця цешыць:

— Не плач, даражэнькі,
Дам хлеба ў ручэньку.

### 595. Таптали ніўку, таптали другую...

Таптали ніўку, таптали другую,
Пакуль вытапталі для матанькі слугу.
Для матанькі слугу, для сябе падругу,
Мацеры — слугою, Колечку — жаною.

### 596. Кавала зязюля ў дупелі...

Кавала зязюля ў дупелі,
Пакінулі дзевачку ў чужыне,
Ды чужой мацеры слугою,
Маладому жанішку жаною.

### 597. Мы ехалі лесам...

Мы ехалі лесам,
Мы ехалі лесам
Ды пакрыліся лістам.
Пакрыліся бабром
Ды вязём дзеўку з дабром.

### 598. Пусці, сваццtable, у хату...

Пусці, сваццця, у хату
На печы пагрэцца,
На дзеваньку падзівіцца:
Ці харошая, ці ўбраная,
Ці для нас спадабаная.
Ці харошая па лічаньку
Нашаму панічаньку.

### 599. Пад'язджаем пад сяло...

Пад'язджаем пад сяло,
Ды грай, дудачка, весяло!
Я скакала, скакала,
А скрыпачка грала.
Маладую на вазу вязу.
Злазь, маладая!
Будзем скрыпачкай гуляць,
На цябе паглядаць,
Якая ты красавіца.
Ох, маладая мая,
Мы цябе прапіваем
І дабра жадаем.

### 600. Адчыняйце ж вароты...

Адчыняйце ж вароты,
Бо вязём маладога.
— А я, жаніх, сяджу,
Ды ўсё маўчу.
Цераз вароты гаршчок ляціць,
А жаніх маўчыць.
Гаршчок праляцеў,
Жаніх ачумеў.

### 601. Адчыняйце ж вароты...

Адчыняйце ж вароты,
Едзе поп-сірата.
А я сустракаю
Ды на жанішка паглядаю.
— Сюды-туды, жанішок, павярніся
Ды з маладою нам пакажыся.

## 602. Сядзіць зайчык пад сасёнкаю — вочкі трэ...

Сядзіць зайчык пад сасёнкаю — вочкі трэ,
Сядзіць зайчык пад сасёнкаю — вочкі трэ.
Ой, жаліцца малады Колька сваёй сястры,
Ой, жаліцца малады Колька сваёй сястры:
— Ці я яму ды дарожачку перайшоў,
Ці я яму ды дарожачку перайшоў?
Ці я яму вараных коней папужаў,
Ці я яму вараных коней папужаў?

## 603. Прыехалі на мецены двор...

Прыехалі на мецены двор
Ды вынеслі ды цясовы стол,
Ды пазнайце, пазнайце па меху,
Ці ўсе тут панове?
Ды пазнайце, пазнайце,
Ды гарэлачкі нам дайце.

## 604. Ці ж мы ў цябе, пане-сваце, не бывалі...

Ці ж мы ў цябе, пане-сваце, не бывалі,
Ці ж мы тваёй гарэлачкі не півалі?

Цяпер вы ў нас прасіце,
Цэбрамі гарэлачку насіце.

Калі не цэбрам, то вядром,
Перавярніце пану-свату хату
Ўверх дном.

## 605. Знаці сватку, знаці...

Знаці сватку, знаці,
Што з багатай хаты.
Сырамі аклаліся,
Пірагамі падпёрліся.

— Я, свашка, лянівa,
У хлеў не хадзіла,
Кароў не даіла,
Я мухі баялася,
У халадку хавалася.

— Як ты лянівa,
Трэба на цябе дубіна,
Каб у хлеў хадзіла,
Кароўкі даіла,
Нам сыры ляпіла.

— Мае ногі ў нагавіцах,
А рукі ў рукавіцах,
Калі будзеце біці,
То не будзе балеці.



*Святочнае гулянне. Народны ансамбль танца «Палессе» (г. Пінск)*

### 606. Сваток сваё гне...

Сваток сваё гне,
Знайшоў ячменнае зерне,
Палажыў на талерцы,
А сам плача па гарэлцы,
Не так па гарэлцы,
Як па краснай дзеўцы.

### 607. Былі ў Кракаве...

Былі ў Кракаве,
Там людзі адзінакавы.
Кракаў заваявалі
І сабе нявестку ўзялі.

### 608. Сакоча зязюлька, сакоча...

Сакоча зязюлька, сакоча,
Із бору ляцеці не хоча.
У бару ягадкі салодкі,
Нап'ецца вадзіцы з крыніцы.
Да плача дзевачка, да плача,
Ад татачкі ехаць не хоча.
У таткі парогі нізенькі,
У таткі па воду блізенька.
У свякраткі парогі высокі,
У свякраткі па воду далёка.

## БАЦЬКІ МАЛАДОГА ЧАКАЮЦЬ І СУСТРАКАЮЦЬ СЫНА З НЯВЕСТКАЙ

### 609. Жаніхова маці...

Жаніхова маці,
Жаніхова маці
Ў акенца сядзіць
Ды на зорачкі глядзіць.
— Зорачкі мае ясныя,
Не змарозце майго сыночка,
Бо мой сын ды й у дарозе,
На вялікім марозе.
Яго конікі ды ціха ідуць,
Важкія ды скрыні вязуць.
Яго коні не каваныя,
Вязуць скрыні маляваныя.

### 610. Выйдзі, пабач, мая мамачка...

Выйдзі, пабач, мая мамачка,
Сколькі нас ды прыехала.
Паехала дзевяць душ,
А прыехала дзесяць.
Дзесятая прылучылася,
А мілому прызнабілася.

### 611. Пакажыце нам пані...

Пакажыце нам пані,
Няхай з намі паскача.
Няхай з намі павітаецца,
Пра здароўе запытаецца.

### 612. Агнянка-свякроўка, агнянка...

Агнянка-свякроўка, агнянка
Ў варотах агонь паліла
Ды нявесце вочы смаліла,
Каб не была звяглівa.

### 613. Ой, гора-гора, чужая маці...

Ой, гора-гора, чужая маці
Напяла кажуха,
Хацела злякаці.
Нявестка кажа:
— Лякай, лякай,
Я не баюся.
За твайго сына
Абруч учаплюся.

### 614. Свёкар добры...

Свёкар добры,
А свякруха ліхая
Не пускала пагуляці,
Як я была маладая.

### 615. Учора была ночанька, а цяпер дзень...

Учора была ночанька, а цяпер дзень,
Ужо свякроўка нявехну даўно жджэ.
Шыла яна шубаньку да долу,
Ды прыбудзь, нявехна, дадому.
Шыла яна шубаньку да зямлі,
Ды прыбудзь, нявехна, да сям'і.
Шыла яна шубаньку па пяты,
Ды прыбудзь, нявехна, дахаты.

### 616. Ой, была ночанька...

Ой, была ночанька
Ды ўжо дзень,
А свякроўка нявестку
Доўга жджэ.

— Нявестка мая жаданна,
Ды ні год, ні два чакала,
Ой, ні год, ні два,
Пакуль ты расла, як вярба,
Тонка ды высока, як сасна.

### 617. Стаіць маманька...

Стаіць маманька
Ды на вуланьцы,
Доўга жджэ,
Ці скора сын нявестачку
прывязе?

Ды вязе нявестка,
Што сяляначкі пралі,
Што мяшчаначкі ткалі,
Белыя лебедзі на моры бялілі,
А сястрыцы ў куфар злажылі.

### 618. Ужо як свёкар гаворыць...

Ужо як свёкар гаворыць:
— К нам мядзведзіцу вязуць.
А свякруха гаворыць:
— Людаедзіцу вязуць.

Дзевяры-та гавораць:
— К нам нятках у вядуць.
А дзве цёткі стаяць,
Усё пра тое ж гавараць.

### 619. Лістам дарога высцілаецца...

Лістам дарога высцілаецца,
Лістам дарога высцілаецца,
Свёкар нявехну дажыдаецца,
Павярнуўшыся да яе, пытаецца:

— Ці шчасліва, нявехна,
Ці шчасліва ў бога?
Ды распусці долю
Ды па маёму полю.

Ды распусці шчасце
Ды па маёй хаце,
Штоб на маёй глебе жыта радзіла,
Штоб у маёй аборы кароўкі рыкалі.

Штоб у маёй стаенцы конікі ржалі,
Штоб мая нявехна сыноў раджала.
Штоб яна радзіла дзевяць сыночкаў,
Дзевяць сыночкаў і дзесяту дочку.

### 620. Конікі, тупý, тупý...




Конікі, тупý, тупý,
Прывезлі на двор ступý.
Не ступу — калодзіцу,
Не дзеўку — малодзіцу.

### 621. Ой, у агародзе ды на новай градцы...

Ой, у агародзе ды на новай градцы
Зеллечка разлягае,

А ў жанішка, у маладога,
Вяселлечка пачынае.

Бог яму дае,
Матанька памагае.

### 622. Ды выйдзі, свякруха, паглядзі...

Ды выйдзі, свякруха, паглядзі,
Што табе баяры прывязлі:
Да ці дзіку казу, ці ласяня,
Ці маладую нявестку, як паняня.

### 623. Выйдзі, маці, паглядзі...

Выйдзі, маці, паглядзі,
Што мы табе прывязлі:

Высокую, як яліну,
Чырвоную, як каліну.

Пад ёю зямля гнецца,
Нікому не ўкланецца.

### 624. Паўз сад ды дарожачка...




Паўз сад ды дарожачка,
Тудой ехаў ды Іванечка.

А ў тым садзе ды галубачка,
Злавіў тую ды галубачку.

Злавіў тую ды галубачку,
Узяў яе ды пад шубачку.

Прывёз яе ды дадомачку,
Пусціў яе па падвор'ечку.

Сам сеў ды на ганечкі,
Галубкаю уцяшаецца,

Галубкаю уцяшаецца,
Сваёй мамачкі пытаецца:

— Ой, ці міла, мамка, галубка?
— Была б табе, мой сынок, міла,

Была б табе, мой сынок, міла,
А мне — дзела рабіла,

А мне дзела рабіла,
На работу хадзіла.

### 625. Выйдзі, свякруха, з гарбом...

Выйдзі, свякруха, з гарбом,
Бо вязём табе нявестачку з дабром.

Выйдзі, свякруха, гарбата,
Едзе к табе нявестачка багата.

### 626. Выйдзі, матанька, паглядзі...

Выйдзі, матанька, паглядзі,
Што мы табе прывязлі.
Ды рылатае, ды губатае,
Бо яно ж багатае.

### 627. Выйдзі, мамачка, выйдзі...

Выйдзі, мамачка, выйдзі,
Выйдзі, мамачка, выйдзі.
Не зробім табе крыўды.
Не зробім табе крыўды,
Ох, зробім мы табе славу.
Мы прывезлі ды дзетак пару,
Адно ды раджонае,
А другое ды суджонае.
Раджонае — Колечка,
Суджонае — Олечка.

### 628. Выйдзі, мамачка, паглядзі...

Выйдзі, мамачка, паглядзі,
Выйдзі, мамачка, паглядзі,
Што мы табе прывязлі:
Ці авечку, ці ягня,
Ці маладу дзевачку, як паняня.
Паглядзі, мамачка, у акенца,
У двары месячык ды сонца,
Ясны месячык ды сонца.
Ясны месячык — сынок твой,
Ясна сонейка — нявестачка.

### 629. Выйдзі, матухна, паглядзі...

Выйдзі, матухна, паглядзі,
Што табе баяры прывязлі.
— Мы табе пудзіла прывезлі —
Чорнае, кудлатае па полю ходзіць,
Верабеек гоніць.
— Гыля, гыля, верабейкі,
Ляціце к бацьку ў канапелькі,
А на свёкраву збажынку не ляціце,
Мне ў свёкра яшчэ доўга жыці.

### 630. Выйдзі, свякроў, паглядзі...

Выйдзі, свякроў, паглядзі,
Выйдзі, свякроў, паглядзі,
Што мы табе прывязлі.
Прывязлі з млыну пярыну
І яшчэ маладую дзяўчыну.
Вы яе сустракайце,
Да работы прывучайце,
Харошаму навучайце.
Яна ўмее і рабіці,
І з людзьмі гаварыці.

### 631. Падзівіся, свякроўка, збоку...

Падзівіся, свякроўка, збоку,
Сын прывёз нявестку касавоку.
Ды хароша нявестачка,
Ды свякроўка санліва.

### 632. Выйдзі, маці, паглядзі...

Выйдзі, маці, паглядзі,
Што мы табе прывязлі:
Ці шляхцянку,
Ці мяшчанку,
Ці з сям'і сялянку?
Выйдзі, маці, з хаты,
Не забудзь папытаці:
Ці ўмее кросны ткаці,
Ці ўмее наравацi?
Каб ніт не путаўся,
Каб бёрда не зламалася,
Каб свёкар не дзівіўся,
Каб людзі не смяяліся.

### 633. Выйдзі, матухна, паглядзі...

Выйдзі, матухна, паглядзі,
Што мы табе прывязлі.
Выйшла, матухна, паглядзела
Ды й заплакала, пайшла.

### 634. Не лякайся, свякроўка...

Не лякайся, свякроўка,
Што нявестка маленька.
Мы ж яе павышым,
На паперы паставіўшы.
На золаце, на паперы
Стане вышэй за дзверы.

### 635. Ой, радуйся, зямля...

Ой, радуйся, зямля, —
Дробны дождж ідзе.
Ой, радуйся, мамка, —
Сын нявестку вязе:
Ігручую і рабочую,
На ўсе дзела ахвочую.
— Сюды-туды я яе пашлю,
А сама ж уперад пайду,
То па дровы, то па лучыну,
Па ўсякую прычыну.

### 636. Радуйся, маці...

Радуйся, маці,
Сын нявестку вязе.
Высокую, як сасонку,
Чырвону, харошу.
У клуню — малацільніцу,
У хату — калацільніцу.
Добрую нявестачку,
У хату — карыстачку.

### 637. Стуку, стуку...

Стуку, стуку,
Прывезлі табе ступу.
Не ступу, а нявестачку,
Прымі яе ў хатачку.

### 638. Ці рада, мамка...

Ці рада, мамка,
Майму прывозу?
Як не рада,
Дык я назад адвожу.

### 639. Бацюхна родненькі...

Бацюхна родненькі,
Стань у канец століка,
Будзеш сабе за саколіка.
Ды паляці на Ўкраінaчку,
Збірай сваю ўсю радзінaчку:
Блізкую і далёкую, багатую
і ўбогую.
Што багата — для славанькі,
А ўбога — для праўданькі.
Што багата — піці, есці,
А ўбога — песні пеці.
Што багата — напіцеся,
А ўбога — пажурыцеся.

### 640. Ці рад, бацюхна...

Ці рад, бацюхна,
Майму прыезду,
Майму прыезду,
Майму прывозу?

### 641. Ды не наступайце, дзевачкі...

Ды не наступайце, дзевачкі,
Ды не наступайце, дзевачкі.

Ды не адчыняйце дзвярыны,
Ды не выпускайце звярыны.

Бо мы ў мыле конікі гонім,
Пакуль гэту звярыну лавілі.

Злавілі звярыну на рынку,
Мішачку за жонку.

### 642. Ой, знаці, знаці, што чужая маці...

Ой, знаці, знаці, што чужая маці,
Вывернула кажух, ды хоча спужаці.
А сынок не баіцца, блізка становіцца,
А нявестка не знае, ды за ім ступае.

### 643. Выйдзі ты, мая мамачка...

— Выйдзі ты, мая мамачка,
Сустракай баярачку.
— Сыночак мой маладзенькі,
Рада б я сустракаці —
Не ведаю, як назваці?
— Мамачка мая родная,
Заві яе пралескаю —
Будзе табе нявесткаю,
Заві яе княгінькаю —
Будзе табе гаспадынькаю.

### 644. Шаўковая нітачка ў сцену б'е...

Шаўковая нітачка ў сцену б'е,
А нявестка свякрусе добры дзень дае.
Ды не той добры дзень, што на дзень,
А той добры дзень, што навек.

### 645. Будзь здарова, мама...

Будзь здарова, мама,
Як цябе не знала, дык мамаю не звала.
Як цябе пазнала,
Дык мамаю назвала.

### 646. Здарова, нявестка, у маім даму...

Здарова, нявестка, у маім даму,
Распусці долечку па майму полечку,
А прыхільнічка — па падвор'ечку,
Сваю красачку — па застоллечку.

### 647. Будзь здарова, нявестка...

— Будзь здарова, нявестка!
Як цябе не знала,
Так нявесткай не звала.
Як цябе ўзнала,
Так нявесткай назвала.

### 648. Свякроў нявестку ды перапівала...

Свякроў нявестку ды перапівала,
Ды перапівала, ды паздраўляла:
— Будзь жа, нявестка,
Як зіма, здарова, як вясна, вясёла,
Як лета, шчаслiва, як восень, багата.

### 649. Перапіваю...

Перапіваю чулкі з рукавічкамі,
Каб не бегаў за чужымі маладзічкамі.

Перапіваю намітку
Ад Севера да Юга,
Каб любілі друг друга.

### 650. Перапіваю той крайчык...

Перапіваю той крайчык,
Каб быў сын Мікалайчык.

### 651. Перапіваю...

Перапіваю воўка,
Каб была жонка лоўка.

Перапіваю кашэль гліны,
Каб пазвалі на хрысціны.

Перапіваем ліса,
Каб дзеці вяліся.

Перапіваю дуба,
Каб жыць было люба.

Перапіваю кускоў цэлы стол,
Каб было дзяцей повен пол.

### 652. Ішлі дымы па-за лугамі...

Ішлі дымы па-за лугамі,
Ой, то не дымы, а пара коней ідзе,
Малады Ванюша жоначку вязе.
— На табе, бацька, пару коней на двор,
А табе, маці, нявестку за стол.
Ды вучы яе, як сама знаеш.
Каб шоўкам шыла, ды не памыліла,
А дротам ткала, ды не ўварвала.

### 653. Ой, ляціце, чорны галачкі...

Ой, ляціце, чорны галачкі,
Ой, ляціце, чорны галачкі.
Накажыце маёй мамачцы,
Што я еду ды ў парачцы.
Ляці, ляці, саколіку,
Ляці, нясі вестачку,
Што вязём мы нявестачку.
Вестачка — на стол,
А нявестачка — на двор.

### 654. Блізкія ды суседачкі...

Блізкія ды суседачкі,
Выйдзіце, паглядзіце
На нашага ды маладога,
На паненачку яго, што стаіць.
Сама яна невялічанька,
Па лічаньку — белалічанька.
З-пад яе ды рукавічанька
Ціхі вецер павявае,
А з яе белага лічанька
Ясна сонца ззяе.

### 655. Ой, што гэта на парог лезе...

Ой, што гэта на парог лезе,
Ой, што гэта на парог лезе:
Чорнае, лахматае,
Хлебнае ды багатае?
— Гэта свёкарна нявехну страчае,
Нявехну страчае ды долі пытае:
— Не будзь, нявехна,
Вельмі гардліва,
Да будзь, нявехна,
Вельмі шчаслівa.

### 656. Здрыгнулася хата...

Здрыгнулася хата,
Што нявеста багата.
Прывезла кухроў пару
Ды абору тавару:

І радзюжак, падушак,
І абору цялушак.

### 657. Жанішка-брацейка...

Жанішка-брацейка,
Што ў цябе за паненачка?
Чаму на нас не дзівіцца,
Чаму да нас не хіліцца?
Яна ж думае, што чужыначка,
А гэта — жанішкова радзіначка.
Яна ж думае — чужаніцы,
А гэта — жанішковы сястрыцы.

### 658. Выкупляйце, дружкі, шапачку...

Выкупляйце, дружкі, шапачку,
Выкупляйце, дружкі, шапачку.
А не будзеце выкупляць —
Будзем столь выціраць.

### 659. Ой, мамка-вутка...

Ой, мамка-вутка,
Паварочвайся хутка.
Цяпер мы з дарогі,
Памарозілі ногі.

### 660. Ой, здзявайце вы пяньковыя...

Ой, здзявайце вы пяньковыя,
Ой, здзявайце вы пяньковыя —
Надзявайце вы шаўковыя.
Шаўковыя наляжаліся,
Шаўковыя наляжаліся —
Пяньковыя навіселіся.

### 661. Увайшла Надзечка ў новую хату...

Увайшла Надзечка ў новую хату,
Кінула вачыма па новай хаце:
Ці ёсць каму дары дараваці?
Што ні паліца, то залавіца,
Што ні паліца, то залавіца,
Што ні куточак, то дзеварочак.

### 662. Пасела каля мяне чужына...

Пасела каля мяне чужына,
Пасела каля мяне чужына
Ды ўся Коліна радзіна.
Па правы бачок — сваты,
Па левы бачок — залоўкі
Ды ўсе Коліны сястрыцы.

### 663. Я сёння прыведзена...

Я сёння прыведзена,
Усё я абгледзела.
Казалі мне людзі,
Што ў майго свёкаркі
На градцы вінаград расце,
А па разорцы ды віно цячэ.
Аж у майго свёкаркі
На градцы лебяда расце,
А па разорцы вада цячэ.

### 664. Я ж табе, свёкарка, не пані...

Я ж табе, свёкарка, не пані,
Я ж табе, свёкарка, не пані,
Я ж табе нявестка суджана.
Я ж табе хатаньку замяту,
Я ж табе вадзіцы прынясу,
Я ж цябе татачкай назаву.

### 665. Я ў цябе, свёкра, першы дзень...

Я ў цябе, свёкра, першы дзень,
Ды мая мамка пасланцоў шле:

— Ідзі, ідзі, дзіцятка, дадому,
Бо ўжо маё падвор'ейка засмурнела.

Ужо мая хатанька нямецена,
Уся мая сямейка нявесела.

### 666. Падмяту хату, падмяту і сені...

Падмяту хату, падмяту і сені
Ды і сяду на парозе.
Ой, як успомню мамчыну роскаш,
Абальюць мяне слёзы.
У маёй мамачкі крутыя горы,
Мне гуляць можна было даволі.
А ў свякрухначкі ўсюды роўненька,
Мне гуляць нявольненька.

### 667. Хадзіла Манечка ды па новай хаце...

Хадзіла Манечка ды па новай хаце,
Пыталася ў Колечкі, як матаньку зваці.

— Ой, заві, Манечка, як сваю звала,
То будзе табе ад людзей слава.

Ад людзей слава, ад мяне другая,
Што маю матаньку як сваю назвала.

### 668. У полі два дубочкі...

У полі два дубочкі,
Абодва кучаравы.
Ёсць у мяне два браточкі,
Абодва багаты.

Аддавалі мяне замуж і прыказвалі:
— Сем год не бываці.
Я ж, маладая, не ўтрымалася—
Цераз год вестачку паслала.

Цераз год вестачку паслала,
А на трэці гадок шэраю зязюлькай стала.
К роду паляцела,
Каб праведаць маці.

### 669. Каму ехаць па завівалу...

Каму ехаць па завівалу,
Ды каліна-маліна.

Старшаму дружку па завівалу,
Ды каліна-маліна.

### 670. Каго паслаць па завівалы?

— Каго паслаць па завівалы?
— Старэйшага брата
Паслаць па завівалы.
Пайшоў брацец па завівалы,
Каменні не зняў, завівалы не ўзяў.
— Меншага брата паслаць па завівалы.
Меншы брат каменні зняў,
Завівалы ўзяў.

### 671. Ды выбегла мурашачка...

Ды выбегла мурашачка
З дубовай калодзіцы,
Ды вынесла нам завівала,
Тонкія, бяленькія, як бумага, раўненькія.

### 672. Вылецела ды мурашачка...

Вылецела ды мурашачка
З цёмнага ды куточка,
Ды вынесла спавіванн'ечка,
Вечнае дзівlivanн'ечка.

Ды завілі хахлушачку,
Ванечку на ігрушачку.
Ой, каб мы ўжо яе схвацілі,
Мы б яе развілі.

### 673. Мы цябе, дзевачка, завіваем...

Мы цябе, дзевачка, завіваем,
Мы цябе, дзевачка, завіваем,
Шчасцем, доляй абсыпаем.

Ой, будзь багата, як зямля,
Ой, будзь прыгожа, як ружа,
Ой, будзь здарова, як вада.

### 674. Завівала мяне дзядзіна...

Завівала мяне дзядзіна
Чорная, як гадзіна.
Завівала, умарыла,
Слёзак не ўраніла.

### 675. Завівала мяне дзядзіна...

Завівала мяне дзядзіна,
Завівала мяне дзядзіна,
Чорная, як гадзіна.
Завіваначка старая,
Завіваначка старая,
Маю косачку сцёрла.
Сцёрла-самяла,
Пад чэпчык схавала.

### 676. Ой, рэчка, рэчка, балота...

Ой, рэчка, рэчка, балота,
Косачка мая залатая.
Не раз я цябе часала,
За адзін дзянёчак сцерла.

### 677. Нашы свахі-няўдахі...

Нашы свахі-няўдахі
Не ўмеюць касы расплятаці.
Расплятали — парвалі,
У чапец клалі — памялі.

### 678. Зірні, маці, ды на мой пасаг...

Зірні, маці, ды на мой пасаг,
Што ўсе дзеўкі ў косах сядзяць.
А на маю мілую раса ўпала,
Што нясуць ёй павівала.
Павівалачка — шэльма,
Маю косачку сцерла.
Ой, сцерла, зняла,
Пад чэпчык схавала.

### 679. Прыляцела ластаўка...

Прыляцела ластаўка,
Крылейкі адцятыя,
Крылейкі адцятыя,
А галоўка асмалена.
Прыехала дзіця ды з вянца,
Бела ручка ды звязана,
Руса каса ды расплецена.



*Народны хор в. Вялікае Падлессе (Ляхавіцкі раён)*

— Ты мой татка, ты мой татка,
Ды запляці русу косаньку,
Ды развяжы белу ручаньку.

## 680. Завівальніца скача

Завівальніца скача.
— Чаго яна хоча?
— Хоча нічога —
Князя маладога.

## 681. Не сядзі, Колечка...

Не сядзі, Колечка,
Ды не сядзі,
Паднімі завівалу
Ды паглядзі.
Маленца мы цябе падманулі,
Да старой бабы пасадзілі.

## 682. Часала дзевачка белы лён...

Часала дзевачка белы лён
Ды ганіла сватачак дамоў.
— Ды ідзіце, сватачкі, з хаты,
Дайце мне лянок дачасаці.
Як я свой лянок дачашу,
Тады сваіх сватачак пазаву.

## 683. Ды не сядзі ты, Колечка, не сядзі...

— Ды не сядзі ты, Колечка, не сядзі,
Ды не сядзі ты, Колечка, не сядзі,
Паднімі кітаечку, паглядзі.
Ці то бабанька, ці старая?
— То не бабанька, не старая,
То ж мая размова кругавая.

## 684. Чаго ты, маладзенькая, не плачаш...

— Чаго ты, маладзенькая, не плачаш,
Ты ж сваю косачку траціш.
— Хоць я косачку трачу,
Белага лебедзя пабачу.
Лебедзік, лебедзік — Ванечка,
Лебедзік, лебедзік — Ванечка,
Лебедзінка, лебедзінка — Манечка.

## 685. Ой, свахі-няўдахі...

Ой, свахі-няўдахі,
Не ўмелі касы расплятаці:
Расплятaлі — парвалі,
Пад чапец клалі — зламалі.
— Ды й ідзіце, сваханькі, дадому,
Мяшайце свінням палову.
А палова сопка —
Пазалягала глотка.
— А вы, дружачкі, за імі
Ды ешце палову са свіннямі.

## ПЕРАЗОЎ

## 686. Глядзіць дзеванька ў даліну...

Глядзіць дзеванька ў даліну,
Выглядае радзіну.
Яе радзіна п'е, гуляе,
Аб ёй не думае.
Мы ж сякеркі маем,
Мы ж галлё парубаем,
Масточкі памасцім
І дзеваньку навясцім.

### 687. Ой, добры дзень, добрыя людзі, і мы к вам!

— Ой, добры дзень, добрыя людзі, і мы к вам!
Ці не залятала наша чырачка сюды к вам?
— Хоць залятала, не залятала, не скажам.
— Хоць вы з яе крылы-пёрышкі сарвіце,
Вы пра яе хоць адно славечка скажыце,
Хоць вы ж ды яе ламаць і таўчы пастаўце,
Толькі ж яе ў госцейкі часта пускайце.

### 688. Злодзей, сватка, злодзей...

Злодзей, сватка, злодзей,
Украў нашу дачку,
Захаваў у каморачку.

І замочкам замкнуў,
І калочкам заткнуў,
І мядочкам замазаў, і нам не паказаў.

Замкнёная — адамкніце,
Заткнёная — адаткніце,
Нам наша пакажыце.

### 689. Выйдзі, Ніначка, выйдзі...




Выйдзі, Ніначка, выйдзі,
Не будзе табе крыўды,
Вынясі каліноньку,
Звесялі радзіноньку.

Выйшла Ніначка, выйшла,
Як чырвоная вішня,
Вынесла каліноньку
Звесяліць радзіноньку.

## 690. Выйдзі, Лідачка, выйдзі...

Выйдзі, Лідачка, выйдзі,
Ці няма табе крыўды?
А як маеш крыўданьку,
То пакарыся роданьку,
Забяром дадоманьку.
— Ой, мой бацюхна родны,
Трэба было не аддаваці,
Чым цяпер адбіраці.

## 691. Прывезлі мяне ды маладзіцу...

Прывезлі мяне ды маладзіцу,
Прывезлі мяне ды маладзіцу
Ў дубовую святліцу.
Я бедная ды заплакала,
Як бярозанька закапала.
— Выйдзі, пабач, мая
маманька,
Выйдзі, пабач мая родная,
Што ў цябе ды за зяценька:
Ён высокі, як дубочак,
А харошы, як паночак.

## 692. Што ж мы і хацелі...

Што ж мы і хацелі,
Тое ж і зрабілі:
З цеста паляніцу,
А з дзеўкі маладзіцу.

## 693. Свахначка-галубачка...

Свахначка-галубачка,
Прашу я вас,
Ой, штоб не было майму дзіцяці
Гора ў вас.
Ой, штоб не стаяла яна
Позвнім вечарам пад акном,
Штоб не ўціралa
Дробных слёзак рукавом.
Ой, каб не было ў яе
З лазінанькі хатанькі,
Ой, каб не было ў яе
З суседанькі матанькі.

## 694. Сваха свасе ды пакарылася...

Сваха свасе ды пакарылася,
Каб на нашу Каценьку не сварылася,
Бо наша Каценька вельмі маленькая.
Не будзіце яе, як певень пяе,
Будзіце яе, як пастух ідзе.
Певень пяе рана з поўначы,
А пастух ідзе, рана паснедаўшы.

### 695. Збірайся, родзе багаты...

Збірайся, родзе багаты,
Перапіваць тавар рагаты.
А вы, сястрыцы-цяліцы,
А вы, перазвяначкі, тонкія, бяленькія,
Як бумага, святленькія!
Перапіваў бацька кароўку
На маю бедную галоўку.
Кароўцы рана ўставаці,
А я люблю доўга спаці.
У панядзелак падаіла,
А ў аўторак працадзіла,
А ў сераду цадзілку мыла.
Дзівіцеся, людзі, збоку,
Якая гаспадыня без уроку.

### 696. Ой, зацвіла ды каліналька ў лузе...

Ой, зацвіла ды каліналька ў лузе,
Прыбудзь, прыбудзь, мая маманька, у пярэзвы.
Хоць прыбудзе, не прыбудзе — не знаю,
Сваю маманьку па голасу пазнаю.

### 697. Ой, ды на двары два калодзежы ды й вядро...

Ой, ды на двары два калодзежы ды й вядро,
Нашай Галечцы ды да матуленькі не відно.
Зраўняй, божа, горы ў далінку роўненька,
Каб нашай Галечцы было да матуленькі відненька.

### 698. Выйду на гораньку — млын меле...

Выйду на гораньку — млын меле,
Прынясі, божа, маю радзінаньку да мяне.
Ой, млын меле ды ўсякімі бакамі,
Ідзі, радзіначка, з вялікімі дарамі.

### 699. Паедзь, адведай маладую дзеваньку...

Паедзь, адведай маладую дзеваньку:
Ці добра яна жыве,
Ці хараша сям'ю заве,
Ці заве свякроў матанькаю,
Ці заве дзевяроў брацейкамі.

## 700. Ці не тут тое сяло...

Ці не тут тое сяло,
Што нашу сястрыцу ўзяло?
Ці не тут тая хата,
Куды сястра наша ўзята?

Мы так доўга стаялі,
Нашы рукі, ногі ўсталі.
Прыйшлі мы ў хатку
Ды к добраму парадку.

Пасадзіце нас да столу,
Частуйце хлебам-соллю.
Паднясіце талерачку
І белую гарэлачку.

## 701. Выйдзі, Манечка, з хаты...

Выйдзі, Манечка, з хаты,
Прыехала твая маці.
Прывезла гасцінчыка:
Пірага і сырчыка.

## 702. Дзе наш зяць падзеўся...

Дзе наш зяць падзеўся:
Ці ў клочча ўкруціўся,
Ці пайшоў сена касіці,
Каб нас не прасіці?
А мы сена пакасілі
І самі сябе папрасілі,
Выпілі, закусілі.

## 703. Харошая гаспадыня...

Харошая гаспадыня
Ды добра наварыла.
Дзе ж тая гаспадыня,
Што гэту страву варыла?
Няхай паспытае,
Ці салёная страва,
Ці добрая слава,
Ці добрая слава.

## 704. Чый жа гэта перазоў...

— Чый жа гэта перазоў
Цераз вулачку перайшоў?
— Гэта Лідзін перазоў
Цераз вулачку перайшоў.
Ад нядзелі да нядзелі,
Каб людзі паглядзелі.

## 705. Зналі мы, зналі, куды дачку аддалі...

Зналі мы, зналі, куды дачку аддалі:
Дзе сады вішнёвыя, там людзі вясёлыя,
Дзе пералазы нізкія, там суседзі блізкія,
Дзе клеці новыя, там бочкі поўныя.

## 706. Ды пагнуліся лаўкі...




Ды пагнуліся лаўкі *,
Як селі прыданкі.

Ды шчэ не так пагнуцца,
Як гарэлкі нап'юцца.

— Просім, госці, ды жывіцеся,
Вы на нас не дзівіцеся.

Мы з гэтае хаты,
Будзема вас прахаці.

— А вы нас не прасіце
Ды паболей насіце,

Парасяты ды пячоныя,
Кураняты ды вароныя.

## 707. Уздрыгнуліся сені...

Уздрыгнуліся сені
Дзе пераазвяны селі.
Яшчэ не гэтак уздрыгнуцца,
Як мядочку нап'юцца.
Мядочку саладзенькага
З кубачка залаценькага.

## 708. Бярозка мая кудравістая...

Бярозка мая кудравістая,
Свякроўка мая наравістая.
Рана ўстае, работу дае:
— Ідзі, сынок мой, травы накасі,
Травы накасі, каня папасі.

---

* Першы радок кожнай страфы паўтараецца.

А ты, нявестка, вады прынясі,
Вады прынясі і печ затапі.
Па ваду ішла — задумалася,
З вадою ішла — расплакалася.
Пачуў міленькі, каня пасучы:
— Не плач, мілая, ваду несучы,
Наплачашся яшчэ, са мной жывучы.
Пі, маці, ваду з поўнага вядра,
Жалей нявестку, бо яна ў цябе адна.
Будзе другая, ды ўжо не такая,
Будзе трэцяя яшчэ «лепшая».

### 709. Хоць вы мяне таўчы, малаціць застаўляйце...

Хоць вы мяне таўчы, малаціць застаўляйце,
Але мяне часта ў госці пускайце,
Бо я ж у вас таўчы, малаціць умею,
А прасіцца часта ў госці не смею.

### 710. Пілі бацькі нашы...

Пілі бацькі нашы
Ды пілі, папівалі,
Ды і нам прыказвалі,
Каб па поўнай выпівалі.

### 711. Ой, сваценка наша...

— Ой, сваценка наша,
Смачная капуста ваша!
— Тры дні варылася,
Тры мышы ўвалілася.

Бегла кошка з печы,
Памачыла хвост і плечы.

### 712. Ой, сваценка-салавейка...

Ой, сваценка-салавейка,
Як у цябе харашэнька!
А ў нашага сваценкі на руцэ
Вышываныя рукаўцы.
Ці зязюленька накавала,
Ці сваценка вышывала?

### 713. Па ўсім сяле ціхенька...

Па ўсім сяле ціхенька,
А ў нашага свата весяленька.
Ой, п'юць мяды саладзёныя,
Гарэлачку якавітую
За дзеваньку працавітую.

### 714. Каля новага млына...

Каля новага млына
Ды вутачка плыла.
Плыла яна, паплывала,
Манечку дзівавала.
— Не дзівуйся, Манечка,
Яшчэ ж табе дзіўней будзе,
Як вячэры не будзе.
Самі сядуць вячэраці,
Цябе пашлюць да броду
Па халодную воду.
Пакуль вады прынясла,
Ды і вячэра адышла.
— Ой, свякроўка, мая матанька,
Я вадзіцы прынесла
І лыжачкі памыла.
Каб мая маці знала,
Дык вячэры прыслала.

### 715. Швагерчык-маладзец, бывай здаровы...

Швагерчык-маладзец, бывай здаровы!
Дзяўчына-сястрыца, з намі дадому!
Тут табе сцежачкі невядомыя,
Тут табе сцежачкі невядомыя.

Па гэтых сцежачках блудзіць будзеш,
А цябе суседушкі судзіць будуць:
Не папытаешся — скажуць: нямая,
А папытаешся — скажуць: дурная.

### 716. Як не будзе па чужых хатах хадзіці...

Як не будзе па чужых хатах хадзіці,
Ды не будзе сваю свякроўку судзіці.
Ды не будзе каморачка за хатку,
Ды не будзе суседачка за матку.

А як будзе па чужых хатах хадзіці,
Будзе, будзе сваю свякроўку судзіці.
Ды будзе, будзе каморачка за хатку,
Будзе, будзе суседачка за матку.

### 717. Стаіць конік на стаенцы, рагоча...

Стаіць конік на стаенцы, рагоча,
Брат с сястрою расстацца не хоча.

Стаіць конік на стаенцы, ножкаю туп,
Няма ж табе, мая сястрычка, жыцця тут.

Конік на стаенцы паляжыць,
А мая сястрычка ў суботаньку прыбяжыць.

## 718. Прапіла маці дочку...




Прапіла маці дочку
На салодкім мядочку.

Напілася ды й скача,
А праспаўшыся, плача:

— Добра было прапіваці,
Цяжка будзе аддаваці.

Коліць мамцы ў грудзі —
Павязуць дочку ў людзі!

Колюць мамцы ў пяты —
Павязуць дочку з хаты!

## 719. Дадому, сваты, дадому...

Дадому, сваты, дадому,
Паелі коні салому.

І грэчану мякіну,
І пад плотам крапіву.

## 720. Круглае балота...

Круглае балота
Ды на ім ягад густа.

Там Ніначка ягады брала,
У свой край паглядала:

Ці не едуць госцікі прыданыя,
Іх вазы маляваныя, конікі ўбраныя.

## 721. Ой, на моры ды на дошчачцы...

Ой, на моры ды на дошчачцы,
Там дзеванька ды палошчыцца.
Ды палошчыцца ды ўмываецца,
Яшчэ і на шлях углядаецца:
Ці не едзе мая маманька,
Ці не едзе мая родненька,
Ці не вязе мне гасцінчыка,
Чырвонага ды Васільчыка.
Ой, не рада я гасцінчыку,
Так як рада я Васільчыку.

## 722. У панядзелак рана...

У панядзелак рана,
У панядзелак рана,
Там сіняе мора грала.
Там Галюхна ды воду брала,
У свой край паглядала:

Ці не едзе мой татачка,
Ці не едзе мой родненькі,
Ці не вязе мне гасцінчыка?
Не так рада я гасцінчыку,
Як я рада свайму татачку.

## 723. З віннага калодзежа...

З віннага калодзежа
Ды дзяўчына ваду брала,
У свой край ды пазірала,
З саколікамі ды размаўляла:

— Ляціце, мае вы саколікі,
Ляціце ды ў маю старонку.

Накажыце мацi, татачку,
Што я тут ды не прывыкну.

Тут горы ды высокія,
Калодзежы ды глыбокія,
Зямля камяністая,
Сям'я ды наравістая.

## 724. Кляновая лісцінанька...

Кляновая лісцінанька,
Куды цябе вецер нёс:
Ці ў гару, ці ў даліну,
Ці назад на раўніну?
Маладая Манечка,
Куды цябе бацька аддаў:
Ці ў туркі, ці ў татары,

Ці ў турэцкую зямлю,
Ці ў шляхецкую сям'ю?
Там зямля камяністая,
Там сям'я наравістая.
Тваю ходу пераходзяць,
I работу пераробяць,
I мову перамовяць.

## 725. Нешта ў лесе зашумела...




Нешта ў лесе зашумела,
Эй, сасна з ветрам гаварыла.

— Ой ты, вецер, ты мой вецер,
Эй, не вей, вецер, нада мною.

Не вей, вецер, нада мною,
Эй, павей, вецер, над ялінóю.

Павей, вецер, над ялінóю,
Эй, над ялінòю зелянòю.

У каморы зазвінела,
Эй, цешча з зяцем гаварыла.

— Ой ты зяцю, ты мой зяцю,
Эй, не карай маёй дзіцяці.

Не карай маёй дзіцяці,
Эй, не тры яе маладосці.

Не тры яе маладосці,
Эй, пускай к матцы часта ў госці.

У нядзельку параненька,
Эй, у гадочак хоць разочак!

## 726. Дайце, свахі, ды пірага...

Дайце, свахі, ды пірага,
Вазьмём вала ды за рага.

А сівую кабылу ды за грыву,
А свахначку за чупрыну.

Ды павязём іх на таржок,
Ды купім сабе піражок.

## 727. Стаяла Надзечка на прымосце, стаяла...

Стаяла Надзечка на прымосце, стаяла
Ды звала мамачку к сабе ў госці:
— Ой, прыбудзь, мамачка, ка мне ў госці, ой, прыбудзь.
Як будзеш ехаць каля рыначку, як будзеш,
Не купляй пірагоў, не купляй.
Ой, купі, мамачка, салавейку, ой, купі.
Салавейка раненька шчабятаць будзе,
Нас, маладых, пабуджаць будзе.

### 728. Каліна-маліна галлё паламала...

Каліна-маліна галлё паламала.
Як я была ў маці, то й гора не знала.
Як замуж я пайшла, ды свякруха ліхая
Сама рана ўстала, мяне не разбудзіла.

Ды пайшла па суседзях, узяла ды асудзіла.
— Уставай, нявестка,
Уставай, маладая,
Ідзі даі карову, што ад бацькі прыгнала.

— Не, не пайду даіць карову, што ад бацькі прыгнала,
Пайду даіць карову, што ад свёкра дастала.
— Чужыя каровы гуляюць у дуброве,
А мая нявестка ўсё спіць у каморы.

### 729. Ды прыехала маці...

Ды прыехала маці
Ды адведаці дзіцяці:
Ці піла, ці ела,
Ці піла, ці ела,
Ці добра спала?
Можа яно ды не ела,
Можа яно ды не ела,
Як учора павячэрала.

### 730. Пабудзь, дачка, з тыдзень...

Пабудзь, дачка, з тыдзень,
Для цябе горы ды паніжуцца,
Калодзежы ды набліжуцца,
Зямля параўнее, сям'я ды пасмірнее.

### 731. Ой, мая мама...

Ой, мая мама
Мяне рана падняла.
Ой да, ой да, рана падняла.

Красату маю згубіла,
Рана замуж аддала.
Ой да, ой да, рана замуж аддала.

### 732. Ой, каб я знала...

Ой, каб я знала,
Што мне будзе замужам ліха,
То гуляла б і сядзела б
У сваёй маманькі ціха.

І радзіна далёка,
І дзяціна малая.
Завяла, засохла
Яшчэ і сама маладая.

Ой, я тую каліну
Паламлю і ў печ кіну.
Завяла і засохла
Яшчэ і сама маладая.

### 733. Аддала мяне маці...

Аддала мяне маці
На чужую зямлю ды ў вялікую сям'ю.
Сям'я пасела вячэраць,
А мяне адправілі па ваду.
Гара высокая, вада далёкая,
Хутка не вярнуся.
Я крынічку знайшла, зачарпнула паўвядра,
Пакуль дадому прыйшла,
Ды слязьмі даліла.
А вялікая сям'я павучае мужыка:
— Чаму жонкі не б'еш, чаго волю даеш?
— А за што ж яе біці?
Яна ўмее ўсё рабіці,
Пісаць, чытаць
І па садзіку гуляць.

### 734. Дзе ж нашы гадаваныя...

Дзе ж нашы гадаваныя,
Любімыя, каханыя,
Якія з намі елі, пілі,
Ад нас паляцелі.
Чаму з намі не вітаюцца,
Пра здароўе не пытаюцца?

### 735. Выйдзі, Надзечка, выйдзі...

Выйдзі, Надзечка, выйдзі,
Ці няма табе крыўды?
Як маеш крыўданьку,
То скардзіся роданьку,
Забярэм дадоманьку.
— Ой, мой бацэньку родны,
Было лепш не даваці,
Чым цяпер забіраці.

### 736. Наехала пераразвян...

Наехала пераразвян
Поўны двор,
Рубаюць дрэва
І ўсё клён,
Робяць скрыпанькі на выбор.
Грайце, скрыпанькі, голасна,
Каб было баценьку жаласна.

### 737. Маладая Надзечка...

Маладая Надзечка
На вуліцу выбягае,
К дарожаньцы прыпадае:
Ці шуміць дуброванька,
Ці звініць дарожанька,
Ці едзе маценька,
Ці вязе гасцінчыка —
Бяленькага сырчыка?

### 738. Як паеду каля млына...

Як паеду каля млына,
Стаіць дзеўка, як маліна,
Хустачкай пакрытая,
Слёзанькамі ўмытая.
Каб я гэту бяду знала,
Не йшла б замуж ды гуляла.
Цяпер трэба прывыкаці
Позна легчы, рана ўстаці,
Дзевяць кароў падаіць,
Дзяжу хлеба замясіць.

### 739. Ой, што за гадзінанька настала...

Ой, што за гадзінанька настала,
Што Надзечка па радзінаньку паслала?
Паслала чатыры кані, пяты воз,
Каб з тым вызнаці, што прывёз.

### 740. Там, на возеры, плавалі качаняты...

Там, на возеры, плавалі качаняты,
Ужо табе, Надзечка, мінуцца дзяўчаты,
Там, на возеры, плавалі індыкі,
Ужо табе, Надзечка, мінуцца музыкі.
Там, на возеры, плавалі качоры,
Ужо табе, Надзечка, мінуцца вячоры.

### 741. Выйшла Надзечка на загуменне...

Выйшла Надзечка на загуменне,
На шырока поле.
Ой, поле, поле, ды не бацькі майго,
Ды не бацькі майго — свякорка майго.

У майго баценькі загоны вузенькі,
Загоны вузенькі, межы блізенькі.
А ў майго свякорка загоны шырокі,
Загоны шырокі, межы далёкі.
А мая свякроўка умна-разумна,
Умна-разумна і шчаслівая.
Стаўляе дочак па дзве на загон,
Мяне, маладую, на загон самую.
— Жні, нявестка, не адгінайся,
На маіх дочак не спадзявайся.
Мае дочкі пажнуць, павяжуць,
Табе, маладзенькай, праўду не скажуць.
Да мяжы дажнуцца, вадзіцы нап'юцца,
З цябе, маладой, ды й пасмяюцца.

## 742. Ці высока салавей гняздо ўе?

Ці высока салавей гняздо ўе?
Ці ўсім пераззвянам месца е?
Каму няма, кажыце,
Да месца па крэслы бяжыце,
Найпярод бацькоў садзіце.

## 743. Ой, у полі вішанька трайчаста...

Ой, у полі вішанька трайчаста,
Бывай, бывай, ты мой баценьку, часта.
— Ой, як жа мне, маё дзіцятка, бываці,
Калі да цябе і дарожанькі не знаці.
Чырвонаю ды калінаю зарасла,
Зялёнаю ды малінаю завісла.
— Ой, як будзе мой свёкарка багаты,
То заставім тую каліну рубаці,
Каб было тую дарожаньку знаці.

## 744. Стаіць конік ды на стаенцы рагоча...

Стаіць конік ды на стаенцы рагоча,
А брат з сястрою расставацца не хоча.
Стаіць конік ды на стаенку ножкаю — туп,
Ды ўжо табе, сястрынка, жыці тут.
Ой, ты, конік, ды на стаенцы паляжы,
А ты сястрынка, у суботаньку прыбяжы.

## 745. Ой ты, сваце, сівы селязеню...




Ой ты, сваце, сівы селязеню,
Пазваў на абед, заві на вячэру.

Прыпеў *:
Ой, каб наша бяседанька
Ды ўся была вясёленька
Ў свайго свата за сталом,
У свайго свата за сталом.

Ой ты, сваха, сівая галубка,
Пазвала на абед — варочайся хутка.

Кашка з маслам — не з маім шчасцем,
Рыбка з перцам — не з маім сэрцам.

Піці-есці не буду, не хачу —
Грайце, музыкі, то я вам паскачу.

## 746. Чарачка мая...

Чарачка мая,
Срэбраная,
Залатымі беражкамі
Аблажоная,
Ой, аблажоная.
Каму чару піць —
Здраваму быць.
Пані Галі
Чару выпіваць,
Ой, чару выпіваць.
Ой, чарачка, чарачка,
Якая ты добра,
Якая ты зверху,
Такая ты зодна.
Ці мне цябе выпіці,
Ці мне цябе выліці?

* Прыпеў паўтараецца.

Як я цябе вып'ю—
Вясёлая стану,
Як я цябе выллю—
Сорама дастану.
Сорама,
Эх, сорама!

Ой, хто п'е—
Таму налівайце,
Хто не п'е—
Таму не давайце.
А я буду піці, піці,
Як малыя дзеці, дзеці,
Засунуся ў куток—
Па дзве чаркі ў раток.
Здорава,
Ой, здорава!

Ой, хто п'е—
Той крывіцца,
Хто не п'е—
Той дзівіцца.
А я буду піці, піці,
Як малыя дзеці, дзеці,
Засунуся ў куток—
Па дзве чаркі ў раток.
Здароў будзь,
Ой, здароў будзь!
Ой, калі ж піці—
То піці да дна,
Ой, то піці да дна.
А калі спаці—
Да белага дня,
Ой, да белага дня.
Ой, хто верна мяне любіць,
То той мяне прыгалубіць,
Душачка мая,
Ой, душачка мая!
А хто ж цябе
Піці будзе,
То той доўга
Жыці будзе.
Ой, выпіла, выхіліла,
Сама сябе пахваліла,
Што я добрага роду,
П'ю гарэлку, як воду.
Гарэлачка не вада,
Напіціся не шкада.
Гарэлачка шумна.
Давядзе да гумна.
А на гумне сена
Парэжа калена.
А ў старане салома
Да й наробіць сорама
Сорама,
Эх, сорама!

Ой, выпіці—то то я,
Закусіці—то то я,
Да работы—баляць бокі,
Да кудзелі—галава,
З хлопцамі пагуляці—
То ахвота мая!

### 747. У нашага свата...

У нашага свата,
Саламяна хата,
Сені маляваныя,
Гуляем п'яныя.

У нашага свата
Новая хата,
Сені з бярозы,
Гуляем цвярозы.

Учэсна, учэсна, Надзечка,
Участавала радзіну.
Участаваўшы, правяла,
За калін масточак завяла
Ды й дарожаньку паказала.

## 748. А ты, півавар...

Allegro ♩ = 132




А ты, півавар,
Піва налівай,
А ты, музычэнька,
Весяленька грай.
Ой, каб наша бяседанька
Заўжды была весяленька,
Сваціейка за сталом!

## 749. Як з'едзем мы на мяцёны двор...

Як з'едзем мы на мяцёны двор,
То выносьце нам ды цясовы стол,
Пастаўце бочку мядочку,
Дайце нам па кубачку
За нашу галубачку,
Што яна к вам пераляцела,
З намі жыць не захацела.

## 750. Маладая дзеванька...

Маладая дзеванька,
Як ты тут прывыкаці будзеш?
Тут горы высокія,
Калодзежы глыбокія,
Тут сцежкі невядомыя,
Сусекі незнаёмыя.
— А я сцежкі павытапчу
І не буду блудзіці,
Я з суседкамі пазнаёмлюся,
Буду гаварыці.

### 751. Цераз бор сасна калыхалася...

Цераз бор сасна калыхалася,
Дачка к татачку сабіралася,
Каліначкай умывалася,
Бяліначкай уціралася.
Каліначка, пакрась мяне,
Бяліначка, пабялі мяне,
Каб я ў татачкі
Любая госця была.

Я да таткі іду,
Усё вяночкі пляту,
Ад таткі іду — разрываю,
Па кветачцы раскідаю.
Я к татку на двор —
Мёд-віно на стол.
Ад таткі са двара —
Мёд-віно са стала.

### 752. Селі пераазвяны, селі...

Селі пераазвяны, селі
Чорнага вала з'елі,

Чорнага, рагатага
У свата багатага.

### 753. У нядзелю рана...

У нядзелю рана,
Чуць сонейка ўсходзіць,
Мужыкова маці
Ужо па хаце ходзіць.
Усё па хаце ходзіць,
Лучыну ламае.
Свёкар яшчэ горшы,
Вачыма маргае.
Мае залавіцы
Ходзяць, як звярыцы,
Слова не прамовяць,
А ўсё цугам ходзяць.
Мая братавая
Хораша гуляе,
А я, маладзенька,
Слёзы праліваю.

У нядзелю рана,
Чуць сонейка ўсходзіць,
Мужыкова маці
Ды нявестку будзіць:
— Ці ты спіш, ці не спіш,
Бадай ты не ўстала.
Ідзі выгань тое,
Што з дому прыгнала.
А я, маладзенька,
Рана ўсхапілася,
Дробнымі слязамі
Без вады ўмылася.
Ой, нашто ж ты мяне браў
З чорнымі вачыма?
Трэба было браці
З велькімі грашыма.
Ой, нашто ж ты браў мяне
З чорнымі брывамі?
Трэба было браці
З коньмі, з каровамі.

### 754. Ой, блудзілі прыданачкі...

Ой, блудзілі прыданачкі,
Ой, блудзілі прыданачкі.
Блудзілі ў чыстым полі
Ды дарожаньку згубілі.

Вылецела, выбегла вуценя,
Сюды-туды, прыданачкі,
Ды да сяла,
Бо тут наша дзеванька весяла.

### 755. Ой гуляйце, прыдане, гуляйце...

Ой гуляйце, прыдане, гуляйце,
Вы ж сабе конікі не дбайце.
Бо наша Ганначка вам рада,
Пагнала конікі да стада.
Не так да стада, як да чарады,
Загадала гуляці аж да серады.

### 756. Маладога маці...

Маладога маці,
Устаўшы раненька,
Зязюльку праслаўляе:
— Дзякуй табе, зязюлька,
Дзякуй табе, шэрая,
Што ты мне прыкавала
На поле — работніцу,
А ў хату — ахвотніцу.

### 757. Слава богу, сына ажаніла...




Слава богу, сына ажаніла
Да нявесткі даждала.
Да не буду хлеба пекці,
Да не буду хаты месці,
Да не буду ложак мыці,
Ой, я буду да парадачак весці.
Ой, дай, божа, ляльку,
То я буду за няньку.

### 758. Думай, свякруха, яшчэ і гадай...

Думай, свякруха, яшчэ і гадай,
Чым нявестачку карміць:
Ці сырнічкам, ці наліснічкам,
Ці варэнічкам у масле.

### 759. Дзе ж наша Манечка...

Дзе ж наша Манечка,
Дзе ж яна забарылася,
Ці па ваду пайшла,
Ці ў клеці замкнулася?
— Мы ж па ваду не пасылалі,
Мы ў клець не замыкалі.
Сядзіць яна за скам'ёю,
Мёд і віно пералівае.
Мёд і віно ды гарэлачку,
Ужо ж яна ды не дзевачка.

### 760. Як селі прыданкі...

Як селі прыданкі —
Увагнуліся лаўкі.
Яшчэ лепей увагнуцца,
Як гарэлачкі нап'юцца,
Як гарэлачкі нап'юцца
Ды больш наядуцца.

### 761. Прыданачкі, мае галачкі...

Прыданачкі, мае галачкі,
Напіцеся ды са шкляначкі.
Напіцеся ды з кубачка,
Тут жа ваша галубачка.

### 762. Прыданыя дамоў едуць...

Прыданыя дамоў едуць,
А Вольгачку тут кідаюць.
А Вольгачку тут кідаюць
Ды Мікалайку прыказваюць:
— Не бі ж яе дубцом,
А карай яе слаўцом.
Не бі ж яе нагайкаю,
Ды заві ж яе хазяйкаю.

### 763. Ой, рэчка, рэчка Славечна...

— Ой, рэчка, рэчка Славечна,
Чаго ж ты не цячэш?

— А як жа мне, рэчцы, быстра цеч,
Калі ж на мяне ўсе лозанькі нахіліліся,
Усе лозы спалі.

— Ой, Ніначка, чаго ж ты хмурненькая?
Ты ж учора была вясёленькая,
А сёння хмурная.

— Абсела мяне чужына,
Уся Валодзіна радзіна.

### 764. Не плач, Надзечка, у нас добра будзе...

Не плач, Надзечка, у нас добра будзе,
Нашы жорны самі мелюць,
З-пад печы сама вада цячэ.

Наша кошачка лыжкі памые,
Наша кошачка лыжкі памые,
Наша Надзечка ў кулак не завые.

### 765. Бяру я ягаданькі...

Бяру я ягаданькі
І не ведаю чаму
Ды не ведаю каму.
Занесла б я бацeньку,
Але ён далёка ад мяне.
Занесла б я свёкру,
Ды не захоча ён узяць ад мяне.
— Ой, нявеста небагатая,
Ягадкі твае кіслы,
Бо ты мне не пад мыслі.

### 766. Ой, у бары, у бары...

Ой, у бары, у бары
Ды каліна жаркая.

За добрым чалавекам
Ды жонка гаворкая.

Як яна загаворыць,
То як у званы зазвоніць.

Як яна заспявае,
То як у скрыпку зайграе.

Як яна засмяецца,
То салавей дзівуецца.

### 767. Была хата ж, як цямніца...

Была хата ж, як цямніца,
А цяпер жа, як святліца.

Пасадзілі мяне пад паліцаю
Ды й назвалі ж мяне маладзіцаю.

### 768. Памалу, сватове, памалу хадзіце...

Памалу, сватове, памалу хадзіце,
Цясовыя столікі не зварушыце,

Нашае Надзейкі не ўгнявіце,
А то потым не ўцешыце.

### 769. Сядзем жа мы...

Сядзем жа мы
Ды не так, не сяк.
Дайце нам ды маток нітак,
Будзем мы ніці віці
Ды гарэлачку піці.
Гарэлачку саладзенькую
За дзяўчыну маладзенькую.

### 770. Старая хата, новая печ...

Старая хата, новая печ,
Старая хата, новая печ.
Не ўмее Танечка бліноў печ.
На яе свякруха крычыць,
За яе Колячка заступаецца:
— Ой, годзе, маці, паграseveraжаці,
Учора была дзеўкаю,
Сёння стала жонкаю.

### 771. Ой, у клеці, у клеці...

Ой, у клеці, у клеці
Ды на пераклеці.
Там свякроўка ступіла,
Нявестку будзіла:
— Уставай, нявестка,
Пірагі мясіці
Ды знайдзі, нявестка,
Чым дзяжу накрыці.
— Вазьму, маманька,
Я льнянога своя,
Накрыю дзяжу і стола.

### 772. Дзень добры, сястрычка...

— Дзень добры, сястрычка,
Ці жыва, здарова?
Ці жыва, здарова,
Ці добрая доля?
— Добрая, браток, доля,
Не зычу нікому,
Нават ворагу свайму.
Хвартушок тоненькі
Слёзак поўненькі.
— Не плач жа, сястрычка,
Ты ж таго хацела.
Я ж хацеў ды не даці,
Ты ж стала плакаці.

### 773. Праз маю хату, мае сені...

Праз маю хату, мае сені
Зязюлька ляцела.
А не даў мне бог, не судзіў мне бог
За каго хацела,
Ад каго піла, ад каго ела, падарачкі мела.
Каго не любіла, насмяхалася,
Таму я дасталася.

### 774. Ой, чэсна-чэсна Лідачка...

Ой, чэсна-чэсна Лідачка
Ды й частавала радзіну.
Ды й частуючы, правяла,
За калінавы мосцік завяла
Ды й дарожку ўказала.
— Радзіначка мая,
Ды бывай ты здаровая, як зіма,
Ды бывай вясёлая, як вясна,
Ды бывай ціхая, як лета,
Ды бывай багатая, як восень.

### 775. Ой, мой баценька родны...

Ой, мой баценька родны,
Выбірайся дадому,
Не рабі мне дагону.
Будуць мяне даганяці
І весь век наракаці,
Што загубіла нам хату
Вялікаю дружынаю,
Сваёю радзінаю.

### 776. Браточкі ад'язджаюць, сястрыцу кідаюць

Браточкі ад'язджаюць, сястрыцу кідаюць.
— Браточкі мае родныя, як паедзеце дадому,
Вазьміце мяне з сабою.
— Сястрыца мая родная, не на тое аддавалі,
Каб цябе дамоў бралі,
А за тое аддавалі, каб за цябе пагулялі.
Не жаль жа нам сівога каня валаска,
А жаль нашай сястрыцы галаска.
Не жаль жа нам сівога каня падковы,
А жаль нам сястрыцы размовы.

### 777. Кукавала зязюленька ў жыце...




Кукавала зязюленька ў жыце,
Пакідаем Светачку тут жыці.

### 778. Ой мы, прыдане, паедзема...

Ой мы, прыдане, паедзема,
Цябе, Надзечка, тут пакінема.
А ты, Колечка, глядзі, глядзі,
Ёй чаравічкі купі, купі,
Каб яна боса не хадзіла,
Каб гаршком вады не насіла.

### 779. Не пайду я дадоманьку...

Не пайду я дадоманьку,
Буду тут начаваці.
Буду тут начаваці,
На бацькавай сенажаці.
Бо ў доме чужа маці,
Чужа маці, чужы бацька.
У варотах сустракаюць,
Грабелькі з рукі бяруць,
Вядзерачка даюць.
— Ідзі, нявестка, да броду,
Па халодную воду.
Не так ім хочацца напіціся,
Як з нявесткі пакпіціся,
Не так вады жадаючы,
Як нявестку збываючы.

### 780. Не жаль нам каліны...

Не жаль нам каліны,
Не жаль нам каліны,
Што галубы абдзяўбалі,
А пташачкі ды абабралі.
А жаль нам дзяўчыны,
Што адну аставілі:
Без роду, без племені,
Без роднага бацюхны.

### 781. Ды падзякуем свату...

Ды падзякуем свату
За паўнюсеньку хату,
Каб ён сыноў жаніў,
Каб ён дачок аддаваў
Ды нас на вяселле зваў.

## ПРЫПЕЎКІ І ТАНЕЦ

### 782. Падушачкі, падушачкі...




Падушачкі, падушачкі
Ды ўсе пухавыя.
Малодачкі, малодачкі
Ды ўсе маладыя.

Сцялю, сцялю пасцелечку,
Сцялю пухавую.
Каго люблю, каго люблю,
Таму падарую.

Янку люблю, Янку люблю,
Янку пацалую,
Пуховую падушачку
Яму падарую.

На пуховай падушачцы
Добра паляжаці,
З маладою Марылькаю
Добра жартаваці.

Жыта маё веянае
Сыпалася з меха.
Жонка ж мая маладая,
Бярэць мяне ўцеха.

## ДЗЕЛЯЦЬ КАРАВАЙ

### 783. Сейся, авёс ранні...

Сейся, авёс ранні,
Прыбывай, родзе слаўны:
Дзядзюхны і цёткі,
Брацейкі і сястрыцы
Каравай дзяліці.

### 784. Ды рана ж, рана...

Ды рана ж, рана,
Ды ў нашым двары вяселле.
Ды рана ж, рана,
Ды ў нашым двары святліца.
Ды рана ж, рана,
Ды ў святліцы скам'іца.
Ды рана ж, рана,
Ды на скам'іцы скацерка.
Ды рана ж, рана,
Ды на скацерцы каравай.
Ды рана ж, рана,
Ды ўгадайце баяры.

Ды рана ж, рана,
Што ў нашым караваі.
Ды рана ж, рана,
Ды з сямі крыніц вадзіца.
Ды рана ж, рана,
Ды з сямі саліц саліца.
Ды рана ж, рана,
З сямі курак яечка.
Ды рана ж, рана,
Ды з сямі каровак маслечка.

### 785. Дзе ты бываў, дзе ты бываў...

— Дзе ты бываў, дзе ты бываў,
Слаўны караваю?
Што ты відаў, што ты відаў,
Слаўны караваю?
— Бываў жа я, бываў жа я
У чыстым полі,
Відаў жа я, відаў жа я
Месяц з зарою.
Месяц ясны — Іванка,
А ясная зара — Мар'янка.

### 786. Старшая каравайніца...

Старшая каравайніца
Да па полю гарцавала
І птушачкі цалавала,
З зайчыкамі танцавала.
— Заенька да шэрэнанько да бялесенько,
Паскач, зайка, куды хоч,
Бяры сабе пару, катору хоч.
Як зайка наш будзе,
Так нам прыбудзе.

### 787. Не стой, каравай, у жыці...

Не стой, каравай, у жыці,
Годзе табе служыці.
Служыў ты нядзеленьку і панядзелак,
А ў аўторак — людзей сорак.
Трэба цябе раздзяліці.
Трэба цябе раздзяліці,
На мір божы распусціці.

### 788. Ой, рана-рана ды за гарою новы двор...

Ой, рана-рана ды за гарою новы двор,
А ў тым двары вяселле.
Там стаяць сталы цясовыя
Ды на іх скацеркі шаўковыя.
— Угадайце, баяры, што ў нашым караваі?

— І з сямі палёў — пшанічанька,
І з сямі крыніц — вадзічанька,
І з сямі курэй — яічанька,
І з сямі кароў — маслечка.
— Ды ўгадайце, баяры, каму каравай краіці?
— Старшаму свату краіці!
А ён кажа:
— Я не ўмею і ножычка не маю.
Малодшы сват кажа:
— Я ўмею, я і ножык маю,
І радзіну ўсю знаю.

### 789. Катораму дружку краіці...

— Катораму дружку краіці?
— Малодшаму дружку краіці.
— Я, брацейкі, не ўмею,
Ды яшчэ і не смею.
— Катораму дружку краіці?
— Другому дружку краіці.
— Я, брацейкі, не ўмею,
Ножыка не маю, ды яшчэ не смею.
— Катораму дружку краіці?
— Старшаму дружку краіці.
— Я ўмею і смею, і ножык маю,
І каравай буду краіці.

### 790. Дружка каравай крае...




Дружка каравай крае,
Залаты ножык мае,
Срэбрану талерачку,
Шоўкаву хусціначку.

### 791. Наш дружочак красен...

Наш дружочак красен,
Яго ножычак ясен
Каравая краяці.
— А-вай...
Наш дружок каравай крае
Да й носа не ўцірае.
Дайце яму да памялішча
Падцерці насішча.
— А-вай...
Наш дружочак вельмі
харош,
Бела лічка, вусы ў нос.
Насыпце яму канапель,
Хай дзяўбе, як верабей,
Да няхай скача, як белка,
Да плача, як дзеўка.

### 792. Дружаньку, галубаньку...

Дружаньку, галубаньку,
Дай нам хоць гусаньку.
Мы пшаніцу палолі,
Ручкі калолі,
Караваю не спыталі.
Сват каравай крае,
Залаты ножык мае,
Сярэбраную талерачку,
Правую ручаньку.

### 793. Дзякуй маладой, маладому...

Дзякуй маладой, маладому
І табе, дружку,
За тваю ўслужку.
Дзякуй усім,
А каравай сама з'ем.

### 794. Дарую першаму свату...

Дарую першаму свату
Кошку гарбату,
Другому свату—
Сучку касмату,
А трэцяму свату—
Мыш хвастату,
Каб ён тую мыш злавіў,
Хвост адрубіў
І бізун зрабіў.
І павесіў на сцяне,
Каб жонка бізун брала
І кругом хаты свата ганяла.

## ГОСЦІ

### 795. Ой, пайду я ў лес па дровы...

Ой, пайду я ў лес па дровы,
Зламаю каліноньку.
Завёз мяне мой міленькі
На чужу староналньку.
А ў чужой староналньцы
Ні бацькі, ні маці,
Толькі ў саду зеляному
Салаўі шчабечуць.
Пойце, пойце, салавейкі,
Трыма галасамі,

А я пайду ў сад зялёны
Умыюся слязамі.
Ой, сарву я з ружы кветку
Ды й пушчу на воду.
Плыві, плыві, з ружы кветка,
Аж да майго роду.
Плыла, плыла з ружы кветка
Ды й стала кружыцца,
Выйшла маці воду браці
Ды й стала журыцца.
— Ой, чаго ж ты, з ружы кветка,
На вадзе завяла?
Ой, чаго ж ты, мая дочка,
Така стара стала?

### 796. Цячэ рэчанька невялічанька...

Цячэ рэчанька невялічанька,
Скочу, пераскочу,
Ой, аддай мяне, мая матанька,
За каго я хочу.
Як аддавала, то й прыказвала
У гасцях не бываці,
А як прыбудзеш, маё дзіцятка,
То й выганю з хаты.
Цярпела гадок, цярпела другі,
Трэці не сцярпела,
Абярнулася зязюленькаю,
У госці паляцела.
Полем ляцела, поле крапіла
Дробнымі слязамі,
Лесам ляцела, голле ламала
Голымі рукамі.
Як прыляцела, у саду села,
Стала кукаваці.
Выйшаў старшы брат на падвор'ечка
Ружжо заражаці.
— Маценька мая, дазволь, родная,
Зязюльку забіці,
Бо яна куе, жалю надае,
Нельга пеpажыці.
— Ой, не дазволю, ты мой сыночку,
Зязюльку забіці.
Гэтай зязюлі, як маёй дачцы,
На чужыне жыці.

### 797. Як я захачу...

Як я захачу,
Дрэва пасячу,
Да свайго роду
Крыламі далячу.
Буду лятаці,
Буду куваці,
Ці не пачуе
Родная маці.

— Ой, стары, стары,
Выйдзі з хаты.
Што гэта за пташачка ў садзе
кукуе?

— Калі пташачка,
То ў бор хай ляціць кукаваці,
А як дзяціна,
То прашу дахаты.

**798. Ой, даўным-даўно...**

Ой, даўным-даўно
Ў маманькі была.
Ужо мая дарожачка
Зеллем зарасла,
Зеллем зарасла,
Лістам запала,
Чырвонаю калінаю панавісала.
Пайду зелле ножкамі сарву,
Чырвону каліну на луг нахілю,
Да свайго татачкі ў госці пайду.

**799. Ой, даўно, даўно...**

Ой, даўно, даўно
Я ў раду была,
Дарожка мая
Дзярном зарасла.

Ой, дзярном, дзярном,
Яшчэ і дзеранінаю,
Дзе я хадзіла
Яшчэ дзяўчынаю.

**800. Сівенькая маманька...**

Сівенькая маманька
Ўстала раненька,
Зязюльку праклінае:
— Бадай табе, зязюлька,
Бадай табе, рабая,
Ды ўвесь век не кукаваці,
Што ты ў мяне адкукавала

І з поля работніцу,
І з хаты ахвотніцу.
Ой, знаці, знаці,
Што няма дачкі ў хаце:
Лыжачкі пад лаўкаю
Зараслі мураўкаю.



# вяселле ў Дружылавічах

. . . . . . . . . . . . .

*Паміж нас маладыя*
*За вясёльным сталом,*
*Павянчалася шчасце*
*Ды пад шлюбным вянком.*

*Горка, горка гарэлка*
*За вясельнай гульбой,*
*Падсалодзяць нам чаркі*
*Малады з маладой!*

*Падсалодзяць тым шчасцем,*
*Што два сэрцы зліло,*
*Каб вясёлым, мядовым*
*Век жыццё іх было!*

А. Русак

Дружылавічы — гэта вялікая, прыгожая вёска. Недзе каля двухсот хат, школа-дзесяцігодка, дзіцячы сад, бальніца, Дом культуры, пошта, сельсавет, аптэка, магазіны — не так ужо і мала. Любімае дрэва тут — вішня, якой абсаджаны ўсе сядзібы, асабліва з боку дарогі. Вясной, як бы снегам, пакрываюцца дрэвы белым вішнёвым цветам. А ў ліпені, у час ураджаю, не ўбачыш на вуліцы ніводнага дзіцяці без папяровага мяшочка, поўнага сакавітых чырвоных ягад.

Нічога, што ў спякоту тут бывае пыльна на дарогах. Затое блізка лес, у якім ёсць цудоўны бярозавы гай. Па грыбы, чарніцы, ажыну сюды едуць і ідуць з усіх суседніх вёсак.

Добра дагледжаныя палі, цэлыя плантацыі цукровых буракоў, кукурузы, бульбы «гавораць» аб тым, што тут жывуць вельмі працавітыя людзі.

Трыццаць чалавек з іх не вярнуліся з фронту. Прыблізна столькі ж загінула ў час акупацыі. На вясковых могілках ёсць брацкая магіла, якая прытуліла чатырнаццаць чалавек зажыва пахаваных і забітых жанчын, дзяцей, старых.

Як і ўсюды, тут з павагай адносяцца да старых. Сярод іх шмат народных умельцаў. Асабліва славіліся Дружылавічы сваімі «бэрдныкамы» — майстрамі па вырабу спецыяльных прыстасаванняў для ткацкага станка, якія тут называюць «бэрдамы». Жанчыны вельмі прыгожа ткуць, вышываюць і, зразумела, спяваюць.

Тыя, хто пабываў у вёсцы, не паскардзяцца на негасціннасць, а запрошаныя на вяселле — на недахоп весялосці.

Да двухсот песень выконваецца на вяселлі, большасць з іх мы друкуем. Яны запісваліся ад розных выканаўцаў. Але асноўны ма-

тэрыял запісан ад Фёклы Маркаўны Семянчук, 1900 г. н., Кацярыны Міхайлаўны Навумавец, 1904 г. н. і Антаніны Міхайлаўны Навумавец, 1931 г. н. Усе трое — карэнныя жыхары вёскі Дружылавічы.

Вяселле ў вёсцы — цэлая падзея, сапраўднае свята. Тут з дзяцінства ўсе адзін у другога на вачах. Незапрошаныя ідуць на вяселле проста паглядзець, паслухаць.

Існуе ў вёсцы з даўніх часоў вельмі цікавы, але не менш клапатлівы звычай: кожная маці загадзя рыхтуе пасаг для сваёй дачкі — вышываныя і саматканыя тонкай работы ручнікі. Чым больш па-майстэрску яны зроблены, тым лепшая майстрыха маці нявесты, тым вышэй ёй гонар і павага.

## ЗАПОІНЫ

Гэта пачатковы этап цяперашняга вяселля, які адбываецца за некалькі тыдняў да яго.

Раней гэты тэрмін залежаў ад таго, як хутка абодва бакі змогуць падрыхтавацца. Цяпер немалаважную ролю адыгрывае звычай рэгістрацыі маладых у сельсавеце па сканчэнні месяца пасля падачы заявы. Бывае, што хлопец і дзяўчына, якія, як правіла, доўга сустракаюцца, даюць адзін другому згоду на ўступленне ў шлюб, нясуць у сельсавет заяву і толькі пасля гэтага паведамляюць аб сваім кроку бацькам. Але бацькі, вядома, аб усім дагадваюцца, для іх не з'яўляецца вялікай нечаканасцю такая навіна.

У сваты ідуць звычайна маці, бацька хлопца, ён сам, хрышчоны бацька, хрышчоная маці і блізкі таварыш. З сабой яны абавязкова бяруць хлеб і гарэлку. «Добрый вэчор до хаты. Дай вам біг, шоб жылы богато і на хліб, і на грошы, і на діты харошы» — так ці прыкладна так пачынае сваю прамову сват. Далей ён паведамляе аб намеры свайго прыходу. Бацька і маці дзяўчыны запрашаюць сватоў у хату. Сама яна ідзе ім насустрач і вітаецца з усімі адразу.

Пакуль накрываюць на стол, даюць знаць блізкім сваякам дзяўчыны. Пэўнага замацавання абавязкаў у гэтым выпадку няма. Хто з хатніх дзяўчыны менш усяго заняты, той і ідзе за імі. Доўга чакаць гасцей не прыходзіцца, таму што яны загадзя папярэджваюцца.

У гэты ж вечар удакладняецца дзень вяселля, характар яго правядзення. Бацькі дамаўляюцца аб тым, чым і як будуць дапамагаць адзін аднаму ў падрыхтоўцы да вяселля.

Госці весяляцца дапазна, п'юць песні. Прычым спецыяльных вясельных песень у гэтым выпадку выконваецца мала. Вось адна з іх:

Зялёны садочак, зялёны,
Вакол руткаю апляцёны.
Ніхто ў тым садочку не бываў,

Адзін Васілька ў карты граў,
Ён сабе Ганначку намаўляў:
— Паедзем, Ганначка, з намі,
З маладымі сватамі.
— Як жа мне ехаць з вамі,
З маладымі сватамі?
Шкада мне маценьку кідаці,
Бо мая маценька старэнькая
Так, як галубка сівенькая,
Няма каму ёй пасцельку паслаці,
А як устане — прыбраці.

Так, у гэты вечар дзяўчыну «запіваюць». Часта можна чуць, што яе «засваталі». Але звычайна гэта цырымонія мае назву «запоіны».

Вядома, не заўсёды ў цяперашні час усё адбываецца па такому прыкладу. Звязана гэта перш за ўсё з тым, што жаніх і нявеста часта бываюць з розных мясцін. У гэтым выпадку звычай патрабуе, каб да вяселля дом нявесты наведалі бацькі хлопца, аказаўшы тым самым павагу дому, з якім яны павінны парадніцца.

Пярэчанні з боку бацькоў у адносінах выбару іх сына ці дачкі бываюць рэдка і носяць суб'ектыўны характар. Іх можа насцярожыць, напрыклад, дрэнная рэпутацыя дзяўчыны ці хлопца, але ніколі — матэрыяльнае становішча. Больш у наш час цэняцца сціплы нораў, бездакорныя паводзіны, ветлівасць дзяўчыны, чым яе багаты пасаг.

У наш час вяселле назначаюць у любым месяцы, арыентуючыся на выхадныя дні (суботу ці нядзелю), або любое з савецкіх свят.

## ВЯНКІ

У чацвер нявеста абыходзіць усіх дзяўчат вёскі і запрашае іх да сябе ў пятніцу на вянкі.

У пятніцу вечарам у доме нявесты пануе ажыўленне: дзяўчаты робяць з каляровай паперы кветкі і вяночкі, якія прызначаюцца дружкам з світы жаніха, чуюцца жарты, смех, песні. Спецыяльных абрадавых песень моладзь не спявае. Гэта звычайныя сучасныя песні.

Раней дзяўчаты ў гэты вечар павінны былі шыць маладой вэлюм. Паспяхова зробленым лічыўся доўгі вэлюм, які ззаду няслі хлопчык і дзяўчынка. «Няхай такімі ж доўгімі будуць шчасце і жыццё маладых», — гаварылі ў народзе. Яго прымацоўвалі да спецыяльна зробленага з воску вяночка. Вянок быў па-майстэрску выліты ў выглядзе рознакаляровых (фарбаваных) кветачак, перапляценых адна з другой, як у цяперашнім вянку з палявых кветак. За кожную з кветак «брыльянта» (так называлі гэты вянок) устаўлялася пяро паўліна. Пер'і вельмі прыгожа пакачваліся ў такт рухаў

галавы нявесты. Відавочна таму нявеста ў вясельных песнях часта параўноўваецца з павай.

Да прыезду жаніха з дружынай усе зробленыя кветкі дзяўчаты складваюць у сіта і накрываюць вэлюмам. Тое, што кветкі складваюць менавіта ў сіта, а не ў які-небудзь кошык, не выпадкова, бо перад тым як пячы хлеб і вясельны каравай, праз яго прасейваюць муку. У гэтым выражаецца павага да хлеба, які заўсёды быў для беларускага селяніна святыняй.

Дружына жаніха (як мага больш маладых хлопцаў) у асобе галоўнага чашніка таргуе ў дзяўчат вэлюм з кветкамі, каб падарыць іх нявесце. Атрыманыя грошы дзяўчаты растрачваюць на свой погляд.

Пасля «торгу» кожны чашнік просіць у дзяўчыны, якая яму спадабалася, прыкалоць яму да пінжака ці кашулі кветку з сіта. Доўга яшчэ моладзь весяліцца і толькі позна вечарам ці нават ноччу жаніх са сваёй дружынай едуць дадому.

## КАРАВАЙ

Раніцай у пятніцу маці нявесты абыходзіць сваіх блізкіх сваякоў і запрашае іх на «каравай». У каравайніцы запрашаюцца (звычайна 5 чалавек) шчаслівыя ў сямейным жыцці, добрыя, сумленныя жанчыны. Галоўнай каравайніцай, па традыцыі, з'яўляецца хрышчоная маці.

Запрошаныя каравайніцы ў абед ідуць «расчыняты» каравай: прасейваюць муку праз сіта, разводзяць яе цёплай вадой і дабаўляюць дрожджы. Для гэтага моманту ёсць спецыяльная песня:

Хто знае, што ў нашым караваі?
Цэбар вады крынічнае,
Мяшок мукі пшанічнае.

Часы чатыры цеста падыходзіць. Каравайніцы разыходзяцца па хатах.

Увечары яны прыходзяць зноў — пячы каравай. Прыйшоўшыя раней сустракаюць астатніх песняй. Маці нявесты запрашае ўсіх на кухню. Нявесце, якая выходзіць да іх, каравайніцы спяваюць:

Ой, над сялом белая лябёдка лятае,
То не лябёдка лятае, то мая мацэнька каравайнічак збірае:
— Збірайцеся, каравайнічкі, у радочак,
Як ярыя пчоланькі ў мядочак.

Рыхтуюць каравай дружна, спорна, размеркаваўшы паміж сабой абавязкі. Дзве каравайніцы месяць цеста. Ім пяюць:

Каравайнічкі, да каравай мясіце,
Да каравай мясіце,

Да госпада-бога прасіце,
Каб каравай удаўся
І ўсім дастаўся,
Каб усім дзялілі,
Усе благаславілі.

Адна падпальвае печ, астатнія рыхтуюць лапату і «обічко» (рэшата без дна), а потым робяць шышкі.

Для шышак месяць спецыяльнае цеста, прэснае, без дражджэй, таму што дражджавое дрэнна трымаецца, адвальваецца. Робяць іх так: зразаюць 2-х і 3-х-лапчатыя галінкі вішань, абкручваюць іх вузкімі палоскамі, зробленымі з прыгатаванага цеста, і абпякаюць іх перад полымем, мерна паварочваючы і змочваючы час ад часу вадой ці жаўтком курынага яйца (каб блішчалі). Нявесце на каравай робяць тры «тройчатыя» і дзве «двойчатыя» шышкі. Жаніху — дзве «тройчатыя» і тры «двойчатыя».

Замешанае для каравая (у любым вялікім посудзе) цеста перакладваюць у «обічко», змазанае знутры воскам (каб каравай добра адставаў), і даюць яму магчымасць падысці.

Каравайніцы, што мясілі цеста, мыюць рукі ў агульным посудзе (без мыла) і выліваюць ваду пад вішню. Пры гэтым спяваецца наступная песня:

Каравайнічкі, ручкі мыйце
Да на вішанькі ваду ліце,
Каб вішанькі радзіліся,
Каб дзетачкі любіліся.
Ручкі памыйце, ручніком патрыце,
Тую вадзіцу ў крыніцу зліце,
З той крыніцы вадзіцу бярыце,
Вадзіцу бярыце, вішаньку паліце:
Каб на той вішаньцы ягадкі радзіліся,
Каб на той вішаньцы галубкі любіліся,
Каб сваімі крылкамі яны абдымаліся,
Да на той вішаньцы дзеткі калыхаліся.
Свякроўка будзе іх калыхаць,
Галубочкі будуць іх забаўляць.

Паміж тым песня старэйшай каравайніцы (ці любой іншай жанчыны па яе загаду) паведамляе аб тым, што пара садзіць каравай у печ:

Каравай гіча, гіча,
Каравайнічак кліча:
— Ой, дзе ж яны забарыліся,
Што да мяне не з'явіліся.

«Обічко» з цестам ставяць на вялікую плоскую лапату, якую пасыпаюць мукой (каб цеста не прыліпла), і пад песні садзяць у печ:

Лапату вялікую шукайце,
Каравая ў печ саджайце,
Каб наш каравай высокі рос,
Каб нашага свата за бараду патрос.

Сунуць лапату з караваем у печ і лоўка дастаць яе адтуль вельмі складана. Аднаму ўправіцца цяжка. Таму дапамагаюць адна другой у гэтым некалькі каравайніц. Караваю пры гэтым жадаюць вырасці вельмі вялікім:

Расці, караваю, вышэй таго гаю,
Таго гаю зялёнага,
Васіля маладога.

Пячэцца каравай паўтары, а калі вельмі вялікі, то і дзве гадзіны. Каравайніцы тым часам рыхтуюць зеляніну для ўпрыгажэння яго. Зеляніну часцей усяго загадзя прыносяць з лесу і лугу. Каравайніцы перабіраюць яе, звязваюць адабраную ў пучкі і букецікі, каб усё было гатова да моманту ўпрыгажэння каравая.

Старэйшая каравайніца сочыць за тым, каб своечасова дастаць каравай з печы. Дастаюць яго адтуль на лапаце. Іншы раз ён можа вырасці вельмі вялікім, тады прыходзіцца разбіраць уваход у печ. Гэта самы цікавы момант усяго абраду. Усе адразу ажыўляюцца, прытанцоўваюць, пяюць:

Ой, дзе ж тыя кавалі?
Да бярыце сякеры,
Вусце ламайце,
Каравай даставайце.
Ой, дзе ж тыя кавалі жывуць,
Што вялікі сякеры куюць,
Трэба тыя сякеры браць,
Печ разбіваць, каравай даставаць.
Ой, дайце мне меч, меч
Парубаць печ, печ,
Печ парубаць.

Са змазанага воскам «обічка» каравай вымаецца лёгка. Месца, куды яго паставіць, ужо падрыхтавана. Гэта — «віко» (накрыўка ад дзежкі, у якой «росчыняюць» хлеб), на якое сцелюць сена, каб каравай не ападаў на дно. Сена накрываюць «надіжныком» (тонкі, саматканы абрус з чырвонымі краямі).

Брат выносіць каравай у пакой, дзе дзяўчаты робяць вянкі, і ставіць яго ў цэнтры стала. Пакуль каравай астывае, каля яго танцуюць, пяюць:

Багаты, Ганначка, бацька твой,
Зарадзіла пшаніца на навіне,
Да высокі стагі на двара,
А вышэй каравай на стале.

Каравайніцы патрабуюць у брата нявесты (жаніха) выкуп за каравай. Той спасылаецца на тое, што каравай яшчэ не ўпрыгожаны і выкупляць пакуль што няма чаго.

Старэйшая каравайніца аб'яўляе, што пара ўпрыгожваць каравай. Каравайніцы бяруць па шышцы і «дружно» ўтыкаюць іх у каравай. Пачынаецца ўпрыгажэнне каравая, яно суправаджаецца песнямі:

Каравайнічкі вясёлы
Прыгожанька ўбіралі,
Прыгожанька ўбіралі
Да й песню спявалі:
— Ой, дай жа нам, божа,
Да й у гэтай хаце,
Да й у гэтай хаце
Тысячу ўтаргаваць.

Пойдзем, каравайнічкі, у ціхі гай,
Нарвём барвіначку на каравай,
Будзем каравай квяціць,
Ганначцы долю дарыць.

— Ой, зялёны барвіначку,
Дзе ты рос,
На рыначку?
— Ой, я рос у гародцы,
А цяпер у рашотцы.

Старшая каравайніца
Не ў бяседзе сядзела,
Не ў бяседзе сядзела,
Па-над гаем хадзіла,
Цвет-каліну ламала,
Каравая квяціла.
І нікога не гнявіла:
Ні старога, ні малога,
Ні самога маладога.

Калі каравай упрыгожан, пяюць:

Ой, у новым дварэ,
На цясовым стале
Дарагі тавар стаіць.
Ой, не ёсць то ж тавар,
То Ганначчын каравай,
То яе заслужанька.
Заслужыла ў бацэнькі
Ні за гадок, ні за два,
Ні за чатыры нядзелькі,
А з малое дзетанькі.
Удаўся каравай, удаўся,
І ў чырвоныя кветкі ўбраўся,
То ў руту, то ў кветкі,
Каб любіліся дзеткі.

Упрыгожаныя шышкі, каб яны не скрануліся з месца, унізе перавязваюць чырвонай шарсцянай ніткай, якую потым акуратна захоўваюць. Раней жанчыны павязвалі яе на руку, калі ішлі ў поле жаць, каб не балелі рукі. Іншы раз можна пачуць, што яе падвязваюць маленькім дзецям ад нядобрых вачэй. Такая чудадзейная сіла прыпісваецца гэтай нітцы таму, што яе благаслаўляе разам з караваем увесь род нявесты (жаніха), гэта значыць вельмі шмат людзей.

Калі каравай упрыгожаны, брат нявесты згаджаецца на выкуп, які патрабуюць каравайніцы. За яго доўгія ваганні яны пяюць яму адпаведныя песні:

Гаспадар багаты—
Мядзведзь рагаты.
Баіцца падступіць,
Каравай выкупіць.

А наш Мішачка скуп, скуп,
Да па сметнічках туп, туп,
Шылячычкі збірае,
Каравай выкупляе.

Калі ён паложыць грошы на каравай, старэйшая каравайніца з паклонам перадае каштоўны дар яму ў рукі. Брат тройчы («окрунэцца» (перакруціцца) і нясе яго ў кладоўку, дзе ставіць на стол, пасыпаны зернем.

Каравайніцы праводзяць яго песняй:

Высока сонейка, высока,
Занясём каравай далёка
Да паставім на жыце,
Дай ім, божа, пражыці.
Да паставім на аўсе,
Дай ім, божа, што ўсім.

Каравай у нявесты павінен быць гатовы да прыезду жаніха са сваёй дружынай.

Гаспадары запрашаюць каравайніц за стол. Яны не забываюць пра каравай, аб чым сведчаць словы наступнай песні:

Зажурыўся каравай
Да ў каморы стоячы:
— Вы п'еце і гуляеце,
А пра мяне не дбаеце.
Адазваўся гаспадар:
— Не журыся, каравай,
Мы п'ём і гуляем
І пра цябе дбаем.

Заканчваецца застолле далёка за поўнач. Калі каравайніцы папаліся пасіўныя, мала спявалі песень, то «гледачы», якіх заўсёды больш чым дастаткова пад вокнамі (свет у час вяселля гарыць ва ўсіх пакоях і вокны не завешваюцца), абавязкова высмеюць іх наступнай песняй:

Каравайнічкі немы
Грэцку кашу елі,
Грэцка каша сопка,
Да заліпла ім глотка.

Усіх каравайніц запрашаюць на наступны дзень на вяселле.

## ПЕРШЫ ДЗЕНЬ ВЯСЕЛЛЯ

У суботу ў абедзве хаты збіраюцца госці. Да жаніха некалькі раней, таму што трэба яшчэ ехаць да маладой, у вёсцы якой заўсёды адбываецца рэгістрацыя. Такія выпадкі, калі і жаніх і нявеста з адной вёскі, цяпер бываюць вельмі рэдка. З жаніхом едзе ўся моладзь, запрошаная на вяселле, сват і самыя блізкія сваякі (браты, сёстры, цёткі, дзядзькі). Маці з бацькам застаюцца дома з запрошанымі гасцямі. На ад'езд жаніха госці спяваюць песню:

Маці сына выражала,
Месяцам апаразала,
Зорачкаю засцягнула,
Шчасцем-долею агарнула:
— Едзь, мой сыну, на Ўкраіну
Па чужое дзіця.
На чужую староначку
Па ціхую жоначку.
Чужое дзіця ціха размаўляла,
Майго сыночка сабе выбірала.
Залаты месяц цябе апаразаў,
Дарожку шчаслівую табе ўказаў,
Зоранька ясна цябе засцягнула,
Маценька твая благаславіла.

Жаніха праводзяць да ўпрыгожанага шарамі, стужкамі і кветкамі аўтобуса ці машыны, якія заўсёды выдзяляе на вяселле калгас. Усе жадаюць хлопцу ўдачы.

У доме нявесты таксама збіраюцца госці. Чуюцца песні:

Расхадзіўся ясны месяц па небу,
Збіраў ясны зоранькі ў грамаду,
Расхадзіўся бацька па сялу,
Да збіраў ён усю сваю радзіну:
— Хадзіце да мяне, да майго дзіцяці
У далёкую старонку выражаці.

Ластавачка чорненькая,
Чаго рана з выраю ляціш?
Чаго ты, дзеванька, рана замуж ідзеш?
Яшчэ ж не ўмееш гаспадарыць.
— Што не ўмею, то сумею,
Чаго не знаю, то спытаю.

Нявесту дзяўчаты адзяваюць у вясельнае ўбранне. Спецыяльных песень пры гэтым моладзь не спявае. Але ў памяці жанчын ад гэтага абраду засталося шмат цікавых і кранаючых душу песень, якія яны спяваюць за сталамі ў той час як нявесту «ўбыраюць у вэлюм».

Дзе ты, Ганначка, хадзіла,
Што твая галоўка збялела?
— Да хадзіла, дзеванькі, у вішнёвы сад,
Да на маю галоўку цвет упаў,
Хоць вецер павее—не звее,
Хоць сонца засвеціць—не звяне.

Хадзіла Ганначка па лугу,
Насіла каліну ў хвартуху,
За ёю дзеванькі хадзілі,
У яе каліны прасілі.
Яна ім каліны не дала,
А сабе вяночак звіла.

Хадзіла Ганначка ў вішнёвы сад,
Да на яе галоўку цвет упаў,
Да на яе галоўцы зацвітаў,
Да яе Васечка спадабаў.

Захацела дзеванька калінавага вяночка
Да й паслала сваю мацэньку
Да й па каліну.
Пакуль мацэнька—да луга,
То каліна зацвіла.

Акрамя таго, пяюцца такія песні:

Няпраўдзівая каліна
Да няпраўданьку казала.

Казала:
— Я галля не спушчу.
Казала:
— Я ягад не ўраджу.
Але ж яна галлё спусціла,
Але ж яна ягады ўрадзіла.

Няpraўдзівая Ганначка
Да няпраўданьку казала.
Казала:
— Я Васечку не люблю.
Казала:
— Я за яго не пайду.
А яна яго любіла
І за яго захацела.

Маценька-чарэшанька,
Вядзі мяне харашэнька:
У тонкай белай сарочцы,
Каб любілі мяне хлопцы;
У тонкай белай спадніцы,
Каб любілі панічы.

Мая маценька-кветка,
Не аддай мяне ўлетку,
Бо ў свёкра ніва шырокая,
А ў мяне сіла малая.
А аддай мяне ўзімку,
Як я ўгадую сілу.
У свёкра ніва звужэе,
А ў мяне сіла пабольшае.

З прыездам жаніха «высілныкы» пяюць ужо новыя песні:

Заехаў зяць на цесцеў двор,
Пабіў масты жалезныя,
Разліў віно зялёнае.
А цешча зяця спужалася,
За новы сені схавалася.
— Пастой, цешча, не пужайся,
За новы сені не хавайся,
Немножка нас наехала:
Семсот сватоў, акрамя братоў,
А свашачка-семілетачка
Між сватамі, як кветачка.

Ой, не сядзі, Ганначка, не сядзі,
Адчыні акенца да й паглядзі,

Ці харошы Васечка на кані,
Ці ясен месяц на небе.
— Да харошы Васечка на кані,
Да харошы мой высокі, чарнаброў,
Калі мне яго бог судзіў
І ля мяне пасадзіў.

Добрая цешча свайго зяця ждала,
Чыстым полем дарожку слала,
Каб у цёмным лесе не зарасіўся,
Каб у чыстым полі не запыліўся,
Каб у чыстым полі не запыліўся,
Каб да цешчанькі панічом з'явіўся.

Жаніху раяць:

Ой, не сядзі, Васечка, не сядзі,
Адчыні акенца
Да бяры вішанькі з кішэні,

Да давай цешчаньцы па жмені.
Цешчанька іх скаштуе,
Для цябе дочаньку даруе.

Жаніха запрашаюць у дом, але да нявесты дзяўчаты яго не пускаюць, патрабуючы выкуп. Жаніх прапаноўвае дзяўчатам то шакаладку, то каробку цукерак, то грошы. Яны нарэшце выводзяць да яго «нявесту», чым-небудзь пакрытую. Пад жарты, смех, песню

Пазнавай, Васілька,
Ці твая, ці не твая,

Ці тая, ці не тая,
Ці, можа, баба старая

жаніх адкрывае ёй твар, але гэта якая-небудзь пажылая жанчына. Ён патрабуе вывесці да яго нявесту. Тады з суседняга пакоя брат (родны або дваюрадны) выводзіць за левую руку сапраўдную нявесту. Яна ўсім адразу кланяецца і праходзіць з братам за стол пад песню:

Брат сястру за стол вядзе,
А ведучы, навучае:
— Будзь пакорна і старому, і малому,
І баценьку роднаму.

Жаніх садзіцца за той жа стол, але не побач з нявестай. Паміж імі брат нявесты і сведкі. Маці і бацька жадаюць маладым шчасця і выпіваюць да дна чарку віна, за імі следам выпіваюць усе.

Сястра нявесты ў гэты час раздае родным жаніха падарункі і абавязкова абвязвае іх ручнікамі (свата, сясцёр, братоў — накрыж).

У прошлым усё праходзіла некалькі інакш. Апраналі нявесту ў каморцы, дзе захоўваўся каравай, на дзежцы, пакрытай выробленай аўчынай ці «кожухом» (каб у яе шчасця было столькі, колькі ў іх ворсу). Брат расплятаў ёй касу і стужку кідаў на дзяўчат. Каторая яе раней схопіць, тая і замуж першая пойдзе. Ад гэтага моманту захаваліся і песні:

Брат сястрынку расплятаў,
Дзе ж тыя ўплёты падзяваў,
Ці на раку, ці на Дунай папускаў?
Ні на раку, ні на Дунай не пускаў,
Малодшай сястрынцы пааддаваў.
Ой, дзеванькі да сястрыначкі мае,
Абараніце косанькі мае.
Дзеванькі розгачкі пабралі,
Косачкі абараняли,
Розгачкі ўсе пабілі,
Косанькі не абаранілі.

На левую руку маладой павязвалі вышыты ручнік. Трымаючы за гэты ручнік, брат выводзіў сястру да гасцей. Нявеста падыходзіла да стала, за якім сядзелі «сваі» госці, і ўсім кланялася на тры бакі. За другім сталом сядзеў жаніх са сваёй «родыньню». Усім, акрамя жаніха, нявеста падавала руку і садзілася за «свой» стол.

Маці з бацькам жадалі маладым шчасця і запрашалі ўсіх выпіць. Сёстры абвязвалі ўсіх прыехаўшых сватоў ручнікамі. Застолле працягвалася да таго часу, пакуль чарка тройчы не абыдзе кругом стала.

Вельмі многа і часта на вяселлях увогуле, а ў гэты момант асабліва пяецца так званых сіроцкіх песень. Нявесту іншы раз даводзяць да слёз. У вёсцы ўвогуле лічыцца, што вельмі нясціпла весяліцца на сваім вяселлі, асабліва ў першы дзень, калі дзяўчыну павінны забраць з бацькоўскага дому.

Плакала дзеванька ў святліцы,
Прылажыла галоўку да зямліцы:
— Зямліца сырая-сырая,
За што маю мамачку забрала?
Усю сваю радзіну абышла,
Нідзе сваю мамачку не знайшла.
Будуць весці маладых на пасад,
Яна сваю галоўку скланяе,
Яна сваю мамачку шукае:
— Бедная мая галоўка ў вяночку,
Няма маёй мамачкі ў радочку.

Бедная мая галоўка ў цвеце,
Няма маёй мамачкі на свеце.

Ой, на дворыку непагоданька, мельгано,
Ой, дзесьці тваёй маценькі, Ганначка, не відно.
Ой, Ганначка, па дворыку пахадзі,
Сваю маценьку на вяселлечка папрасі.
— Ужо я не раз і не два там прайшла,
Толькі ж сваёй маценькі не знайшла.
Ой, пайшла я з гары да ў даліну
І знайшла я маценьчыну магілу.
А на той магіле каласок—
То маёй маценькі валасок.
— Хадзі, маценька, хадзі, родная, са мною,
Ці не будзе лепшага ладу з табою.
— Ой, не пайду, маё дзіцятка, не пайду.
Зрабілі мне цёмную хатачку невідну,
Не прабілі мне ні акна, ні дзвярэй,
Не прамоўлю ні славечка.

Ой, знаць, знаць, што сіроцкае вяселле,
Чорным сукном засцелена падвор'е;
Зыйшлі анёлы імглою,
Узялі яе маценьку з сабою,
Пакінулі Ганначку навек сіратою.

Сірата дзеванька, сірата
Выйшла да воза, як ружа,
Уздыхнула цяжненька:
— Мой божа, хто ж мне, сіротцы, паможа?
Адазваўся бацэнька ў святліцы:
— Я ж табе, дзіцятка, памагу,
Варанога коніка запрагу.

Хто ж там у лесе так звонка гукае?
То ж Ганначка сваю маценьку шукае:
— Да хадзі, хадзі, мая маценька, не ляжы,
Хоць адзін дзянёк мне паслужы.

Сват з боку жаніха аб'яўляе, што «чарку» сваю госці ўжо выпілі, пара адпусціць маладых узаконіць свае адносіны. Жаніха суправаджаюць сведка і адна з сябровак нявесты. Нявесту — яе брат і сведка. Пры выхадзе з дому ёй спяваюць:

Маладая дзеванька, сабірайся,
Там цябе чакаюць,
Для цябе цэркаўку адмыкаюць,
Прыстолы засцілаюць
І свечкі ставяць.

Але вядуць маладых не вянчацца ў царкву, а рэгістравацца ў Дом культуры. Калі яны жывуць не вельмі далёка, то ідуць пешкі,

у другім выпадку едуць на легкавых аўтамабілях, матацыклах, аўтобусе, якія выдзяляе калгас. Маладая сядае ў першую машыну, малады — у наступную.

Каля ўваходу ў Дом культуры маладых хлебам-соллю сустракаюць дырэктар Дома культуры і ўсе супрацоўнікі, а таксама аднавяскоўцы. Пацалаваўшы хлеб, маладыя праходзяць у актавую залу. Пры іх з'яўленні ўсе ўстаюць і стаяць, пакуль яны не пройдуць на сцэну. Гучыць вясельны марш. На сцэне ўжо падрыхтаваны стол, накрыты вышытым абрусам і двума рушнікамі. На яго ставяць хлеб з соллю. Перад сталом на падлозе разасланы вышыты ручнік. На сцэну нявесту вядуць па леваму боку, а жаніха — па праваму.

Старшыня і сакратар сельсавета праводзяць традыцыйную шлюбную цырымонію. Сведкі праводзяць маладых на «вясельны ручнік», пасля чаго яны ўжо ўвесь час трымаюцца ў пары. Ім уручаюць пашпарты, аб'яўляецца вясельны танец, распіваецца традыцыйная бутэлька шампанскага. Гучаць вершы, зачытваюцца віншавальныя тэлеграмы. Увесь час шчоўкаюць фотаапараты мясцовых любіцеляў і спецыяльна запрошанага з раёна фатографа. Павіншаваць маладых на сцэну паднімаюцца ўсе сваякі, сябры. На «горка» з залы маладая адказвае жменямі цукерак.

Каля хаты маладых сустракае маці. Яна трымае паднос з хлебам-соллю і трыма чаркамі. Маладыя цалуюць хлеб, усе трое выпіваюць з чарак, астаткі выліўшы цераз левае плячо (каб не было бяды). Іншы раз маці выходзіць насустрач у надзетым навыварат «кожуху» (каб зяць баяўся цешчы). Пасля прывітання яна запрашае ўсіх у дом.

У хаце сват з боку жаніха просіць у гасцей дазволу пасадзіць маладых на пасад:

Благаславіце, бацька і маці,
Блізкія і суседзі,
Прыезжыя і госці,
Маладых на пасад весці.

Яму адказваюць хорам: «Біг благословыть». Тады ён кладзе адну руку на правае плячо жаніха, другую — на левае плячо нявесты і гаворыць:

У гэтых маладых
Ёсць бацька і маці;
Суседзі званыя,
Госці спраханыя.
Благаслаўляю гэтых маладых
На пасад сесці.

Пасля яго слоў маладыя садзяцца побач на падушку (каб жылі па душы, былі заўсёды разам).

У час вяселля не змаўкаюць песні:

Ляцелі гусанькі цераз сад,
Прасілі Ганначку на пасад:
— Будуць цябе дарыць,
Шчасцем-долею дзяліць,
Да вялікім дарам — пасагам.

Ляцелі гусанькі цераз сад,
Прасілі Ганначку на пасад.
— Ляціце, гусанькі, то і я іду,
Благаславі, маценька, то сяду.

Прыехала Ганначка з-пад вянца
Да не прамовіць ні слаўца.
Паясок жываток цісне—
Слаўца не прапісне.
А вянок галоўку клоніць—
Слаўца не прамовіць.

Ой, цяпер Васенька вельмі рад,
Што з Ганначкаю шлюб узяў,
На белым ручнічку пастаяў.

На белым ручнічку пастаяў,
За праву ручаньку патрымаў.
За праву ручаньку патрымаў,
Залаты пярсцёначак памяняў.

Дзіцятка, ці ты ж яшчэ маё?
Маценька, ужо я не твая,
Цяпер я таго пана,
З якім я да шлюбу стала,
З кім я пярсцень мяняла.

Госці танцуюць перад хатай на вуліцы, ці ідуць у клуб, дзе заўсёды ў дзень чыйго-небудзь вяселля да паслуг маладых і іх гасцей танцавальная зала, магнітафон і прайгравальнік. Але ні адно вяселле ніколі не абыходзіцца без гармоніка і барабана. Барабаны ў вёсцы часта робяць самі: на круглы драўляны абруч нацягваюць тонка выробленую скуру і прыбіваюць медныя бляшкі. З дрэва выразаюць фігурную палачку. Гарманіста і барабаншчыка запрашаюць загадзя. Звычайна гэта хто-небудзь заднавяскоўцаў.

Самы любімы танец і ў моладзі і ў пажылых людзей — цыганачка ці «сірбіянка». Хто-небудзь з найбольш баявых дзяўчат ці жанчын выходзіць у цэнтр і просіць гарманіста сыграць «сірбіянку». За ёй выходзяць усе астатнія, і танец не прыпыняецца да таго часу, пакуль танцуючыя не праспяваюць усіх частушак, якія ведаюць. Гарманіст не адложыць гармонік да таго часу, пакуль самі танцоры не папросяць аб гэтым. Моладзь са здавальненнем танцуе і вальс і польку. Жаніху з нявестай уступаюць месца ў крузе.

Стравы на вясельныя сталы падаюцца самыя розныя, за дзень іх некалькі разоў мяняюць. Для гаспадыні і яе памочнікаў тут ёсць магчымасць паказаць свае кулінарныя здольнасці.

У прошлым жа галоўнымі закускамі былі халадзец, «густэ молоко» (тварог, разведзены смятанай), мяса, агуркі, капуста, каша, на салодкае — вараныя грушы. Лічылася, што калі паспрабаваў кашы з грушамі, дык можна і выходзіць з-за стала.

Вечарам, у самы разгар вяселля, ад дому нявесты раздаецца страшэнны грукат. Гэта галоўны сват (хрышчоны бацька нявесты) хапае качаргу ці ўхват, барабаніць ім па сценах, вокнах і моцным голасам заклікае: «На ўспомоганне!» Гэта значыць, што пара «дарыты» маладых. Усе спяшаюцца ў хату, але сват не супакойваецца і працягвае крычаць:

Хто не падарыць,
У таго воўк свінню задавіць.
Калі няма чым дарыць,
Я буду хату валіць.

У некаторых вёсках (напрыклад, в. Горбаха) маладую ідзе дарыць уся вёска. Жанчыны пры гэтым спяваюць:

Хай цябе, дзіця,
Бог успаможа,
Бог успаможа,
Доленьку ўложа.

Першыя падыходзяць дарыць бацькі. Ім спяваюць:

Станавісь, радзіна, у адзін рад
Да дары Ганначку, хто чым рад.
— Лажы мне, баценька, на стол белы грошы,
Бо я ў цябе была жанчык харошы,
Я ў цябе жала—грошай не брала.
Цяпер будуць жаць—грошыкі браць.
Першага дзянёчка—па залатому.
Другога дзянёчка—па чырвонаму.

За бацькамі дараць сваякі, суседзі, знаёмыя. Дараць цяпер у асноўным грошы. Раней маладым дарылі матэрыю, авечак, нават карову. Аб гэтым і песні:

Ці ў цябе, Ганначка, радзіны няма?
Няма каму ў канец стала стаць,
Песеньку заспяваць?
— Ой, ёсць у мяне радзіна,
Ёсць і маценька адзіна,
Яна ў канец стала стане,
Песеньку заспявае.

Станавісь, род багаты,
Да дары статкам рагатым,
З бычкамі і авечкамі,
З ярымі пчоланькамі.

Станавісь, радзіна, у адзін рад
Да дарыце Ганначку на стале,
Хоць па шылячычку злажыце,
Маладую здарыце.

Калі маладую «здараць», хрышчоны бацька жаніха аб'яўляе, што пара «рушаты до дому». Але брат нявесты не хоча аддаваць сваю сястру. Сват прапаноўвае яму выкуп. Спяваюцца песні:

Ой, я сястры не аддам
І за грошы не прадам.
Мая сястра міла
Сядзіць, як каліна.

Брацейка да намеснічак,
Сядзь са мною ў крэслачка
Да ўмей таргаваці,
Як сястру прадаваці.

Калі брат сыходзіцца са сватам у цане, спяваецца:

Татарын, браток, татарын
Прадаў сястрынку дарам,
А русую косаньку прадаў за шастак,
А яе, маладую, прадаў за так.

Маці ці бацька маладой прыносіць «покрывало» — метры тры якога-небудзь тонкага матэрыялу. Сястра абвязвае яго кругом шыі

нявесты. Гэта падарунак свекрыві. Сястра жаніха («осыпалныца») становіцца на лаўку і абсыпае маладых зернем, каб былі шчаслівыя.

Хрышчоны бацька жаніха выводзіць маладых з-за стала, а на іх месца прыводзіць бацькоў нявесты. Маладых тройчы абводзяць кругом стала, пасля чаго яны павінны нізка пакланіцца бацьку з маці. Усе гэтыя цырымоніі суправаджаюцца шматлікімі песнямі, галоўная мэта якіх — расчуліць маладую:

Ой, думай, Ганначка, думай,
Завязуць цябе за Дунай,
Да між горы крутыя,
Да між людзі ліхія,
Дзе п'юць гарэлку кружкамі,
Дзе б'юць жонак дручкамі.

— Сядзем, матка, павячэраем з табою,
Павячэраўшы, падзелімся з табою.
Табе, матка, сені, камора,
А мне, матка, — скрыня, пярына, карова.

Ой, занудзіш, мая маценька, без дачкі,
Панарастаюць па-пад лаўкаю казлячкі,
Траўкаю да мураўкаю пазарастаюць лыжачкі,
Сітнічкам да ракітнічкам — місачкі.

Зязюлька куе — сад разлягае,
Дзеванька плача, на воз сядае.
На воз сядала — ручку давала:
— Дзякуй табе, матка, што гадавала,
Дзякуй за тваё гадаваннечка
І за харошае выдаваннечка.

Ой, жаль маю, да мой баценька, на цябе,
Што застаецца зялёная рутанька ў цябе.
— Калі шкада табе, дзіцятка, рутаньку,
То прышлі, прышлі свайго мілага з касою,
Хай сажне зялёну руту з расою.
То прышлі, прышлі свайго мілага з вазочкам,
Хай бярэ зялёну руту з пясочкам.

Ой, там за гарою
Да мядзведзь рыкае,
Не ідзі замуж, Ганначка,
Бо свякроў ліхая.
— Я таму мядзведзю
Дам саладзіну,
А свякроўцы ліхой —
Таўкачом у спіну.
Да няхай мядзведзь
Саладзіну смокча,

А свякроўка ліхая
У запеччы квокча.

Рыкнула кароўка з парога,
Заставайся, маценька, здарова.
Усё сваё, маценька, пабяру,
Пакідаю слядочкі па двару.
Хто на мае слядочкі нарыне́,
Той мяне, маладу, успаміне:
— Тут маё дзіцятка хадзіла,
Красату ў вяночку насіла,
Праўданьку ў сэрцы дзяржала.

Заплач, дзеванька, у бацькавай хаце,
То будзе бацька лепш шкадаваці:
Паставіць на воз залатую скрыню,
Паложыць у воз залатую пярыну.

Сонейка з рання ўсходзіць,
Дзеванька вакол стала ходзіць.
«Баценька»,—да пакорна просіць.
«Родненькі»,—да пакорна просіць.
— Дзіцятка, да застанься дома,
Роднае, да застанься дома.
— Баценька, да не мая воля.
Родненькі, да не мая воля.
За мной род чужы ходзіць,
Васечка за ручаньку водзіць.

Ой, нуце, нуце, бо не рана будзе,
Каб не прыйшлося ў бару начаваці,
З траўкі-мураўкі пасцельку слаці,
Дробнаю расою ўмываціся,
Зялёным лісточкам уціраціся.

Сыпце пшаніцу ў нова карыта,
Карміце коней у вяліку дарогу,
Каб не прыйшлося ў бару начаваці,
У бару начаваці, каліну ламаці,
Каліну ламаці, у пучкі вязаці
Да на воз класці, дамоў яе везці.
Свякроўка-любка да ягадкі любіць,
Да ягадкі любіць—раненька будзіць.
Раненька збудзіць, яшчэ й прыгалубіць.

Падступі, маценька, да мяне блізенька,
То я пакланюся нізенька,
Каб косанькі зямліцу крылі,
А слёзкі ножкі памылі.
— Дочачка, залатое зярнятка,
Кланяйся баценьцы і маценьцы нізенька,
Каб коскі зямліцу ўкрылі,
А слёзкі ножкі памылі.

— Дзякуй, баценька, за тваё гадаванне,
Колькі год я бывала,
То грознага слова не чувала,
Толькі русу касу гадавала.

Збіралася малада ў маценькі спытаць:
— Ці мне там начаваць,
Ці дамоў прыязджаць?
— Дзіцятка маё роднае,
Не ганьбуй сваім домам.
Не ганьбуй сваім домам,
Прыязджай жа дадому.
Хоць ноччу, хоць поўначчу,
Хоць у позні абед
Да дадому прыедзь.

Бяры, жанішок, бяры,
Да ўмей шанаваці,
Не давай збыткаваці
Ні старому, ні малому,
Ні самаму маладому.
Каб босай не хадзіла,
Пасталы не насіла,
Каб чаравічкі—казловы,
А панчошкі—шаўковы.

Паедзеш дадому, бяры сабе зязюльку з сабою
Да прыкуй ля ложка,
Яна будзе ранесенька кукаваці,
Бо чужая свякроў—не маці.
Не будзе ранесенька будзіці,
Выйдзе на вуліцу судзіці:
— Ёсць у мяне нявестка малада,
На небе сонейка садзіцца,
А мая нявестка ўжо спіць.
На небе сонейка ўзышло і стала
Да й мая нявестка ўстала.

Стаіць конік на стаянцы, рагоча.
Брат з сястрою разлучацца не хоча.
Стаіць конік на стаянцы—ножкай туп.
— Аставайся, мая сястра, ты ўжо тут.

Зраўняй, божа, гару-даліну раўненька,
Каб мне было да маценькі відненька,
Зраўняй, божа, гару-даліну яшчэ раўней,
Каб мне было да маценькі яшчэ відней.

Дзеванькі да галубачкі,
Прасіце вы бога,
Каб дуга паламалася,
Каб Ганначка засталася.

— Каб я думала ў бацькі быць,
То я б не сеяла зялёнай руты.
Я б пералазы разгарадзіла,
На зялёную руту конікі пусціла:
— Ешце, конікі, зялёную руту,
Бо ўжо мне ў бацькі больш не быць.
Табе, рута, адзін дзянёчак,
А мне ў бацькі—адзін вечарочак.

Ходзіць Ганначка па двару,
Пазіраецца на зару:
— Ой, знаць, маценька, дождж будзе.
На маю касу імгла ўпадзе.
Табе, маценька, жаль будзе.

Дзіцятка ад'язджае, маценька навучае:
— Каб раненька ўставала,
Каб «дзень добры» давала
І старому, і малому.
І свёкарку, і свякроўцы,
І дзеверу, і ятроўцы.

Не плач, дзеванька, ад бацькі ідучы,
Яшчэ наплачашся ў свёкра жывучы,
На яго парогі наступаючы,
На яго зноравы знараўляючы.

Кланялася бяроза зялёнай дубраве:
— Дзякуй, табе, зялёна дубрава,
За тваё зацішшачка.
Я за табою стаяла,
Буйных вятроў не чувала,
Толькі белая бяроза
Голлечка гадавала.
Кланялася Ганначка свайму баценьцы
нізенька:
— Дзякуй табе, баценька,
За тваё гадаванне,
Што я ў цябе гуляла,
Рэзкага слаўца не чувала,
Толькі ж я, маладзенькая,
Косаньку гадавала.

Дайце той дзеваньцы
Цыбулі ў вочы,
Каб яна заплакала,
Ад бацькі ідучы.

Выграбай, матка, жар, жар,
Будзе табе дочкі жаль, жаль,
Выграбай, матка, попел,
Мы тваю дачку ўхопім,
Закідай на бок дровы,
Аставайся здарова.

Праводзіць сватоў і маладых выходзяць усе госці. Маладую жаніх нясе на руках да самай машыны, у якой едуць таксама сведка і сват.

Бацька з маці тройчы абыходзяць з вядром вады і хлебам вакол машыны, выліваюць ваду пад пярэднія колы (каб не было ўперадзе бяды) і кладуць паміж коламі хлеб, які адразу ж забіраюць, як толькі машына праедзе. Госці пры гэтым спяваюць:

З дарогі, ворагі,
Да не пераходзьце дарогі,
Да няхай пярэйдзе гасподзь-бог,
А за госпадам бацька мой.

Да няхай бацянька судосіць
У бога доленькі папросіць,
Да няхай пярэйдзе з вадою,
Да няхай удзеліць долю.

Разам з нявестай едуць усе яе сяброўкі, хлопцы, запрошаныя на вяселле, а таксама чалавек пяць-шэсць найбольш блізкіх сваякоў, якіх называюць «прыданы».

Да жаніха прыязджаюць позна вечарам ці наогул ноччу. Хоць час і позні, на вуліцы поўна тых, хто жадае ўбачыць нявесту. Яна рассыпае па ўсім двары зерне і цукеркі. Сустракае маладых маці хлебам-соллю. Іншы раз яна апранае навыварат «кожух». Тады госці спяваюць:

Знаці, знаці, што чужая маці
Вывернула кажуха,
Да й ідзе пужаці.

— Не выварочвай, свякроўка, кажуха,
Бо я добра сакатуха.
Ты за качаргу, я за палена,
Пераб'ю табе калена.

Маці запрашае маладых і гасцей у хату. Сват тройчы абводзіць іх вакол стала і садзіць на «кожух» ці падушку. У гонар нявесты з моманту яе з'яўлення на парозе дома не змаўкаюць хвалебныя песні:

Ой, радуйся, мацелька,
Вязе сын нявестачку.
Высоку, як яліна,
Чырвону, як каліна,
Багату, як восень,
Здарову, як зіма,
Ціхую, як лета,
Вясёлу, як вясна.

Ой, умненька да разумненька
Ганначка
Лесам ехала—шумела,
Полем ехала—грымела,
Сялом ляцела імглою,
На двор сцякла ракою,
У сені ўскочыла рыбкаю,
У хату ўвайшла паваю,
За стол села паннаю.
Да яе свёкарка не пазнаў,
Да яе паннаю называў:
— Накрыйце паненку ручніком,
Каб не пакрылась пылочкам.
— Я ж табе, свёкарка, не пані,
Я ж табе малада з дарамі,
Я ж табе нявестка з прыданым.

Ой, рад быў я, сынку,
Як ты радзіўся,

Цяпер я й радзейшы,
Што ты ажаніўся.
Узяў сабе жонку,
Як на небе зорку,
Высоку, як яліна,
Чырвону, як каліна,
У хату—гаспадыню.

Наша дзеванька не дасыпала,
Яснае свечкі не ўгасала.
Яна, малада, толькі дары прала,
А за тыя дары белы грошы брала.

Радуйся, маценька,
Сын вязе нявестачку,
У хату—рагатуху,
А ў клуню—малатуху.

Адчыні, госпадзі, варота,
Бо едзе нявестка багата,
Да вядзе конікі хвастаты,
Гоніць каровы рагаты,
Да гоніць цялушкі цялісты,
А вязе авечкі ваўністы.
Ляцяць пчолы мядзісты,
Да следам гусі пярэсты
Да пытаюць маладую:
— Дзе сесці?
— Да сядзьце, гусанькі, на дварцэ,
У майго свёкаркі на паплаўцэ.

Адчыняй, мамачка, варота,
Вядзе сын нявестку, што золата.
Адчыняй, мамачка, аконца,
Прывезлі нявестку, што сонца.
Выйдзі, мамачка, паглядзі,
Што мы табе прывязлі:
Ці авечка, ці ягня,
Ці з чужога края паняня.

Выйдзі, мамачка, да паглядзі,
Што мы табе прывязлі.
Высоку, як яліна,
Чырвону, як каліна.
Не радуйся, маценька,
Маладой нявестачцы.
Як не навaрыш сама,
То не будзеш есці.
Выйдзі, маценька, на сходанькі,
Паглядзі нявестаньку:
Ці прыгожа, ці ўбрана,
Ці падыходзіць на лічэнька
Нашаму панічэньку.
Ці хароша па мове
Нашаму панове.

Свякроў жадае сваёй нявестцы ўсяго найлепшага:

Будзь жа ты, нявестка,
Здарова, як зіма,
Будзь жа ты, нявестка,
Вясёла, як вясна,
Будзь жа ты, нявестка,
Ціхая, як лета,
Будзь жа ты, нявестка,
Багатая, як восень.

Падпіўшыя госці могуць праспяваць і жартаўлівыя песні:

Тупу́, тупу́, конікі, тупу́,
Прывязлі на двор ступу.
Не ступу—калодзіцу,
Не дзеўку—малодзіцу.
Ой, возьмем да павязём
Да будзем вучыць,
Запражом у сівы коні
Да будзем валачыць.
Ой, возьмем да павязём,
Да будзем навучаць,
Запражом у сівы коні
Да будзем араць.

Не пужайся, свякроўка,
Што нявестка малая,
Мы яе падвышым,
На шаўкі паставім.
На шаўкі паставім,
Золата падсыплем.
Золата падсыплем,
З Васільком зраўняем.

Прыехаўшыя з нявестай прыданы сядзяць за асобным сталом. Раней яны, адпраўляючыся за нявестай, абавязкова квяцілі сябе калінай. Аб гэтым ёсць нават спецыяльная песня:

Наехалі прыданы
І ўсе людзі каханы.
Ні за адной шапачкай
Да каліны няма.
Ой нашто нам каліна,
У нас ёсць жыта, ярына,
Сам бог ходзіць
Да жыта родзіць,
Да за шапачкі тыча.

Песень, якія прымяркоўваюцца абрадам да гэтага моманту, вельмі шмат:

Хадзіла маці і нудзіла маці,
Пакуль сына зарадзіла.
Цяпер пабіла ногі цераз парогі,
Пакуль яго ажаніла.

Дагадалася маці,
Куды дачку аддаці:
Між сады-вінаграды,
Між людзі вельмі рады,
Між сады зялёныя,
Між людзі вясёлыя.

Ганначка ўвайшла ў нову хату,
Увайшла ў нову хату,
Пачала гаварыць.
Пачала гаварыць,
Госпада-бога прасіць:
— Памажы ж мне, божа,
У гэтай новай хаце.
У гэтай новай хаце,
Увесь век каратаць.
Увесь век каратаць
І старых паважаць.

Ходзіць Ганначка па новай хаце,
Пытаецца Васеньку, як маценьку зваць.
— Заві, заві, Ганначка,
Як сваю звала.
То будзе табе, Ганначка,
Ад людзей слава.
Ад людзей слава,
Ад мяне другая,
Што ты маю маценьку,
Як сваю назвала.

Нявеста ўвесь гэты час сядзіць за сталом у «покрывалы». Сват здымае яго і перадае маці пад песню:

Шкада тую маладзіцу,
Што сядзіць у цямніцы.
Трэба ёй прастор даць—
Пакрывала зняць.

Маці з пакрываламу руках танцуе перад гасцямі і спявае:

Дай, божа, добры час,
Як у людзей, так і ў нас,
Шчаслівая гадзіна,
Весяліся, радзіна,
Да дай, божа, ляльку,
То буду за няньку.
Да дай, божа, дзеці,
То і я буду глядзеці.
Дзякуй богу, сына ажаніла
Да нявестку даждала.
Да не буду хлеб мясіць,
Ваду насіць,
Толькі буду хату месці
І ў хаце лад весці.
За печчу толькі буду сядзець
І дзяцей глядзець.

Прытанцоўваючы, маці прыбліжаецца да грубкі (звычайна ёсць у кожным доме) і закідвае «покрывало» наверх.

Сват выводзіць маладых, і яны ў суправаджэнні сведкі і ўсіх дзяўчат ідуць у камору, дзе стаіць каравай. Жаніх здымае з маладой вэлюм і кідае яго на дзяўчат: на якую ўпадзе, тая і замуж раней выйдзе. Свякроў павязвае маладой на галаву хустку і выводзіць да гасцей. Яны спяваюць:

Ты, святы панядзелку,
Сапсаваў нам дзеўку.
Пасадзіў пад паліцаю,
Нарадзіў маладзіцаю.

Прыданы хутка пасля гэтай цырымоніі ад'язджаюць. Уся прыехаўшая моладзь застаецца ў жаніха. Доўга танцуюць, пяюць. Госці, якія паступова разыходзяцца па хатах, забіраюць іх да сябе на ноч.

У нявесты чакаюць вяртання прыданых і хутка таксама разыходзяцца.

## ДРУГІ ДЗЕНЬ ВЯСЕЛЛЯ

У доме нявесты госці збіраюцца рана, доўга сядзяць за сталом, пяюць песні:

Прапіла маці дачку
На салодкім мядочку.
Як піла, то й спявала,
Прапіла, то й заплакала.
Добра было табе, маценька,
Салодкі мядок піць.
Прыйдзе дзянёк панядзелачак,
Няма з кім дзельца рабіць.

Маценька ўстала сабе ранесенька,
Умылася бялесенька,
Села сабе ў акеначка,
Паглядае сабе на падвор'ечка:
— Вырвана ў мяне ружа
Да й чырвона, прыгожа.

У гэты дзень яны едуць у паразоў да жаніха. Аб транспарце бацька нявесты клапоціцца загадзя. Звычайна яго выдзяляе калгас.

Раней, адпраўляючыся ў паразоў, везлі з сабой куфар з прыданым нявесты на асобным кані, ззаду магла быць прывязана карова. На куфры сядзеў брат (брацця) нявесты; ён павінен быў яго прадаваць. За лёгкі куфар сваты не хацелі нічога даваць. Тады маглі з ім аб'ехаць разы тры, а то і больш вакол хаты. Усё, што было ў куфры, вывешвалася на «бальку» (перакладзіна над печчу). «Родына» жаніха падыходзіла яго разглядаць. Гэта былі





*Колькі куранятак, столькі хлопчыкаў і дзяўчатак*

ручнікі, абрусы, убранне нявесты, пакрывала на ложак, занавескі, нават тканыя «половыкы» (дарожкі на падлогу). Чым іх больш, тым багацейшай лічыцца нявеста.

У доме жаніха госці пяюць песні:

Кукавала зязюлька на клуні,
Будзіла дзеваньку ў клуні:
— Уставай, Ганначка, доўга спіш,
Чым свайго свёкарка абдарыш?
— Што табе, зязюлька, да таго?
Ёсць у мяне маценька на тое,
Чаго не будзе, то дабудзе,
Чаго не стане, то дастане.

Стуку-пастуку свёкар да клеці:
— Уставай, нявестка,
Ужо куры пелі і зоры свяцілі.
А нявестка ўстала да горда адказала:
— Як у бацькі была,
То курэй не чула і зор не знала,
А як да свёкарка пайшла, пераначавала,
І куры пачула, і зоры пазнала.
Куры пачула, сені метучы.
Зоры пазнала, па ваду ідучы.

Нявеста ўжо ў іншай сукенцы і падоранай свекрывёй хустцы. Па шуму машыны, крыкам усе адразу даведваюцца, што прыехаў перазоў. Прыехаўшыя пяюць:

Дзе ж наша гадаванае,
Мілае, каханае,
Што з намі піла, ела
І ад нас паляцела?
Там у Васечкі сады цвілі,
Там яно села, упала,
Голасна закавала,
Жаласна заплакала,
Усю сваю радзіну ў госці
запрашала.
— Выйдзі, Ганначка, выйдзі,
Калі не маеш крыўды,
Прыехала твая маці,
Кліч нас дахаты.

Сустракаць іх выходзяць бацькі, сват, некаторыя госці, самі маладыя. Некалькі чалавек з «пырызвян» апрануты ў смешныя касцюмы і размалёваны да непазнавальнасці. Гэта «цыганы». Сярод іх не толькі «цыган» з «цыганкаю» і «дзіцём», якія цягнуць за сабой чыгун і «потэсь» (да чаго прывязваюць воўну), але і «доктар» з вялікім шкляным слоікам, напоўненым вадой, і з выглядаючымі з усіх кішэняў бутэлькамі з «гарілкаю», «салдат» з піянерскім барабанам, апрануты ў вузенькія штаны, якія літаральна трашчаць па швах. Жанчыны пераапрануты ў мужчынскае плацце, мужчыны — у жаночае. «Доктар» прымушае каго-небудзь піць яго «лекі». Калі «ахвяра» адказваецца, яе тут жа акружаюць «цыган» з «цыганкай» і падымаюць такі крык, які можа спыніць толькі дроб «салдацкага» барабана. «Цыганы» ходзяць па хатах,

выпрошваюць грошы, прадукты, рознае стар'ё, стараюцца залезці каму-небудзь у кішэню, украсці што-небудзь з таго, што вісела на плоце. Гэту іх павадку даўно ведаюць, таму загадзя ўсё з плота здымаецца. Сваю дабычу «цыганы» прыносяць у дом жаніха, выгружаюць на стол і пачынаюць прадаваць. «Доктар» ходзіць па вёсцы і «лечыць хворых». «Салдат» ганяецца за вясковымі хлопчыкамі, дзяўчатамі, спявае песні.

Паразвян усаджваюць за сталы, аказваюць ім усялякую павагу, што выражана і ў песнях:

Перазвяначкі-паняначкі,
Напіцеся са шкляначкі,
Напіцеся з кубачка,
Бо тут ваша галубачка.

Ой, у садзе салавейка гняздо ўе,
Ці ўсім перазвяначкам месца е?
Калі не ў хаце, то ў сенях,
Прыбірайце месца, каб селі.
Калі не ў сенях, то ў каморы,
Прыбірайце месца даволі.
— Просім вас, перазвяначкі, просім.
Мы ж вам місачкі носім,
Мы ж вас харашэнька просім.
— Вы нас не прасіце,
Толькі нам паднасіце
Гусята, парасята,
Яшчэ й сівыя галубята.
Нам не патрэбна з міскі,
Нам можна й з палумiскі.
У нас тонкія пальцы,
Нам не патрэбны відэльцы.

Шмат спяваецца ў перазоў сумных песень, прысвечаных нявесце, якую ўжо аддалі ў чужую хату:

Прыехала маці ў перазоў к дзіцяці,
Прывязла гасцінчыка—каравая і сырчыка.
Прывязла іголку і клубочак шоўку:
— Паднімайся, дзіцятка, раненька,
Вышывай харашэнька.
— Не вéляць мне, матка, шыць-вышываць,
Да вéляць мне, матка, таўчы, малоць.
Таўчы, малоць, свінням даваць,
Свінням даваць, свінней заганяць.
Таўчы, малоць я, матка, умею.
Толькі я прасіцца да свякроўкі не смею.
Сваха свасе паклон давала,
Каб ля дачкі не збыткавала,
Каб не была да каморка за хатку,
Каб не была да суседка за матку...

Некаторыя песні жартаўлівага характару прысвечаны свату, які дагаджае пераразвянам:

Куды ж наш сват дзеўся,
Ці ў клочча ўкруціўся,
Ці ён сена косіць,
Што перазвян не просіць?

У нашага свата
Галава кудлата,
Ён галавою патрасе,
Нам гарэлкі прынясе.

Ой, хваліўся сват,
Што ён вельмі багат,
Ой, хадзема паглядзема,
Ці ядуць коні сена.

Як ядуць коні сена,
То і мы пасядзема.
Як ядуць коні салому,
То й рушайма дадому.
Ой, паелі коні саламу
Да й дасталі стрэху,
Нарабілі людзям смеху.
Мы вакол абышлі
І нічога не знайшлі.
Толькі клець без памоста
Да кабыла бясхвоста,
Тры казы на адной назе
Па хляве гарцавалі,
Тры крупіны ў чарапіне
На паліцы стаялі.

У адрас «пырызвян» пяюцца жартоўныя песні:

Глядзяць перазвяначкі коса,
Што ў сватоў поўна печ проса:
— Каб як нам паціхеньку ўцячы,
Бо заставяць нас проса таўчы.

Гнуцца лаўкі, гнуцца лаўкі,
Дзе сядзяць дзеўкі-перазвянкі.

А яшчэ больш загнуцца,
Як мёду нап'юцца.

Ой, на запечку лён, лён,
Госцейкі з хаты вон, вон,
У нас на прыпечку лапата,
У кожнага ёсць свая хата.

Вечарам, калі «пырызвяны» збіраюцца ехаць (ад'язджаюць), пяюцца наступныя песні:

Ой, бег зайчык цераз гайчык,
Скок на воз.
Ездзіў браток па сястрынку,
Не прывёз.
Ой, бег зайчык цераз гайчык,
Скачучы.
Ездзіў браток па сястрынку,
Плачучы.

Мая маценька родна,
Збірайся дадому,
Каб не было мне дакору.
Бо будуць мне даганяць,
Увесь век дакараць,
Што згубіла, згубіла
Нявестаньчына радзіна,
Усю гарэлку папіла
І хлеб увесь паела.

Едзем, радзіна, едзем дадому,
Бо ўжо паелі коні салому.
Паелі салому, паелі сенца,

Пара нам дадому,
Дапілі ўжо вінца.
Пара, сваточкі, нам ужо дахаты,
Маладой пары трэ аддыхаці,
Бо ім раненька патрэбна ўстаці.
На другу нядзельку
Будзем вас у госці зваці.
У госці вас зваці
Да Ганначку пытаці:
— Ці табе, дзіцятко,
Там дом раднейшы?
Ці табе маценька
Там вярнейшая?
— Маценька не родна
І баценька тожа.
Дружочак верны—
Ён мне дапаможа
Жыцейка жаць,
Снапочкі вязаць
І ў баценькі свайго
Парады пытаць.

Пасля таго як «пырызвяны» паехалі, госці пачынаюць разыходзіцца. Другі дзень — гэта самы вясёлы дзень вяселля. Няма канца жартам, танцам. Гэты дзень доўга будуць памятаць усе ўдзельнікі вяселля.

## ТРЭЦІ ДЗЕНЬ ВЯСЕЛЛЯ

У панядзелак госці збіраюцца ў звычайным парадку і ў жаніха і ў нявесты. Весяляцца, пяюць песні як сучасныя, так і вясельныя. Прычым з вясельных песень пяюць тыя, у якіх гаворыцца аб цяжкім жыцці нявесты ў доме свекрыві. Галоўная асаблівасць гэтага дня ў тым, што і ў доме жаніха, і ў доме нявесты дзеляць каравай. Аб гэтым паведамляе сват:

Госці зазваны,
Суседзі спраханы,
Кішэні трасіце,
Каравай купіце.

Ён выносіць каравай на стол і пытаецца ў прысутных:

Ці ёсць у нашых маладых
Суседзі блізкія і далёкія,
Браты і сёстры,
Дзядзькі і цёткі,
Бацька і маці?
Ці веляць, ці благаслаўляць
Каравай раздаваць?

Яму адказваюць: «Біг благословыть». Каравай падыходзяць атрымліваць у такім парадку, у якім дарылі маладых. Шышкі заўсёды атрымліваюць бліжэйшыя сваякі (маці нявесты пакідае ў сябе адну «тройчастую», жаніха — «двойчастую» шышку), ніжнюю частку — музыканты, верхнюю — дзеляць паміж усімі гасцямі, якія пяюць:

Сваці, божа, з раю
Нашаму караваю,
Каб было віднесенька
Краяць раўнесенька,
Бо ў нас род вялікі,
Усіх трэба абдзяліць.

У той момант, калі сват перадае традыцыйную шышку маці нявесты (жаніха), госці пяюць:

Павеяў вецер з другога боку,
Дарыце маценьцы шышку высоку
За то, што вучыла кужалец ткаць,
Кужалец ткаць, жыцейка жаць,
Чужой маценьцы ва ўсім уступаць,
Кароткую ночку не дасыпаць.

Госці кладуць на «віко» грошы, выпіваюць чарку за шчасце маладых і атрымліваюць узамен кусок каравая. Чуюцца жарты, смех, усе ажыўляюцца, спяшаюцца выкупіць сваю долю каравая. Іншы раз сват-каравайшчык мог «лішні» кавалак каравая «незнарок» сунуць сабе ў кішэню або ў рот. За гэта жанчыны нават свату, які не мае такіх намераў, папярэджваючы яго, спяваюць:

Каравай каравайшчык крае
Да ўсё сабе дбае.
То ў рот, то ў кішэню,
Сваім дзецям на вячэру.

Грошы разам з «вікомь» у доме жаніха адразу перадаюць маладым, а ў доме нявесты — маці. Маці аддае іх сваім дзецям у час «гостыны». У «гостыны» едуць самыя блізкія сваякі жаніха. Пасля іх ад'езду госці ў хуткім часе разыходзяцца. У дом нявесты «гостына» прыязджае звычайна пад вечар. Іх усаджваюць на самае ганаровае месца. Пяюць:

Цераз каліну я пераліну
Да цябе, маценька,
Хоць на гадзіну.
Цераз каліну — перапяліцаю,
Да цябе, маценька — маладзіцаю.

Я ягаданькі бяру
І не ведаю, каму.
Занясла б я да бацянькі,
Да далёка ён ад мяне.
Занясла б я да свёкарка,
Да не любіць ён мяне.

Пры ад'ездзе «гостына» спявае:

Былі ў свата багатага
Да з'елі вала рагатага,
Елі галубцы ў малацэ
Да сухую рыбаньку ў пярцэ.

Добрая ў маці дзяціна,
Да добрая была гасціна.
Хоць яна ноччу хадзіла,
Пры сабе красаньку насіла.
Насіла красаньку ў вяночку,
Трымала праўданьку ў сардэчку.

З ад'ездам «гостыны» вяселле афіцыяльна заканчваецца. Але госці працягваюць наведвацца да бацькоў маладых на працягу цэлага тыдня.

Вядома, у наш час усе апісаныя абрады ў большай ступені ўмоўныя. Часта маладыя адразу ж пасля вяселля пераходзяць жыць у дом нявесты. Свекрыві нявесткі страшыцца няма чаго. Паміж імі ўстанаўліваюцца сяброўска-сваяцкія адносіны. Бываюць выпадкі, што маладыя атрымліваюць як падарунак на вяселле ключы ад новай кватэры. Але, паважаючы старыя добрыя традыцыі, вяселле ў вёсцы стараюцца згуляць менавіта так, як апісана вышэй.

# ЗМЕСТ-ПАКАЗАЛЬНІК, ЗАЎВАГІ, КАМЕНТАРЫІ

ФАЛЬКЛОР І СУЧАСНАСЦЬ 5

ВЯСЕЛЬНЫ АБРАД 19

ВЯСЕЛЬНЫЯ ПЕСНІ 55

## Сватанне, запоіны (змовіны, заручыны)

**1.** Было ў месячкі два ражкі...
Зап. Захарава В. у 1969 г. у в. Какорыца Драгічынскага раёна ад Крывіцкай М. (1904). Блізкі па зместу варыянт песні быў зап. Э. М. у 1846 г. у в. Пабярэжжа і Скуплін Барысаўскага п. Песню спявалі, калі маладога садзілі на пасад, пераводзілі яго «з рабяцкага стану да ў мужаскую славу». Там ёсць такія радкі:

Да ў месяца два ражкі крутыя,
Да Яначкі два браты радныя.
Адзін брахна каня сядлаець,
А другі брахна яго наўчаець:
— Да будзь, брахна, разумненькі,
Да паедзеш, брахна, у чужыя людзі,
Выйдзець к табе танок дзевак;
Не бяры тоей, што ў золаце,
Да бяры тую, што ў розуме;
Мы золата ў краме дастанем,
Мы розуму свайго не ўставім.

Вяселле. Абрад.—Мн., 1978, с. 60.

**2.** Гарошак па дарозе коціцца... 56
Зап. Дземянцей Л. у 1981 г. у в. Чамярын Пінскага раёна ад Жук В. П. (1935).

**3.** Даю табе дзевяць конікаў... 56
Гл. заўвагу № 2.

**4.** Не любі, сыночку... 57
Зап. Захарава В., Макарская Н. у 1969 г. у в. Парэчча Пінскага раёна ад Макарскай Я. Ф. (1924). Паўторны запіс песень у гэтай вёсцы зроблены праз дзесяць год. Рэпертуар не змяншыўся.

**5.** Ванечка коніка сядлае... 57
Зап. Скарапанава І. у 1973 г. у в. Антонаўка Буда-Кашалёўскага раёна ад Краўчанка В. Т. (1887).

**6.** Маці сына да выражала... 57
Гл. заўвагу № 4.

**7.** Дымна ў полі, дымна... 57
Зап. Захарава В. у 1975 г. у в. Парэчча Пінскага раёна ад Клімовіч А. П. (1914).

**8.** Ой, мая мамачка родная... 58
Зап. Літвінка В. у 1970 г. у в. Верхні Церабяжоў Столінскага раёна ад Казубоўскай М. М. (1926).

**9.** А ў нядзельку рана... 58
Зап. Захарава В. у 1968 г. у в. Бакуны Пружанскага раёна ад Багдановіч С. С. (1922).

**10.** Сакалок да бору ляціць... 58
Зап. Фёдараў Д., Васіленка С. у 1967 г. у в. Асаўніца Іванаўскага раёна ад Хацковай М. І. (1924).

**11.** Маладая ўжо дзеванька кажа... 58
Зап. Гарашчук А. у 1978 г. у в. Скароднае Ельскага раёна ад Лось М. С. (1905).
**12.** Ой, скарэй бы вечара даждаці... 59
Зап. Яраслаўцава Р. у 1979 г., у в. Барыскавічы Мазырскага раёна ад Такарскай М. Г. (1935).

**13.** Краем, борэм калінанька зацвіла... 59
Зап. Р. Шырма ў 1928 г. у в. Шакуны Пружанскага павета ад Захвеі Хвораст. Вар.: Гл. заўвагу № 10.
**14.** Ой, белая бярозанька... 59
Зап. Фёдараў Д. у 1979 г. у в. Хільчыцы Жыткавіцкага раёна ад Мароз А. Г. (1914).
**15.** Маладзенькая Ганулька... 60
Гл. заўвагу № 14.
**16.** Судзі, божа, ды латаці даждаці... 60
Зап. Захарава В., Карней Т. у 1978 г. у в. Парэчча Пінскага раёна ад Фісюк М. А. (1911).
**17.** Ой, чыя ж гэта радзіна... 60
Зап. Яраслаўцава Р., Даргель Л. у 1975 г. у в. Махновічы Мазырскага раёна ад Дзенісенка І. А. (1914).
**18.** Ай, у лесе, у лесе даліна... 60
Зап. Фёдараў Д., Габрылеўская Н. у 1979 г. у в. Хільчыцы Жыткавіцкага раёна ад Белько Е. Е. (1935).
**19.** Ой, хлопчыкі, за гумном... 60
Зап. Фёдараў Д., Палонская Л. у 1979 г. у в. Пагост Жыткавіцкага раёна ад Тарасюк Е. В. (1907).
**20.** Каля балоцечка гуляла маладзенька... 61
Зап. Захарава В., Кірыловіч Л. у 1975 г. у в. Парэчча Пінскага раёна ад Жук С. А. (1938).
**21.** Ты, мой баценька... 61
Гл. заўвагу № 4.
**22.** З-пад белага ды бярэзнічку... 61
Зап. Раговіч У. у 1962 г. у в. Коўчыцы II Светлагорскага раёна ад Казаковай П. І. (1928) і Станкевіч У. А. (1922).
**23.** Ды не наступай, Літва... 62
Зап. Фёдараў Д., Дворнікава Г. у 1973 г. у в. Верасніца Жыткавіцкага раёна ад Вашковай Т. А. (1936).
**24.** Ой, чые гэта конікі... 62
Зап. Няфагіна Г., Кірыловіч Л. у 1975 г. у в. Парэчча Пінскага раёна ад Мельнікавай Т. А. (1905).
**25.** Стукнула-грукнула на дварэ... 62
Гл. заўвагу № 24.
**26.** А ў нядзелечку парану... 62
Зап. Кавалёва Р., Барташ Л. у 1974 г. у г. Светлагорску ад Ярашэвіч Е. К. (1906).
**27.** Ой, у саду салавейка гняздо ўе... 62
Зап. Няфагіна Г., Кардубэйка Л. у 1975 г. у в. Парэчча Пінскага раёна ад Вакульчык Е. Л. (1932).
**28.** Ешце галушкі... 62
Зап. Фёдараў Д., Дзямідава Г. у 1973 г. у в. Азераны Жыткавіцкага раёна ад Кулеш Ф. П. (1910).
**29.** Ці я табе, маманька, надаела... 63
Зап. Фёдараў Д., Палонская Л. у 1979 г. у в. Пагост Жыткавіцкага раёна ад Зохны М. І. (1924).
**30.** Непраўдзівая калінка казала... 63
Зап. Захарава В., Мазырко А. у 1973 г. у в. Ліпа Буда-Кашалёўскага раёна ад Цыгановай А. Я. (1912).
**31.** Хвасталася ды дзеванька... 63
Зап. Захарава В., Саевіч О. у 1980 г. у в. Пярэдзелка Лоеўскага раёна ад Івахненка А. Г. (1910).
**32.** Гаварыла каліна... 63
Зап. Яраслаўцава Р., Бугай Л. у 1979 г. у в. Баланевічы Мазырскага раёна ад Шпакоўскага А. Н. (1906).
**33.** Сівы, белы селязеньчыку... 63
Зап. Яраслаўцава Р., Пысько Г. у 1979 г. у в. Скрыгалава Мазырскага раёна ад Табуліной Ф. І. (1900).
**34.** Дай, божа, маладым... 64
Зап. Фёдараў Д., Жытка І. у 1979 г. у в. Пагост Жыткавіцкага раёна ад Тарасюк Е. В. (1907).
**35.** Пашлём сокала аж пад небеса... 64
Гл. заўвагу № 4.
**36.** Ой, прыходзьце на заручыны... 64
Зап. Кабржыцкая Т. В., Петухова Г. В. у 1980 г. у в. Бывалькі Лоеўскага раёна ад Асадчай Х. С. (1912).
**37.** Звалі мяне на заручыны... 64
Зап. Захарава В., Петрашкевіч А. у 1980 г. у в. Пярэдзелка Лоеўскага раёна ад Івахненка А. Г. (1910).
**38.** Ды стаяла Танечка пад вязком... 64
Зап. Захарава В., Новік Л. у 1980 г. у в. Барэц Лоеўскага раёна ад Мельнік Т. А. (1908).
**39.** Нас на змовіны пазвалі... 64
Зап. Скарапанава І., Леонава І. у 1973 г. у в. Дзербічы Буда-Кашалёўскага раёна ад Гаўрусёвай А. М. (1898). Песня добра вядома ў суседніх вёсках (Антонаўка, Ліпа).
**40.** Таццянчын баценька... 65
Зап. Фёдараў Д., Габрыловіч Н.

у 1973 г. у в. Верасніца Жыткавіцкага раёна ад Белко Е. Е. (1927).
**41.** Беражыся, дзевачка, беражыся... 65
Зап. Скарапанава І., Жытка І. у 1973 г. у в. Антонаўка Буда-Кашалёўскага раёна ад Краўчанкі В. Г. (1897).
**42.** Сяк-так вяселле бог нам даў... 65
Зап. Ганчарова С., Чысцякова В. у 1977 г. у в. Рамязы Ельскага раёна ад Сіўчук Н. А. (1922).
**43.** Наехалі заручнікі... 65
Зап. Кавалёва Р., Малая Ж. у 1977 г. у в. Новая Рудня Ельскага раёна ад Бандарэнкі В. І. (1928).
**44.** Білі два званы, білі... 65
Зап. Літвінка В., Юркоўская Н. у 1979 г. у в. Верхні Церабяжоў Столінскага раёна ад Карпінскай В. Н. (1904).
**45.** Пусці, свацця, у хату... 65
Зап. Няфагіна Г., Кірыловіч Л. у 1975 г. у в. Парэчча Пінскага раёна ад Вакульчык Е. Л. (1932).
**46.** Пусці, свацця, у хату... 66
Зап. Яраслаўцава Р. у 1979 г. у г. Мазыры ад Зубар Г. Н. (1914).
**47.** Сватове-панове, па што вы прыехалі... 66
Зап. Яраслаўцава Р., Лобан Г. у 1979 г. у в. Барысковічы Мазырскага раёна ад Бяспалавай П. М. (1908).
**48.** За гумном—даліна... 66
Зап. Яраслаўцава Р., Пячонка Л. у 1979 г. у в. Зімавішчы Мазырскага раёна ад Колас А. С. (1903).
**49.** Хто ў маім садочку рана быў... 66
Гл. заўвагу № 48.
**50.** Зязюлька гняздзечка звіла... 66
Гл. заўвагу № 48.
**51.** Мастом ідзе—маставіна гнецца... 67
Зап. Няфагіна Г., Дзерунова Т. у 1975 г. у в. Парэчча Пінскага раёна ад Церлецкай К. Д. (1911).
**52.** Казалі дзевачкі... 67
Зап. Скарапанава І., Карпава Л. у 1973 г. у в. Дзербічы Буда-Кашалёўскага раёна ад Аляксеевай П. Р. (1913).
**53.** Не ідзі, не ідзі, маладая дзеванька... 67
Зап. Скарапанава І., Кірыловіч Л. у 1974 г. у в. Скароднае Ельскага раёна ад Жук С. А. (1924).
**54.** Я думала, што на сяле граюць... 67
Зап. Яраслаўцава Р., Горб Е. у 1969 г. у в. Мінічы Ляхавіцкага раёна ад Юруць Е. (1922).
**55.** Кукавала кукушачка за двαром... 67
Зап. Захарава В., Новік Л. у 1980 г. у в. Пярэдзелка Лоеўскага раёна ад Анікеенка Г. І. (1898).
**56.** Ой, гула пчолка, гула... 67
Зап. Захарава В., Чарняева Ж. у 1968 г. у в. Бакуны Пружанскага раёна ад Кавальчук Н. (1922).
**57.** Як цябе, мая мамачка, жаль не бярэ... 68
Зап. Яраслаўцава Р., Васілёнак Н. у 1979 г. у в. Забалоцце Мазырскага раёна ад Заяц Т. Ф. (1927).
**58.** Заручае мяне татка, заручае... 68
Гл. заўвагу № 36.
**59.** Піце, сваты, гарэлачку... 68
Гл. заўвагу № 57.
**60.** Піце, ешце, сваты... 68
Гл. заўвагу № 28.
**61.** Каціўся гарошак ды па сенажаці... 68
Зап. Захарава В., Жытка І. у 1978 г. у в. Парэчча Пінскага раёна ад Клімовіч А. П. (1914).
**62.** Ой, у цябе, Галечка... 68
Гл. заўвагу № 61.
**63.** Вецер не вее, сонца не грэе... 69
Гл. заўвагу № 57.
**64.** Ой, калі б знала, калі б ведала... 69
Зап. Карасёва А., Пінчук І. у 1975 г. у в. Прудок Калінкавіцкага раёна ад Яўчык А. І. (1919).
**65.** Ой, што б я знала, ведала... 70
Зап. Яраслаўцава Р., Пысько Г. у 1979 г. у в. Скрыгалава Мазырскага раёна ад Бакавец А. Ф. (1908).
**66.** Годзе, каліна, годзе, маліна... 70
Зап. Яраслаўцава Р. у 1979 г. у в. Зімавішчы Мазырскага раёна ад Гуцко Л. Е. (1922).
**67.** Ой, калі б знала, калі б ведала... 70
Зап. Яраслаўцава Р., Махонь С. у 1979 г. у в. Гальцы Столінскага раёна ад Вахільчук В. К. (1935).
**68.** Чаму зязюля не кукавала... 71
Зап. Карасёва А., Граховіч Г. у 1975 г. у в. Махновічы Мазырскага раёна ад Дзенісенка А. А. (1913).
**69.** Ой, у полі бярозанька развіта... 71
Зап. Яраслаўцава Р., Махонь С. у 1979 г. у в. Гальцы Столінскага раёна ад Іванцовай М. М. (1935).
**70.** Дзяўчына мая заручаная... 71
Зап. Яраслаўцава Р., Папко Т. у 1979 г. у в. Гальцы Столінскага раёна ад Няўдахі А. А. (1936).
**71.** Дзяўчына мая заручаная... 72
Гл. заўвагу № 70.

**72.** Ой, пад плотам бузіна... 72
Зап. Кабржыцкая Т. у 1980 г. у в. Бывалькі Лоеўскага раёна ад Савянок І. П. (1918).
**73.** Сонейка за гару заходзіць... 72
Гл. заўвагу № 2.
**74.** Пушчу я паву па Дунаю... 72
Гл. заўвагу № 17.
**75.** Заручоначка Ніначка... 73
Зап. Жытка І. у 1980 г. у г. Светлагорску ад Ярашэвіч Е. К. (1906).
**76.** Добра было, мамка, заручыны піці... 73
Зап. Кавалёва Р. у 1977 г. у в. Новая Рудня Ельскага раёна ад Дубадзел М. І. (1933).
**77.** Ці я табе, мамка мая, дакучала... 73
Зап. Кавалёва Р., Селіванава Н. у 1977 г. у в. Сізаны Ельскага раёна ад Каваленка С. В. (1942).
**78.** Запіта, дзеванька, запіта... 73
Зап. Дземянцей Л. у 1981 г. у в. Чамярын Пінскага раёна ад Мікалайчык М. А. (1915).
**79.** Ой, у полі бярозанька не крыта... 73
Гл. заўвагу № 67.
**80.** На заручынах была... 74
Гл. заўвагу № 60.
**81.** Не сядзіце, сваты, без дзела... 74
Гл. заўвагу № 2.
**82.** З богам, з богам, пан-дружанька, у дарогу 74
Зап. Шнаркевіч Н. і Каруза П. у 1971 г. у в. Парасляны і Жадзены Пружанскага раёна ад Кудрэйкі М. В.

## Вянкі

**83.** Журылася дзеванька, журылася малада... 74
Зап. Кавалёва Р., Манько Л. у 1979 г. у в. Гальцы Столінскага раёна ад Няўдахі Т. В. (1917).
**84.** Разжалілася каліна... 75
Зап. Сяргейчык З. у 1970 г. у в. Салава Драгічынскага раёна ад Марчук Н. Я. (1928).
**85.** Да ружы, дзевачкі, да ружы... 76
Гл. заўвагу № 70.
**86.** Сягоння субота—сняты дзянёчак... 76
Зап. Кавалёва Р., Канец Т. у 1977 г. у в. Новая Рудня Ельскага раёна ад Дзянісенка П. К. (1910).
**87.** Ды й хадзіла ж Ніначка па полю... 76
Зап. Літвінка В., Хвісюк Л. у 1979 г. у в. Ніжні Церабяжоў Столінскага раёна ад Літвінка В. В. (1909).
**88.** Чуці, чуці ў зялёнай руце... 76
Зап. Сяргейчык З. у 1970 г. у в. Салава Драгічынскага раёна ад Марчук Ф. А. (1901).
**89.** У суботаньку—вясёлы дзянёк... 77
Зап. Хамечка В. у в. Бурмакі Драгічынскага раёна ад Карнейчык М. П. (1922), Кузьміцкай З. (1937).
**90.** Маладая паміж радзінаю хадзіла... 77
Зап. Карасёва А., Рагальская А. у 1975 г. у в. Зімавішчы Мазырскага раёна ад Зубрыцкай А. Н. (1927).
**91.** Каб я знала, што ў баценькі болей не буду... 77
Зап. Карасёва А., Валюк Р. у 1975 г. у в. Махновічы Мазырскага раёна ад Дзенісенка А. А. (1913).
**92.** Ішла Надзечка з вядром па ваду... 78
Гл. заўвагу № 84.
**93.** Ды й ішло сонца-сонейка... 78
Гл. заўвагу № 83.
**94.** У нядзельку рана сіняе мора іграла... 78
Зап. Захарава В. у 1975 г. у в. Чамярын Пінскага раёна ад Мікалайчык М. А. (1915).
**95.** Дзе ты, дзеванька, хадзіла... 78
Зап. Захарава В. у 1975 г. у в. Парэчча Пінскага раёна ад Мікалайчык А. М. (1938).
**96.** Зборная суботка настае... 79
Зап. Кавалёва Р. у 1969 г. у в. Вялікі Лес Баранавіцкага раёна ад Калейчык В. М.
**97.** Зборная суботачка, зборны дзень... 80
Зап. Яраслаўцава Р., Алішкова І. у 1975 г. у в. Махновічы Мазырскага раёна ад Канопліч В. А. (1905).
**98.** Ды прала дзевачка белы лён... 80
Зап. Яраслаўцава Р., Александровіч Т. у 1975 г. у в. Махновічы Мазырскага раёна ад Капыловіч М. І. (1900).
**99.** Да вілі ёлку на сяле... 80
Гл. заўвагу № 22.
**100.** Ляцелі галкі ў тры радочкі... 81
Зап. Скарапанава І., Казак В. у 1973 г. у в. Дзербічы Буда-Кашалёўскага раёна ад Гаманенка А. А. (1890).

## Каравай

**101.** Стаіць дубочак тонкі, высокі... 81
Зап. Захарава В., Трафімчык Н. у 1979 г. у в. Верхні Церабяжоў Столінскага раёна ад Карпінскай В. Н. (1904).
**102.** Ой, чыя то маці... 82
Зап. Захарава В. у 1969 г. і 1979 г. у в. Парэчча Пінскага раёна ад Макарскай Я. Ф. (1924) і Ганчарова С., Хамянкова Н. у

1976 г. у в. Рамязы Ельскага раёна ад Цік Т. А. (1930).
**103.** Ой, вечар, вечар... 82
Гл. заўвагу № 102.
Песня бытуе ўсюды, дзе ёсць каравайны абрад. У 1981 г. яе зап. Дземянцей Л. у в. Чамярын Пінскага раёна ад Жук В. П. (1935), у 1982 г. Захарава В., Навумавец В. у в. Дружылавічы Іванаўскага раёна ад Навумавец А. М. (1931), Навумавец Е. М. (1904), Семянчук Ф. М. (1900).
**104.** Збірайцеся, каравайнічкі, усе пяць... 82
Гл. заўвагу № 103.
**105.** Ой, над сялом... 82
Гл. заўвагу № 103.
**106.** Ой, ніхто не ўгадае... 83
Гл. заўвагу № 4.
**107.** Каравайнічкі, ручкі мыйце... 83
Гл. заўвагу № 4.
**108.** Наша печ рагоча... 83
Гл. заўвагу № 102.
**109.** Ой, матка-ютка... 83
Зап. Кавалёва Р. у 1968 г. у в. Вялікае Сяло Пружанскага раёна ад Мардань М. Г. (1936).
**110.** Ляцелі галачкі з-пад гаю... 84
Зап. Кавалёва Р. у 1970 г. у в. Пясчаная Светлагорскага раёна ад Стараселец Е. С. (1919).
**111.** А хвала табе, божа... 84
Зап. Кавалёва Р., Прышчэпа С. у 1980 г. у в. Дзеражычы Лоеўскага раёна ад Анікеенка Х. П. (1898).
**112.** Каравай у печы йграе... 85
Гл. заўвагу № 19.
**113.** Стану я ў печы... 85
Зап. Няфагіна Г., Бугаёва Т., у 1979 г. у в. Рубель Столінскага раёна ад Крылоўскай Л. І. (1904).
**114.** Караваю, расці... 85
Зап. Захарава В. у 1981 г. у в. Асаўніца Іванаўскага раёна ад Хацкевіч М. І. (1925).
**115.** Ой, калі мы каравай пяклі... 85
Гл. заўвагу № 4.
**116.** Каравай гіча, гіча... 86
Гл. заўвагу № 4.
**117.** Удайся, каравай, удайся 86
Зап. Захарава В. у 1979 г. у в. Верхні Церабяжоў Столінскага раёна ад Кулік Н. А. (1910).
**118.** Ой, дзе ж тыя кавалі... 86
Гл. заўвагу № 4.
**119.** Чаго наша века рагоча... 86
Зап. Ярослаўцава Р., Махонь С. у 1979 г. у в. Гальцы Столінскага раёна ад Апанасюк В. Ф. (1909).
**120.** Наш каравай харошы... 95
Гл. заўвагу № 4.
**121.** Ой, чыя то маценка... 95
Гл. заўвагу № 4.
**122.** Загарадзі, баценька, гародзец... 95
Гл. заўвагу № 4.
**123.** Ой, бяжаць дзеўкі, бяжаць... 95
Гл. заўвагу № 4.
**124.** Як мы свайго каравая радзілі... 95
Зап. Фёдараў Д., Вароніна І. у 1973 г. у в. Верасніца Жыткавіцкага раёна ад Прахарэнка Е. К. (1905).
**125.** Спусціся з неба... 95
Зап. Няфагіна Г., Гаўрылюк І. у 1979 г. у в. Рубель Столінскага раёна ад Каляды П. Ф. (1905).
**126.** Убірайся, каравай... 96
Гл. заўвагу № 4.
**127.** Першая каравайніца... 96
Зап. Захарава В., Васіленка С. у 1967 г. у в. Асаўніца Іванаўскага раёна ад Хацкевіч М. І. (1924).
**128.** Старшая каравайнічка... 96
Зап. Захарава В., Лісоўская Е., у 1978 г. у в. Табулкі Пінскага раёна ад Пракопчык В. С. (1913).
**129.** Караваю, наш раю... 96
Гл. заўвагу № 101.
**130.** Загарадзі, баценька, гародзец... 96
Гл. заўвагу № 101.
**131.** Ды бяжыць зайчык-райчык... 97
Гл. заўвагу № 4.
**132.** Удача, Надзечка, удача... 97
Гл. заўвагу № 101.
**133.** Ой, у новаму двары... 97
Гл. заўвагу № 4.
**134.** Да багат, Васілька, бацька твой 97
Зап. Захарава В., Куляшова Л. у 1978 г. у в. Моладава Іванаўскага раёна ад Капель М. А. (1906).
**135.** Караваю, мой раю... 97
Зап. Фёдараў Д., Пратасеня І. у 1974 г. у в. Пагост Жыткавіцкага раёна ад Літвенка Н. В. (1900).
**136.** Ой, караваю, перад печчу... 98
Зап. Ганчарова С., Федасенка С. у 1977 г. у в. Рамязы Ельскага раёна ад Іллюк Ф. І. (1899).
**137.** Дзе ж нашы каравайніцы забарыліся... 98
Гл. заўвагу № 4.
**138.** Мядзведзь барадаты... 98
Гл. заўвагу № 4.
**139.** Ой, дзе ж наш гаспадар дзеўся... 98
Зап. Няфагіна Г., Гаўрыльчык Т. у 1979 г. у в. Рубель Столінскага раёна ад Вабішчэвіч А. А. (1921).
**140.** Едкі, каравайнічкі, едкі... 98
Гл. заўвагу № 9.
**141.** Старша каравайнічка п'яна... 99
Гл. заўвагу № 19.
**142.** Да былі мы ў каморцы... 99
Гл. заўвагу № 136.

**143.** Ой, мала, мала вошчачку 99
Зап. Захарава В., Пархоменка Т. у 1977 г. у в. Пешкаў Нараўлянскага раёна ад Глушэц С. М. (1920). Сукаюць свечкі.

## Першы дзень вяселля. У маладога, калі збіраюцца ехаць па маладую

**144.** Сыпце пшаніцу ў новы карыта... 99
Зап. Захарава В., Дзерунова Т. у 1975 г. у в. Табулкі Пінскага раёна ад Сцепанюк М. В. (1911). Вар.: Шырма Р.—Беларускія народныя песні. У чатырох тамах. Запіс і расшыфроўка мелодыі Р. Шырмы. т. 4. Мн., 1976, с. 225. Выязджаюць па маладую.
**145.** Маці сына да выражала... 100
Зап. Захарава В., Макарская Н. у 1981 г. у в. Парэчча Пінскага раёна ад Макарскай Я. Ф. (1924). Вар.: Зап. Яраслаўцава Р., Махонь С. у 1979 г. у в. Гальцы Столінскага раёна ад Іванцовай М. М. (1916).
**146.** У стораны, усе дочкі, у стораны... 100
Зап. Яраслаўцава Р., Махонь С. у 1979 г. у в. Гальцы Столінскага раёна ад Іванцовай М. М. (1916), Вахільчук В. К. (1935).
**147.** Лёнечку маці радзіла... 100
Гл. заўвагу № 66.
**148.** Ой, у гародцы на новай градцы... 100
Зап. Кавалёва Р., Зуева М. у 1979 г. у в. Гальцы Столінскага раёна ад Мельнік Г. І. (1905).
**149.** Едзе жанішок да дзеўкі... 101
Гл. заўвагу № 4.
**150.** Стаіць дубочак, стаіць зялёны... 101
Гл. заўвагу № 4.
**151.** Знаці, чашнічак, знаці... 101
Гл. заўвагу № 41.
**152.** Ой, баценька родненькі мой... 101
Зап. Фёдараў Д., Булахава В. у 1973 г. у в. Азераны Жыткавіцкага раёна ад Кузьміч А. Е. (1902).
**153.** Ванечку маладзенькага... 102
Зап. Захарава В., Жытка І. у 1978 г. у в. Моладава Іванаўскага раёна ад Куцко Д. Б. (1913).
**154.** Ой, заказаў Васілька свайму роду... 102
Зап. Кавалёва Р., Карамазіна Н. у 1977 г. у в. Новая Рудня Ельскага раёна ад Бандарэнкі В. І. (1928).
**155.** Не куй, Ванечка, стальнога нажа... 102
Гл. заўвагу № 154.
**156.** Расхадзіўся ясны месячык па небу... 102
Зап. Фёдараў Д., Падгурская З. у 1969 г. у в. Здзітава Бярозаўскага раёна ад Пліс В. М. (1916).
**157.** Ясны месячык па небу бродзіць... 103
Гл. заўвагу № 125.
**158.** Вы, баяры мае любыя... 103
Зап. Ганчарова С., Савіч З. у 1977 г. у в. Рамязы Ельскага раёна ад Сыч А. Л. (1930).
**159.** Ой, на моры... 103
Гл. заўвагу № 158.
**160.** Бацька едзе па лучыну... 103
Зап. Захарава В., Фісюк А. у 1978 г. у в. Рудня Пінскага раёна ад Шкіль М. П. (1923).
**161.** Ды чаму ж, жанішок... 104
Зап. Захарава В., Гарэгляд Т. у 1969 г. у в. Дамашыцы Пінскага раёна ад Тарэлка В. П. (1926).
**162.** Мамачка сыну вячэру давала... 104
Гл. заўвагу № 41.
**163.** Ідзе жанішок да дзеўкі... 104
Гл. заўвагу № 4.
**164.** Іванка ідзе да дзеўкі... 104
Гл. заўвагу № 2.
**165.** Хоць я свашка маленькая... 104
Зап. Захарава В., Макарская Н. у 1969 г. у в. Парэчча Пінскага раёна ад Пярлецкай К. Д. (1911).
**166.** З каралеўскага двара... 105
Зап. Кавалёва Р., Карась Г. у 1979 г. у в. Гальцы Столінскага раёна ад Хоміч В. П. (1914).
**167.** Дабранач, бацюхна... 105
Зап. Захарава В., Рулёва Е. у 1973 г. у в. Ліпа Буда-Кашалёўскага раёна ад Івановай В. Г. (1900).
**168.** Калышыце мяне высока... 105
Гл. заўвагу № 17.
**169.** Полем, полем, як дымам... 105
Гл. заўвагу № 48.
**170.** Там поле роўненька... 105
Зап. Скарапанава І., Кунцэвіч Л. у 1973 г. у в. Дзербічы Буда-Кашалёўскага раёна ад Майсеенка А. Н. (1913).
**171.** Пад сяло пад'язджаем... 105
Зап. Ганчарова С., Чысцякова В. у 1977 г. у в. Рамязы Ельскага раёна ад Сіўчук Н. А. (1912).

## У маладой да прыезду маладога. Прыезд маладога. У застоллі

**172.** Дзеванькі, падружанькі... 106
Гл. заўвагу № 47.
**173.** Ды на рагі хата, на рагі... 106
Гл. заўвагу № 4.
**174.** Цешча зяця дажыдала... 106
Гл. заўвагу № 16.
**175.** Цешча зяця сладкавала... 106
Зап. Кавалёва Р., Малая Ж. у 1977 г. у в. Новая Рудня Ельскага раёна ад Неўчык Я. Ф. (1903).
**176.** А цешча зяця на вячэру ждала... 106
Гл. заўвагу № 175.

**177.** Ой, зялёная рутачка... 107
Зап. Кавалёва Р., Завадская А. у 1979 г. у в. Гальцы Столінскага раёна ад Хоміч А. А. (1920).
**178.** Ой, ляцеў салавейка ў вішнёвы сад... 107
Гл. заўвагу № 101.
**179.** Мы зусім ды не ведалі... 107
Зап. Фёдараў Д., Палонская Л. у 1979 г. у в. Пагост Жыткавіцкага раёна ад Сасневіч С. П. (1912).
**180.** Круглае, маленькае... 107
Зап. Захарава В., Жытка І. у 1979 г. у в. Мерчыцы Пінскага раёна ад Гарагляд А. Г. (1925).
**181.** З'ехала дзвесце баяр на наш двор... 108
Гл. заўвагу № 101.
**182.** Стукнула, грукнула на дварэ... 108
Гл. заўвагу № 4.
**183.** Ды наехала сватоў поўны двор... 108
Гл. заўвагу № 119.
**184.** Ды прыехаў Колечка з-за Асінцу... 108
Зап. Захарава В., Калевіч Л. у 1979 г. у в. Парэчча Пінскага раёна ад Якуш Л. І. (1931).
**185.** Пад парогам быстра рэчка... 108
Зап. Фёдараў Д., Панкова Л. у 1979 г. у в. Пагост Жыткавіцкага раёна ад Дударавай Г. К. (1906).
**186.** Як уехаў жаніх у варота... 109
Гл. заўвагу № 101.
**187.** Ці, Валя, на таго ты пaглядзела... 109
Зап. Ганчарова С., Чысцякова В. у 1977 г. у в. Рамязы Ельскага раёна ад Цік Т. А. (1930).
**188.** Пусці, сват, у хату... 109
Зап. Захарава В., Казак К. у 1975 г. у в. Чамярын Пінскага раёна ад Бахур М. К. (1918).
**189.** Прыбілася ды рыба к гату... 109
Зап. Доўбік Л., Давыдава Н. у 1969 г. у в. Жарабковічы Ляхавіцкага раёна ад Кухарчык А. М. (1901).
**190.** На марозе ды на северы... 110
Зап. Захарава В., Дунаевіч Н. у 1979 г. у в. Парэчча Пінскага раёна ад Сахарчук М. Ф. (1941).
**191.** Першы сват цераз парог лезе... 110
Зап. Ганчарова С., Савіч З. у 1977 г. у в. Рамязы Ельскага раёна ад Шацько М. С. (1904).
**192.** Увайшоў сватка ў хату... 110
Гл. заўвагу № 47.
**193.** Прыехала сваха... 110
Гл. заўвагу № 7.
**194.** На паўзгор'ю сінія кветкі цвіцелі... 110
Зап. Карасёва А., Граковіч Л. у 1975 г. у в. Махновічы Мазырскага раёна ад Дзянісенка А. А. (1919).
**195.** Ой вы, бацюхна... 111
Зап. Захарава В., Калевіч А. у 1978 г. у в. Парэчча Пінскага раёна ад Пракопчык Л. А. (1931).
**196.** А я ў таткі на адыходзе 111
Гл. заўвагу № 108.

## Абмен падарункамі паміж жаніхом і нявестай

**197.** Жаркая, жаркая ды каліна ў лузе... 111
Гл. заўвагу № 114.
**198.** Маладая Леначка... 111
Зап. Яраслаўцава Р., Даргель Л. у 1975 г. у в. Махновічы Мазырскага раёна ад Канопліч Г. І. (1905).
**199.** Маладая дзевачка... 111
Гл. заўвагу № 4.
**200.** Ой, каля стола — сіняе мора... 112
Зап. Кавалёва Р., Зяневіч Т. у 1970 г. у в. Гаравіца Драгічынскага раёна ад Астапук І. В. (1935).

## Нявесту апранаюць. Расплятанне касы

**201.** Не сядзі, Надзечка, не сядзі... 112
Зап. Карасёва А., Ліпневіч В. у 1968 г. у в. Боркі Ганцавіцкага раёна ад Рабцэвіч В. І. (1910).
**202.** Каб я знала, што ў бацькі не быці... 112
Зап. Лушчыцкая І., Пашынская Г. у 1970 г. у в. Альшанка Пінскага раёна ад Сінкевіч М. А. (1943).
**203.** Ой, нізам, нізам... 113
Зап. Галуза Н., Атрошчанка П. у 1967 г. у в. Моладава Іванаўскага раёна ад Амяльчук П. А. (1919). Паўторны запіс зроблены Літвінка В. у 1981 г.
**204.** Выскачыў старшы брат з каморы... 113
Гл. заўвагу № 203.
**205.** Станьце, дзеванькі... 113
Зап. Сурскова В. у 1968 г. у в. Чамярын Пінскага раёна ад Жук В. П. (1935). Паўторны запіс зроблен Дземянцей Л. у 1981 г.
**206.** Ой, рута, рута, дробнае зелле... 113
Зап. Крахалева Э., Хандогіна С. у 1967 г. у в. Кабакі Бярозаўскага раёна ад Івановай Г. А. (1936).
**207.** Брат сястрычку расплятаў... 113
Зап. Кавалёва Р., Дзікола А. у 1968 г. у в. Вялікае Сяло Пру-

жанскага раёна ад Чарнякевіч В. Д. (1910).
**208.** Ой, маманька-кветка... 113
Зап. Скарабагатава Л., Стрэж Р. у 1967 г. у в. Кабакі Бярозаўскага раёна ад Івановай Г. А. (1936).
**209.** Захацела Надзечка з каліны вяночка... 114
Зап. Яраслаўцава Р., Давыдовіч С. у 1967 г. у в. Страдзічы Брэсцкага раёна ад Якавук М. (1908).
**210.** Ой, гула пчолка, гула... 114
Гл. заўвагу № 56.
**211.** Хадзіла дзеванька па полю... 114
Зап. Чарняўская Л., Чарнагорава Т. у 1969 г. у в. Калдычэва Баранавіцкага раёна ад Лосік Ю. А. (1921).
**212.** Субота, нядзеля настае... 114
Зап. Кавалёва Р., Ганчук Л. у 1969 г. у в. Паланечка Баранавіцкага раёна ад Стрэчань Н. К. (1937).
**213.** Ляцелі галачкі ў тры радочкі... 115
Гл. заўвагу № 2.
**214.** Ой, чыя гэта вішня... 115
Гл. заўвагу № 101.
**215.** Ой, што гэта, ой, што гэта ды за зарыва... 115
Гл. заўвагу № 22.
**216.** Наша дружка маленька... 116
Гл. заўвагу № 1.
**217.** Нежаласлівая Валечка... 116
Гл. заўвагу № 102.
**218.** Загрукацелі вараныя коні на дварэ... 117
Гл. заўвагу № 22.
**219.** Стукнула, грукнула на дварэ... 117
Зап. Раговіч У. у 1962 г. у в. Коўчыцы II Светлагорскага раёна ад Папругі А. Я., Пятух Н. К., Станкевіч У. А., Казаковай П. І., Русаковай З. Р., Саковіч А. Л.
**220.** Таргуйся, брацец, таргуйся... 118
Зап. Захарава В., Канькоў В. у 1980 г. у в. Рудня-Каменева Лоеўскага раёна ад Ісачанка Е. М. (1906).
**221.** Расплящём касу маладой дзевачцы... 118
Гл. заўвагу № 4.
**222.** Расплятаю касу... 118
Гл. заўвагу № 4.
**223.** Завівайся, мая каса русая... 118
Гл. заўвагу № 2.
**224.** Меншы брат касу расплятаў... 119
Гл. заўвагу № 165.
**225.** Дагадайся, Галечка... 119
Гл. заўвагу № 187.
**226.** Затрубілі ў трубачку рана на зары... 119
Гл. заўвагу № 190.
**227.** У сенечках на крэслечку... 119
Гл. заўвагу № 195.
**228.** Скакала сарока па страсе... 120
Гл. заўвагу № 205.
**229.** Каціліся калёсы... 120
Гл. заўвагу № 205.
**230.** Ды стаяць дзевачкі... 120
Гл. заўвагу № 165.
**231.** Ой, глянь, мамка... 120
Гл. заўвагу № 187.
**232.** Гуляла дзеванька... 120
**233.** Ой, церам, церам, церамок... 121
Гл. заўвагу № 78.
**234.** Сягоння нядзелечка... 121
Гл. заўвагу № 188.
**235.** Карыся, Манечка, карыся... 121
Зап. Захарава В., Макарская Н. у 1969 г. у в. Парэчча Пінскага раёна ад Чырко А. А. (1901).
**236.** Падбягу пад акенца—ажно свет... 121
Гл. заўвагу № 87.
**237.** Памалу, братка, ідзіце... 121
Зап. Літвінка В., Марозава А. у 1981 г. у в. Моладава Іванаўскага раёна ад Грабар Т. (1923).

## Нявеста-сірата

**238.** У нас сягоння святы дзянёк нядзеля... 122
Зап. Захарава В., Новік Л. у 1980 г. у в. Пярэдзелка Лоеўскага раёна ад Анікеенка Х. І. (1898).
**239.** Цвілі садочкі ў тры радочкі 122
Гл. заўвагу № 135.
**240.** Сядзела Манечка пад ляском... 122
Зап. Дуброўскі В., Новік Л. у 1980 г. у в. Рудня-Каменева Лоеўскага раёна ад Кірэйцавай А. І. (1907).
**241.** На сягонняшні васкрэсны дзень нядзелі... 123
Гл. заўвагу № 238.
**242.** Зялёная дубравушка... 123
Гл. заўвагу № 238.
**243.** Знаці рутаньку, знаці... 123
Гл. заўвагу № 240.
**244.** Сірата, дзевачка, сірата... 123
Гл. заўвагу № 3.
**245.** Плыла шчука-рыба па ціхай вадзе... 124
Зап. Дуброўскі В., Новік Л. у 1980 г. у в. Барэц Лоеўскага раёна ад Мельнік Т. І. (1907).
**246.** Чаго сядзіш, Валечка... 124
Зап. Ганчарова С., Савіч З. у 1977 г. у в. Сізаны Ельскага раёна ад Каваленка С. В. (1942).
**247.** Чаму, Лідачка, па новым сяле не ходзіш... 124
Гл. заўвагу № 2.
**248.** Ой, хто ж там ды памаленьку гукае? 124
Зап. Захарава В., Чарняева Ж. у 1968 г. у в. Бакуны Пружан-

скага раёна ад Лапука А. Я. (1900).
249. Годзе, Надзечка, сядзеці... 125
Гл. заўвагу № 4.
250. Хадзіла Леначка па новай святліцы... 125
Зап. Літвінка В. у 1981 г. у в. Моладава Іванаўскага раёна ад Куцко Д. Б. (1913).
251. Ды хадзіла Манечка кругом саду... 125
Гл. заўвагу № 240.
252. То рабая зязюлька па сенажаці лятае... 125
Зап. Літвінка В., Лясун Л. у 1979 г. у в. Верхні Цярабяжоў Столінскага раёна ад Козел Г. К. (1897).
253. Ой, хто ж гэта ды па барочку блукае... 126
Зап. Захарава В., Карней Т. у 1975 г. у в. Парэчча Пінскага раёна ад Глушко А. В. (1910).
254. Ой, белая, белая бярозка... 126
Гл. заўвагу № 9.
255. А хто ў лесе паціханьку гукае? 126
Гл. заўвагу № 9.
256. Ой, двор вялікі... 127
Зап. Дземянцей Л., Субота З. у 1980 г. у в. Страдубка Лоеўскага раёна ад Грышкавец Е. І. (1919).
257. Знаці рутаньку па насеннечку... 127
Зап. Захарава В., Козел Т. у 1980 г. у в. Цесны Лоеўскага раёна ад Кацёл Т. І. (1918).
258. На камяні чорны воран крача... 128
Зап. Няфагіна Г., Міхайловіч Л. у 1979 г. у в. Бярэзцы Столінскага раёна ад Няўдахі С. Д. (1901).
259. Ці ты, божа, не бачыш... 128
Гл. заўвагу № 68.
260. Кукавала зязюленька ў садочку... 128
Зап. Кавалёва Р., Муская Т. у 1969 г. у в. Паланечка Баранавіцкага раёна ад Зуй М. І. (1904).
261. З неба, з неба хмарка ідзе... 129
Гл. заўвагу № 260.
262. Знаці зязюленьку па лятанейку... 129
Зап. Яраслаўцава Р.. Кулак А. у 1969 г. у в. Жарабковічы Ляхавіцкага раёна ад Кухарчык А. М. (1901).
263. Дзе твая, Надзечка... 129
Зап. Журовіч Л., Трыбо А. у 1969 г. у в. Жарабковічы Ляхавіцкага раёна ад Кухарчык А. М. (1901).
264. Ой, хто гэта тонка, голасна гукае... 130
Гл. заўвагу № 248.
265. Нікому няма гора... 130
Гл. заўвагу № 135.
266. Няшчасна, матка, сіроцкая доля... 130
Гл. заўвагу № 81.
267. Станьце, мужычкі, усе ў рад... 130
Гл. заўвагу № 81.
268. Зборная нядзелька, зборная... 131
Зап. Шырма Р. у 1930 г. у в. Рудаўляны Гродзенскага павета ад Канецкай Г. (70 г.). Шырма Р. Беларускія народныя песні. Т. 4, «Беларусь», 1976, № 177. Вар.: Гл. заўвагу № 2.

## Пасад

269. Біце крэмень, біце... 131
Зап. Захарава В., Супруновіч С. у 1976 г. у в. Ацяты Маларыцкага раёна ад Дземчук С. Г. (1916).
270. Йдзе Іванка на пасад... 131
Зап. Кавалёва Р., Зеневіч М. у 1974 г. у в. Глушкавічы Лельчыцкага раёна ад Швед А. Ф. (1910).
271. Ой, ступіла дзевачка... 132
Зап. Скарапанава І., Руклінская Т. у 1975 г. у в. Скароднае Ельскага раёна ад Лось Е. Е. (1904).
272. Ступнула дзевачка на парог... 132
Зап. Яраслаўцава Р., Александровіч Т. у 1975 г. у в. Махновічы Мазырскага раёна ад Капыловіч М. І. (1900).
273. Ой ты, ёлачка баравая... 132
Зап. Яраслаўцава Р., Арлова В. у 1975 г. у в. Барыскавічы Мазырскага раёна ад Шчыпер Л. Ф. (1941).
274. Сцяліце нору залатую... 132
Зап. Яраслаўцава Р., Печанка Л. у 1975 г. у в. Зімавішчы Мазырскага раёна ад Ціханавай Е. Л. (1926).
275. Ды ішла дзеванька на пасад... 132
Зап. Захарава В., Філок Л. у 1975 г. у в. Парэчча Пінскага раёна ад Лойкі А. М. (1906).
276. Ішла дзевачка на пасад... 133
Зап. Кавалёва Р., Макейчык Л. у 1977 г. у в. Новая Рудня Ельскага раёна ад Высоцкай М. А. (1919).
277. Разгарэўшыся, каліна... 133
Зап. Яраслаўцава Р., Малашэвіч О. у 1979 г. у в. Гальцы Столінскага раёна ад Вакуліч В. Ф. (1919).
278. Ідзе, ідзе Манечка на пасад... 133
Зап. Карасёва А., Даргель Л. у 1975 г. у в. Махновічы Мазырскага раёна ад Капыловіч М. І. (1900).
279. Ішла Маруська на пасад... 133

Зап. Кавалёва Р., Малая Ж. у 1977 г. у в. Новая Рудня Ельскага раёна ад Неўчык Е. В. (1903).
**280.** Расступіцеся, падружкі... 133
Зап. Ганчарова С., Калянкова Н. у 1977 г. у в. Рамязы Ельскага раёна ад Цык Т. А. (1930).
**281.** Назбірала Кацечка дзевачак поўны двор... 134
Зап. Кавалёва Р., Лысуха А. у 1977 г. у в. Новая Рудня Ельскага раёна ад Дубадзей В. І. (1936).
**282.** Ішла дзевачка на пасад... 134
Гл. заўвагу № 274.
**283.** Брат сястру на пасад вядзе... 134
Гл. заўвагу № 73.
**284.** Брат сястру на пасад вядзе... 134
Гл. заўвагу № 272.
**285.** Ляцелі галачкі... 135
Зап. Скарапанава І., Жэбіт Н. у 1975 г. у в. Скароднае Ельскага раёна ад Васькоўскай Е. Е. (1914).
**286.** Пасцяліце нору, бо я іду... 135
Зап. Ганчарова С., Савіч З. у 1977 г. у в. Рамязы Ельскага раёна ад Іллюк А. І. (1902).
**287.** Каля цесцева двара... 135
Гл. заўвагу № 9.
**288.** З мора вада выліваецца... 136
Зап. Дземянцей Л., Шынкевіч Т. у 1980 г. у в. Страдубка Лоеўскага раёна ад Засючэнка М. А. (1905).
**289.** Дзевачкі ідуць, вяночкі ўюць... 136
Зап. Няфагіна Г., Берковіч М. у 1979 г. у в. Рубель Столінскага раёна ад Каляды Е. К. (1910).
**290.** Ой, пусці, сваццяя, у хату... 136
Зап. Яраслаўцава Р. у 1975 г. у г. Мазыры ад Зубар А. І. (1914).
**291.** Бяліла дзевачка белы лён... 136
Зап. Яраслаўцава Р., Ратомская Т. у 1975 г. у в. Зімавішчы Мазырскага раёна ад Патапавай Е. Д. (1919).
**292.** Ой, ці табе, мамка, жаль, не жаль... 136
Зап. Яраслаўцава Р., Міцкевіч К. у 1979 г. у в. Скрыгалава Мазырскага раёна ад Татулінскай Ф. І. (1900).
**293.** Закавала зязюля... 137
Зап. Кавалёва Р., Руклінская Т. у 1975 г. у в. Кавалі Ельскага раёна ад Руль Н. А. (1919).
**294.** Ды ўступіла Галечка на парог... 137
Зап. Яраслаўцава Р. у 1975 г. у в. Скрыгалава Мазырскага раёна ад Табулінай Ф. І. (1900).
**295.** Пастаньце, суседкі, усе ў рад... 137
Зап. Карасёва А., Дарашчонак З. у 1974 г. у в. Хароліцы Акцябрскага раёна ад Беразоўскай Н. П. (1929).
**296.** Станавіся, радзіначка... 138
Зап. Яраслаўцава Р., Вінаградава С. у 1975 г. у в. Забалоцце Мазырскага раёна ад Козінцавай П. С. (1914).
**297.** Як ты, Анечка, не баішся... 138
Гл. заўвагу № 2.
**298.** Благаславі, божа... 138
Зап. Васілевіч К. у 1970 г. у в. Моталь Іванаўскага раёна ад Мінюк Л. С. (1920).

## Нявесту дарыць

**299.** Збірайся, радзіна багатая... 139
Зап. Захарава В., Палуяновіч Л. у 1975 г. у в. Парэчча Пінскага раёна ад Лойкі А. М. (1906).
**300.** Адзывайся, племя... 139
Гл. заўвагу № 88.
**301.** Стойце, баяры, у адной старане... 139
Зап. Кавалёва Р., Зяновіч М. у 1977 г. у в. Глушкавічы Лельчыцкага раёна ад Швед А. Ф. (1910).
**302.** Дарую я вам шчасце і долю... 139
Зап. Захарава В., Новік Л. у 1980 г. у в. Пярэдзелка Лоеўскага раёна ад Анікеенка Х. П. (1898).
**303.** Дарую грошы, каб былі дзеці харошы 140
Гл. заўвагу № 88.
**304.** Дарую бульбы падполле... 140
Гл. заўвагу № 299.
**305.** Дарую меднымі... 140
Гл. заўвагу № 48.
**306.** Дарую гектар грэчкі... 140
Гл. заўвагу № 299.
**307.** Дарую лес, а ў лесе дубкі 140
Гл. заўвагу № 2.
**308.** Перапіваю стог жыта... 140
Гл. заўвагу № 2.
**309.** Даю стакан суніц... 140
Зап. Фёдараў Д., Захарчанка Н. у 1973 г. у в. Азераны Жыткавіцкага раёна ад Аліфіравец Н. В. (1937).
**310.** Дарую мяшок гліны... 140
Гл. заўвагу № 48.
**311.** Дарыце сіротаньку... 140
Гл. заўвагу № 88.

## Пажаданні

**312.** Жывіце здаровы... 141
Гл. заўвагу № 306.
**313.** Каб жылі багата, як восень... 141
Гл. заўвагу № 240.
**314.** Дару падарунак... 141
Гл. заўвагу № 88.
**315.** Відна Надзю па паходцы... 141
Гл. заўвагу № 88.

## Перад ад'ездам да шлюбу

**316.** Зялёная рутанька... 141
Зап. Лаўшук Л., Дабракова Л. у 1969 г. у в. Здзітава Бярозаўскага раёна ад Чайчыц А. Г. (1910).
**317.** Ох ты, ёлачка баравая... 141
Зап. Карасёва А., Ганчар Т. у 1979 г. у в. Забалоцце Мазырскага раёна ад Заяц Т. Ф. (1927).
**318.** Рада маценька... 141
Зап. Касакоўская Я., Калачынская Л. у 1970 г. у в. Сварынь Драгічынскага раёна ад Капуза В. С. (1932).
**319.** Сядай, Надзечка, у канец стала... 142
Зап. Клубава В., Калачова В. у 1967 г. у в. Макарава Камянецкага раёна ад Еўдамок А. І. (1919).
**320.** Ды сядзела дзеванька вышэй усіх... 142
Зап. Музыка Т., Муская Т. у 1969 г. у в. Паланечка Баранавіцкага раёна ад Зуй М. І. (1904).
**321.** Ты ж, мая матанька... 142
Зап. Захарава В., Макарская Н. у 1970 г. у в. Забараўцы Пінскага раёна ад Сярэдзіч С. З. (1900).
**322.** За лесам, ляском сонейка ўзыходзіць... 142
Зап. Захарава В., Фісюк А. у 1975 г. у в. Парэчча Пінскага раёна ад Гур'янчык В. Ф. (1908).
**323.** Да дубу, зязюля, да дубу... 142
Гл. заўвагу № 70.
**324.** Даліна, даліна... 143
Зап. Рагальская А. у 1979 г. у в. Вялікія Зімовішчы Мазырскага раёна ад Зубрыцкай А. Н. (1927).
**325.** Ды падай, маманька, грабянца... 143
Зап. Захарава В., Карней Т. у 1978 г. у в. Рудка Пінскага раёна ад Шкіль М. А. (1923).
**326.** Ды гудуць пчолкі ды на тры райкі... 143
Зап. Яраслаўцава Р., Менько Л. у 1979 г. у в. Гальцы Столінскага раёна ад Няўдах Т. В. (1918).
**327.** Ды ўпаў грабянец пад стол... 143
Гл. заўвагу № 73.
**328.** У нядзельку рана... 143
Зап. Кавалёва Р., Кароткая С. у 1979 г. у в. Гальцы Столінскага раёна ад Вакуліч В. Ф. (1919).
**329.** Тая ёлачка, тая сасёначка... 143
Зап. Скарапанава І., Лапіцкая В. у 1973 г. у в. Залессе Чачэрскага раёна ад Міхальковай М. П. (1914).
**330.** Ды падай, мама, шубу... 144
Гл. заўвагу № 74.
**331.** Дзевачка ды да шлюбу ішла... 144
Зап. Кавалёва Р., Зайцава Е. у 1979 г. у в. Гальцы Столінскага раёна ад Майсак З. Ф. (1905).
**332.** Ой ты, грушка мая кучаравая... 144
Зап. Фёдараў Д., Боцех З. у 1973 г. у в. Верасніца Жыткавіцкага раёна ад Белько Е. Е. (1898).
**333.** Пасеяў Валодзя свой садвінаград... 144
Зап. Карасёва А., Банько І. у 1974 г. у в. Рудня Мазырскага раёна ад Бачэўскай А. П. (1908).
**334.** Паедзем, дзевачка, да богу маліцца 144
Гл. заўвагу № 12.
**335.** Ды ўслужы, братка, услужы... 145
Гл. заўвагу № 323.
**336.** Да вянца, дзеванька, да вянца... 145
Гл. заўвагу № 4.
**337.** Да вянца, Манечка, да вянца 145
Гл. заўвагу № 323.
**338.** Ой, коню, коню буланы... 145
Зап. Літвінка В., Арэхава Т. у 1979 г. у в. Верхні Церабяжоў Столінскага раёна ад Хлябовіч Е. С. (1921).
**339.** З дарогі,варогі... 145
Гл. заўвагу № 335.
**340.** Не сядзі, княжа, не сядзі... 146
Зап. Карасёва А., Рэдзька Л. у 1975 г. у в. Вялікія Зімовішчы Мазырскага раёна ад Зубрыцкай А. Н. (1927).
**341.** Памолімся богу, памолімся богу... 146
Гл. заўвагу № 70.
**342.** Ой, бярыце, дзевачкі, розачкі... 146
Зап. Кавалёва Р., Карпенка В. у 1979 г. у в. Гальцы Столінскага раёна ад Хоміч А. І. (1936).
**343.** Мамачка, перайдзі мне дарожачку... 146
Гл. заўвагу № 339.
**344.** Ды за нашу Дашу... 147
Зап. Александровіч Т., Даргель Л., у 1975 г. у в. Махновічы Мазырскага раёна ад Юдзіцкай А. А. (1912).

## Па дарозе да шлюбу

**345.** Вярба, вярба, вярбіца... 147
Гл. заўвагу № 317.
**346.** Ой, чые то конікі... 147
Зап. Яраслаўцава Р., Шылкіна Г. у 1968 г. у в. Чамярын Пінскага раёна ад Жук В. П. (1935).
**347.** Ой, броду, броду... 147
Гл. заўвагу № 88.
**348.** Добра таму, чый сын едзе... 148
Гл. заўвагу № 88.

**349.** Ой, на гары ды цэркаўка стаяла... 148
Зап. Дубовік І., Казак К. у 1981 г. у в. Чамярын Пінскага раёна ад Мельнік А. П. (1944).
**350.** Ой, маманька мая... 148
Гл. заўвагу № 346.

## Пасля шлюбу пяюць у дарозе і дома

**351.** Субота, нядзеля, як адзін дзянёчак... 149
Зап. Цвірка Л., Сідзіна С. у 1969 г. у в. Медзяневічы Баранавіцкага раёна ад Бурак Г. Д. (1902).
**352.** На дварэ дожджык рушыць... 149
Зап. Долбік Л., Давыдава Н. у 1969 г. у в. Жарабковічы Ляхавіцкага раёна.
**353.** Мецена вуланька ды з канца... 149
Зап. Хамечка В. у 1972 г. у в. Бурмакі Драгічынскага раёна ад Карнейчык М. П. (1922), Кузьміцкай З. (1937).
**354.** А ехала Анісся з вянца... 150
Гл. заўвагу № 92.
**355.** Выйдзі, выйдзі, мамачка, з калачом... 150
Гл. заўвагу № 92.
**356.** Кацілася ясная зорка... 150
Зап. Ганчарова С., Падгурская Л. у 1977 г. у в. Княжабор'е Ельскага раёна ад Новак К. Ф. (1901).
**357.** Ой, ці жаль матулю, ці не жаль... 150
Зап. Кажухова Н., Казак В. у 1973 г. у в. Антонаўка Буда-Кашалёўскага раёна ад Краўчанка В. Т. (1897). Вар.: Шырма Р., № 80. Зап. Шырма Р. у 1939 г. у м. Белавежа ад Казак Г. Расшыфроўка мелодыі Шырмы Р.
**358.** Маманька, ужо ж я не твая 151
Гл. заўвагу № 322.
**359.** Прыехала дзіця з вянца... 151
Зап. Канцавая Н., Дзерунова Т. у 1978 г. у в. Парэчча Пінскага раёна ад Клімовіч Н. Ф. (1905).
**360.** Дзякуй табе, мая мамачка... 151
Гл. заўвагу № 73.
**361.** Прыйшла дзеванька ад вянчанейка... 151
Зап. Фёдараў Д., Пяцібрат І. у 1974 г. у в. Пагост Жыткавіцкага раёна ад Раманоўскай М. П. (1902).
**362.** Прыехала дзіцятка з касцёла ды пытае... 152
Зап. Літвінка В., Шостак Н. у 1979 г. у в. Ніжні Церабяжоў Столінскага раёна ад Карутаўскай І. П. (1914).
**363.** Прыехала ды дзіця з вянца... 152
Гл. заўвагу № 359.
**364.** Замецена вуліца з канца... 152
Гл. заўвагу № 73.
**365.** Сечана калiначка, сечана... 153
Гл. заўвагу № 359.
**366.** Зажыгай, маці, свечку... 153
Гл. заўвагу № 94.
**367.** Ціха, не гаманіце... 153
Зап. Скарапанава І., Кашкарова С. у 1973 г. у в. Дзербічы Буда-Кашалёўскага раёна ад Майсеенка А. Н. (1913).
**368.** Выйдзі, бацэнька, з бубянцамі, ключамі... 153
Зап. Карасёва А., Даргель Л. у 1975 г. у в. Махновічы Мазырскага раёна ад Заяц М. В. (1924).
**369.** Ой, наш жаніх весел стаў... 153
Зап. Захарава В., Юркоўская Н. у 1979 г. у в. Верхні Церабяжоў Столінскага раёна ад Грэчка Ф. Е. (1919).
**370.** А мы ў цэркві бывалі... 154
Зап. Літвінка В., Салавей Л. у 1979 г. у в. Верхні Церабяжоў Столінскага раёна ад Кулік Н. В. (1934).
**371.** А мы бацюшку ды ашукалі... 154
Гл. заўвагу № 367.
**372.** Абманулі папа... 154
Гл. заўвагу № 74.
**373.** Мы папа ашукалі... 154
Зап. Дземянцей Л., Субота З. у 1980 г. у в. Страдубка Лоеўскага раёна ад Грышкавец В. С. (1909).
**374.** Каля новага двара... 154
Гл. заўвагу № 370.
**375.** Былі ж мы ў папа на чэсці... 155
Гл. заўвагу № 370.
**376.** Ляцелі павукі з навукі... 155
Зап. Кардзенкова Т., Карней Т. у 1978 г. у в. Парэчча Пінскага раёна ад Водчыц А. І. (1900).
**377.** Ой, пад мастом, пад вяльмовым... 155
Гл. заўвагу № 7.

## Другі дзень вяселля Жаніх едзе да нявесты

**378.** Маці сына выправажала... 155
Гл. заўвагу № 2.
**379.** Ой, ідзі, Колечка... 155
Зап. Кавалёва Р., Калачынская Л. у 1970 г. у в. Сварынь Драгічынскага раёна ад Капуза В. С.
**380.** Цешча зяця злякалася... 156
Гл. заўвагу № 4.
**381.** Ой, з'ехаў зяць... 156
Зап. Карасёва А., Іванова А. у 1975 г. у в. Бабровічы Івацэвіцкага раёна ад Пінчук В. Н. (1921).

**382.** Не гусі гэгалі... 156
Зап. Яраслаўцава Р., Анцыферава С. у 1967 г. у в. Знаменка Брэсцкага раёна ад Нічыпарук Г. Н.
**383.** Не сядзі, жанішок, не сядзі... 156
Зап. Лушчыцкая І., Пыліна Т. у 1970 г. у в. Лышча Пінскага раёна ад Прыгодзіч Ю. Д.
**384.** Ехалі мы лесам-борам... 156
Гл. заўвагу № 4.
**385.** Ой, борам, борам, барамі... 157
Гл. заўвагу № 4.
**386.** Чаму цешча не выходзіць... 157
Гл. заўвагу № 4.
**387.** Ой, братка Іванка... 157
Гл. заўвагу № 4.
**388.** Не лякайся, цешчанька... 157
Гл. заўвагу № 4.
**389.** Чыя ж гэта радзіна... 157
Гл. заўвагу № 4.

## Маладую «асыпаюць»

**390.** Ой, ступіла залатым абцасам на ўслон... 158
Зап. Фёдараў Д., Атрошчанка П. у 1967 г. у в. Моладава Іванаўскага раёна ад Амяльчук П. А. Вар.: Зап. Захарава В. у 1981 г. у в. Парэчча Пінскага раёна ад Макарскай Е. Ф. (1924).
**391.** Не над рэчкаю стаю... 158
Гл. заўвагу № 4.

## Брат «прадае» сястру

**392.** Браток, браток саколю... 158
Гл. заўвагу № 1.
**393.** Браточку-наменічку... 158
Гл. заўвагу № 95.
**394.** Месяц, месяц, Колечка... 158
Гл. заўвагу № 1.

## Госці ў доме нявесты

**395.** Застукалі конікі на памосце... 158
Зап. Карасёва А., Пінчук І. у 1976 г. у в. Прудок Калінкавіцкага раёна ад Іяўчук А. А. (1919).
**396.** Сені, за сеньмі... 159
Гл. заўвагу № 5.
**397.** Я не хачу, маладзенькая... 159
Гл. заўвагу № 101.
**398.** Кавала, зязюлька, кавала... 159
Гл. заўвагу № 101.
**399.** Няпраўдзівая калінка... 159
Гл. заўвагу № 100.
**400.** Каб я знала, што ў баценькі болей не буду... 160
Гл. заўвагу № 299.
**401.** Ой, мамка, мая кветка... 160
Гл. заўвагу № 245.
**402.** Як у полі дуб ды бяроза... 161
Зап. Кавалёва Р., Ісакава Н. у 1977 г. у в. Новая Рудня Ельскага раёна ад Мірашнічэнкі Ю. А. (1930).
**403.** Гуляй, дзеўка, красуйся... 161
Гл. заўвагу № 240.
**404.** Пагуляйце, дзевачкі... 161
Гл. заўвагу № 245.
**405.** А ці не будзеш ты, Анечка, жалаваці... 161
Гл. заўвагу № 314
**406.** Чаму ў цябе, Ганначка, розуму не стала... 161
Зап. Карасёва А., Граковіч Л. у 1975 г. у в. Махновічы Мазырскага раёна ад Дзенісенка А. А. (1913).
**407.** Не кукуй, зязюлька, у зялёным лесе... 162
Гл. заўвагу № 356.
**408.** Ой, знай, дзеванька... 162
Гл. заўвагу № 29.
**409.** У варот вярба стаяла... 162
Гл. заўвагу № 273.
**410.** Галя з двара з'язджала... 162
Гл. заўвагу № 357.
**411.** З'язджала Галечка... 163
Зап. Кавалёва Р., Малая Ж. у 1977 г. у в. Новая Рудня Ельскага раёна ад Бандарэнкі В. І. (1928).
**412.** Ой, у лузе ды каліна стаяла... 163
Гл. заўвагу № 317.
**413.** Каліна-маліна, не стой за ракою... 163
Гл. заўвагу № 4.
**414.** Ой, ступіла Ніначка на парог... 164
Гл. заўвагу № 344.
**415.** Села Танечка за сталом... 164
Зап. Яраслаўцава Р., Мураша І. у 1975 г. у в. Барыскавічы Мазырскага раёна ад Беспалавай К. М. (1918).
**416.** Разжалілася каліна... 164
Гл. заўвагу № 84.
**417.** Надзечка на выходзе... 164
Зап. Яраслаўцава Р., Мароз А. у 1979 г у в. Гальцы Столінскага раёна ад Няўдах Т. В. (1918).
**418.** Як заржалі сівы коні... 164
Гл. заўвагу № 240.
**419.** Стукнулі, грукнулі на дварэ... 165
Зап. Кавалёва Р., Гарбачэўская Г. у 1969 г. у в. Падгорная Баранавіцкага раёна ад Самсонік А. М. (1898).
**420.** А ў нядзелю рана... 165
Гл. заўвагу № 240.
**421.** Калі б знала я... 165
Зап. Кавалёва Р., Фомчанка Л. у 1977 г. у в. Кавалі Ельскага раёна ад Руль Н. А. (1919).
**422.** Плакала Лідачка ў святліцы... 165
Гл. заўвагу № 245.
**423.** Кукавала зязюленька ў садочку... 165

Зап. Ярослаўцава Р., Мурашка І. у 1975 г. у в. Барыскавічы Мазырскага раёна ад Пакорскай М. Г. (1935).
**424.** Ой, прасіце, дзеўкі, бога... 166
Зап. Няфагіна Г., Грыгаровіч Л. у 1979 г. у в. Рубель Столінскага раёна ад Шкрабец В. Д. (1904).
**425.** Чаго сядзіш, што думаеш, Ніначка? 166
Гл. заўвагу № 4.
**426.** Сабраліся ўсе галачкі... 166
Зап. Ярослаўцава Р., Бугай Л. у 1979 г. у в. Баланевічы Мазырскага раёна ад Шытавец К. П. (1934).
**427.** Выдаюць цябе замуж чужыя людзі... 167
Гл. заўвагу № 28.
**428.** Нявесціна матка па сенях ходзіць... 167
Зап. Няфагіна Г., Бугаёва Т. у 1979 г. у в. Рубель Столінскага раёна ад Крылоўскай Л. С. (1904).
**429.** Дзіцятка маё дарагое... 167
Зап. Скарапанава І., Чуткова Н. у 1973 г. у в. Рутковічы Чачэрскага раёна ад Лушковай М.І. (1932).
**430.** Рана, рана, ранюсенька... 167
Зап. Раткевіч Ж. у 1980 г. у в. Рудня-Каменева Лоеўскага раёна ад фальклорнага ансамбля.
**431.** Ой, рэчка, рэчка Славечна... 168
Гл. заўвагу №. 317.
**432.** Ужо ты, Манечка... 168
Зап. Захарава В., Кавалеўская Т. у 1975 г. у в. Парэчча Пінскага раёна ад Саўчук В. Г. (1907).
**433.** Не сядзі, Мішачка, не сядзі... 168
Гл. заўвагу № 322.
**434.** Просім цябе, малады Ванечка, з павагай... 168
Зап. Карасёва А., Даращонак З. у 1976 г. у в. Харомцы Акцябрскага раёна ад Беразоўскай Н. П. (1929).
**435.** Бяры, зяцю, дачку... 169
Гл. заўвагу № 357.
**436.** Збірай, дачка, пасталы і анучы... 169
Гл. заўвагу № 322.
**437.** Штосьці ў лесе зашумела... 169
Зап. Кавалёва Р., Барташ Л. у 1976 г. у в. Чырковічы Светлагорскага раёна ад Метраховіч В. М. (1896).
**438.** Ідзе цешчачка ў камору... 169
Гл. заўвагу № 359.
**439.** Ой, маці, маці, я твой зяць... 169
Гл. заўвагу № 430.
**440.** Закідай, мамка, жар, жар... 170
Гл. заўвагу № 322.
**441.** Чаму, Лідачка, не вячэраеш... 170
Гл. заўвагу № 245.
**442.** Чаго сядзіш, не вячэраеш... 170
Зап. Раткевіч М. у 1980 г. у в. Суткоў Лоеўскага раёна ад Бажэнка М. Б. (1904).
**443.** А ты будзеш па мяне, мамка, бедаваць... 170
Гл. заўвагу № 245.
**444.** Ці я табе, мамачка, надаела... 170
Зап. Літвінка В., Карней Т. у 1981 г. у в. Моладава Іванаўскага раёна ад Вырвец М. М. (1922).
**445.** Ці я табе, бацюхна, не міла... 171
Гл. заўвагу № 4.
**446.** Ты казала, мамка... 171
Гл. заўвагу № 421.
**447.** Я табе, мая мамка, не дзіцятка... 171
Зап. Скарапанава І., Казак С. у 1973 г. у в. Дзербічы Буда-Кашалёўскага раёна ад Раманенка А. А. (1890).
**448.** Ой, жаль мне, матухна, на цябе... 171
Гл. заўвагу № 4.
**449.** Ці я табе, мамачка... 172
Зап. Кавалёва Р., Малая Ж. у 1977 г. у в. Новая Рудня Ельскага раёна ад Бандарэнкі В. І. (1928).
**450.** Убіраймася, ды не гаймася, бо ўжо свет 172
Гл. заўвагу № 271.
**451.** Ды бацюхна родны... 172
Гл. заўвагу № 430.
**452.** Ды добра ж табе, дзевачка... 172
Зап. Захарава В., Петухова Л. у 1980 г. у в. Пярэдзелка Лоеўскага раёна ад фальклорнага ансамбля вёскі.
**453.** Колькі ў мамы не працуеш... 172
Гл. заўвагу № 240.
**454.** Ой, пасею жыта... 172
Зап. Дземянцей Л. у 1982 г. у в. Вербавічы Нараўлянскага раёна ад Халадовіч А. Д. (1940).
**455.** За лес сонца заходжвае... 173
Зап. Няфагіна Г., Бугаёва Т. у 1979 г. у в. Рубель Столінскага раёна ад Пашкевіч Р. К. (1952).
**456.** Азірніся, маці... 173
Гл. заўвагу № 430.
**457.** Запалі, мамка, свечкі... 173
Гл. заўвагу № 238.
**458.** Кальнула бацьку ў грудзі... 173
Зап. Захарава В., Фесюк А. у 1978 г. у в. Парэчча Пінскага раёна ад Гарагляд Г. Г. (1923).
**459.** Хадзіла дзяўчына па двару... 173
Зап. Скарапанава І., Кудрашо-

ва В. у 1973 г. у в. Дзербічы Буда-Кашалёўскага раёна ад Майсеенка І. Г. (1905).
**460.** Пазнаеш, мамка, дачку ад-даўшы... 174
Зап. Захарава В., Дунаевіч А. у 1978 г. у в. Парэчча Пінскага раёна ад Януш Л. С. (1911).
**461.** Ой, знаці, знаці... 174
Гл. заўвагу № 317.
**462.** Ды хвалілася мамачка, што дачка была... 174
Гл. заўвагу № 424.
**463.** Паслухай, дзяўчынка, што твая мамка гаворыць... 174
Зап. Карасёва А., Граковіч Л. у 1975 г. у в. Махновічы Мазырскага раёна ад Дзенісенка А. А. (1913).
**464.** Давай, мамка, павячэраем... 174
Гл. заўвагу № 129.
**465.** Хадзем, мамка, у камору... 175
Зап. Яраслаўцава Р., Луцкая В. у 1975 г. у в. Барыскавічы Мазырскага раёна ад Ерманавец Т. І. (1900).
**466.** Зялёны рамон... 175
Зап. Кавалёва Р., Іваненка Л. у 1977 г. у в. Новая Рудня Ельскага раёна ад Дворак А. А. (1941).
**467.** Наша маладая, як сыр белы... 175
Гл. заўвагу № 97.
**468.** Наша маладая бела, як дзень... 175
Зап. Ганчарова С., Хмельніцкая Л. у 1977 г. у в. Рамязы Ельскага раёна ад Іллюк Ф. І. (1899).
**469.** У нашага жаніха—сокала вочы... 175
Зап. Літвінка В., Петухова Л. у 1979 г. у в. Рубель Столінскага раёна ад Пашкевіч В. А. (1909).
**470.** Хваліліся сваты, што яны багатыя... 176
Гл. заўвагу № 4.
**471.** Нашаму княжому... 176
Зап. Захарава В., Раткевіч Ж. у 1980 г. у в. Пярэдзелка Лоеўскага раёна ад Мельнік Т. І. (1907).
**472.** Наша маладая... 176
Гл. заўвагу № 4.
**473.** Ваша маладая... 176
Зап. Дземянцей Л., Шыляева Л. у 1980 г. у в. Страдубка Лоеўскага раёна ад Канаваленка В. К. (1911).
**474.** Наша маладая... 176
Гл. заўвагу № 101.
**475.** У нашага свата свадзьба была... 176
Гл. заўвагу № 245.
**476.** Разганяйся, маці... 176
Гл. заўвагу № 245.
**477.** Ды падзякуем свату... 177
Зап. Яраслаўцава Р., Бугай Л. у 1979 г. у в. Скрыгалава Мазырскага раёна ад Верамей А. В. (1896).
**478.** Ды падзякуем свату... 177
Зап. Захарава В. у 1980 г. у в. Пярэдзелка Лоеўскага раёна ад фальклорнага ансамбля вёскі.
**479.** А ў нашага свата... 177
Гл. заўвагу № 273.
**480.** У нашага свата... 177
Гл. заўвагу № 4.
**481.** Ой, у нашага свата... 177
Гл. заўвагу № 22.
**482.** Ой, у нашага свата... 177
Гл. заўвагу № 11.
**483.** У нашага свата... 178
Гл. заўвагу № 270.
**484.** А ў нашага свата харошая хата... 178
Гл. заўвагу № 302.
**485.** А ў нашага свата... 178
Зап. Яраслаўцава Р., Прылуцкая С. у 1975 г. у в. Барыскавічы Мазырскага раёна ад Бяспалавай П. М. (1908).
**486.** У нашага свата лысая галава... 178
Гл. заўвагу № 11
**487.** А на свацці кашуля... 178
Гл. заўвагу № 97.
**488.** Мая свацейка, якая ты прыгожая... 179
Гл. заўвагу № 342.
**489.** Паехалі, як вочачкі... 179
Зап. Кавалёва Р., Макейчык Л. у 1977 г. у в. Новая Рудня Ельскага раёна ад Высоцкай М. А. (1919).
**490.** Ды казалі нам людзі... 179
Гл. заўвагу № 252.
**491.** Ой, сватка, ты харош... 179
Гл. заўвагу № 359.
**492.** А сват свацці сплёў лапці... 179
Гл. заўвагу № 97.
**493.** Ехалі баяры ў сераду... 179
Гл. заўвагу № 167.
**494.** А ў нашага свата... 179
Зап. Скарапанава І., Лутková Л. у 1973 г. у в. Раўковічы Чачэрскага раёна ад Аўсеенка А. А. (1916).
**495.** Горды, горды сват, горды... 180
Гл. заўвагу № 11.
**496.** Прыйшоў на вяселле наш сваток... 180
Гл. заўвагу № 423.
**497.** Пойдзем ды паглядзім... 180
Гл. заўвагу № 447.
**498.** Нашы свахі—чохі, чохі... 180
Гл. заўвагу № 489.
**499.** Нашы сваты хваліліся, што багатыя... 180
Зап. Захарава В., Новік Л. у 1980 г. у в. Пярэдзелка Лоеўскага раёна ад Краўчанка А. П. (1914).

500. Нашы свашачкі—малы пчолкі... 181
Гл. заўвагу № 240.
501. Наш сваток, як чаранок... 181
Зап. Кавалёва Р., Грыбоўская А. у 1980 г. у в. Дзержачы Лоеўскага раёна ад Дзеруновай А. І. (1905).
502. Дзе вы, свахі, валачыліся... 181
Гл. заўвагу № 240.
503. Як у нашага свата... 181
Гл. заўвагу № 1.
504. Пышна цешча, пышна... 181
Гл. заўвагу № 9.
505. Наш княжок лахман... 181
Гл. заўвагу № 1.
506. У старшага дружка—лыса галава... 182
Гл. заўвагу № 4.
507. Старшая дружка—кучка... 182
Гл. заўвагу № 424.
508. Цесць, мой бацюхна... 182
Гл. заўвагу № 38.
509. Сабірайся, Танечка, з намі... 182
Гл. заўвагу № 245.
510. З намі, дзеванька, з намі... 182
Гл. заўвагу № 1.
511. Не думай, Манечка, не думай... 183
Гл. заўвагу № 33.
512. Ой, сваты, сваточкі... 183
Гл. заўвагу № 65.
513. Не журыся, Галюхна... 183
Гл. заўвагу № 292.
514. Пасядзьце, баяры, шарам... 183
Гл. заўвагу № 294.
515. Дружачкі, не даражыце... 184
Гл. заўвагу № 36.
516. З мора вада выліваецца... 184
Гл. заўвагу № 72.
517. Кляновы лісточак... 184
Гл. заўвагу № 38.
518. Я ж табе, маманька, казала... 184
Гл. заўвагу № 245.
519. Аддаеш мяне, мамка... 185
Гл. заўвагу № 39.
520. У дарогу, дзевачка, у дарогу... 185
Гл. заўвагу № 52.
521. Пайду я ў клець спаці... 185
Гл. заўвагу № 100.
522. Свату, свату разбою... 185
Гл. заўвагу № 170.
523. Там у лесе, у лесе мядзведзь рыкае... 185
Гл. заўвагу № 40.
524. Як пайду я ў лес па дровы... 186
Гл. заўвагу № 41.
525. Едзь, едзь, дзевачка, у чужыя людзі... 186
Гл. заўвагу № 42.
526. Ой, паедзем, свахны, дадому... 186
Гл. заўвагу № 136.
527. Старшая сваха, ды пасунься на лаве... 186
Гл. заўвагу № 158.
528. Малады маршалачку... 187
Гл. заўвагу № 187.
529. Родная мая маценька... 187
Гл. заўвагу № 280.
530. Аглядзелася маці... 187
Гл. заўвагу № 286.
531. Лета ж маё, лета... 187
Гл. заўвагу № 154.
532. Баценька дзетак пытае... 187
Гл. заўвагу № 43.
533. Наце вам, дружачкі... 188
Гл. заўвагу № 76.
534. Сваце, сваце, ды давай нам волю... 188
Гл. заўвагу № 86.
535. Зімовае зеллейка, ці ты зімы баішся... 188
Гл. заўвагу № 44.
536. Наша маладая, як дзень мілы... 188
Гл. заўвагу № 117.
537. Не плач, матанька... 188
Гл. заўвагу № 252.
538. Што ты сабе, маладая Надзечка, думаеш... 189
Гл. заўвагу № 101.
539. Пі, дружачка... 189
Гл. заўвагу № 47.
540. Коні гагочуць, дадому хочуць... 189
Гл. заўвагу № 48.
541. Пазнаеш, матка... 189
Гл. заўвагу № 46.
542. Ой, пабачыш, маманька... 189
Гл. заўвагу № 324.

## Развітанне нявесты з бацькамі, раднёй, сяброўкамі

543. Кланялася бяроза... 190
Гл. заўвагу № 4.
544. Скокнула Ганначка з лаўкі далоў... 190
Гл. заўвагу № 215.
545. Ля варот бяроза стаяла... 191
Гл. заўвагу № 66.
546. З мора вада выліваецца... 191
Гл. заўвагу № 90.
547. Сядзем, баценька, паабедаем з табою... 191
Гл. заўвагу № 274.
548. Выйду за варотачкі... 191
Гл. заўвагу № 51.
549. Ой, аддаў мой баценька, аддаў... 191
Гл. заўвагу № 4.
550. Лятала пава па крутой гары... 192
Гл. заўвагу № 4.
551. Я жаль маю, мая мамачка, на цябе... 192
Гл. заўвагу № 22.
552. Пакуццё, маё пакуццё... 193
Гл. заўвагу № 54.
553. Скрыня мая, бязухая... 193
Гл. заўвагу № 57.
554. Браткі, мае браткі... 193
Гл. заўвагу № 95.

**555.** Ой, барвінку, барвінку... 193
Гл. заўвагу № 4.
**556.** Не плач, мамка, па мне... 193
Гл. заўвагу № 245.
**557.** Пара дзеўкам дадому ісці... 194
Гл. заўвагу № 61.
**558.** Ой, за сінімі, сінімі сенечкамі... 194
Гл. заўвагу № 1.
**559.** Ужо зязюлька ў лугі ўлятае... 194
Гл. заўвагу № 64.
**560.** Кацілася яблычка з гары далоў... 194
Гл. заўвагу № 67.
**561.** Аддавала дзевачка дабранач... 194
Гл. заўвагу № 69.
**562.** Да хіліцеся ж, лозы... 195
Гл. заўвагу № 70.
**563.** Сядай, Валечка, на вазы... 195
Гл. заўвагу № 83.
**564.** Чырка-кітайка на двор махае... 195
Гл. заўвагу № 22.
**565.** Ужо конікі запрэжаны... 195
Гл. заўвагу № 148.
**566.** Месяц узыходзіць... 195
Гл. заўвагу № 166.
**567.** Ужо свет світае... 196
Гл. заўвагу № 4.
**568.** На крутым чырвоным беражку... 196
Гл. заўвагу № 4.
**569.** Маладая Манечка... 196
Гл. заўвагу № 177.
**570.** Маладая Манечка... 197
Гл. заўвагу № 277.
**571.** Крача вутачка, крача... 197
Гл. заўвагу № 1.
**572.** Пачакайце, сваты... 197
Гл. заўвагу № 2.
**573.** Пастой, кабыла... 197
Гл. заўвагу № 78.
**574.** Зашумела дуброва зялёна... 197
Гл. заўвагу № 205.
**575.** Ціха, баяры, ідзіце... 198
Гл. заўвагу № 188.
**576.** Сабірайся, дзевачка, сабірайся... 198
Гл. заўвагу № 94.
**577.** Стаіць яблынька... 198
Гл. заўвагу № 4.
**578.** Дзякуй, дзякуй, татачка, за хлеб-соль... 198
Гл. заўвагу № 4.
**579.** Ой, як кракнуў селязень... 198
Гл. заўвагу № 165.
**580.** Дзіўныя людзі, нам не дзівіцеся... 199
Гл. заўвагу № 299.
**581.** Бывайце здаровы, бацькавы парогі... 199
Гл. заўвагу № 187.
**582.** Куды, дачка, сабіраешся... 199
Гл. заўвагу № 190.
**583.** Ой ты, Манечка маладзенькая... 199
Гл. заўвагу № 195.
**584.** Заграбай, маці, жар, жар... 200
Гл. заўвагі № 1, 4, 8. Песня бытуе ўсюды на Палессі.
**585.** Ой, гэкнула гусанька цераз мора летучы... 200
Зап. Фёдараў Д., Габрылевіч Н. у 1973 г. у в. Верасніца Жыткавіцкага раёна ад Белкі Е. Е. (1913).
**586.** Паганяй, фурман, клячу... 200
Зап. Ганчарова С., Чысцякова С. у 1977 г. у в. Верасніца Жыткавіцкага раёна ад Белкі Е. Е. (1913).
**587.** Ходзіць-паходзіць ясён месяц па небе, гэй! 201
Зап. Шырма Р. у 1940 г. у Беластоку. Ён адзначыў, што гэта песня з-пад Дзісны. Вар.: Гл. заўвагу № 1.
**588.** Ой, бі каня, паганяй каня... 201
Зап. Няфагіна Г., Гаўрыльчык Т. у 1979 г. у в. Рубель Столінскага раёна ад Шкрабец В. Д. (1905).
**589.** Бяжы, брацейка, расою... 201
Гл. заўвагу № 1.
**590.** Ехалі, ехалі па-над прызбаю... 202
Гл. заўвагу № 314.
**591.** Ляці, ляці, сокал мілы... 202
Гл. заўвагу № 36.
**592.** Бяжыце, конікі, рыссю, рыссю... 202
Гл. заўвагу № 36.
**593.** Ой ты, Надзечка, упярод бяжы... 202
Гл. заўвагу № 220.
**594.** Не лякайцеся, людзі... 202
Гл. заўвагу № 272.
**595.** Таптаді ніўку, таптаді другую... 202
Зап. Захарава В., Капусціна А. у 1980 г. у в. Суткоў Лоеўскага раёна ад фальклорнай групы.
**596.** Кавала зязюля ў дупелі... 203
Зап. Захарава В., Дзіўнель Л. у 1980 г. у в. Мохаў Лоеўскага раёна ад фальклорнага мужчынскага ансамбля.
**597.** Мы ехалі лесам... 203
Гл. заўвагу № 253.
**598.** Пусці, свацця, у хату... 203
Гл. заўвагу № 275.
**599.** Пад'язджаем пад сяло... 203
Гл. заўвагу № 299.
**600.** Адчыняйце ж вароты... 203
Гл. заўвагу № 322.
**601.** Адчыняйце ж вароты... 203
Гл. заўвагу № 51.
**602.** Сядзіць зайчык пад сасёнкаю—вочкі трэ... 204
Гл. заўвагу № 286.
**603.** Прыехалі на мецены двор... 204
Гл. заўвагу № 154.
**604.** Ці ж мы ў цябе, пане-сваце, не бывалі... 204
Гл. заўвагу № 43.
**605.** Знаці сватку, знаці... 204
Гл. заўвагу № 76.
**606.** Сватоқ сваё гне... 205
Гл. заўвагу № 86.

**607.** Былі ў Кракаве... 205
Гл. заўвагу № 44.
**608.** Сакоча зязюлька, сакоча... 205
Зап. Шырма Р. у 1946 г. у в. Апечкі Стаўбцоўскага раёна ад Грыгаровіч В. Вар.: Гл. заўвагу № 1.

## Бацькі маладога чакаюць і сустракаюць сына з нявесткай

**609.** Жаніхова маці... 206
Гл. заўвагу № 84.
**610.** Выйдзі, пабач, мая мамачка... 206
Гл. заўвагу № 101.
**611.** Пакажыце нам пані... 206
Гл. заўвагу № 4.
**612.** Агнянка-свякроўка, агнянка... 206
Гл. заўвагу № 4.
**613.** Ой, гора-гора, чужая маці... 206
Гл. заўвагу № 1.
**614.** Свёкар добры... 206
Гл. заўвагу № 84.
**615.** Учора была ночанька, а цяпер дзень... 207
Гл. заўвагу № 2.
**616.** Ой, была ночанька... 207
Гл. заўвагу № 5.
**617.** Стаіць маманька... 207
Гл. заўвагу № 9.
**618.** Ужо як свёкар гаворыць... 207
Гл. заўвагу № 38.
**619.** Лістам дарога высцілаецца... 207
Гл. заўвагу № 101.
**620.** Конікі, тупу, тупу... 208
Зап. Захарава В., Літвінка В. у 1979 г. у в. Верхні Церабяжоў Столінскага раёна ад Казла А. А. (1932).
**621.** Ой, у агародзе ды на новай градцы... 208
Гл. заўвагу № 31.
**622.** Ды выйдзі, свякруха, паглядзі... 208
Гл. заўвагу № 11.
**623.** Выйдзі, маці, паглядзі... 209
Гл. заўвагу № 11.
**624.** Паўз сад ды дарожачка... 209
Гл. заўвагу № 22.
**625.** Выйдзі, свякруха, з гарбом... 210
Гл. заўвагу № 12.
**626.** Выйдзі, матанька, паглядзі... 210
Гл. заўвагу № 12.
**627.** Выйдзі, мамачка, выйдзі... 210
Гл. заўвагу № 113.
**628.** Выйдзі, мамачка, паглядзі... 210
Гл. заўвагу № 69.
**629.** Выйдзі, матухна, паглядзі... 210
Гл. заўвагу № 68.
**630.** Выйдзі, свякроў, паглядзі... 211
Гл. заўвагу № 69.
**631.** Падзівіся свякроўка, збоку... 211
Гл. заўвагу № 43.
**632.** Выйдзі, маці, паглядзі... 211
Гл. заўвагу № 4.
**633.** Выйдзі, матухна, паглядзі... 211
Гл. заўвагу № 69.
**634.** Не лякайся, свякроўка... 211
Гл. заўвагу № 47.
**635.** Ой, радуйся, зямля... 211
Гл. заўвагу № 179.
**636.** Радуйся, маці... 212
Гл. заўвагу № 195.
**637.** Стуку, стуку... 212
Гл. заўвагу № 245.
**638.** Ці рада, мамка... 212
Гл. заўвагу № 55.
**639.** Бацюхна родненькі... 212
Гл. заўвагу № 19.
**640.** Ці рад, бацюхна... 212
Гл. заўвагу № 19.
**641.** Ды не наступайце, дзевачкі... 212
Гл. заўвагу № 322.
**642.** Ой, знаці, знаці, што чужая маці... 213
Гл. заўвагу № 1.
**643.** Выйдзі ты, мая мамачка... 213
Гл. заўвагу № 1.
**644.** Шаўковая нітачка ў сцену б'е... 213
Гл. заўвагу № 295.
**645.** Будзь здарова, мама... 213
Гл. заўвагу № 68.
**646.** Здарова, нявестка, у маім даму... 213
Гл. заўвагу № 68.
**647.** Будзь здарова, нявестка... 213
Гл. заўвагу № 4.
**648.** Свякроў нявестку ды перапівала... 214
Гл. заўвагу № 4.
**649.** Перапіваю... 214
Гл. заўвагу № 114.
**650.** Перапіваю той крайчык... 214
Гл. заўвагу № 114.
**651.** Перапіваю... 214
Гл. заўвагу № 23.
**652.** Ішлі дымы па-за лугамі... 214
Гл. заўвагу № 289.
**653.** Ой, ляціце, чорны галачкі... 215
Гл. заўвагу № 139.
**654.** Блізкія ды суседачкі... 215
Гл. заўвагу № 113.
**655.** Ой, што гэта на парог лезе... 215
Гл. заўвагу № 141.
**656.** Здрыгнулася хата... 215
Гл. заўвагу № 139.
**657.** Жанішка-брацейка... 215
Гл. заўвагу № 180.
**658.** Выкупляйце, дружкі, шапачку... 216
Гл. заўвагу № 180.
**659.** Ой, мамка-вутка... 216
Гл. заўвагу № 2.
**660.** Ой, здзявайце вы пяньковыя... 216
Гл. заўвагу № 2.
**661.** Увайшла Надзечка ў новую хату... 216
Гл. заўвагу № 57.
**662.** Пасела каля мяне чужына... 216
Гл. заўвагу № 57.

**663.** Я сёння прыведзена... 216
Зап. Кавалёва Р., Барташ Л. у 1974 г. у в. Пясчаная Рудня Светлагорскага раёна ад Старасeлец Е. С. (1909).
**664.** Я ж табе, свёкарка, не пані... 216
Гл. заўвагу № 69.
**665.** Я ў цябе, свёкра, першы дзень... 217
Гл. заўвагу № 295.
**666.** Падмяту хату, падмяту і сені... 217
Гл. заўвагу № 83.
**667.** Хадзіла Манечка ды па новай хаце... 217
Гл. заўвагу № 2.
**668.** У полі два дубочкі... 217
Гл. заўвагу № 4.
**669.** Каму ехаць па завівалу... 218
Гл. заўвагу № 37.
**670.** Каго паслаць па завівалы? 218
Гл. заўвагу № 4.
**671.** Ды выбегла мурашачка... 218
Гл. заўвагу № 102.
**672.** Вылецела ды мурашачка... 218
Гл. заўвагу № 95.
**673.** Мы цябе, дзевачка, завіваем... 218
Гл. заўвагу № 31.
**674.** Завівала мяне дзядзіна... 219
Гл. заўвагу № 1.
**675.** Завівала мяне дзядзіна... 219
Гл. заўвагу № 94.
**676.** Ой, рэчка, рэчка, балота... 219
Гл. заўвагу № 94.
**677.** Нашы свахі—няўдахі... 219
Гл. заўвагу № 78.
**678.** Зірні, маці, ды на мой пасаг... 219
Гл. заўвагу № 31.
**679.** Прыляцела ластаўка... 219
Гл. заўвагу № 114.
**680.** Завівальніца скача 220
Гл. заўвагу № 127.
**681.** Не сядзі, Колечка... 220
Гл. заўвагу № 11.
**682.** Часала дзевачка белы лён... 221
Гл. заўвагу № 101.
**683.** Ды не сядзі ты, Колечка, не сядзі... 221
Гл. заўвагу № 134.
**684.** Чаго ты, маладзенькая, не плачаш... 221
Гл. заўвагу № 143.
**685.** Ой, свахі-няўдахі... 221
Гл. заўвагу № 143.

## Перазоў

**686.** Глядзіць дзеванька ў даліну... 221
Гл. заўвагу № 117.
**687.** Ой, добры дзень, добрыя людзі, і мы к вам! 222
Зап. Скарапанава І., Лапіцкая Е. у 1973 г. у в. Залессе Чачэрскага раёна ад Міхальковай М. П. (1914).
**688.** Злодзей, сватка, злодзей... 222
Гл. заўвагу № 11.
**689.** Выйдзі, Ніначка, выйдзі... 222
Гл. заўвагу № 101.
**690.** Выйдзі, Лідачка, выйдзі... 223
Гл. заўвагу № 17.
**691.** Прывезлі мяне ды маладзіцу... 223
Гл. заўвагу № 101.
**692.** Што ж мы і хацелі... 223
Гл. заўвагу № 94.
**693.** Свахначка-галубачка... 223
Гл. заўвагу № 19.
**694.** Сваха свасе ды пакарылася... 223
Гл. заўвагу № 309.
**695.** Збірайся, родзе багаты... 224
Гл. заўвагу № 309.
**696.** Ой, зацвіла ды калінанька ў лузе... 224
Гл. заўвагу № 188.
**697.** Ой, да на двары два калодзежы ды й вядро... 224
Гл. заўвагу № 190.
**698.** Выйду на гараньку—млын меле... 224
Гл. заўвагу № 190.
**699.** Паедзь, адведай маладую дзеваньку... 224
Зап. Захарава В., Жыглінская Л. у 1981 г. у в. Парэчча Пінскага раёна ад Жук С. Л. (1924).
**700.** Ці не тут тое сяло... 225
Гл. заўвагу № 295.
**701.** Выйдзі, Манечка, з хаты... 225
Гл. заўвагу № 699.
**702.** Дзе наш зяць падзеўся... 225
Гл. заўвагу № 2.
**703.** Харошая гаспадыня... 225
Гл. заўвагу № 4.
**704.** Чый жа гэта перазоў... 225
Гл. заўвагу № 180.
**705.** Зналі мы, зналі, куды дачку аддалі... 225
Гл. заўвагу № 180.
**706.** Ды пагнуліся лаўкі... 226
Гл. заўвагу № 620.
**707.** Уздрыгнуліся сені... 226
Гл. заўвагу № 4.
**708.** Бярозка мая кудравістая... 226
Зап. Палуяновіч Л. у 1975 г. у в. Выганашчы Івацэвіцкага раёна ад Лапец М. І. (1923), Палуяновіч Н. П. (1937).
**709.** Хоць вы мяне таўчы, маладзіць застаўляйце... 227
Зап. Захарава В., Палуяновіч Л. у 1975 г. у в. Парэчча Пінскага раёна ад Гур'яновіч В. Ф. (1908).
**710.** Пілі бацькі нашы... 227
Гл. заўвагу № 709.
**711.** Ой, свацейка наша... 227
Гл. заўвагу № 1.
**712.** Ой, свацейка-салавейка... 227
Гл. заўвагу № 299.
**713.** Па ўсім сяле ціхенька... 227
Гл. заўвагу № 180.
**714.** Каля новага млына... 228
Гл. заўвагу № 4.

**715.** Швагерчык-маладзец, бывай здаровы... 228
Гл. заўвагу № 68.
**716.** Як не будзе па чужых хатах хадзіці... 228
Зап. Кардзянкова Т., Карней Т. у 1978 г. у в. Чамярын Пінскага раёна ад Лукашык Я. Ф. (1923).
**717.** Стаіць конік на стаенцы, рагоча... 228
Гл. заўвагу № 716.
**718.** Прапіла маці дочку... 229
Зап. Захарава В., Кардзянкова Т. у 1978 г. у в. Парэчча Пінскага раёна ад Фісюк М. С. (1911).
**719.** Дадому, сваты, дадому... 229
Гл. заўвагу № 718.
**720.** Круглае балота... 229
Гл. заўвагу № 198.
**721.** Ой, на моры ды на дошчачцы... 229
Гл. заўвагу № 92.
**722.** У панядзелак рана... 230
Гл. заўвагу № 92.
**723.** З віннага калодзежа... 230
Гл. заўвагу № 28.
**724.** Кляновая лісціналька... 230
Гл. заўвагу № 718.
**725.** Нешта ў лесе зашумела... 230
Гл. заўвагу № 4.
**726.** Дайце, свахі, ды пірага... 231
Гл. заўвагу № 12.
**727**. Стаяла Надзечка на прымосце, стаяла... 231
Зап. Захарава В. у 1975 г. у в. Азершчына Рэчыцкага раёна ад Лапацінай Т. К. (1900).
**728.** Каліна-маліна галлё паламала... 232
Гл. заўвагу № 4.
**729.** Ды прыехала маці... 232
Зап. Літвінка В., Цынкевіч М. у 1979 г. у в. Верхні Церабяжоў ад Літвінка В. В. (1909).
**730.** Пабудзь, дачка, з тыдзень... 232
Зап. Кавалёва Р., Еўдасеў В. у 1974 г. у в. Барыскавічы Мазырскага раёна ад Квартальнай В. І. (1916).
**731.** Ой, мая мама... 232
Гл. заўвагу № 256.
**732.** Ой, каб я знала... 233
Гл. заўвагу № 180.
**733.** Аддала мяне маці... 233
Гл. заўвагу № 47.
**734.** Дзе ж нашы гадаваныя... 233
Гл. заўвагу № 188.
**735.** Выйдзі, Надзечка, выйдзі... 233
Гл. заўвагу № 4.
**736.** Наехала пэразвян... 234
Гл. заўвагу № 4.
**737.** Маладая Надзечка... 234
Зап. Карчык Л., Красавіцкая Р. у 1967 г. у в. Пелішча Камянецкага раёна.
**738.** Як паеду каля млына... 234
Зап. Кухарчык Т., Катляр Т. у 1969 г. у в. Падлессе Ляхавіцкага раёна ад Таранды В. Р. (1907).
**739.** Ой, што за гадзінанька настала... 234
Зап. Яраслаўцава Р. у 1970 г. у в. Прыбарава Брэсцкага раёна ад Базарук А. С.
**740.** Там, на возеры, плавалі качаняты... 234
Зап. Бабкова І., Давыдовіч С. у в. Страдзічы Брэсцкага раёна ад Дзямчук В. П. (1946).
**741.** Выйшла Надзечка на загуменне... 234
Гл. заўвагу № 4.
**742.** Ці высока салавей гняздо ўе? 235
Гл. заўвагу № 4.
**743.** Ой, у полі вішанька трайчаста... 235
Гл. заўвагу № 4.
**744.** Стаіць конік ды на стаенцы рагоча... 235
Гл. заўвагу № 4.
**745.** Ой ты, сваце, сівы селязеню... 236
Зап. Захарава В., Літвінка В. у 1979 г. у в. Верхні Церабяжоў Столінскага раёна ад Каржоўнік У. Ф. (1892), Казёл Н. С. (1930), Казёл А. А. (1932). Вар.: Зап. Лукомскі А. у 1958 г. у г. п. Тураў Жыткавіцкага раёна.
**746.** Чарачка мая... 236
Гл. заўвагу № 745.
**747.** У нашага свата... 237
Гл. заўвагу № 88.
**748.** А ты, півавар... 238
Гл. заўвагу № 745.
**749.** Як з'едзем мы на мяцёны двор... 238
Гл. заўвагу № 317.
**750.** Маладая дзеванька... 238
Гл. заўвагу № 317.
**751.** Цераз бор сасна калыхалася... 239
Зап. Захарава В., Алейнікава Н. у 1969 г. у в. Какорыца Драгічынскага раёна ад Зіновіч М. П. (1932).
**752.** Селі пэразвяны, селі... 239
Зап. Аксёненка І., Брычкова Н. у 1969 г. у в. Новая Мыш Баранавіцкага раёна ад Банкевіч К. Л.
**753.** У нядзелю рана... 239
Гл. заўвагу № 752.
**754.** Ой, блудзілі прыданачкі... 239
Гл. заўвагу № 745.
**755.** Ой гуляйце, прыдане, гуляйце... 240
Гл. заўвагу № 745.
**756.** Маладога маці... 240
Гл. заўвагу № 19.
**757.** Слава богу, сына ажаніла... 240
Гл. заўвагу № 4.
**758.** Думай, свякруха, яшчэ і гадай... 241
Гл. заўвагу № 53.
**759.** Дзе ж наша Манечка... 241
Гл. заўвагу № 19.

**760.** Як селі прыданкі... 241
Гл. заўвагу № 139.
**761.** Прыданачкі, мае галачкі... 241
Гл. заўвагу № 745.
**762.** Прыданыя дамоў едуць... 241
Зап. Ганчарова С., Калянкова Н. у в. Аляксандраўка Ельскага раёна ад Ілюк В. С. (1910).
**763.** Ой, рэчка, рэчка Славечна... 241
Гл. заўвагу № 17.
**764.** Не плач, Надзечка, у нас добра будзе... 242
Гл. заўвагу № 5.
**765.** Бяру я ягаданькі... 242
Гл. заўвагу № 322.
**766.** Ой, у бары, у бары... 242
Зап. Захарава В., Пятрэнка С. у в. Вярхі Камянецкага раёна ад Саўчук Ю. Н. (1893).
**767.** Была хата ж, як цямніца... 242
Гл. заўвагу № 12.
**768.** Памалу, сватове, памалу хадзіце... 243
Гл. заўвагу № 12.
**769.** Сядзем жа мы... 243
Гл. заўвагу № 75.
**770.** Старая хата, новая печ... 243
Гл. заўвагу № 170.
**771.** Ой, у клеці, у клеці... 243
Гл. заўвагу № 119.
**772.** Дзень добры, сястрычка... 243
Гл. заўвагу № 188.
**773.** Праз маю хату, мае сені... 244
Зап. Кавалёва Р., Дарашчонак З. у 1974 г. у в. Харомцы Акцябрскага раёна ад Беразоўскай Н. П. (1929).
**774.** Ой, чэсна-чэсна Лідачка... 244
Зап. Палуяновіч Л. у 1976 г. у в. Выгакашчы Івацэвіцкага раёна ад Лукашэвіч П. А. (1905).
**775.** Ой, мой бяценька родны... 244
Гл. заўвагу № 75.
**776.** Браточкі ад'язджаюць, сястрыцу кідаюць 244
Зап. Даргель Л., Аляксандровіч Т. у 1975 г. у в. Махновічы Мазырскага раёна ад Заяц П. Ю. (1909).
**777.** Кукавала зязюленька ў жыце... 245
Гл. заўвагу № 776.
**778.** Ой мы, прыдане, паедзема... 245
Гл. заўвагу № 180.
**779.** Не пайду я дадоманьку... 245
Гл. заўвагу № 180.
**780.** Не жаль нам каліны... 245
Гл. заўвагу № 28.
**781.** Ды падзякуем свату... 245
Гл. заўвагу № 4.

## Прыпеўкі і танец

**782.** Падушачкі, падушачкі... 246
Гл. заўвагу № 745. Распрацоўка мелодыі Шырмы Р.

## Дзеляць каравай

**783.** Сейся, авёс ранні... 246
Гл. заўвагу № 55.
**784.** Ды рана ж, рана... 246
Гл. заўвагу № 55.
**785.** Дзе ты бываў, дзе ты бываў... 247
Гл. заўвагу № 4.
**786.** Старшая каравайніца... 247
Гл. заўвагу № 4.
**787.** Не стой, каравай, у жыці... 247
Гл. заўвагу № 4.
**788.** Ой, рана-рана ды за гарою новы двор... 247
Гл. заўвагу № 77.
**789.** Катораму дружку краіці... 248
Гл. заўвагу № 745.
**790.** Дружка каравай крае... 248
Гл. заўвагу № 745.
**791.** Наш дружочак красен... 249
Гл. заўвагу № 745.
**792.** Дружаньку, галубаньку... 249
Гл. заўвагу № 745.
**793.** Дзякуй маладой, маладому... 249
Гл. заўвагу № 745.
**794.** Дарую першаму свату... 249
Гл. заўвагу № 57.

## Госці

**795.** Ой, пайду я ў лес па дровы... 249
Гл. заўвагу № 4.
**796.** Цячэ рэчанька невялічанька... 250
Гл. заўвагу № 4.
**797.** Як я захачу... 250
Гл. заўвагу № 745.
**798.** Ой, даўным-даўно... 251
Гл. заўвагу № 745.
**799.** Ой, даўно, даўно... 251
Гл. заўвагу № 240.
**800.** Сівенькая маманька... 251
Гл. заўвагу № 240.

ВЯСЕЛЛЕ Ў ДРУЖЫЛАВІЧАХ 253

Зап. Дземянцей Л., Навумавец В. у 1981 г. у в. Дружылавічы Іванаўскага раёна.

П 14 **Палескае вяселле** / [Уклад. і рэд. В. А. Захаравай]. — Мн.: Выд-ва «Універсітэцкае», 1984. — 303 с., іл., 4 л. іл.

У пер.: 1 р. 60 к.

У кнізе сабраны унікальныя па сваёй захаванасці вясельныя песні, якія запісаны ў наш час на тэрыторыі Беларускага Палесся.

Зборy папярэднічае ўступны артыкул пра фальклор і сучаснасць, апісанне вясельнага абраду. У кнізе ёсць нотныя прыклады, фотаздымкі, навуковы каментарый.

Разлічана на фалькларыстаў, студэнтаў-філолагаў і ўсіх, хто цікавіцца народнай творчасцю.

**П $\frac{4604000000-005}{M317-84}$ 51—83** **ББК 82.3Бел-6**

**Полесская свадьба**

Издательство «Университетское» Государственного комитета БССР по делам издательств, полиграфии и книжной торговли.

На белорусском языке

В книге
использованы слайды
В. А. Барановского,
В. В. Драчева, Ю. С. Иванова,
В. А. Крука, А. М. Лободы

Рэдактар А. І. Гутарава
Малодшы рэдактар Г. М. Школьнік
Мастак Р. В. Кондрад
Мастацкі рэдактар С. У. Балянок
Тэхнічны рэдактар В. П. Безбародава
Карэктары З. М. Машкевіч, Н. А. Соціна

ІБ № 558

Здадзена ў набор 25.05.83. Падпісана да друку 20.12.83. АТ 08760. Фармат 60×84¹/₁₆. Папера мелаваная. Гарнітура нова-газетная. Высокі друк. Ум. друк. арк. 17,67. Ум. фарб.-адб. 43,86. Ул.-выд. арк. 14,18. Тыраж 6 300 экз. Зак. 302. Цана 1 р. 60 к.

Выдавецтва «Універсітэцкае» Дзяржаўнага камітэта БССР па справах выдавецтваў, паліграфіі і кніжнага гандлю. 220048, Мінск, праспект Машэрава, 11.

Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КП Беларусі. 220041. Мінск, Ленінскі праспект, 79.



1 р. 60 к.



палескае вяселле